Уладзімір Караткевіч

# Нельга забыць

Раман амаль што сентыментальны

Мінск
Мастацкая літаратура
1982

*Памяці друга майго*
*Гераніма Стулпана - прысвячаю*

УСЕ ІМЁНЫ І ПАДЗЕІ Ў ГЭТЫМ РАМАНЕ -ВЫДУМАНЫЯ. УСЯКАЕ ПАДАБЕНСТВА З РЭАЛЬНА ІСНУЮЧЫМІ ЛЮДЗЬМІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВЫПАДКОВЫМ.

## П р а л о г

Дарога на поўнач ад горада кантралявалася інсургентамі і была небяспечнай. Таму ганцам, якія павінны былі трапіць у размяшчэнне коннага палка, даводзілася скакаць з захаду, пераправўляючыся ўнаброд праз Друць або - гэтая дарога была карацейшай, але і больш небяспечнай - ехаць поймаю ракі, паплавамі, каб потым, адолеўшы Дняпро, адчуваць сябе ў бяспецы пад аховаю ўрадавых войск.

На пяцьдзесят вёрст выгінастага рэчышча быў толькі адзін паром, вярстою вышэй ад горада. Яго нельга было аддаць у рукі паўстанцаў, якія маглі б такім чынам парушыць сувязь паміж часткамі карных войск і біць іх паасобку. З гэтай мэтай на левы, процілеглы гораду бераг Дняпра генерал Фікельмонт выслаў роту выпрабаваных у баях салдат пад началам капітана Пора-Леановіча. Капітану не вельмі верылі як нашчадку сепаратысцкай фаміліі і ўраджэнцу Магілёва. Таму "ў дапамогу яму" і "на адпачынак" паставілі, таксама капітана, Юрыя Горава, карэннага русака са старой маскоўскай фаміліі.

Гораў быў паранены ў левую руку ў сутычцы з атрадам паўстанцаў пад Ракавам і адасланы "ў тыл на лячэнне і адпачынак".

Тылу не было. У гэты трывожны жнівень 1863 года вайна была паўсюль. "Белыя" спрачаліся з "чырвонымі", беларусы абураліся шавінізмам "белага жонду". Успыхвалі, затухалі і зноў выбухалі ачагі абурэння палітыкай цара.

Пераспелае жыта плакала зярнятамі, а ў жыце стаялі шыбеніцы. І не ўстаў ніхто добры, любоўны, і не сказаў людзям, што нельга рэзаць адзін аднаго, што свет вялікі і на кожнага выстачыць ніў, што хлеб аднолькава смачны, на якой мове яго ні называй. Не мог сказаць.

Галоўным быў не хлеб. Галоўнай была свабода.

Становішча ставала трывожным. У канцы ліпеня генерал Фікельмонт даў загад знішчыць на Дняпры ўсе чаўны. Асобыя атрады рушылі выконваць загад. Пачалася вакханалія знішчэння. Папрасякалі днішчы чаўноў, віцін, шугалеяў. Не пашкадавалі апошняй душагубкі. Тры дні па ўсім Прыдняпроўі шугаў у неба агонь. Палілі кастры бярвенняў, з якіх інсургенты маглі б звязаць плыты. Прыбярэжнаму насельніцтву, што жыло амаль толькі рыбай, заставалася адно - галадаць.

Кардон, які абараняў паром, жыў нервова і напружана. А між тым баяцца не было прычыны. Цэнтр паўстання даўно

перамясціўся на захад. Галоўны атрад паўстанцаў Прыдняпроўя быў разгромлены яшчэ на пачатку лета, і генералу Фікельмонту гэта не магло не быць вядома.

Інсургенты ў колькасці пяцідзесяці шабель і двухсот штыкоў і кос групаваліся ў Звярынскіх лясах. Там іх выпадкова пабачыў нейкі селянін і кінуўся ў горад - папярэджваць. Дарогаю ён адабраў прыпрэжку ў ксяндза і ўсю дарогу гнаў коні. Перад самым горадам прыпражны конь здох. Мужык выпраг каранніка, узваліўся на яго і... палкоўнік Фралоў нашчэнт разбіў інсургентаў, акружыўшы іх. Кіраўнік атрада Усяслаў Грынкевіч быў узяты ў палон і асуджаны на смерць. Зараз ён сядзеў на гарадской гаўптвахце і чакаў. Яго павінны былі вылечыць, выспаведаць перад тварам Усёдаравальнага і толькі потым застрэліць, як сабаку. Дзеці-дэмакраты пажалі жудасны пасеў прыгоннікаў-бацькоў.

Але асобныя дробныя атрады яшчэ блукалі па пушчах, і плёткі перабольшвалі іх сілу. Ніхто нічога не ведаў, як заўсёды на вайне, і кардон калаціла ліхаманка трывогі і жаху.

Таму нікога не здзівіла, што 18 жніўня на кардон прыляцеў улан на ўзмыленым кані, нешта хутка перадаў Пора-Леановічу і быў перапраўлены на той бок ракі. Конь раняў на насціл белыя хлапякі пены і так цягнуўся да вады, што пасыльны ўдарыў яго. Гораў пераправіў конніка на другі бераг (загад Фікельмонта прадугледжваў абавязковую прысутнасць на плывучым пароме аднаго з афіцэраў пры чатырох салдатах) і са шкадобаю глядзеў, як жывёла, амаль па-чалавечы стогнучы, выносіла улана на стромы чырвоны адхон.

Гэта было перад вечарам. Парыла так нясцерпна, што салдаты і капітан абліваліся потам. Паром не быў "самалётам"[1], які рухае сіла плыні, і даводзілася цягнуць яго сілаю ўласных рук.

Цьмянае ад сонца люстра ракі здавалася мёртвым. Не боўтала рыба, і шэрыя чаплі на водмелях стаялі расхрыстаныя, замораныя, падобныя на пачварных вядзьмарак, апранутых у лахманы. Толькі ластаўкі ў быстрым лёце чыркалі крыламі ваду, ды недзе за бясхмарным даляглядам бурчаў нябачны пярун. Бурчаў упарта, раз-пораз.

"Будзе вераб'іная ноч", - падумаў Гораў.

Быццам адказваючы яму, адзін з салдатаў уздыхнуў:

---

[1] Самалётамі зваліся паромы, якім дастаткова было даць першы штуршок. Далей іх рухала плынь. "А салдат перакінуць на востраў самалётамі" (Загад Пятра I пры штурме Шлісельбурга.)

- Залье нас сёння. Як вясной, будзем куваць на востраве.

Працілеглы бераг быў нізкі, толькі на ўзвозе, дзе стаяла хатка паромшчыка і адрына, быў высакаваты пясчаны ўзгорак, упрыгожаны дзвюма хвоямі і дзесяткам чорных вольх. Туды вада не даставала.

- Іван, - спытаў салдата Гораў, - ты тут пяты год служыш. Што, шалее ў навальніцу Дняпро?

- Рака з характарам, - твар у салдата быў чырвоны, абліты сонцам. - У палавень залье ўсю пойму, толькі верхавіны над вадою дрыжаць. І так вёрст на сем. Несаабразнае месца для парома, пане, вось што я вам скажу. Тут у вераб'іную ноч дрэнна. Усе старыкі на пойме вадой залье... унь той клін адхопіць. Перапраўляцца нават і не думай. Канцы.

Паром торкнуўся ў бераг, і адразу лаза на беразе, якая дагэтуль плыла перад вачыма, спынілася, замерла.

Салдаты з вясёлым гоманам пацягнулі на ўзвоз чорны мораны дуб, прывезены на паліва.

Капітан уздыхнуў. Яму на хвіліну стала зайздросна. Быць такім шчыра вясёлым, такім неўтаймавана жыццярадасным - гэтага ён не мог, для гэтага трэба было быць істотай іншай пароды.

Усё тое ж самае. Трохі не месяц вочы бачаць той самы абрыдлы кардон, хатку паромшчыка, у якой філасофствуе за гарэлкай Пора-Леановіч, адрыну і вялізную стайню, дзе размясціліся салдаты, паласатую будку вартавога, асклізлы паромны канат.

Адзін паратунак - Дняпро. Ды і той ляжыць зараз пад свінцова-цяжкімі промнямі сонца, трывожны і немы.

А ў Маскве зараз цішыня. Масква толькі пачынае ажываць. Пусцеюць дачы і маёнткі. На ліпах Няскучнага саду першыя жоўтыя лісцікі; з багатых, па-асенняму, рынкаў даносіць пахам "валовых мордачак" (улюбёныя яблыкі маменькі). Маменька, пэўна, паехала зараз у манастыр маліцца за здравіе воіна Юрыя і за дараванне яму веры. Едзе паўз Круціцкае падвор'е ў сваім нехлямяжым, падобным на гарбуз вазку. Фурман Сідар з вялізным - на трох - задам крычыць на сустрэчных страшным голасам: "Адыдзі, сцеражыся!" А ў блакітным небе сляпуча блішчаць купалы сабораў, і плыве бязважкі контур Круціцкага церамка.

А вось і сам ён, Юрый, выходзіць з парадных дзвярэй, праходзіць дарожкай пад ліпамі, з насалодаю дыхаючы

празрыстым і ўжо схаладнелым паветрам. Ванька ў армяку з дзіркай пад пахай трасецца на козлах.

- Гэй, Ванька!

І вось ляціць, ляціць вазок. Спачатку па Цвярской, потым бульварам, потым на Арбат. І лікуе, захлынаецца ў грудзях ад радасці сэрца. Так, вайна скончана, вайны ніколі больш не будзе. І ліпы! І Арбат! І цудоўныя асабнячкі... І Nadine ўстае яму насустрач у сваёй белай сукенцы...

- Гэта вы? Божа мой, як я рада!

І зноў - занадта паспешліва - апускае да вышывання нявінныя, цёмна-сінія, дзівосныя вочы. Што з таго, што яны толькі двойчы абмяняліся парай нязначных слоў, што яны амаль незнаёмыя. Усё адно гэта Масква, і сонца, і дзень без крыві і стрэлаў. І Масква гэта, і ёсць Nadine, Надзенька, Надзейка, як кажуць тут. Што з таго, што ён цэлы год не бачыў яе, што яны малазнаёмыя. Вось ён бачыць яе валасы колеру ржавых кляновых лісцяў, такія пушыстыя, мяккія, лягусенькія, падзеленыя белым радком, яе рот з прыпухлай ніжняй губкай.

- Надзенька, каб вы толькі ведалі, як я сумаваў па вас, як нясцерпна мне было без вас на гэтай зямлі, што стаптана капытамі конных палкоў.

Яна ўсміхаецца. І цішыня. Недзе ўдарыў і змоўк у шкляным паветры далёкі звон. Шчасце! Масква! І цішыня, цішыня. ў шатах ліп. Цішыня.

Стрэл.

Гораў ад неспадзяванасці спатыкнуўся аб корань, які - д'ябал ведае нашто - выпер акурат на дарозе. І адразу пачуў за плотам распанелы грудны голас.

- Сымон, давай карту.

Вернуты стрэлам і гэтым голасам на зямлю, Юрый глыбока і цяжка ўздыхнуў і амаль з нянавісцю агледзеў страшны ў чаканні невядомага Дняпро.

Бровы маладога чалавека задрыжалі. Але ўжо ў наступны момант ён справіўся - нездарма яго паважалі за шалёную храбрасць, хоць толькі ён ведаў, як цяжка яна яму даставалася, - і цвёрдай хадою накіраваўся ў двор, гэты сумны двор, выбіты, як ток, акружаны паламаным плотам.

Сярод двара, тварам да забітай брамы, стаялі два чалавекі: салдат-дзяншчык і афіцэр. Салдат трымаў скрынку з пісталетамі і калоду карт. Афіцэр браў са скрынкі пісталеты і, не цэлячыся, страляў у браму, у маленькі белы чатырохкутнічак, прыбіты да шулы.

Афіцэр стрэліў апошні раз і павярнуўся:

- А-а, камрад... Да зброі, вісусы-гусары...

Горава ў які ўжо раз уразіў яго сухі прыгожы твар, белыя валасы і бакенбарды і, галоўнае, страшнаватыя блакітныя вочы з выразам пустаты і пагарды да ўсяго. І яшчэ рэзкі шнар паўз брыво і левую скронь.

Калі пры першай сустрэчы ён запытаўся ў Пора-Леановіча наконт паходжання гэтай адмеціны, той неахвотна буркнуў:

- Шпагаю тут адзін... падурэў. Штафедрон.

- Ну і што? - спытаў тады Гораў.

- Паспадзяваўся занадта на французскую школу, - з жахлівай іроніяй сказаў Леановіч, - у славутага, бачыце, Мерсье вучыўся.

Гораў ведаў, што чалавек, з якім звёў яго лёс, карыстаецца славаю першага ў палку - і не толькі ў палку - брэцёра, што ён ужывае толькі дуэльныя пісталеты, але за такім заняткам, як сёння, заставаў Леановіча ўпершыню.

- Руку набіваў, - сказаў Пора-Леановіч з паблажлівай ласкавасцю, - адвучвацца нельга.

Сымон, быццам жадаючы пахваліцца поспехамі пана, аддзёр ад шулы карту і здалёк паказаў яе Юрыю.

- Ат, глупства, - пагардліва сказаў Леановіч.

- Нічога не разумею, - сказаў Гораў, - звычайны туз... Жалудовы.

- А вы паглядзіце лепей, - раўнадушна сказаў капітан.

Гораў падышоў, схіліўся над картай і мімаволі пацягнуў ротам паветра.

Туз быў віновы. Тры кулі, пасаджаныя амаль адна ў адну, зрабілі з віней жолудзі.

- Капітан, - сказаў Гораў, - гэта лепшае, што я калі-небудзь бачыў,

- Лухта, - сказаў капітан, - хадзем лепей вып'ем...

...Гэта была звычайная вясковая хата, толькі што з бакоўкаю. Ды яшчэ палілі яе "па-беламу", так што хоць у гэтым сэнсе афіцэрам пашанцавала. Вялізны негабляваны стол, шырокія лавы, цемнаваты "Спас"у куце.

На вокнах у гаршках "алёнчыны слёзы". Сухія слёзы, бо зямля ўся ў тытунёвым попеле. Аж шэрая.

Адзінай украсай пацямнелых сцен былі два лубкі. . На адным святы Елісей з тварам хітрага ідыёта, насылаў на отракаў мядзведзіцу. Фарба ад німба расплылася ў Елісея па галаве, і

невядома было, чаму ён з такой раскошнай шавялюрай пакрыўдзіўся на мянушку "лысы".

На другім лубку тры татарыны дзялілі палон.

Пакуль Сымон ставіў на стол гарэлку, гуркі ў смятане, міску з варанымі кіяхамі і патэльню, на якой клекаталі ў кіпячым масле смажаныя гусцёркі, Пора-Леановіч сядзеў на лаве ля акна, чысціў пісталеты і размаўляў сам з сабою.

- Зброю, міл-свет Юрый Аляксандравіч, трэба даглядаць толькі самому. Гэта адзіная машына, годная двараніна. Масла для зброі - арыстакрат сярод маслаў для ўсіх машын... Толькі самому. Мой сябра аднойчы загінуў з-за таго, што крэмень у дуэльным пісталеце быў тлусты... Нават не брудны, проста тлусты, ад пальцаў.

Гораў глядзеў, як пальцы Пора-Леановіча з незвычайнай пяшчотай мацалі сталь, і здзіўляўся, чаму нешматслоўны, заўсёды іранічны калега сягоння такі гаваркі, быццам баіцца пакінуць язык хоць на хвіліну без працы.

А Леановіч ужо скончыў з пісталетамі, паклаў іх у футляр і сеў да засланага стала.

- Сёння я нап'юся, - вельмі сур'ёзна сказаў ён.

Юрый сеў за стол з другога боку. Ён толькі прыгубіў першую чарку: піць не хацелася.

Спякота за акном стала, відаць, зусім нясцерпнай. Грозны Дняпро ледзь рухаў у разамлелых берагах цяжкія, як расплаўленае волава, плыні. Пярун бурчаў ужо зусім блізка, замрэяна, амаль без перапынку.

Гэта чаканне жахлівага, разлітае ў знемагаючай прыродзе, гняло нервы. Кроў здавалася густой і цяжкай, як ртуць. Яна цякла павольна, нараджаючы панура-злосныя, амаль ліхаманкавыя думкі. І Леановіч да таго ж ляскаў чарку за чаркай, як быццам жадаў што б там ні было выканаць свой добры намер: напіцца да моцы божай.

Уважаючы на сённяшні настрой Леановіча, ад гэтай "моцы божай" можна было чакаць чагось цікавага. І таму Гораў бадай не здзівіўся, калі Пора-Леановіч раптам адсунуў чарку.

- Вайна называецца, - з лютай весялосцю сказаў ён. - Сумна, Юрачка. Мне б тады ваяваць, калі рабавалі, за косы валілі пад сябе дзяўчат. А тут замест усяго гэтага - капеечны віст і бацькоўскае пасячэнне пейзанаў. Абас... мы з расійскай гісторыяй.

Проста перад сабою, на фоне акна, Гораў бачыў яго сілуэт, рэзкі, прыгожы профіль з прамым носам і ссунутымі бровамі.

- Ты кажаш "людзі", - сказаў Леановіч, хоць Гораў нічога не казаў. - Вось калі не ўходаюць цябе мае суайчыннікі і ты дажывеш да нейкага там часу, - ты ўбачыш дажджы Леанід. Гэта зорны дождж. Зямля пападае ў яго кожныя трыццаць тры гады. І тады лятуць Леаніды. Зялёныя. Фасфарычныя. Быццам пан-бог, здзяцінеўшы, шморгае тысячамі западак і глядзіць, ці ўсё яшчэ людзі льюць кроў... Так яны лятуць тысячагоддзі. І кожны раз, як прылятаюць, бачаць на зямлі тое самае: п'юць кроў, гвалцяць, круцяць хвастом добрыя людзі.

За акном - Юрый з трывогай сачыў за гэтым - хмары пачалі наплываць аднекуль і зацягваць неба. Яны накіпалі з амаль неверагоднай хуткасцю, грувасціліся адна на адну, пасоўваючыся туды, да Дняпра, у бок горада, дзе вісела яшчэ бялёсая смуга на невялічкім лапіку блакітнага неба.

Задуха стала нясцерпнай. І нясцерпным стала чаканне.

Толькі Леановіч, здавалася, не адчуваў нічога. Яго нахабныя і страшныя вочы гарэлі вясёлым шаленствам. І Гораў, успомніўшы яго сённяшнюю забаўку, зразумеў, што чалавек, які сядзіць насупраць яго, - страшны чалавек, вельмі небяспечны чалавек, драпежнік, у якога, пэўна, зусім няма ў душы месца для так званых пакут сумлення.

Леановіч торкнуў пальцам у адзін з лубкоў.

- Мы вось... як гэтыя тры татарыны. Адзін татарын - Філька (так ён зваў генерала Фікельмонта), другі татарын - я, а трэці - вы, вельмі шаноўны Юрый Аляксандравіч... Дзелім цноту прыдняпроўскай зямлі. Занятак з сэнсам. Таму што яна пад каго толькі не клалася. І выяўляецца, што ўсё гэта па меншай меры непатрэбна-с.

І тут пачалося. За акном раптам сцямнела. Шалёная віхура праляцела дваром, задзёрла шынель на галаву вартавому, схіліла на страху стайні чорную вольху, і тая затрапятала, сагнуўшыся ў дугу.

Шаленства перадднавальнічнага ветру не скончылася на гэтым. Ён вырашыў, відаць, наведацца ў госці да людзей у хаце. Раптоўна грукнулі. дзверы, страшэнная пройма пацягнула да печы, дзьмухнула ў чалеснікі, задзёрла па дарозе абрус, ледзь не сарвала яго са стала разам з наедкам і вылецела ў комін, сказаўшы выразным фальцэтам:

- Аоў.

Гораў убачыў у акно, як гэты парыў проймы выкінуў з напаўразбуранага коміна галчынае гняздо і пагнаў яго, як кола, па пыльнай траве.

- Сымон, чортаў сын, - крыкнуў Гораў, - каглу забыў зачыніць.

І сам кінуўся да печы, зачыніў каглу, падторкнуў яе анучай.

Сымон скочыў у хату як апантаны, паправіў абрус, зачыніў дзверы, шуснуў у бакоўку і борздзенька выскачыў адтуль з запаленай свечкай.

Гораў убачыў, што Леановіч сядзіць, успёршыся скронню на кулак, вельмі бледны, з заплюшчанымі вачыма. Вусны яго варухнуліся:

Стаіць певень над кручаю, -

Заторкнута с... анучаю.

І растлумачыў:

- Разгадка гэтай загадкі - "кагла". Катэхізіс народнай мудрасці ўвесь складаецца з такіх выслоўяў. Гораў убачыў, што Сымон задаволена хмыкнуў.

- Ідзіце, Сымон, - сказаў ён, гледзячы ў акно.

Сымон выйшаў. Гораў павярнуўся да субяседніка і з дакорам сказаў:

- Як вам не сорамна. Пры салдаце паказалі сябе дурнейшым за яго. Аблаялі народ. Вы ж беларус. Старога роду.

Па шчоках Леановіча папаўзлі чырвоныя плямы. І раптам ён зацікаўлена спытаў у Горава:

- Што мне, есці гэта? І што такое, наогул, беларус? Каго тут не было? Немцы былі, палякі былі, літва была. І раптам... бе-ла-рус. Сеў сабе з дурной мордай і - сікась-накась - пальцам у носе калупае...

Пры апошніх словах зрэнкі Леановіча папаўзлі да пераносся. Твар стаў такі дурны, што Гораў са сваім легкаважным і вясёлым характарам не вытрымаў, засмяяўся.

- Няма нічога смешнага, - вызверыўся Леановіч. - І ў вас і ў нас адна хвароба. Усю сваю гісторыю мы задніцай думалі. І наконт будучага ў гэтым сэнсе я аптымістам быць не магу... Чаго ад нас чакаць? Святаслаў забі Яраслава, Яраслаў забі Ізяслава, Ізяслаў забі Святаполка, а Святаполк коцнуў Барыса ды яшчэ і Глеба... туды ж яго матары. А тыя да пакутніцкай канчыны ўходалі двух братоў і трох сватоў і за гэта хрысталюбівай праваслаўнай царквою прылічаны да хеўры святых...

Вераб'іная ноч за акном ужо ўступіла ў свае правы. Неяк вельмі хутка. Дождж сцябаў так, што, здавалася, паветра было менш, чым вады. Маланкі крэслілі неба. Так часта, што жоўты

агеньчык свечкі стаў зусім непатрэбным. У сінім агні бліскавіц Гораў бачыў мярцвяны твар, пакрыты кропелькамі поту.

- І заўсёды на наш вялікі народ палка знойдзецца, часцей за ўсё чужая. Цар, псар - гэта нам усё адно, абы кумпякі магутныя былі, ды барада венікам, ды вусы пажахлівей. І ўжо тут мы ў вернападданасці сваёй усяго яго абліжам, аж да цяжкага гузна. Іх вялікасць у ложы сядзяць, гімн, створаны вялікім паэтам, яму спяваюць, а бараны ў лікаванні да яго ўсім натоўпам кідаюцца... А блакітныя мундзіры іх - па мордзе, па мордзе: "Сядзіце на нумарных месцах. Чорт вас ведае, а раптам у вас гармата ў каго ў кішэні..." А ў тых па мордах і юшка цячэ, і слёзы замілавання. І не разбярэш, чаго яны галосяць - ці ад болю, ці ад захаплення... А назаўтра - "За цара, за веру, з намі бог! Бязбожныя французішкі караля свайго да смерці забілі. Бі іх, пакуль смяротнай ікаўкай не загікаюць". Патрыятызм.

Юрыю і шкада было гэтага чалавека, і абурэнне разбірала. І ўсё ж згадзіцца з ім было нельга. Гэта азначала, што ўвесь ягоны свет: універсітэт, дзе прафесары чыталі пра мікракосм, Nadine, якая захапляецца Тургеневым, чынны, велічны, дзяржаўны спакой Неўскай набярэжнай, маці, якая просіць аб веры для сына і хрысціцца з любоўю на крыж Міколы на Курыных ножках, - усё мана, усё міраж.

Казаць Леановічу аб гэтых няўлоўных прыкметах, бадай што, і няварта было. Ён, прасталінейны, мог і не зразумець. Таму Гораў даволі бездапаможна - ён і сам адчуў гэта і пачырванеў - сказаў яму:

- Вы дваранін, капітан Леановіч, вы павінны паважаць традыцыі...

Леановіч ускіпеў:

- А адкуль маё дваранства ідзе, вы ведаеце? Чаму ў мяне да прозвішча прыдомак "Пора", ці, па-простаму, "Пара"?

- Не, не ведаю,

- Таму што ад бандзюкоў паходзім, міл-свет Юрый Аляксандравіч... У цараванне, здаецца, цара-цяляці горад Магілёў аддаўся ва ўладу баганоснага маскоўскага воінства. Заўважце, сам. Ну, на знак удзячнасці жыхароў уганорылі трымаць гарнізон коштам самога ж вялікага града. І сталі тут нашы лабідуды думу думаці. "Гэта каб яшчэ батагамі, дык згода была б - усё жыццё з-пад батагоў не вылазім. А грошыкі - тут ужо не. Дудкі".

Стук у дзверы прымусіў Леановіча змоўкнуць. І Гораў сказаў холадна:

- Заходзь.

Увайшоў Іван, той самы, з якім Гораў размаўляў на пароме. Грубы, чырвоны твар Івана, твар сапраўднага салдафона, быў мокры. З-пад салдацкай бесказыркі спадала пасма рэдкіх сівеючых валасоў. І нягледзячы на тое, што ён быў мокры, хоць выціскай, што з шыняля капала, - кожны пазнаў бы ў ім старога, бывалага салдата. Выраз твару казаў сам за сябе, выраз афіцыйнай адданасці і пачцівасці, праз які відавочна праглядала лёгкая пагарда і свая, незамаскаваная, думка аб усім.

- Чаго табе? - спытаў Леановіч.

- Ваша высакароддзе, вада прыбывае. Рака пайшла старыкам.

Гораў мог бы пабажыцца, што на твары Леановіча мільганула радасць.

- Брашы больш, - з недапушчальнай фамільярнасцю сказаў капітан. - Што ж, за гадзіну залівені магло так раку наліць?

- Пэўна, у вярхоўях некалькі гадзін ліло, ваша высакароддзе. Вадамерная рэйка пад вадой.

- Ну і добра. Дні два можам не чакаць мяцежнікаў... Ідзі да д'ябла.

І, пабачыўшы, што салдат усё яшчэ стаіць, спытаў:

- Ну, чаго табе яшчэ?

- Прахожыя могуць сунуцца ў ваду на звычайным пераездзе цераз старык... Дазвольце мне каравул паставіць... Могуць патопнуць.

- Твая якая справа? - спытаў капітан. - Няхай не соваюцца ў ваду, няхай вяртаюцца ў Збароў і там начуюць... Ніякіх каравулаў.

- Слухаюся - ніякіх каравулаў, - сказаў Іван і выйшаў.

Леановіч яшчэ хвіліну маўчаў, гледзячы за акно, дзе ў сінім святле маланак буйна скакалі па зямлі густыя вадзяныя бізуны. Потым казаў далей:

- І вырашылі рэзаць кроўных братоў. Калі ваш продак сярод іх быў, дык я яму не пазайздрошчу. Таму што некалькі тысяч іх было, і ніхто не ўцёк... Пачалося з таго, што нехта са стральцоў на кірмашы пірог у бабы ўхапіў. І тут мой продак, як хрысціянін, не вытрымаў, выбег з ратушы з крыкам "Пара!..".

...Увесь Мікалаеўскі спуск касцямі закідалі - адсюль і пайшла новая назва: Касцярня... Колькі стральчыхі па іх пагаласілі, колькі дзеці! Нічога не зробіш, любоў да брата... А з-за чаго? З-за пірага ўсё, родненькі, з-за пірага...

...З пірага і дваранства наша пачалося. Кароль польскі - бац, прывілей: даць Леановічам прыдомак "пара", а як на іхняй мове гэта дрэнна гучыць, то перарабіць яго на "пора". Весяліся, Марцэля! А потым у горад польскае войска, ды кожнага дваццатага - на слуп: няма чаго зламысныя змовы з Масквою заводзіць. Э-ех, павесяліліся.

- У вас ёсць народ, - ціха сказаў Гораў. - Ёсць павага да чалавека, любоў да яго. Хіба гэтага мала? Я ведаю, многа дрэннага рабілі і робяць улады, але ж людзі не вінны.

- Мы вельмі любім народ, - сказаў Леановіч, усміхаючыся кутком прыгожых губ. - Каб зручней залазіць яму ў кішэнь... Не-е, вы, Юрый Аляксандравіч, з вашай слінявай вераю ў чалавека ідзіце - ведаеце куды? Гэта быдла па галаве трэба біць. І ваша, і наша, і польскае, і ўсякае. Іншага яны не варты... Шкадаваць? Каго? За што? За тое, што яны мэкаюць і бобам сыплюць? За тое, што ў іх спіна прыстасавана для сядла? За тое, што іхнія зады самі пэндаляў просяць?.. Не-е, Юрый Аляксандравіч, будзем шчырымі... Ёсць мой мозг і мая рука, што кожнага здолее ўзяць за глотку. Я іду! Хіліся?.. І нікога не шкадуй для сваёй мэты... Пакуль у сілачку не ўваб'ешся, - маўчы, падпарадкоўвайся і паступова прывучай усіх баяцца цябе... А там - не шкадуй. Ні жанчын, ні дзяцей. Ідзі па трупах, і добра табе будзе. З людзьмі ўсякія сродкі добрыя. Здрада, атрута, данос, а пасля нож, бізун, турма... І не трэба саромецца. Я не саромлюся. На прыгожыя словы - пляваць. Я такіх брыдот нараблю, што ўсіх ванітаваць будзе. Вас будзе ванітаваць, а я тым часам на кожнага пятлю накіну. І зацягну...

Дзіўны чалавек сядзеў перад Горавым. Страшны, як шалёная рысь. І Гораў няшчыра пазяхнуў і спытаў:

- Вы французскай хваробай ніколі не хварэлі, капітан? Бо нешта мне здаецца, што такія словы сведчаць аб размякчэнні спіннога мозгу.

- Нават слоў маіх баіцёся, - жорстка засмяяўся Пора-Леановіч. -Не, капітан, я не хварэў французскай хваробай. Ніколі. І продкі мае не хварэлі. Зберагалі для мяне сваю сілу.

- Ішлі б вы лепей спаць, капітан.

- А вы што?

- Я не хачу вас слухаць. Я афіцэр. Што б я ні думаў, я звязаны прысягай і законам гонару.

- Псу пад хвост, - сказаў Леановіч.

Ён устаў і шырока пацягнуўся, распраўляючы мускулы. Засмяяўся:

- Прашчур - малайчына. Галоўнае - стаць на той бок, які выйграе.

Гораў адышоў ад стала, успёрся локцямі на падваконне і прыціснуў лоб да халоднага шкла.

Дождж ліў так, што ўся зямля ў сляпучым святле бліскавіц укрывалася сінімі ўспышкамі падаючых кропель. Быццам поле нізкіх, ля самай зямлі, кветак вырастала паўсюль і зноў згасала ў цемры. Білі грымоты.

Нехта люта сваволіў, ломячы ў хмарах тоўстыя дрэвы.

Праз шум дажджу пачуўся шолах колаў па хліпкай зямлі. Глухія галасы.

Гораў угледзеўся ў цемру:

- Нехта прыехаў.

Ён накінуў плашч і выйшаў.

Сярод двара стаяла парная прыпрэжка. Дымелі спіны зillустраваных коней. А за імі ледзь вымалёўваўся цёмны сілуэт лёгкай брычкі з узнятым верхам. Фурман, сівавусы чалавек, падобны ў плашчы на натапыраную птушку, завіхаўся ля коней. Ад маланак цень яго, вялізны і нехлямяжы, кідаўся ва ўсе бакі.

Завеска брычкі адшморгнулася: з'явілася і ступіла на прыступку невялічкая нага. Жанчына, высокая і зграбная, у цёмным плашчы, стала проста ў ваду, якая плыла па ўсім двары, і азірнулася.

- Сюды, пані, - спяшаючыся з ганка ёй насустрач, голасна сказаў Гораў.

Ён адчыніў перад жанчынаю дзверы. Тая пераступіла парог і адкінула капюшон, мружачы вочы ад сляпучага - пасля цемры - агеньчыка свечкі.

Здзіўлены Леановіч глядзеў на жанчыну вялізнымі вачыма.

Глядзець было на што. Ніколі яшчэ Гораў не бачыў такога аблічча.

Густыя цёмныя бровы, якія здаваліся амаль мужчынскімі, каб не агромністыя, як чорныя азёры, бліскучыя вочы і прыпухлы маленькі рот. Прамы, невялічкі нос, мяккі авал трохі асіметрычнага аблічча, якому самая гэтая асіметрычнасць надавала дзіўны выраз мяккай і жаночай пакорлівасці ў спалучэнні з уладнасцю, мала таго, з прывычкай уладарыць.

"Адкуль гэта, - падумаў Гораў, - ад арыстакратызму? Наўрад ці. Яна, відаць, такі самы арыстакрат, як я. Праста чалавек духу і думкі. А ўладнасць - як гэта я не здагадаўся? - проста таму, што мужчыны не могуць не быць рабамі перад такой жанчынай.

І ён адчуў, што каб не мундзір, каб не вайна, - ён, можа, і сам стаў бы яе рабом. І нёс бы гэтае рабства нават з прыемнасцю.

На цёмна-русых валасах жанчыны, над лобам, вясёлкава блішчалі малюсенькія кроплі вады. І быў гэта твар, у якім было нешта дзіцячае і безабароннае пры ўсёй дарослаcці.

Леановіч уздыхнуў і апусціў твар у далоні. Гораву здалося, што плечы капітана калоцяцца ад прытоенага смеху. Але, калі Леановіч узняў вочы, твар яго быў сур'ёзны.

- На той бераг, калі ласка, - сказала жанчына.

Леановіч глянуў на гадзіннік. Было адзінаццаць гадзін ночы.

- Сядайце, піце чай, - спакойна сказаў Пора-Леановіч. - Сымон, фурману шклянку гарэлкі. Коней - выцерці.

- Дзякуй вам на добрым слове, але я не магу, - сказала яна.

- Падпарадкуйцеся, калі ласка, - ветліва, але цвёрда сказаў Леановіч.

Жанчына прыўзняла на яго вочы, быццам здзіўленая гэтай нечаканай цвёрдасцю, Але ўсё ж падпарадкавалася, села

Гораў паспешліва згроб разам з абрусам рэшткі вячэры і выпіўкі. Адной рукой. Правая віcела на перавязі. Яна зусім загаілася, але не магла доўгі час вісець усцяж цела, зацякала.

Увесь гэты час жанчына безуважліва глядзела ў акно. І нават потым, калі пілі чай, не дакранулася да ежы, нягледзячы на ўсе ўгаворы Леановіча. Толькі пагрэла рукі аб шклянку і адпіла некалькі глыткоў. Леановіч павольна і з відавочнай насалодаю хлябтаў бурую ад заваркі вадкасць.

Калі Сымон прыбраў са стала, капітан зручна сеў, прыхіліўшыся спіною да сцяны, і, спытаўшы дазволу, закурыў.

- Дык у чым справа, пані?

- На той бераг. Я вельмі спяшаюся, - усхвалявана сказала яна. - За ўсю дарогу я толькі тут на цэлую гадзіну затрымалася.

- Давядзецца чакаць да раніцы, - спакойна сказаў Леановіч.

- Чаму?

- Вось загад генерала Фікельмонта ўначы абараняць паром, не падпушчаць чужых людзей. Тым больш цывільных... Пераначуйце тут. Пакой мы аддамо вам.

- Мне нельга.

- Вельмі шкадую, пані. Загад Фікельмонта. Ваенны час, пані. Інсургенты...

- Я не інсургент. Я толькі жанчына, маці.

- Захварэла дзіця? - пацікавіўся Пора-Леановіч.

- Не. Я спяшаюся да мужа.

- Шкадую, пані, але дапамагчы не магу. Палявы суд - непрыемная штука. І ёсць загад Фікельмонта, - як малому дзіцяці, добразычліва тлумачыў Леановіч.

- У мяне таксама загад. Яго сіяцельства. Прачытайце.

Ніхто не папрасіў назваць прозвішча. У гэты час на Беларусі было толькі адно "сіяцельства", падпарадкоўваючыся волі якога рухаліся палкі, ганцы заганялі да смерці коней, людзі мучылі людзей.

- Так, загад Мураўёва, - сцвярджальна сказаў Леановіч, гледзячы на паперу.

Гораву здалося, што выгляд у Леановіча не вельмі здзіўлены.

- Ого, - з удаванай уважлівасцю сказаў Леановіч, - дык вы жонка Усяслава Грынкевіча. Таго?

- Так, - сказала жанчына, сыходзячы да чагосьці, падобнага на просьбу, - вы ж бачыце, што я вязу памілаванне. Будзьце літасцівы.

Твар яе аж ззяў.

- Замянілі пажыццёвай катаргай. Гэта такое шчасце! Такое...

Яна ўпершыню ўсміхнулася. Не было нічога прыгажэйшага за гэту ўсмешку.

- Мужу варта было б думаць раней, - суха сказаў Леановіч. - Замест саламянай падушкі ён абдымаў бы зараз адну з самых прыгожых жанчын, якіх мне даводзілася бачыць.

Жанчына ўспыхнула, але стрымалася:

- Я ўсё гэта разумею. Але зразумейце і вы. Ён будзе жывы. Толькі на той бок - і праз гадзіну я там... І ён жывы.

Леановіч маўчаў, нешта абдумваючы. Зірнуў на гадзіннік. Машынальна глянуў і Гораў. Дванаццаць гадзін. Быццам у адказ праз рык навальніцы данесліся далёкія глухія ўдары саборнай званіцы горада.

- І яшчэ адна прычына, - сказаў нарэшце Леановіч. - Вераб'іная ноч. Рака ўсхадзілася. Можна патапіць паром. І вас. І людзей.

- Зразумейце, яго кожную хвіліну могуць забіць.

Гораў бачыў: яшчэ дзесяць хвілін такога катавання, і жанчына можа заплакаць. Усе другія на яе месцы плакалі б ужо.

Пора-Леановіч, усё з тым самым выразам дагаджэння на сухім прыгожым твары, накінуў на плечы жанчыне плашч.

- Выйдзем, пані... Гораў, хадзем з намі.

Дождж на дварэ пачынаў сціхаць, затое ўзняўся і абяцаў зрабіцца яшчэ больш моцным нізавы вецер. Калі яны, з цяжкасцю пераадольваючы яго імпэтныя парывы, выйшлі на адхон, - іхнім вачам адкрылася жудаснае відовішча.

Рака лютавала. Нізавыя парывы ветру развялі вялікія, у рост чалавека, хвалі. Яны каціліся супраць плыні, шоргаючы белымі грабянцамі. Хлапякі пены ля берага з цяжкасцю, з яўнай напругай пасоўваліся па плыні, падскокваючы на вадзяных гмахах. А ў прыдоннай лазе круцілася, віравала рудая пена. Хвалі ішлі адна за адной, і процілеглы бераг губляўся ў чарнільным навальнічным цямноцці.

Але і адтуль, са змроку, далятаў усхваляваны, нізкі гук вады. Рака таўклася ў берагі, імкнучыся вырвацца з іх. Праз пляму святла на вадзе слізгануў па хвалях дзіравы кошык, потым - цэлае дрэва, яблыня, вымытая з карэннем. Дзіўна было бачыць на яе апырсканых пенай галінах, якія круціліся, то знікаючы пад вадой, то зноў выплываючы, два-тры недаспелыя антоны.

Леановіч моўчкі паказаў рукою, што трэба вяртацца ў пакой. Толькі там, у разамлелай цеплыні начнога чалавечага гнязда, ён сказаў:

- Вы самі бачыце, пані. Паром немінуча знясе. Пачакайце да раніцы.

- Але ён чакае, - амаль умольна сказала яна.

- Ён чакаў два месяцы. Некалькі лішніх гадзін нічога не зменяць, - абыякава да здзеклівасці сказаў капітан.

"Не можа ж ён не разумець яе становішча, - думаў Гораў. - Што гэта? Здзек або халодная подласць".

Жанчына, здавалася, не заўважала інтанацый Леановіча.

- Для асуджанага кожная гадзіна чакання - гэта лішнія маральныя пакуты, - проста сурова сказала яна, - вы ведаеце гэта...

- Вы можаце загінуць пры пераправе.

- Я не баюся гэтага.

- Я за вас таксама не баюся, - абыякава сказаў Леановіч. - Але я адказны за жыццё салдат. У іх таксама жонкі.

- Я магу паехаць з ёю, - раптоўна для самога сябе сказаў Гораў.

- Вы адзін не здолееце, - са спакойнай усмешкай на прыгожых і жорсткіх вуснах сказаў Пора-Леановіч. - Не звяртайце ўвагі, пані. Гэты парыў сведчыць аб добрым сэрцы,

але ў капітана Горава параненая рука... у бітве з інсургентамі... Дарэчы, у гэтай бітве ён выявіў сябе героем,

То быў несумленны ўдар, але Гораў змоўчаў: ён не хацеў сказаць, што паранены пад Ракавам, а не тут, ён наогул не хацеў апраўдвацца.

- Так, - сказаў ён, - але можна спытаць у салдат, хто захоча.

- Салдацкая самадзейнасць? - Спакой тону Леановіча межаваў са здзеклівасцю. - Ну, не... А адказ - мой.

- Мне здаюцца падазронымі вашы паводзіны, - сказаў Юрый.

- Капітан Гораў, - не павышаючы голасу, сказаў Леановіч. - Я забараняю вам... Вы пакуль што падначалены.

Гораў змоўк. Ён зразумеў, што капітана не зрушыць, што ён мацнейшы за каменны мур. І такі ж раўнадушны. Гораў нават адчуў на хвіліну, што сабою ён, Юрый, пагарджае, а Леановіча пачынае паважаць за такое няўхільнае выкананне абавязку. І ўсё ж гэта быў жорсткі абавязак, непрыемны абавязак.

- Я паплыву, - сказала жанчына, - я добра плаваю.

Зірнуўшы на яе рашучы, мэтаімклівы твар, Гораў зразумеў, што гэта не пустая пагроза.

- Я не дазволю вам, - сказаў Леановіч. - Вы забылі, што я мужчына і воляй лёсу адказны за жыццё дамы, за ваша жыццё.

- Вы мужчына? - горка сказала яна. - Сапраўдны мужчына сам паплыў бы са мною, калі не хоча рызыкаваць салдатамі і паромам. Вы проста баязлівец.

- Я дзесяць разоў стаяў на бар'еры пад кулямі, - безуважна сказаў Леановіч. - Я тройчы паранены на вайне...

Яна кінулася да яго, потым бяссільна апусцілася на ўслон, упала галавою ў далоні:

- Майце літасць, пан капітан... Божа! Хоць галаву аб вас разбі!!!

- Не раю, - сказаў Леановіч.

Слухаць маўчанне, якое наступіла пасля гэтых слоў, было нясцерпна. Гораў выйшаў на ганак і доўгі час стаяў, затуліўшыся ад халоднага ветру, за рогам хаты. Потым, з цяжкасцю вырываючы ногі з раскіслага глею, пайшоў да брамы пад рэдкім, як слёзы, дажджом,

Далёкія чырвоныя бліскавіцы ўсё яшчэ ўспыхвалі на вяршынях чорных вольх. Вецер не сціхаў. Рака ўтрапёна плёскалася пад адхонам.

Гораў абышоў пасты - паўсюль яго сустракалі воклічамі. Кардон не спаў.

...У гадзіну ночы, агледзеўшы ўсё, што трэба і не трэба, Гораў усё яшчэ гуляў пад дажджом, цяпер без мэты. Праходзячы, нарэшце, да ганка паўз асветленыя вокны хаты, ён убачыў у адным акне твар Леановіча, жахлівы, відавочна пастарэлы твар. Леановіч глядзеў у цемру.

У акне бакоўкі Гораў заўважыў постаць жанчыны. Тая кідалася, як зняволеная. Спынілася, ударыла кулачком па печцы.

Гораў апусціў галаву. Яму не хацелася больш ісці ў хату.

Зноў рака, зноў відовішча звар'яваных хваль. Зноў двор - чортава кроў, плашч пачынае прамакаць! - зноў месца за рогам і агеньчык запалкі ў руцэ.

- Палова другой.

Якраз у гэты час Грынкевічава выйшла на ганак. За ветрам Гораў невыразна пачуў:

- Божа, божа, божа...

За яе спіною з'явіўся сярод цемры аранжавы прамакутнік дзвярэй і ў ім сілуэт падабранай, налітай імпэтнай і спакойнай сілаю, постаці.

- Зайдзіце ў пакой, - добразычліва-ледзяным голасам сказаў Леановіч, - я адказваю за вас.

Яна падпарадкавалася, і Гораў, адчуваючы, што зараз можа адбыцца нешта жахлівае, пайшоў за імі ў пакой, зноў убачыў змучаны, без крывінкі твар.

- Майце літасць...

І раптоўна ўся сіла гэтай натуры, уся яе палкая страснасць выбухнула парывам гора.

- Няўжо ў вас не было кахання... хоць маленькіх успамінаў? Яшчэ тры гады таму ён быў толькі маім жаніхом! Разумееце вы, ці ў вас лядзяш замест сэрца?! Быў май, і мы гулялі ў гарышні... Такі смех быў над паплавамі... А зараз ён заўчасна сівы, змучаны. Яму нельга!..

- Пані, усё гэта дарэмна, - ветліва сказаў Леановіч.

І гэтыя словы вярнулі яе да прытомнасці.

- А-а-х-х вы! Што вы варты? - з невымоўнай пагардай сказала яна. - Фрунт забіў вашу душу. Вы не разумееце нават, што ён не за сябе, што ён за народ, за вас, за гэтых бедных людзей. Ён не дзеля грошай, не дзеля ўлады. Ён... каб народ быў вольны. Гэта і ваш народ, пан капітан. Воля патрэбна ўсім

двухногім. А нам, беларусам, рускім, палякам, - больш за ўсіх. Бо мы штодня без яе паміраем у пакутах.

Твар Леановіча скрывіўся нейкай жудаснай грымасай:

- Пані, я адпраўлю вас не на другі бераг, а з аказіяй у Магілёў, калі пачую яшчэ хоць слова ў гэтым стылі.

Жанчына моўчкі пахітала галавой:

- Які ж вы нізкі чалавек.

Ляснулі за ёю дзверы бакоўкі.

- М-гух, сука, - сказаў Пора-Леановіч.

Гораў праглынуў камяк у горле і ціха сказаў:

- Леановіч, гэта брыдка.

Але на вуснах начальніка кардона зноў з'явілася прыязная і страшнаватая ўсмешка.

- Капітан, - сказаў ён, - гэта, здаецца, вас прыставілі наглядаць за мною, а не мяне за вамі. Мне здаецца, яны зрабілі дрэнны выбар.

Гораў аслупянеў. Ён ніколі не ведаў, ніколі нават не мог падумаць, што на яго можа ўпасці такое падазрэнне. Ён стаяў, моўчкі хапаючы ротам паветра. Бялявыя хвалістыя валасы прыліплі да спацелага лоба, глыбокія сінія вочы сталі жаласнымі.

Быццам атрымаўшы ўдар пад грудзі, ён з хвіліну моўчкі хапаў ротам паветра, а потым кінуўся прэч з пакоя.

Стоячы за рогам хаты, адчуваючы, як мокры ліст высокай вяргіні часам гладзіць яго па шчацэ, ён у думках пагражаў Леановічу самымі жахлівымі помстамі і ў той самы час ведаў, што нічога ён яму не зробіць, што гэты брэцёр з халоднымі вачыма робіць правільна, затрымліваючы жанчыну да раніцы, што на баку гэтага чалавека - права, права вайны, якой яны абодва служаць.

"Што ж, нічога не здарыцца дрэннага. Адна ноч. І раніцай яна сустрэне мужа. Ім дадуць спатканне, - думаў ён. - За што ж я злуюся на Леановіча, які шчыра выконвае загад?.. За тое, што ён свіння. Чаму?.. Ага, проста нельга адбіраць у гэтай жанчыны тых некалькі лішніх гадзін, што яна будзе з мужам перад тым, як... навекі, назаўсёды, хоць ён і будзе жывы".

Мокры ліст вяргіні зноў з ліслівай абыякавасцю пагладзіў яму шчаку.

"Але чаму "навекі"? Чаму "назаўсёды"? - думаў Юрый. - Ён пасядзіць год пяць, а потым, вядома, будзе амністыя... Цар міласэрны... Дрэнны чалавек не адпусціў бы на волю прыгонных... І ўсё ж, гэта жахліва... Нават пяць год. У жанчын такая мімалётная прыгажосць! Што будзе з яе вачыма, з гэтай

гордай шыяй, з гэтымі валасамі праз пяць год? Шкада жанчын, шкада іх дзіцячай безабароннасці... Толькі яе... А Леановіч робіць так, як трэба. Ён добры салдат, Леановіч, а я дрэнны... дрэнны".

І ўсё ж Гораў адчуваў, што ён ніколі не даруе сабе гэтай ночы, гэтых разважанняў за рогам хаты. Ён са злосцю адкінуў рукою мокрае сцябло вяргіні і ступіў у пляму святла, што падала з акна хаты на гразь.

Было дваццаць хвілін на трэцюю.

Ля плота, непадалёк, стаяў Іван, трымаючы нешта за пазухай.

Гораў глыбока ўздыхнуў - нясцерпна было вось так, аднаму, стаяць у цемры - і падышоў да яго. Салдат трымаў за пазухай адну руку. На яго цёмным твары блішчалі вочы пад кашлатымі бровамі.

- Што гэта ў цябе?

- А галчаняткі... бедныя. Познія, - сіпатым голасам сказаў Іван. - Гняздо раскатала. Жорсткая штука ўраган, барын. Дзе хавацца? На якой зямлі?

Настала паўза. Іван глядзеў за пазуху.

- Ты адкуль, Іван? - ціха спытаў Гораў.

- Маскоўскі.

- Землякі, - з нечаканай для сябе пяшчотай сказаў Юрый.

Зноў запанавала маўчаннё. Толькі шапацеў па дзядоўніку дождж.

- О-ох, - сказаў сіпаты голас Івана. - Зараз на Пятніцкай катрынка грае, служанкі ля пад'ездаў семкі лузгаюць... Іван Вялікі непадалёк гарыць, аж вачам балюча.

Абодва не думалі, што ў Маскве зараз таксама ноч. Вачам афіцэра і салдата яна здавалася сонечнай, ззяючай і асветленай цеплынёю вечнага жнівеньскага дня.

- Людзі з царквы ідуць, - казаў Іван. - "Вуглей гарачых!" здалёк даносіцца.

- На развале кнігамі гандлююць, - летуценна сказаў Гораў.

- Угм, - няўпэўнена і адразу неяк адчужана сказаў Іван.

І Гораў таксама адчуў гэта. Ён стаяў, пакутліва думаючы, што яму штосьці трэба ад гэтага салдата, што яму трэба штосьці вырашыць.

- Галчаняткі вы... дурныя. Бач, вачыма лыпаюць.

І раптам Гораў, амаль нечакана для сябе, сказаў:

- Іван, як пераправіцца цераз раку?

Іван спадылба глянуў на афіцэра, павагаўся, а потым цалкам натуральна адказаў:

- Яно можна.

- Ты не думай, - заспяшаўся Гораў. - Я загадваю, я сам з табою і паеду...

- Вядома, загад, барын, іначай нельга, - сурова сказаў Іван. - Можна б і ў начальніка кардона спытаць, але ён, відаць, заснуў.

І прыбавіў:

- Мы човен схавалі.

- Човен? Як асмеліліся? А загад?

- А адкуль у нас рыба ў юшцы? - амаль груба спытаў салдат. - Што ж нам, на кашы сядзець? Калі самі сабе не дапаможам...

- Добра, добра, - сказаў Гораў і пасуровеў. - Што ж, Іван, са мной паедзеш?

- Цяжка ўтраіх, - уздыхнуў Іван, - але паспрабаваць трэба.

- Едзем.

- Ну-к, што ж, - Іван памаўчаў, потым падаў голас ў цемру. - Сідар, га Сідар, галчанятак вазьмі...

Гораў ужо цёпаў прэч ад яго па глыбокай гразі. Спыніўся пад акном бакоўкі, пашкроб у яго пальцам. І амаль адразу ўбачыў за каламутнымі шкельцамі яе твар з пашыранымі вачыма. Гораў прыклаў палец да губ, і яна здагадалася, бязгучна расчыніла акенца,

- Збірайцеся, - шэптам сказаў ён, - і дзьмухніце на свячу: хай думаюць, што вы спіцё.

Бакоўка адразу агарнулася цемрай. Белы цень твару наблізіўся да вачэй Горава.

- Дапамажыце мне.

У цемры дзве цёплыя рукі абвілі шыю Горава. Падтрымліваючы яе за стан, ён павольна пацягнуў яе на сябе - акенца было вельмі вузкім. Перагнуўшыся назад, ён адчуў, як на яго ключыцы ляглі цвёрдыя жаночыя грудзі. У наступную хвіліну яна стаяла поруч з ім.

- Дайце мне руку, - шэптам сказаў ён, - хадзем.

Маленькія цёплыя пальцы праціснуліся ў яго далонь. Гораў, спяшаючыся, павёў яе да берага, спачатку амаль на дыбачках, потым бягом...

- Іван, дзе ты? - шапнуў ён, нахіліўшыся з адхону.

- Тут, - прагучаў у адказ сіпаты голас.

Салдат стаяў на невялічкай убітай сцежцы.

- Хутчэй, - сказаў ён, і яны ўсе пабеглі берагам да высокіх зарасцяў лазы.

...Гораў трапіў нагою па калена ў ваду, балюча накалоў руку на сухую і вострую, як косць, лазіну ў гушчары. Іван узяў жанчыну з рук Горава і, занадта гучна шабоўтаючы нагамі па вадзе, панёс яе некуды ў нетры прыдоннай лазы.

- Ёсць, - сказаў ён, вярнуўшыся, - дайце руку.

І пацягнуў Горава кудысьці ў цемру.

Выцяўшыся каленам аб борт чаўна, Гораў пераваліўся ў хісткую пасудзіну.

- Чакайце, - буркнуў Іван, - толькі сцябла схаваю.

- Якое сцябла?

- Ну, тутэйшае слова, латок, на які нерат укладваюць... Хлопцы, як згубім, не пахваляць.

Ён яшчэ з хвіліну шапацеў у лазе, як вялізны бабёр, потым сунуў у руку Горава вясло.

- А другое?

- Гэта вам не катанне на Яўзе... Тут адным абыходзяцца. Вяслуйце ля самага борта, а потым злёгку падайце канец убок і ўгору.

- Дайце я, - сказала жанчына, - ён не ўмее.

- Сілы пашкадуй, дзіцятка, - грубым голасам сказаў Іван. - Да конскіх могілак дзве вярсты... у цемры.

Конскімі могілкамі называлася месца, ля якога стаяла гаўптвахта.

Іван моцным штуршком выкінуў човен з лазы. І адразу - спачатку слаба, потым мацней - пасудзіну пачало гайдаць, а потым кідаць па хвалях.

- Чорт, - сказаў салдат, - наўкос бяры, не стаў бокам да хвалі.

- Нічога не бачу.

Бледная бязгучная маланка якраз у гэту хвілну заліла няпэўным дрыготкім святлом абшар Дняпра, пасівелага ад ярасці, імклівыя грабянцы валоў, далёкі чорны бераг. Вёслы Горава і Івана ўдарылі па вадзе, ружовай ад святла бліскавіцы. І адразу гэтая вада стала чарнільнай, а на людзей цяжка наваліўся змрок. Потым, быццам жадаючы дапамагчы, неба раз-пораз пачало раздзірацца ўспышкамі святла. Гораў бачыў твар жанчыны, якая з прагай, з чаканнем, зусім без усведамлення небяспекі, толькі з лікуючым імкненнем наперад, да волі, глядзела на другі бераг, які амаль не набліжаўся.

Шкарлупінку кідала ў правалы паміж хваль, вецер адкідваў цёмны шаль на жанчыне, як вялізныя імпэтныя крылы.

Кожныя пяць хвілін даводзілася выліваць ваду; усе прамоклі да пояса. Човен скакаў па хвалях, і пырскі пены ляцелі ў вочы людзей: за бортам раз'юшана пляваўся Дняпро.

Гораву здавалася, што гэта цягнецца вечнасць, што цямноццю і страшным ударам у борт душагубкі ніколі не будзе канца. Човен, пэўна, адносіла.

І ўсё ж наступіў момант, калі хвалі ўтаймаваліся, шкарлупінка плаўна загайдалася ў зацішку, за высокай касой процілеглага берага.

- Ну, барын, - уздыхнуў Іван, - думаў, патопнем.

- Мы не маглі патануць, - упэўнена сказала яна, - як жа нам патануць, калі мы неслі жыццё.

Асклізваючыся на чырвонай гліне абрыву, яны ўзвялі жанчыну на роўнае месца.

- Ідзіце, - сказаў Іван, - туды... Мы не можам праводзіць вас.

Жанчына стаяла моўчкі, потым нечакана схілілася і прынікла губамі да рукі Івана.

- Што вы, што вы, - спуджана мармытаў той, выдзіраючы шорсткую, як капыт, руку з яе пальцаў.

- Дзякуй вам, дзякуй, - задыхаючыся казала яна, - дзякуй за добрыя рукі, за сэрца.

- Ат, - Іван махнуў рукою і занадта паспешліва пачаў спускацца з абрыву,

- Ідзіце, - сказаў Гораў жанчыне, - хутка пачне днець.

І раптам адчуў у цемры, як жанчына прыціснулася шчакой да яго грудзей, прыўзняла твар і дакранулася губамі да яго шчакі.

- Дарагі, родны мой друг.

- Ідзіце, ідзіце, - сказаў Гораў, адчуваючы, як вільгаць просіцца на вочы.

- Я іду. Я іду, - паспешліва сказала яна.

І цень жанчыны растаў у змроку...

...Гораў спусціўся ўніз і знайшоў пад адхонам Івана. Нашчыкаўшы са стажка сухога сена, той наклаў на яго ссохлых леташніх галін лазы, прыплаўленых у повень Дняпром, і паспеў раскласці ў лагчынцы невялічкае, але зыркае вогнішча.

- Сушыцеся, - сказаў ён, - потым самі будзеце веславаць. Я пераплыву... Не трэба, каб нас бачылі разам, ваша высакароддзе.

Яны моўчкі сушылі вопратку каля агню. А потым, калі размялі рукамі сухую, пакарабачаную тканіну, заўважылі, што над Дняпром пачынае шарэць.

У гэтым жаўтавата-шэрым брудным святле вялікая рака сціхла, быццам застыдаўшыся таго, што нарабіла ў мінулую ноч. Усё яшчэ было ветрана, але нізавы вецер даў месца верхавому, і той, як добры дзядзька, сагнаў хвалю, разгладзіў сваім подыхам пахмурную паверхню ракі. Яшчэ падалі кроплі дажджу, але відаць было, што дзень хутка заўсміхаецца ўсімі сваімі прамытымі і цёплымі фарбамі. Ды і дождж крапаў такі рэдкі, што незразумела было: ці то падалі скупыя кроплі, ці небывала дружна хадзіла "жорам" верхаводка.

Іван скруціў вопратку ў вузел і, трымаючы яе ва ўзнятай руцэ, сказаў:

- Дык я паплыву, ваша высакароддзе... Прыйду потым на кардон паплавамі.

І сказаў, быццам даравання прасіў, быццам не афіцэр падбіў яго на процізаконны ўчынак:

- Вайна вайною, а баб шкада... Вельмі баб шкада.

...Калі Гораў, не зусім спрытна валодаючы вяслом, пераадолеў Дняпро і паплыў ля нізкага берага, дзень вось-вось павінен быў перамагчы світанне. Раскашавала мокрая лаза, цяжкія някошаныя травы на берагах дымелі, з улоння Дняпра плыла сытая пара, як ад вядра з сырадоем.

"Божа, - падумаў Гораў, - нават рэкі цякуць малаком. І на гэткай благадатнай зямлі паміраць? І такою светлаю раніцай чакаць смерці? Ну не, няхай хоць на дзве гадзіны скароціць такое чаканне - і тое выдатна. І я не шкадую".

За павароткаю ракі адкрыўся, зусім непадалёку, кардон. На паромным прычале стаяў, успёршыся на балясы, млявы Пора-Леановіч з сігаркаю ў зубах. Паплёўваў у ваду. Іранічным позіркам глядзеў на човен, які набліжаўся, выплываў з імглы.

Гораў прывязаў човен у лазе, выбраўся з яе на сухі бераг і пайшоў паўз прычал. Леановіч глядзеў на зграбную постаць маладога чалавека нейкімі дзіўнымі, саркастычна-пагардлівымі вачыма. І гэтыя вочы прымусілі Горава зрабіць выгляд, што нічога не было, што яны толькі што развіталіся.

- Баюся, што вы дарэмна пайшлі на парушэнне прысягі, капітан Гораў.

Юрый спыніўся. Вочы яго спакойна сустрэлі позірк вачэй Леановіча.

- Тут не прысяга. Вайсковы загад не можа датычыцца жанчыны, якая вязе літасць цара свайму мужу. І той не афіцэр, хто не дапаможа жанчыне ў такіх абставінах.

- Вы яшчэ хлопчык, капітан... І як лёгка яна вас акруціла.

- У яе загад графа Мураўёва.

- Святая нявіннасць... Стары хрэн проста не можа раўнадушна бачыць жаночае хараство.

- У яе загад. І нельга гуляць жыццём памілаванага.

На вуснах Пора-Леановіча з'явілася ўсмешка.

- Вы лічыце, што наш граф так лёгка выпускае з пятлі людзей?

- Н-не разумею вас.

- Яму проста апрыкралі жаночыя просьбы. Яму да слёз хочацца, каб яго лічылі высакародным, каб хоць адна прыгожая жанчына лічыла вылюдкам не яго, а Фільку.

- Што?

- Ён замяняе страту пажыццёвай катаргай і пасылае жанчыну. А за дзве гадзіны да гэтага, з губернатарскай поштай пасылае фельд'егера, каб на месцы паспяшаліся.

Гораў сцяў зубы.

- Калі гэта праўда, дык ён падлюга.

- Ён чалавек, - сказаў Леановіч, - чаго ад людзей чакаць?

- Што далей? - сурова спытаў Гораў.

- Жанчына, відаць, не шкадавала грошай; яна ехала, наступаючы яму на пяты. Як яна магла зрабіць такую дарогу за сорак восем гадзін - не ведаю. Гэта трэба быць жалезным чалавекам... І ўсё ж фельд'егер вырваўся з апошняй станцыі, узяўшы апошняга каня. Ён апярэдзіў яе не больш чым на дзве гадзіны...

Твар Горава быў белы як палатно.

- Не лічыце графа дурным, - раўнадушна сказаў Леановіч...

Ён памаўчаў хвіліну. Гораў не мог болей вытрымаць.

- Дзе той фельд'егер?

- Вы самі яго перавезлі праз Дняпро надвячоркам... Гэты улан прывёз мне загад: што б там ні было затрымаць гэтую жанчыну да трох гадзін раніцы. Хопіць, каб прыняў апошнюю літасць ад папа, памаліўся апошнюю ноч і дастатковы час пагайдаўся на шворцы.

- А ў яе вечныя пакуты сумлення, што спазнілася на паўгадзіны?

- Магчыма, - сказаў Леановіч.

- Ну што ж, - сказаў Гораў, - я парушыў ваш план, - яна ўсё ж паспее. І гэта дрэнна, тое, што вы зрабілі, гэта вельмі несумленна.

- Не мне ж іх шкадаваць. Як кажуць, воўк воўку - чалавек. А вы парушылі абавязак і гонар афіцэра.

- Гонар у афіцэра не ў тым, каб быць катам, - ускіпеў Гораў. - А жанчына паспее, яна не можа не паспець.

Леановіч не слухаў яго.

- Для самазаспакаення думайце, што гэты інсургент быў крыклівы кар'ерыст, а яго жонка - распусніца.

- Гэта ганебна, то, што вы кажаце.

- Ідзіце па трупах, дарагі Гораў, ідзіце па трупах... А пакуль што...

Ён пазяхнуў.

- ...пакуль што ідзіце лепей выспіцеся... Бадай што, і я пайду.

Голас і ўся яго манера былі поўныя такой усеўладнай і лянівай сілы, што Гораў адразу звяў. Неўсвядомлена, нейкімі глыбінямі душы ён разумеў, што гэты чалавек падобны на сціснутую спячую спружыну, якую лёгка выпусціць з палону, і тады яна б'е - да смерці. Няварта было рызыкаваць, раз апошняе дзеянне ўсё ж засталося за ім, Горавым. Юрый як мага спакойней паглядзеў у яго лянівыя вочы, поўныя жахлівай пагарды да ўсяго і пустаты, на рэзкі шнар паўз брыво.

- Бадай што, ваша праўда, - сказаў ён, - я добра папрацаваў сёння ў тыя дзве гадзіны, што вы спалі. Трэба адпачыць.

І ён пайшоў угору, да хаткі паромшчыка, вельмі праменькі і ладны. Пора-Леановіч глядзеў яму ў плечы цяжкім, як ртуць, позіркам.

- Хлапчыска, - сказаў ён,

...Гораў спаў да дзесяці гадзін. Калі ён, умыты, ружовы ад сну і заспакоены, выйшаў з хаты на бераг, ён убачыў Леановіча ў той самай паставе, успёртага на парэнчы паромнага прычала. Сігарка дымела ў яго тонкіх спакойных губах, быццам не гадзіны прайшлі з іх ранішняй размовы, а толькі некалькі секунд. Юрый стаў ля парэнчаў у некалькіх кроках ад яго.

- Выспаліся? - спытаў Гораў.

- Анягож, - роўным тонам, быццам нічога паміж імі не адбылося, адказаў Леановіч.

- Ну вось і добра, - сказаў Гораў, - зараз снедаць будзем. Сымон ужо і гарэлку на стол паставіў... Чаму не пагаманіць пра месца чалавека на зямлі?

Леановіч пакасіўся на яго:

- Сумленне спакойнае, чаму і не пагаманіць.

Яны моўчкі стаялі амаль поруч. Леановіч паплёўваў ваду, Гораў абдзіраў луб з ліпавага прутка.

На процілеглым беразе, над адхонам, з'явілася параконная запрэжка ў лёгенькай брычцы. Фурман, асцярожна трымаючы коней за аброць, зводзіў яе да пераправы. Колы брычкі небяспечна падскоквалі па размытых байраках каляін. На заднім сядзенні сядзеў нехта ў вайсковай форме.

- Трэба будзе даслаць салдат, каб падправілі спуск, - абыякава сказаў Леановіч. - І каго гэта яшчэ нясе?..

Зрок у Горава быў не горшы, чым у сапсана.

- Учарашні улан едзе, - сказаў ён і не ўтрымаўся: - Мазалі, відаць, набіў на паўшар'ях, як пірагі.

- Гэ-эй, - пралунаў над ракою зычны голас.

Афіцэры стаялі моўчкі. Перад імі плыла імкліва-спакойная, скаламучаная плынь. Дзень раздумаў пагодзіцца, і светлаватыя хмары віселі над безжыццёвай ракой.

- Гэ-эй, - крычалі з таго боку два галасы, - паро-ом, па-ром, паром!

Леановіч ляніва павярнуўся да Івана. Іван стаяў над адхонам, свежанькі, быццам усю ноч хроп у стайні.

- І чаго наддзіраюцца? - незадаволена сказаў ён. - Бяры, Іван, трох салдат і перавязі гэтых гарлапанаў сюды.

- Хто з афіцэраў паедзе, ваша высакароддзе?

- Ніхто, - сказаў Леановіч.

...Увесь час, пакуль паром пераплываў раку, афіцэры стаялі моўчкі. Няшчыра спакойнымі вачыма яны глядзелі, як адбітак зялёнага берага, разарваны рухам парома, ляніва калышацца ў вадзе, як дрыжачых коней узводзяць на паром, як замацоўваюць калодкамі колы, як паром павольна вырастае ў памерах, набліжаючыся да іх.

І толькі калі улан падышоў і адказыраў, Леановіч спакойна кінуў недакурак сігаркі ў раку і адразу ж закурыў новую.

Улан стаяў перад ім моцны, як Геркулес, кучаравы ("Ванька-ключнік", - падумалася Гораву), з румянымі вуснамі і нахабнымі светлымі вачыма,

- Паспеў? - спытаў Леановіч.

- Так точна.

- Што новага?

- Генерал Фікельмонт выказвае вам удзячнасць за дасканала выкананы загад.

- Што? - яшчэ нічога не разумеючы, спытаў Гораў.

Улан стаяў "струнка", але з той няўлоўнай вольнасцю, якая ўласціва фельд'егерам і дазваляе думаць аб лёгкай пагардзе да "пехтуры", хоць бы і афіцэраў.

- Папа клікаць не давялося, - усміхнуўся улан, - але апошні ліст напісаў.

- Дзе была страта? - спакойна спытаў Леановіч... - Стойце вольна.

Улан трошкі адставіў нагу.

- За абвахтай, - сказаў ён. - На конскіх могілках. А палове чацвёртай.

У Горава як абарвалася нешта ўсярэдзіне. Белы, як снег, ён спытаў:

- Жонку бачылі? .

- Так точна. Спазнілася хвілін на дзесяць. Я гэта бачыў, Яна амаль да абвахты падышла, а тут на задворках як каленкор ірванулі... То яна бегла, а тут пайшла, як сонная... А гэты, вядома, яшчэ цёплы быў.

- Плакала? - спытаў Гораў.

- Не, зусім не плакала. Толькі і сказала: "Божа, пакарай іх..." Не шкадавала. Я б такую бабу, што мужа не шкадуе, - кожны дзень лейцамі б па тым месцы, адкуль ногі растуць.

- У цябе тваёй думкі не пытаюць, - суха сказаў Леановіч.

- Дазвольце ісці?

- Ідзі.

Фельд'егер скочыў у брычку. Коні пацягнулі яе на адхон, слізгаючыся капытамі і ссоўваючы ўніз чырвоны, як кроў, глей...

Потым заляскаталі паўз хату, па паплаўцу за ёю, па беразе старыка.

А потым вазок знік.

Леановіч нахіліўся над вадой і спакойна сплюнуў у раку недакурак сігаркі.

Тонкі нясцерпны звон напоўніў вушы Горава. Ён мацнеў, мацнеў. Адчуваючы, што прытомнасць знікае кудысь, Гораў варухнуў непаслухмянымі вуснамі. Голас, на яго здзіўленне, быў моцны і звонкі,

І тады, ступіўшы крок наперад, Гораў выразна адчаканіў:

- Капітан Пора-Леановіч, вы нягоднік.

Леановіч рэзка павярнуў галаву, адарваўся ад парэнчаў. Яго халодныя вочы з цікавасцю разглядалі Горава.

- Гораў, вы забыліся на туз, - холадна сказаў ён.

- Вы падлюга і нягоднік, - сказаў Гораў.

- На тры крокі... - іранічна сказаў Леановіч. - Каб разбэшчаная знатнасць не абражала нявіннасці і чысціні.

І раптам пасур'ёзнеў, на гладка выгаленых шчоках набраклі каменныя жаўлакі.

- Што ж, гэтым рана ці позна павінна было скончыцца. Мы занадта перашкаджалі адзін аднаму... Зайдзіце ў хату, вазьміце стрэльбу і чакайце мяне на сцежцы ў Турск, ля вярбы. Я вас дaганю... Раю ўлічыць: мы ідзём на сяброўскае паляванне. На качак.

І спакойна павярнуўся да Горава спіной. Нават не паглядзеў на яго, калі той накіраваўся да хаты...

...Яны ішлі поруч, як сябры. Ніхто, нават вартавы ля пераправы цераз старык, не мог бы падумаць, што гэта не ўчарашнія прыяцелі, а ворагі. Леановіч дружалюбна падтрымаў Горава, калі яны ішлі кладкай.

Хата паромшчыка знікла за густымі вербамі, пад якімі ляжаў старык. Хлюпаючы балотнымі ботамі, яны ішлі далей і далей у лугі. А над імі вісела шэрае нізкае неба.

- Пойдзем да Камарына. Там зручней.

Камарынам зваўся другі старык, другое старое рэчышча Дняпра - доўгае і вузкае возера ў лугах. Яго здалёк адзначалі цёмна-зялёныя шапкі дубоў. Гораву было ўсё адно, куды ісці, ён ведаў, што гэта яго апошняя дарога, і таму ён згодна кіўнуў галавой.

Пора-Леановіч са спакойнай усмешкай сказаў:

- Біцца будзем без секундантаў. На гонар. У ваенны час за такую справу, якой мы намераны заняцца, пагражае цытадэла. Таму - той, каму пашанцуе забіць другога, не павінен шматслоўна гаварыць пра дуэль, або, як казалі продкі, двабой. Забітага - на інсургентаў.

Гораў прагна дыхаў вільготным паветрам, тым паветрам, якое ў дні жніўня выразна прадчувае раскошную цёплую восень.

Крычалі кнігаўкі, малілі аб вадзе, хоць яе досыць было на залітых лугах. І іхні енк аддаваўся недзе глыбока пад сэрцам.

- Пі-іць, пі-ць, - крычала адна, але Гораву здавалася, што гэта яна ў смяротнай скрусе плача "жы-ыць, жы-ыць".

Няўжо можна проста хадзіць па лугах, не думаючы, што чакае смерць? Вось качка ўзнялася з сітнягоў, паказала рабое брушка. Напэўна, сэрца яе ўпала ад жаху, калі яна ўбачыла за спінамі людзей трубкі, што вывяргаюць полымя і смерць. Адкуль ёй было ведаць, што людзі занятыя больш важнай справай.

- У вас правая не ў парадку. Не пужайцеся, я таксама буду левай.

- Я не пужаюся, - адказаў Гораў і, хоць зусім не думаў пра гэта, сказаў з паважнасцю, - я хачу толькі хутчэй стрэліць у вас. Вы мне абрыдлі.

Недзе далёка скупы прамень сонца прабіўся праз хмары і зрабіў на мокрай траве ізумрудную пляму. Каржакаватыя дубы над Камарынам патыхалі блажэннай вільгаццю. Бліснула стужка затокі.

Здзічэлы конь - іх многа было ў тое лета - старожка ўзняў галаву ад вады (з цёплых шэрых губ падалі кроплі) і кінуўся прэч. Коні баяліся людзей. Ад людзей пахла не хлебам, а крывёю, як ад ваўкоў.

- Досыць, - сказаў Пора-Леановіч, - далей не пойдзем. У выпадку чаго будзем казаць, што забілі з хмызоў пад дубамі.

Хмызы былі крокаў за дзвесце. А вакол мокрыя лугі з высокай, перастаялай травой.

Леановіч дастаў з ягдташа скрыначку з дуэльнымі пісталетамі.

- Мае, - сказаў ён, - дагледжаныя, выбірайце першы-лепшы.

І, кінуўшы на зямлю плашч, пачаў мерацьад яго крокі.

- Дзесяць крокаў, спадзяюся, не многа? - са злоснай іроніяй спытаў ён.

І хоць гэта была адлегласць смерці, - бледны Гораў сурова хітнуў галавой.

- І ад бар'ера яшчэ пяць крокаў, на падыход, - сказаў Леановіч.

Яны разышліся на крайні след.

- Па першым крыку кнігаўкі, - крыкнуў Леановіч.

У дваццаці кроках, зусім блізка, Гораў бачыў постаць ворага з пісталетам у апушчанай руцэ. Бачыў страшныя блакітныя вочы, прыгожы рот, сціснуты ў змрочнай і жорсткай усмешцы. І ён ведаў, што, як бы ні хацелася жыць, ён, Гораў, не стане на бар'еры бокам да ворага, не засланіць грудзей пісталетам - хоць правілы дуэлі і дазваляюць гэта. Таму што было нешта большае за страх, які жыў у ім.

- Па першым крыку кнігаўкі, - паўтарыў Леановіч.

Кнігаўкі, спуджаныя крокамі, стаіліся, але потым пачулі цішыню і пачалі ўзлятаць.

Каўкнула першая.

- Пара, - сказаў Леановіч.

Гораў пайшоў, уздымаючы пісталет. Як праз сон, ён бачыў усё бліжэй і бліжэй пустыя сінія вочы. Крок. Яшчэ адзін. Яшчэ.

Мокрыя травы пакідалі на ботах бледна-зялёныя сцяблінкі і пялёсткі перастаялых кветак. І Гораў з жахлівай выразнасцю, як ніколі ў жыцці, бачыў гэта.

І яшчэ бачыў, як са спакойнай усмешкай ішоў на яго вораг і ягоны пісталет быў ужо амаль на ўзроўні грудзей.

І тады, ведаючы, што даволі ісці, што гэта апошняя хвіліна жыцця, і пакутуючы гэтым, і не шкадуючы ні аб чым, Гораў удыхнуў гаркаватае паветра і, не цэлячыся, націснуў курок.

Лёгкі дымок празрыстым камячком вэлюма паплыў на ўзроўні яго вачэй. Праз гэты дымок здзіўленыя вочы Горава ўбачылі, як Пора-Леановіч таргануўся ўперад, быццам наткнуўся грудзьмі на нешта нябачнае, і стаў.

Хіснуўся, неяк дзіўна заводзячы руку з пісталетам і гледзячы на Горава. А потым страшэнна моцным узмахам рукі адкінуў свой пісталет у балоціну.

Нейкая страшная сіла хіліла да зямлі яго нечалавечае моцнае цела. Ён змагаўся, але яна паставіла яго на дрыжачыя калені і потым шпурнула на траву сваёй магутнай рукой.

І Гораў кінуўся на дапамогу, забыўшы ўсё; прыўзняў галаву, ірвануў мундзір, раздзёр сарочку на грудзях і пабачыў нізка, пад левым саском, маленькую круглую ранку.

Гэта было зусім нястрашна, толькі адна-дзве кроплі крыві. Але Горава здзівіла не гэта. Яго здзівілі вочы Леановіча, у якіх зараз не было пустаты, а было смяротнае здзіўленне і яшчэ нешта.

Леановіч варухнуў вуснамі.

- Пісталет... пісталет у багну, - заспяшаўся ён.

Здзіўленыя, неяк па-дзіцячаму светлыя вочы спыніліся на Гораве, які трэсся ад непапраўнасці зробленага.

Пора-Леановіч заварушыў рукамі па грудзях і раптам, на апошнім дыханні, сказаў ясным і чыстым голасам:

- Дзякуй вам... Дзякуй...

І паймаўшы руку Горава, пацалаваў яе дрыжачымі вуснамі.

Потым гэтыя вусны замёрлі, а позірк здзіўлена і безуважна спыніўся на шэрым небе, пад якім усё яшчэ лёталі і енчылі аб літасці кнігаўкі.

- Усё, што я вам расказаў, - праўда, - сказаў Гораў.

Гэта было праз два дні пасля двабою. За кардонам, у лугах, непадалёк ад той вярбы, ля якой яны стрэліся ў дзень дуэлі, стаяла на Збароўскай дарозе знаёмая параконная брычка. Жанчына ў чорным сядзела на заднім сядзенні, прыклаўшы да рота чорную карункавую хустачку. Гораў стаяў адной нагою на прыступцы брычкі. У абаіх былі празрыстыя ад бледнасці твары.

- Вам не варта насіць жалобу, - сказаў Гораў, - вы ж ведаеце, што Мураўёў забараніў нашэнне жалобных убораў, ён і тут бачыць жалобу не па забітых, а па радзіме. Вас могуць з гэтай прычыны абразіць на дарозе...

Ён убачыў вялізныя змучаныя вочы. Амаль на паўтвару.

- Мне ўсё адно, - сказала жанчына.

- І ўсё ж накіньце паўзверх плашч другога колеру. Пасты на дарогах падвоены з прычыны забойства афіцэра.

- Вы расказалі мне жахлівую рэч, - сказала жанчына, - я і сама здагадвалася, што з гэтым мураўёўскім загадам не ўсё добра. Цяпер я пераканалася ў гэтым. Але чаму зараз менавіта вы начальнік кардона?

- Я ж казаў: пасты на дарогах падвоены з прычыны забойства капітана Пора-Леановіча.

- Хто яго забіў? - уважліва гледзячы на Горава, спытала жанчына. - Няўжо інсургенты зноў з'явіліся?

- Яго забіў я, - цвёрда і сумна сказаў Гораў, - не трэба непакоіцца. Мы страляліся на сумленнай дуэлі.

- Не варта было. Ён толькі выконваў загад.

- Варта было, - сказаў Гораў, - варта для яго самога.

Жанчына моўчкі глядзела на мокрыя лугі, дрэмлючыя пад плямамі скупога сонца. Потым нахілілася, выцягнула з дарожнага кофра цёмна-сіні плашч і накінула яго паўзверх жалобнага адзення.

- Бадай што, ваша праўда, - сказала яна. - Я была зусім разбітая, але вы сваёй мужнасцю далі мужнасць і мне. Я ведаю, што мне рабіць.

- Куды вы зараз?

- У Вільню. Да Мураўёва, Я даб'юся ў яго аўдыенцыі і не пабаюся сказаць яму, што я думаю аб яго паводзінах.

- Гэта вельмі небяспечна. А вы яшчэ такая маладая, і для вас не цяпер, не зараз, але магчыма шчасце.

Нясцерпны жаль і немае замілаванне ахапілі душу Горава, калі яна ўзяла яго руку ў свае.

- Я ведаю, ёсць многа добрых людзей, - сказала яна, - людзей з усеабдымным, з чалавечым сэрцам. Такіх, як вы. Але што я магу зрабіць, калі мне ўсё жыццё будуць трызніцца тыя дзесяць хвілін, на якія я спазнілася. Калі для сэрца чалавечага няма і не будзе забыцця... Дарагі мой чалавек. Я ведаю - у мяне ўсё канфіскуюць. Мяне, хутчэй за ўсё, чакае Сібір.

Яна схіліла галаву, а потым, праз імгненне, ускінула на Горава цёмныя вочы.

- Але мне лягчэй. Людзі заўсёды людзі. Людзі паўсюль людзі... Дай вам бог шчасця за добрае сэрца. Шчасця з невядомай мне рускай жанчынай, такой самай добрай, як вы.

- Не трэба, пані, - сказаў Гораў.

- Маўчыце, - сказала яна амаль сурова. - Чым я магу аддзякаваць за ўсё? Толькі словам. Дай вам бог шчасця. І вам, і дзецям, і ўсім нашчадкам вашым. Дай бог, каб мае ўнукі ніколі не варагавалі з вашымі.

- Рушай, - сказала яна фурману пасля хвіліны цяжкага маўчання. - Бывайце, дарагі.

- Бывайце.

Брычка павольна пакацілася па дарозе. Гораў хацеў было ўжо саскочыць з прыступкі, але яна ўзяла доўгімі далонямі яго галаву і прыцягнула яе да сябе на грудзі. Пацалавала ў высокі лоб.

Ён нахіліўся і прыпаў вуснамі да бязвольнага сугіба ля кісці яе рукі.

- Ідзіце... Ідзіце, - шэптам сказала яна.

Споўнены гаротным неўразуменнем, бунтуючы ўсім сэрцам супраць сляпой сілы, якая няўмольна разлучае людзей, Гораў скочыў з прыступкі. Брычка пакацілася хутчэй.

Бясконцыя лугі ляжалі вакол.

А ён стаяў і глядзеў, як брычка, зрабіўшыся цёмнай кропкай, знікала недзе пад чорнымі хмарамі, ад якіх цягнуліся да зямлі шэрыя і напаўпразрыстыя завесы дажджу,

Так скончылася гэта гісторыя. Ураган размёў чалавечыя існаванні і не дазволіў сустрэцца зноў. Паўстанне грымела, усё далей адсоўваючыся на захад, а ў Прыдняпроўі настала ўжо "заспакаенне" і "ўціхаміранне".

І тады да Горава пачалі прыглядацца. Смерць Пора-Леановіча некаторым здалася падазронай. Доказаў не было і не

магло быць. І ўсё ж агульнае падазрэнне было такім, што Гораў хутка быў вымушаны падаць у адстаўку.

Незадоўга да гэтай знамянальнай падзеі яго, памятаючы бой пад Ракавам, узнагародзілі медалём "За ўціхамiранне"... Медаль ён не насіў.

І пайшло далейшае жыццё, такое, як ва ўсіх. Жаніцьба. Масква. Усё тое, аб чым ён марыў за дзень да падзей на пароме.

Няскора ён зразумеў, што паром і жахлівая вераб'іная ноч былі водападзелам яго жыцця, што ўся плынь яго існавання і думак пацякла з той ночы ў зусім іншым напрамку. А калі зразумеў, - агарнула туга.

Яна прыходзіла нячаста, чамусьці часцей за ўсё ў дажджлівыя асеннія ночы. І тады ў вачах паўставаў далёкі край бязлюддзя, крыжы на ростанях, павалены лес паабапал дарог і імклівая быстрыня Дняпра з лядаштым паромам ля адхону,

Ён быў шчаслівы, але чамусьці ў непатольнай цемры начэй усё часцей успамінаў кнігавак над лугамі, шэрыя завесы дажджу і рукі з доўгімі пальцамі, рукі, што сціскалі яго скроні, рукі той, якая знікла, каб ніколі больш не сустрэцца з ім.

У неасэнсаваным жаданні ажывіць гэтыя і без таго жывыя ўспаміны, вярнуць страшны, самы лепшы час свайго жыцця, ён імкнуўся да мінулага, настойліва ўваскрашаў яго, аж да ліслівага дакранання мокрага ліста вяргіні.

Позняй восенню ўспаміны з прыемна-балючых ставалі нясцерпнымі. І тады, каб хоць трошкі перажыць неадольныя чары той зямлі, якая ляжыць недзе і кліча прызыўным клічам, што нельга згасіць у сэрцы, - Гораў браў паляўнічую стрэльбу і знікаў з Масквы. Усё адно куды. Толькі б далей, толькі б стаялі вакол голыя цёмныя лясы, толькі б у свісце ветру чуўся водгук той навальніцы, якая шматавала чорныя вольхі над паромам.

Шаснаццатага лістапада тысяча восемсот шэсцьдзесят шостага года, падчас адной з такіх уцечак, ён, трохі паблукаўшы балотамі, ішоў начным лесам з палявання. Два забітыя цецерукі абцяжарвалі бок, ногі ў балотных ботах спружынілі на налітых вадою мхах.

Нетры скончыліся раптоўна. За ўзлескам ляжалі купіны імшараў, за імі зноў цямнела лясная сцяна. Над галявінаю свяцілі высокія і яскравыя асеннія зоры. І, як заўсёды на самоце пад асеннімі зорамі, душу агарнула шкадаванне аб страчаным і пачуццё закінутасці і безабароннасці.

І вось гэты паўночны Яраслаўскі край здаўся вельмі падобным на тую, таксама закінутую ў балотах краіну, дзе

зараз, пэўна, дажывае на беразе струхлелы паром, дзе калісьці вусны далёкай і незваротнай дакрануліся на хвіліну да яго валасоў.

Гораў стаяў, прыхіліўшыся спіною да замшэлай сасны. Павекі яго, што раптам зрабіліся цяжкімі, прыгашвалі халоднае мільгаценне зорак.

Ноч плыла над балотамі.

І раптам у гэтай начы, аднекуль з зеніту, пакаціліся тысячы хуткіх зеленаватых знічак.

На няўлоўныя імгненні пакідаючы ў небе халодны зеленавата-фосфарны след, яны ляцелі ўніз і згасалі, гінулі ў цемры, а на змену ім з'яўляліся новыя, новыя, новыя.

Гэта былі Леаніды.

Адразу ўспомніліся горкія словы Леановіча, шалёны дождж над самотнай ракой, вялізныя, як азёры, чорныя вочы той, якая знікла і ніколі не вернецца.

Чалавек стаяў пад зеленаватым зорным дажджом і думаў:

"Яны былі ў трыццаць трэцім, яны лятуць зараз. Калі яны прылятуць у дзевяноста дзевятым, на парозе новага стагоддзя, - я яшчэ буду жыць. Калі яны прылятуць у тысяча дзевяцьсот трыццаць другім годзе, - мяне ўжо не будзе. І нават мае дзеці не ўбачаць Леанід шэсцьдзесят пятага года... А яны будуць ляцець і ляцець, сустракаючы ўсё новыя і новыя пакаленні. Што будзе тады, праз сто год, ці далося б нам зразумець радасць і боль тых людзей?".

Ён стаяў, прыхіліўшыся да камля сасны, а проста над ім, з невядомай глыбіні, з чорнага начнога шатра ляцелі і згасалі халодныя зеленаватыя іскры, пакідаючы імгненны незваротны след.

Гінулі над празрыстымі азёрамі Леаніды, гінулі тысячамі, знікаючы ў пахмурых асенніх лясах.

І, гледзячы на іх праз замглёныя слязьмі веі, Гораў думаў:

"Так і мы гінем тысячамі, і невядома, ці з'явяцца нашы браты, ці з'явімся мы самі на зямлі яшчэ раз... Леаніды! Сэрца жадае вас. Хоць вачыма далёкіх нашчадкаў дайце глянуць яшчэ раз на зорны дождж".

Тысячамі зялёных ніцей праляталі над зямлёю і знікалі ў цемры зоркі.

Гінулі Леаніды.

**Р а з д з е л І**

Леаніды не вярнуліся. Астраномы тлумачылі гэта тым, што Юпітэр і Сатурн адцягнулі ўбок іхнюю арбіту. Ва ўсякім разе, у лістападзе 1899 года халодны, фосфарна-зялёны дождж не падаў на забытыя балоціны і лясы. Ноч была звычайнай глухой ноччу позняй восені, а ў паэтаў адабралі яшчэ адну прыгожую легенду.

Леаніды здрадзілі нашай зямлі.

Урэшце, акрамя паэтаў, ніхто занадта не засмуціўся гэтым. На зямлі хапала свайго болю і сваіх клопатаў.

Пячаць стагоддзя ляжала на ўсім, і гэта было жорсткае стагоддзе.

Завея хавала пад гурбамі гарбатыя палескія хаты і хаўтурыла над імі. Замець белымі змеямі бегла па каменных плошчах Пецярбурга, паўзла ў стылую арку генеральнага штаба і бяссільна разбівалася аб падножжа Зімняга палаца. І з вялізнага люстранага акна глядзелі на яе лупатыя, са строгай слязой вочы чалавека. Глядзелі на замець, на халодны граніт, што скаваў увесь горад, і далей, на ўсю няўтульную зямлю, што рабалепствавала ля яго ног.

Горад-сфінкс бязрадасна смактаў з зямлі жыццё, а чалавек быў сэрцам гэтага сфінкса.

І ўсё гэта было падобна на трызненне. У чалавека ўжо аднойчы стралялі ля рашоткі Летняга саду, чалавеку сніліся прывіды, якія хочуць яго смерці. І тады зноў быў выкліканы кат Беларусі і Літвы, каб звіць вяроўку на таго, хто страляў. Потым памёр і кат, - і яго падла, распухлае ад вадзянкі, падла, якое кішэла робакамі, закапалі ў зямлю: ён не заслужыў ад удзячнай бацькаўшчыны нават бальзамацыі.

Усё менш ставала верных людзей. Апошняю надзеяй, як мара, блішчаў за ракою шпіль Петрапаўлаўкі. Туды, у гэтыя муры, ён хацеў бы запакаваць усю Расію. І людзей выводзілі з брамы пад покрывам цемры, садзілі ў чаўны і страчвалі на востраве Галадай.

Турма была надзейнай. Адтуль за дзвесце год не ўцёк ніхто.

Чалавек, якога маглі б паважаць за вызваленне сялян, хаваўся зараз ад уласнага народа. І ўсе на словах схіляліся перад ім, а ў сэрцы - ненавідзелі.

А потым выбух з Екацярынінскага канала скалануў ужо і зямлю. І забойцы, арыстакратка з горкім і прыгожым ротам,

сын селяніна і паповіч, былі, "павешаныя за шыю, пакуль не памерлі".

Дзяржаўны калейдаскоп мільгаў далей. Хваля ўдачы ўсплёсквала на вяршыню людзей-прывідаў, галоўным заняткам для якіх было - не быць людзьмі. Над краем у дымна-чырвоных хмарах выплываў то пергаментна-жоўты твар Пабеданосцава, то халодна-пагардлівае цьмянае аблічча Плеве.

Была і другая Расія, але яе забівалі ці аддавалі анафеме.

Страты. Страты. Страты. Тысячы шыбеніц. Безвыходная Сібір. Загубленыя пакаленні з рабскай душой. Мноства асведаміцеляў-энтузіястаў. Нясцерпная туга ліхалецця.

Некалькі разоў па краіне, як гіганцкія маглі, грукочучы, кацілася вайна. Тысячы белацелых сялянскіх хлопцаў валам валілі да чыгункі, плакалі п'янымі слязьмі пад скавытлівае рыганне гармоні, груба адрывалі ад сябе каханак, раўлі дурным голасам бязглуздыя салдацкія песні, а потым тысячамі белых пагорачкаў ляжалі ў палях, ледзь прыцярушаныя снегам, або борсаліся ў ледзяной вадзе паміж абломкаў, з жахам адчуваючы, як нябачныя гіры няўмольна і няўхільна цягнуць на дно.

На грошы, якія забірала вайна, можна было б даць усім гэтым хлопцам вышэйшую адукацыю. Але ўладары, як усякія ўладары, баяліся асветы.

Рэйкі. Рэйкі. Рэйкі. Дымная сліна з комінаў пэцкае небасхіл. Марлокі даюць гарадам, залітым электрычнасцю, чорнае сонца. Уначы за крывавымі вялізнымі вокнамі раве дэман. Тысячы чырвоных, як гномы, людзей плюшчаць сталь. Змей крычыць медным голасам, падобным на голас гудка, і тысячы заспаных людзей бягуць на гэты голас, каб трапіць у разяўленую пашчу.

Друзнуць мускулы. Краіну не б'е толькі лянівы. А на яе абшарах з помпаю і нізкапаклонствам, з морам віна і цыганамі, з ладанам і зверагалосымі дыяканамі святкуецца трохсотгоддзе дынастыі.

З тых самых лясоў, дзе калісь кастрамскі селянін уратаваў пачатак дынастыі, прывезлі ў падарунак гасудару спілаваны стаўбур трохсотгадовай сасны. Равесніца дынастыі, яна прабіла зямлю пушыстай, як заюшка, лапкай у той самы год, калі баяры каранавалі на царства над змучанай ад смуты краінай слабога бледнага хлопчыка. Яна была красою лесу, калі ўнук гэтага хлопчыка арудаваў на верфях сякерай. Яна была грознай у пачатку сваёй старасці, калі бліскучая сука секла галаву "самазванцу", апекавала над мастацтвам і тысячамі тапіла

беларусаў на пецярбургскіх балотных работах. А потым, ужо нінавошта не здатная, без змогі даваць насенне - былы семяннік з пераспелай, мяккай, як вата, драўнінай - яна стаяла панылая, злосная і без разбору глушыла маладыя пушыстыя сасонкі, якія мелі няшчасце трапіць у яе густы, атрутна-халодны цень.

І вось яе ссеклі.

Міжвольная іронія гэтага падарунка не дайшла да небагатых мазгоў уладара, ён шчыра падзякаваў за тонкі і з паэтычным густам зроблены падарунак.

А між тым усё было скончана.

Былая краса пушчы, абадраная і распранутая, ляжала зрынутай на зямлю. Не хапала толькі чалавека, які ўзяўся б за справу і нашчапаў з яе трэсак.

Такі чалавек знайшоўся.

У лунанні сцягоў, у крыві братазабойчай вайны, у суровых гімнах, у перамогах і горычы ішла на зямлю новая эра.

І чалавек з вялікім лобам, не бронзавы, а жывы, вялікі лесаруб і дойлід, з'явіўся над зрынутым дрэвам і высока занёс ззяючую, як справядлівасць, сякеру...

...А потым рыдалі з яго смерці чорныя ад гора цягнікі.

А потым было жыццё са ўсячынай. Людзі самаахвярна будавалі і бурчалі на чэргі, штурмавалі стратасферу - і вешалі на сцяну процівагазы, стваралі "Ціхі Дон" і жылі прасталінейным, наіўна-напышлівым мастацтвам.

Была і веліч, была і падазронасць, была і жорсткасць, быў і гераізм.

Маленькай прэлюдыяй вялікай навальніцы адгучала ў стрэлах "зязюль" сярод заснежаных ялін напаўзабытая фінская вайна.

І вельмі хутка, так хутка, што не паспелі яшчэ высахнуць слёзы сірот, грымнулі грымоты вялікай бяды, той бяды, пра якую няма сілы пісаць і нельга не пісаць, бо чалавечая памяць кароткая, бо пакуты неадплачаны, бо мёртвых не вернеш, бо ляжыць і доўга будзе ляжаць на пакаленнях цень чорных крыл, бо чалавек не забывае, а калі б забываў, быў бы проста неразумным свінячым быдлам.

Снарад трапіў у старажытную званіцу, і яна градам камянёў пацякла на зямлю. Сабака ліжа халодную руку гаспадара. У страшным шэсці ідуць людзі да ахайных, чысценькіх муроў крэматорыя.

Выбухі. Выбухі. Гучны пошчак нямецкіх буйнакаліберных кулямётаў. Здані аэрастатаў на фоне марознай зары. Недзе ў

канцы Цвярскога бульвара. Сібірскія хлопцы з белымі лыжамі на плячах. Белыя, як прывіды, коннікі, знікаючыя ў кудлах завірухі. Тысячы магіл на падмаскоўных палях. Палескі хлопец стаіць ля сценкі пад рулямі аўтаматаў і глядзіць страшнымі славянскімі вачыма.

Жах вайны. Гнеў вайны. Хто можа забыць пра вас, адмахнуцца ад вас?!

Няма забыцця.

**Р а з д з е л II**

Гэты дом на недалёкай ускраіне Масквы зваўся Домам паэтаў, хоць жылі тут, вядома, не толькі паэты. Пісьменнікі - пераважна маладыя, - сцэнарысты, што панаехалі ў "Масфільм" вучыцца розуму, стракатая мешаніна нацый, колераў скуры, гаворак.

Усе яны набівалі смехам, спрэчкамі, скандаваннем вершаў, упартай працай і лёгкім адценнем цыганшчыны гэты новы сяміпавярховы дом.

Большасць з іх жыла тут кароткі час, некаторыя - даўжэй, стала - не жыў ніхто. І таму самое жыццё вызначалася вясёлай неўладкаванасцю, прадчуваннем чамаданных настрояў і пагардаю да такіх забабонаў, як шторы на вокнах і французскі замок на дзвярах.

Вясёлы, жулікаваты з выгляду літовец Баранаўскас сцвярджаў, што ад дома за вярсту нясе сухім вінам і дрэннымі вершамі. І, бадай што, у гэтых словах было зерне праўды.

Дом узвышаўся над усімі навакольнымі дамамі, над маладым бульварам, над недалёкай лініяй высакавольтнай перадачы і падстанцыяй сваімі жоўценькімі плітачнымі мурамі, прамытымі радамі блакітных вокан і чырвоным дахам.

Дом прыціхаў толькі раніцай: частка людзей была на занятках ці хадзіла па справах, частка працавала ў пакоях. А тыя, што не працавалі, не былі на занятках ці не хадзілі па справах, маўчалі: свята трымаўся закон, які забараняў шумець і перашкаджаць пісаць сябрам.

Затое ўвечары з расчыненых вокан усіх сямі паверхаў спявала і смяялася маладосць. Жылі весела і не заўсёды багата, нават не пачынаючы думаць пра ўласную машыну.

Потым вокны пачыналі зачыняцца, з палітых вуліц павявала свежасцю, буйны россып гарадскіх агнёў - быццам

куча жарынак на бясконцай жароўні - пачынаў згасаць. І дом, разам з усім горадам, засынаў.

Толькі некалькі акон - у тых, хто любіў начную працу і спасылаўся ў гэтым на Дастаеўскага, - спакойна гарэлі да позняй ночы ружовым або зеленаватым святлом.

У тую ноч, з якой пачынаецца наша апавяданне, "начнікам" не давялося спакойна папрацаваць, а тым, хто любіць спаць, - спакойна выспацца.

Па доўгім калідоры шостага паверха гучна маршыравалі два чалавекі год па трыццаці. Абодва былі трохі на падпітку. Адзін, ніжэйшы і бялявы, залівіста граў на губным гармоніку і махаў вузкім канверцікам фотатэлеграмы. Другі, больш высокі, з непрыгожым добрым тварам, строіў з сябе гавайскую гітару, а ў перапынках гучна, на ўвесь калідор, крычаў страшэнным па сіле голасам:

- Уставайце ўсе! Досыць спаць! Уставайце, уставайце! Ур-ра, уставайце!

Пасля адной асабліва заліхвацкай рулады і серыі крыкаў па ўсёй даўжыні калідора пачалі ляскаць і адчыняцца дзверы, а з дзвярэй высоўвацца ўстрывожаныя, заспаныя і проста незадаволеныя аблічча.

- Ур-ра! - лунала калідорам рэха.

- У чым справа, Грынкевіч? - прабасіла ўскудлачаная галава ў адных дзвярах.

Непрыгожы выхапіў з рук бялявага вузкі канверцік.

- Уставайце! Ур-ра-а! Уставайце! У Вайвадса сын нарадзіўся!

Выраз нездавальнення знік з твараў. Бязладнае "ўра!" многіх галасоў пакацілася калідорам.

Вайвадс узяў з рук Грынкевіча вузкі канверт, прыціснуў яго да грудзей. Вочы яго блішчалі:

- Хлопцы, я вельмі... я вельмі. Словам, я запрашаю ўсіх у свой пакой выпіць са мною трошкі віна.

- Што ты, хлопча, - сказаў кудлаты, - позна ўжо. Мы лепей заўтра адзначым. Згода?

- Згода, - хітнуў галавою Вайвадс.

Галовы пачалі знікаць у дзвярах. Калідор стаў пустым і гучным. Два сябры стаялі і глядзелі ў вочы адзін аднаму.

Яны былі вельмі непадобныя адзін на аднаго - беларус і латыш. Беларус - высокі, хударлявы, з выразнымі, вельмі пластычнымі рухамі, з непрыгожым тварам, які прыкрашвалі толькі глыбокія вочы пад цёмнымі бровамі. Латыш - ніжэйшы за

яго, каржакаваты, з белым тварам і таўставатымі вуснамі. Вочы - блакітныя і вельмі ясныя. Валасы жоўтыя і мяккія, як лён, яўна пачыналі радзець. Выгляд надта сялянскі, але незвычайна добры і мілы.

- Пойдзем да мяне, Андрэй, - сказаў Вайвадс, - вып'ем на радасцях бутэльку віна, пагамонім.

Твар яго аж ззяў ад шчасця.

- Чакай, Яніс, - голас Грынкевіча, калі той не крычаў, быў мяккі і даволі ціхі, - я думаю, што нам трэба на якую гадзіну расстацца. Усё адно, відаць, мы ў гэтую ноч не заснём. Але ты спачатку не пра бутэльку думай, а пра жонку. Сядай, брат, і за гадзіну напішы ёй доўгі, вельмі добры ліст. Пра ўсё напішы. І як мы з табою апельсіны сёння на праспекце сеялі. І пра начны марш па калідоры. А я да цябе зайду праз гадзіну, тады і пагамонім.

- Бадай што, твая праўда, - сказаў Вайвадс. - А ты што рабіць будзеш?

- Я да Марыі Крат на хвіліну зайду.

- Чаго гэта сярод ночы?

- Непакоіцца будзе. Я з апоўдня бы ў палонку юкнуў, не зайшоў, не сказаў - куды.

- Ведаеш што, - суха сказаў Яніс, - ты мне друг, і я, на правах друга, карыстаюся прывілеяй казаць табе праўду і толькі праўду. Не падабаецца мне ўся гэтая гісторыя, вось што.

- Чаго раптам?

- Яна не тая, якая табе патрэбна.

- Думаеш, я сам гэтага не ведаю, - з усмешкай сказаў Грынкевіч.

- Дык ты, можа, і ажаніўся б з ёй?

- Мне, брат, амаль усё адно, з кім ажаніцца... Вось сын у яе цудоўны. Як прыязджае - цэлымі днямі з ім дурэў бы... Зіркаты такі, вясёлы. І мяне вельмі любіць. Каб можна было, - узяў бы аднаго сына, без яе.

- Сваіх заводзіць трэба, блажэнны, - сказаў Вайвадс.

- Э-ех, брат, нічога ты не ведаеш, - уздыхнуў Андрэй.

- Дык вось ты мне і раскажы.

- Раскажу. Сёння ты ўсю душу мне разварушыў. Раскажу... пасля.

- І ўсё ж я не хадзіў бы.

- Зайду, - сказаў Грынкевіч, - праз гадзіну.

Вайвадс паглядзеў у спіну Андрэю, з дакорам пахітаў галавою і адчыніў дзверы з нумарам 171. Грынкевіч адышоў

крокаў з дзесяць і спыніўся перад дзвярыма з нумарам 170. Адамкнуў стандартным ключом дзверы, зайшоў да сябе.

У маленькай пярэдняй з дзвюма шафамі ў нішах скінуў палітон, павесіў капялюх і, прыгладжваючы далонямі густы, вельмі мяккі каштанавы чуб, прайшоў пад паўаркай у свой пакой.

Пакой быў абстаўлены так, як можна абставіць чатырнаццаць квадратных метраў, ды яшчэ з густам і фінансамі камендантa будынка. Круглы стол, некалькі крэслаў, ложак з панцырнай сеткай, шыфаньер, пісьмовы стол у куце, ля вялікага акна, і мяккае крэсла ля яго.

Астатняе залежала ўжо ад густаў жыхара. Ложак засцелены дывановым пакрывалам. На шыфаньеры бронзавы званар б'е ў звон. На пісьмовым стале, акрамя паперы, два гравіраваныя партрэцікі: Максім Багдановіч і Блок. Ды яшчэ дзве латышскія забаўкі: гліняны мядзведзь нясе вулей і драўляны, бачоначкам, піўны куфаль з вечкам, трохі больш напарстка. Над сталом невялічкая рэпрадукцыя з "Сіксцінскай мадонны". Аскетычна голыя сцены ўпрыгожвала яшчэ толькі адна рэпрадукцыя "Блакітнай галавы" Паўля Клее. Вайвадс у вясёлы час двойчы пераварочваў яе дагары нагамі, казаў, што ўсё адно нельга разабраць, што там да чаго і што так нават выразней. Шуфляды стала былі напхатыя паперамі, сшыткамі, а ў верхняй шуфлядзе, пустой, ляжала фотакартка маці і самая вялікая яго каштоўнасць - выцвілы, пабляклы дагератып Кастуся Каліноўскага. Срэбра стала вясёлкавым, і заўважыць вобраз можна было толькі гледзячы збоку.

Грынкевіч узяў з ложка букет мімозы, выйшаў і спусціўся па сходах паверхам ніжэй. Там спыніўся ля адных дзвярэй, выцягнуў з кішэні маленькі ключ ад французскага замка і, пастаяўшы хвіліну, адчыніў дзверы і зайшоў. Калі ён стаяў з прыплюшчанымі вачыма і зараз - на твары яго нічога нельга было заўважыць, акрамя нуды і звычайнага суму.

Пакой быў такі самы, толькі, па-жаночаму, больш утульны, хоць утульнасць была з цыганшчынай. Слабае святло начніка асвятляла ражок стала і ложак. На ложку, раскінуўшы валасы па падушцы, спала жанчына.

Грынкевіч паставіў букет у вазу на стале, сеў у крэсла і задумаўся, гледзячы на спячую. Халодны твар, веі злёгку ўздрыгваюць у сне, светлыя валасы ляжаць на падушцы. Тонкая коўдра лёгка ўздымаецца на грудзях. Твар у сне добры, з усмешкаю і... чужы. Быццам гэта не яна стала яму блізкай.

"А што, сапраўды, нас звяло? - спытаў сябе Андрэй. - Бадай што, нічога. Няма таго, вялікага, што было з Алёнай... І ніколі не будзе. Ні з кім..."

Ён горка ўсміхнуўся ў паўцемры.

"Што звяло? Шкадаванне да яе, чыё жыццё склалася так няўдала, любоў да яе сына, цудоўнага маленькага чалавечка... Ну, яшчэ абыякавасць да таго, з кім ідзеш. Таму што з усімі аднолькава... І яшчэ боязь пустэчы поруч з сабой".

Жанчына варухнулася, святло ўпала ёй на твар. Грынкевіч асцярожна паправіў абажур. Зноў задумаўся.

"Хіба ў аднаго мяне так? Яна ў тым-сім нядрэнная жанчына, у меру добрая - для тых, каго любіць, - часам даверлівая ад недалёкасці. Дрэнна толькі, што апошнім часам яна яго бязглузда, па-дурному, раўнуе. Дарэмна. Не паграшыў пакуль што ні ўчынкам, ні позіркам. Жанчыны, наогул, бываюць дурнымі ў рэўнасці: не ведаюць, што калі мужчыну ўвесь час беспадстаўна раўнаваць, то ён нарэшце можа сапраўды пусціцца ва ўсе цяжкія грахі, - "калі ўжо раўнуюць, дык няхай хоць недарэмна". Вось і гэта: пачала з жартоўнай рэўнасці, потым уцягнулася, і зараз ёй сапраўды здаецца, што кожная сустрэчная жанчына толькі і думае, каб зрабіць замах на мяне. Дурная. Таму дурная, што няма куды мне ад цябе ісці. Не таму, што кахаю - кахання ў мяне якраз і на шэлег няма, - а таму, што ўсё адно. І любоў да твайго хлопца, і проста лянота не дазволяць мне пайсці ад цябе".

Ён узяў кавалачак паперы, накрэмзаў на ім некалькі слоў, паклаў на крэсла каля ложка і накіраваўся да дзвярэй.

"І ўсё ж гэта гнюсна, вось такое звыклае і халоднае сяброўства. І ніякія апраўданні, што ты жывы чалавек, - не дапамагаюць".

Гэтая бязлітасная думка мільганула ў яго галаве толькі на імгненне. Потым ён асцярожка зачыніў за сабою дзверы, падняўся на свой паверх і пастукаў у пакой Вайвадса.

Яніс стаяў ля пісьмовага стала, перачытваў скончаны ліст. На стале стаяла ўжо халасцяцкая вячэра: каўбаса, сыр, хатняя вяндліна, кафейнік з чорнай кавай. Да ўсяго гэтага - з выпадку свята - сёння была дабаўлена бутэлька сухога віна і паўбутэлькі рыжскага бальзаму, які сябры, як існыя маладыя варвары, не дабаўлялі ў каву, а пілі проста так.

- Чакай, - сказаў Яніс, - я зараз.

Андрэй сеў ля стала і стаў глядзець на нехлямяжы, вельмі мяккі і добры твар.

З Янісам яны, прыехаўшы ў інстытут, пасябравалі не адразу. Толькі потым, калі аднойчы Грынкевіч абмовіўся, што ён з Віцебскай вобласці, Яніс здзіўлена сказаў:

- А мы былой Віцебскай губерні. Тады мой край называлі, здаецца, "інфлянты". Я латыш, з Латгаліі... І наш Райніс адтуль.

З таго часу "землякі" пачалі прыглядацца адзін да аднаго. Уважліва прачыталі вершы. Вершы абодвум спадабаліся.

Так ішоў час, і зараз яны ўдвух нават жылі камунай, маючы ўсё агульнае. Вайвадс, як больш гаспадарлівы, быў загадчыкам забеспячэння. І ўвесь час яны былі разам. Баранаўскас, які добра ведаў беларускую мову, бо жыў ля самай мяжы Беларусі з Літвою, часам бурчаў:

- Такая дружба, што сарочку няма калі перамяніць.

Але гэтыя два былі цалкам задаволены сабою.

У Вайвадса было цяжкае жыццё.

Сын селяніна з беднай Латгаліі, краіны бяроз над азёрамі і саламяных аканіц, касцёлаў і шчымячых спеваў, ён у раннім дзяцінстве застаўся без маці. З таго часу ён ненавідзеў дактароў: урач адмовіўся пайсці да хворай, бо за ім нельга было паслаць каня і не было надзеі на багаты ганарар. Гэтая нянавісць да дактароў - хоць час змяніўся і ўрачы, вядома, былі не тыя - стала ўрэшце формай ідыясінкразіі: ён не называў іх інакш, як "жывадзёры".

Бацька хадзіў парабкаваць у багатую Земгале, капаў канавы. Такі лёс чакаў і Яніса. І Вайвадс пачаў ненавідзець не толькі дактароў. Нельга было абразіць яго больш балюча, чым назваўшы "земгалес будзіс"[2]. Тады ён смешна злаваўся. Ён, наогул, прымаў жарты толькі ад Грынкевіча і другіх самых блізкіх сяброў. Спакойны, як і нівы яго Латгаліі, цяжкі, як камені на яе скупых палях, ён быў у глыбіні душы вельмі страсны, вельмі добры і вельмі чысты чалавек. Гэтыя страснасць і чысціня абумовілі ўвесь яго шлях.

Сялянскі хлопец, які пасвіў каровы і якога за бліскучыя поспехі ў вучэнні вясковы ксёндз хацеў паслаць вучыцца і меркаваў на сваё месца, раптам адкрыў у сабе звонкі і чысты, як крыніца, талент песнятворцы.

Песні, якія ён пачаў складаць яшчэ ў гады нямецкай акупацыі, былі простымі, мужнымі і чыстымі, як ён сам.

Парабчанская доля шмат чаму навучыла яго. І ён не стаў ксяндзом. Ён стаў адным з першых камсамольцаў ў Латвіі, калі

---

[2] Земгальскі кулак

немцы адкаціліся на захад. Гэта быў дзікі і страшны час: стрэлы ў акно, расправы. Быць тым, кім ён стаў, - на гэта патрабавалася мужнасць. І Андрэй, трохі па-інтэлігенцку іранічны, паважаў за гэта Яніса, паважаў нават за тыя рытарычныя вершы, якія ён пісаў у сваё юнацтва. На шчасце, рытарычнасць не захапіла Вайвадса на доўгі час: паступова ў ім узмужнеў самабытны і яскравы талент, той, пра які грузінскі паэт сказаў: "І здрыганецца, вершам працяты".

Яніс і зараз быў трошкі артадаксальны, але гэта была добрая артадаксальнасць абаяльнага і светлага чалавека. І Грынкевіч любіў яго.

І вось зараз... сын. Андрэй радаваўся за Яніса не менш, чым ён сам.

Хлопцы вонкава не былі цёплымі адзін да аднаго. Іх адносіны былі адносінамі добрай мужчынскай іранічнасці. Але гэта нікому не перашкаджала.

Яніс скончыў нарэшце чытаць ліст і сеў да стала.

- Езус-Марыя! - сказаў ён. - Каб ты толькі ведаў, Андрэйка, які я шчаслівы!

- Ведаю, - сказаў Грынкевіч, - мне таксама шчасна з табой.

- Еш сыр. Праўда, учарашні, падсох. Але добры.

- Хай лепей пуза трэсне, чым дабру прападаць, - сказаў Андрэй.

Налілі па чарцы бальзаму, выпілі за здароўе і доўгі век нованароджанага.

- Што Марыя? - спытаў Вайвадс.

- Спіць, я не будзіў яе.

Яніс памаўчаў. Яму цяжка было зноў пачынаць размову. Але ён, відаць, не змог замоўчаць гэтага, як паслядоўны латгалец. І таму сказаў жорстка:

- Яшчэ раз табе скажу: не падабаецца мне ўсё гэта, не тая гэта жанчына.

- А дзе лепшыя ёсць?

- Паўсюль.

- А чаму гэта яна "не тая"?

- Не тая. Жанчына павінна радасць і запал даваць або боль такі, што, здаецца, лёг бы і памёр. А гэта што? Шэрае балота звычайнага. І горш за ўсё, што ты сам гэта адчуваеш, толькі не прызнаешся. Ты паглядзі на сябе, які ты стаў? Знерваваны, прыбіты нейкі. Вершы бяскрылыя пачаў пісаць. Кінь яе, кажу, пакуль не позна.

- Сын у яе добры.

- Свайго завесці трэба.

- А ты не думаў, што заводзіць сына ад чалавека, якога не кахаеш - свінства.

- Дык чаму не пакахаць каго-небудзь?

- Тое і страшна, што я даўно ўжо не кахаю нікога. Мне амаль усё адно, з кім быць,

- Слухай, - сказаў Вайвадс, - што, урэшце, з табой такое? Мне, як другу, ты, здаецца, мог бы расказаць.

- Распавем, - сказаў Андрэй, - зараз.

Абодва маўчалі. Яніс дапытлівымі вачыма глядзеў, як Андрэй збіраўся з думкамі.

- Налі яшчэ па чарцы, - сказаў Андрэй. - Дык вось, справа пачалася дзесяць год таму... Разумееш, уся справа, напэўна, у дурацкай інтэлігенцкай мяккацеласці і ідэалізме. І яшчэ кроў: у нас у родзе ўсе палкія і заядлыя. Як завядзецца, то калі біцца, дык да смерці, калі кахаць, дык таксама да смерці, калі памятаць, дык да апошняга каменя. І з дзедам у мяне такое было, і з прадзедам. З тым дык наогул страшна скончылася. Я табе ніколі не распавядаў? Ён быў расстраляны за ўдзел у паўстанні... Ну, пра гэта я табе неяк другім разам раскажу, гэта да справы не тычыцца. Галоўнае тое, што мы вельмі страсныя і верныя людзі.

- Выпі, - сказаў Яніс, - лягчэй будзе расказваць.

Яніс глядзеў на сябра, які ўсё яшчэ не мог раскачацца, вялікімі, разумнымі вачыма.

"Езус-Марыя, - думаў ён, - як ён мне падабаецца. І прыгожага ў ім нічога няма, і сімпатычнага, у агульным разуменні, таксама, і ўсё ж..."

Грынкевіч сядзеў, заплюшчыўшы вочы:

- Гэта было дзесяць год таму... Яе звалі Алёна Століч.

## **Р а з д з е л III**

У сорак восьмым годзе Андрэю Грынкевічу было дваццаць год, і за плячыма яго ляжала ўжо багатае падзеямі жыццё. Яно не змяшчалася ў рамкі аўтабіяграфіі, не лезла ў ніякія анкеты. Аб ім можна было толькі ўспамінаць, седзячы дзе-небудзь на травяным адхоне над ракой, калі свеціць сонца і самі змяжаюцца вочы.

І абавязкова каб поруч не было людзей.

Не таму, што яно было несумленным, гэта жыццё, а таму, што ў некаторых сваіх частках яно выломлівалася з агульнага,

было непадобным на тыя існаванні, якія Андрэй кожны дзень бачыў вакол.

Быў далёкі гарадок. Жыла ў гэтым гарадку ззычайная сям'я патомных інтэлігентаў. Незвычайна было хіба толькі тое, што ў бацькі і ў маці было да шлюбу аднолькавае прозвішча: іхнія дзяды былі траюраднымі братамі.

Маці чамусьці баялася гэтага, настойліва і вельмі непаслядоўна імкнулася загартаваць розум і цела сына. Затое нічога не баяўся бацька. Ён прымушаў Андрэя вучыцца плаваць і бегаць, страляць і скакаць вярхом, і галоўнае - імкнуўся прышчапіць яму свой светлы і вясёлы погляд на жыццё.

З гэтага не атрымалася нічога. Таму што была маці з яе вечнай сур'ёзнасцю, з маўклівай, з глыбокай - аж часта да трагізму - любоўю да жыцця-подзвігу, да вершаў, ад якіх гордыя слёзы просяцца на вочы, да песняў, пасля якіх чалавек радасна і лёгка пойдзе на смерць.

І пакоі іхнія былі розныя.

У бацькі светлы, з неверагодна багатай зброяй, што вісела на танным і пацёртым, але ўсё яшчэ вясёлкавым дыване,

- Чхай на ўсё нявартае, брат, беражы сілы... Выдаткуй іх толькі на тое, што варта мужчыны... Нікога не бойся... Нікому не давай наступіць табе на нагу, хоць бы ён быў богам... Пагарджай здабыткам і грашыма.

А ў маці пакой быў заўсёды трошкі замглёны: мо з-за штораў, мо з-за язміну і бэзу, які яна палка любіла і заўсёды вырошчвала пад сваімі вокнамі. Тут быў зусім іншы пах: хвойнай свежасці, кніг, кветак. Тут былі зусім іншыя гукі: парыпванне маснічын і амаль няўлоўныя гукі фартэпіяна - матухна грала сама сабе, вельмі любіла Грыга і Шапэна, зрэдку Бетховена і Шуберта, якога лічыла музычна цяжкаватым і, - што зусім ужо было дзіўна, - напаўзабытага Персэля.

І, галоўнае, тут былі зусім іншыя словы, прыгожыя і трывожныя.

- Бацька мае рацыю, не трэба нікога баяцца. Але ў яго гэта неяк неакрэслена, быццам ён не разумее, што да мужнасці трэба ісці праз ахвяры, часта - праз смерць. А дарэмна... І таму атрымоўваецца, што ў яго проста гожая смеласць, а ў маіх дзеда і бабкі была - мужнасць. Адзін не баяўся расстрэлу, другая - Сібіры.

Матуля ўздыхала:

- Зрэшты, табе рана гэта ведаць, хоць ты і развіты хлопчык.

- Раскажы.

- Пра гэта - не. Скажу, калі ты зможаш утрымаць у памяці. А табе раскажу другое, каб ты ведаў, чаго часам бывае варты адзін чалавек... Быў у Чэхіі адзін вучоны. Гэта быў час, калі чэхі пасля шматвяковага нямецкага панавання пачалі абуджацца, Яны захацелі мець сваю культуру, свае кнігі і музыку. А немцы сказалі ім, што нічога такога ў іх не было, а таму і ў будучым не можа быць.

- Што, матуля, у іх сапраўды не было?

- Вядома, было. Але за многія стагоддзі ўладары спалілі амаль усе іхнія кнігі. А тыя, што зберагліся, трэба было шукаць. Магчыма, нават гады. А шукаць не было часу. Год ці два вырашалі пытанне аб тым, жыць народу ці не. І гэты вучоны (яго звалі Ганка) пачаў шукаць.

- Знайшоў?

- Ну, вядома, калі чалавек вельмі хоча, - збываецца ўсё: дружба, каханне, рух зняволеных... Так і ён знайшоў спачатку адзін вельмі старажытны рукапіс, а потым і другі. І гэта былі кнігі такой паэтычнай сілы, што ўся Чэхія ажыла духам. Яны адкрылі сваю кнігу, такую паэтычную і такую старажытную. Дзе ім было цяпер слухаць немцаў, якія пераконвалі іх у тым, што чэхі толькі вечныя пазычальнікі чужога! І чужых вучоных ніхто не стаў слухаць, хоць яны і лямантавалі аб тым, што абодва рукапісы - падробка. Паэты пачалі пісаць вершы, музыкі - ствараць сваю музыку, вучоныя - шукаць другія старажытныя кнігі. І выявілася, што варта было ўзяцца за справу ўсім - і адразу знойдуцца сотні і тысячы прыгожых старых кніг. І галасы фальшывых вучоных змоўклі. І Чэхія стала Чэхіяй.

- Мама, а гэта былі сапраўдныя рукапісы?

Маці заплюшчвала вочы і ўсміхалася. І лепш за гэтую ўсмешку не было нічога.

- Не варта было б казаць табе пра гэта, Андрэйка. Але рукапісы Ганкі былі сапраўды геніяльнай па таленту і паэзіі падробкай. З легенды не выкінеш слова.

- Несумленна.

- Ты яшчэ дурненькі. Несумленна забіць чалавека, здрадзіць, абакрасці яго. А Ганка проста ведаў, як цяжка - часта проста немагчыма - абудзіць народ, калі ён засне... І ён вельмі любіў.

Так казала маці.

А калі яна паглыблялася ў свае думкі, працавала ці чытала, - заставаўся яшчэ сад са старымі разлатымі яблынямі, адхон да

Дняпра, увесь гарадок на берагах вялікай ракі, гарадок з мрэючымі пад сонцам ліпамі, з новым - "лепшым у рэспубліцы!" - кінатэатрам, з ціхімі завулкамі і зграбным купалком старажытнай царквы Міколы, адкуль некалі пачалося паўстанне горада супраць епіскапа і караля.

І яшчэ была Алёнка Століч, дзяўчынка адзінаццаці год.

Знаёмства з ёю пачалося раней. Яна аднойчы вельмі плакала на беразе ракі ад нейкай крыўды. Ён, яшчэ малы, не вытрымаў, украў з буфета вялізны - з кулак дарослага мужчыны - кавалак цукру і прынёс ёй. Яны хутка, кусаючы па чарзе, абгрызлі гэты кавалак да такой круглаты, што нельга было ўчапіць зубамі. Давялося кунаць яго ў ледзяную ваду прыбярэжнай крынічкі. Цукар лёгка паддаўся зубам, проста з яго цякла ў рот ледзяная, вельмі салодкая вадкасць.

Яны хутка прыкончылі кавалак, і рагі ад слёз высахлі на шчоках Алёнкі, змяшаўшыся каля рота з бруднымі пісягамі - ад цукру і запэцканых далонек.

Усё гэта было даўно. Ён заўжды абараняў яе. Дзіўна, але Андрэй ніколі не баяўся кепікаў наконт "жаніха і нявесты", якія строілі хлопцы, адказваў на іх словам, а часам і кулакамі. Не саромелася нічога і яна. Яны паўсюль хадзілі разам, рука да рукі, і асабліва палюбілі бываць на адхонах Дняпра, зарослых такімі густымі садамі, што нават у спёку там былі вільгаць і холад.

Яны стаялі, успёршыся на балюстраду, перад імі плавілася ў сонцы рака, і здалёк, з царквы Купальніцкага манастыра, якая пакуль што яшчэ была адкрыта, даляталі па вадзе далёкія, зусім шкляныя ўдары званоў.

Гэтую дзіцячую ідылію перарвалі грымоты страшнай буры.

Бацькі Андрэя не паспелі звакуіравацца: горад бамбілі ў першую ж раніцу, а потым, вельмі хутка, насунуўся фронт...

Далей падзеі мільгалі, як у калейдаскопе.

Адзін з першых партызанскіх атрадаў у Асінавецкіх лясах. Маці - медсястра, бацька - падрыўнік і разведчык. Страшэнныя баі. Дарэмныя спробы сілай чатырохсот дрэнна ўзброеных людзей спыніць хоць частку навалы. Потым - блакада.

Двух хлопцаў-разведчыкаў, якія пайшлі шукаць выйсця, схапілі і расстралялі ля сцяны фельдкамендатуры.

Стала ясна, што даросламу не пралезці праз шчыльнае кальцо.

І тады бацька прыйшоў да маці ў яе "медпункт" - дзве прасціны, нацягнутыя пад сасной, - загадаў прывесці Андрэя,

доўга маўчаў, гледзячы на яго прасветленымі вачыма, а потым сказаў жонцы:

- Ну вось, ты яго гераізму і самаахвярнасці вучыла... цяпер, хоць зарана, прыйшоў і яго час...

Голас бацькі гучаў іранічна і злосна, але маці ўсё зразумела.

Страшэнна збялелая, яна глытнула нешта і, гледзячы ўбок, сказала:

- Не прыкідвайся іранічным. Я ад сваіх слоў не адмаўляюся. Ён моцны і разумны... І ён мой сын.

Яна акінула позіркам ладную постаць Андрэя, глянула ў не па-дзіцячы сур'ёзныя вочы. Веі яе задрыжалі. Яна дадала:

- І ён будзе вельмі асцярожны.

І Андрэю пашанцавала там, дзе не пашанцавала двум хлопцам. Яму ўдалося прайсці праз заслоны ў вёску Ражкі і прывесці адтуль дзеда-праваднiка, які ведаў другі выхад праз дрыгву, да якой іх прыпёрлі.

Потым было адступленне праз агонь, дзесяткі плытоў з людзьмі, якія плылі па вiруючай вадзе Дняпра, торкаючыся ў розныя бакі паміж соцень узрастаючых і зноў чэзнучых вадзяных слупоў.

Потым Андрэя з другімі дзецьмі перакінулі з першым самалётам праз лінію фронту: з вышыні ён здаваўся такім прыгожым ва ўспышках зенітак і рознакаляровых радках трасіруючых куль.

Затым была Масква напярэдадні першай зімы: сляпыя вокны, сінія лямпачкі ў пад'ездах, ямы на аколіцах, абстракцыяніcцкая мазаніна на плошчах, мазаніна, што павінна была ашукваць самалёты ворага.

А па начах пранізлівае выццё сірэн. Андрэю здавалася, што гэта апошні марсіянін у адчаі крычыць на вуліцах мёртвага горада.

Дзіўна, але хлопец, у мінулым пяшчотны і ласкавы, як дзяўчынка, не баяўся ні сірэн, ні бамбёжак. Ён стаў вельмі строгі, і на шчоках, зусім не па-дзіцячы, выявіліся падсохлыя ад суровасці мускулы.

Ён думаў, што яго бацькі забітыя. Пасля Масквы была эвакуацыя з дзіцячым інтэрнатам. Сіні ад снягоў паўночны Урал. Андрэй ехаў туды з непахісным рашэннем уцячы пры першай магчымасці. Ён не хацеў быць з іншымі, ён быў партызан, сірата, ён быў сам па сабе.

Словам, гэта быў лёс многіх дзяцей яго пакалення.

Толькі сам ён зусім не быў дзіцём і таму не хацеў дзяліць іхні лёс, не хацеў быць падобным да іх. Хутка гэта выявілася.

Знайшліся людзі, што і ў інтэрнаце паспрабавалі абкрадваць давераных ім дзяцей. Большасць з "давераных", напэўна, абмежавалася б бурчаннем пазавуголлю. І ўсё ж у інтэрнаце ўспыхнуў бунт, на чале якога стаяў былы мамчын сынок і "цюця" - Андрэй Грынкевіч.

Бунт, вядома, быў падаўлены лёгка. Перад начальнікам інтэрната стаяў чалавек, не па гадах развінены хлапчыска, маленькае ваўчаня, сэрца якога жадала толькі аднаго: справядлівасці. І за гэтую справядлівасць прымітыўна, падзіцячы і, значыць, адзіна правільна зразуметую, ваўчаня гатова было біцца да зубоў. Гэта было так лёгка і так па-чалавечы проста зразумець. І начальнік "зразумеў".

Андрэя пакінулі на два дні без абеду - ён не ўзяў нават хлеба і вады. Не ўзяў і на трэці дзень. На чацвёрты дзень яму далі падвойную норму - ён не ўзяў нічога, ён не хацеў хлеба з нячыстых рук.

Яму пагражала калонія, і таму ён уцёк. Ён уцякаў на фронт двойчы, і аднойчы яго вярнулі з-пад самай Рузы. У адной са сваіх эскапад ён наеўся жыта, якое ляжала ў адкрытай платформе і ўкрылася ўжо зялёным кілімам парасткаў. Страшэнны панос ледзь не адправіў яго на той свет.

Калі яго другі раз вярнулі ў інтэрнат, ён даведаўся, што яго бацькі жывыя, што іх таксама перакінулі праз фронт, што яны жывуць у Орску. Моцны, загартаваны падлетак, які нават біцца прывучыўся моўчкі, па-мужчынску, раптам зразумеў, заўчасна пасталеўшы, што дарогі на фронт яму, па маладосці год, заказаны, і... змірыўся. Гэтаму ўзрадаваліся ўсе, усе, хто дрэнна яго ведаў.

Два месяцы ён сумленна і моўчкі працаваў і вучыўся, а потым, падрыхтаваўшыся, уцёк, на гэты раз назаўсёды.

Без дакументаў, без пропуску ён схітрыўся дабрацца да Кунгура (татары, што везлі яго праз тайгу, узялі за гэта бохан хлеба - палову яго запасаў), а потым, праз Чэлябінск і Свярдлоўск, даехаць да Орска. І толькі тут, калі маці пасля ўсіх здзіўленняў і пацалункаў пайшла гатаваць яму нешта на вячэру, ён не стрымаў адзінай за паўтара года слязы.

А маці, як кожная маці, зноў з самага пачатку, пачала рабіць сваю вечную справу: лячыць скалечаную душу сына, зноў прывучаць тую душу да дабра і разумення чалавечнага на зямлі.

Аб астатнім доўга і цяжка расказваць. Рээвакуацыя. Ушчэнт разбураны горад у заходняй Беларусі, куды яны часова прыехалі. Банды лютуюць вакол. І семнаццацігадовы хлопец быў камандзірам аддзялення ў камсамольскім "атрадзе садзеяння".

І тут ён застаўся без першага друга. Тут ён сам упершыню забіў чалавека.

І чамусьці больш за потную, нягледзячы на холад, галаву друга на каленях (машыну страшэнна кідала па замёрзлых камлыгах гразі) Андрэй запомніў здзіўлены і ўтаропллены ў неба позірк ворага, які хацеў забіць яго, Андрэя, і якога замест таго забіў ён сам.

У сорак шостым годзе Грынкевічы вярнуліся ў родны гарадок, які ўжо сяк-так залячыў першыя раны вайны. І ў той самы год Андрэй паступіў ва універсітэт.

І тут настала тое, што можна было назваць маральным перататамленнем. Маці, відаць, не да канца вылекавала яго душу. За пяць год хлопец стаміўся жыць напружаннем і нянавісцю. Стаміўся, але не мог, не ведаў, як жыць іначай. Прамы да рэзкасці, ён забываўся, што такое далікатнасць, пяшчотнасць, пяшчотнае нежаданне прыносіць людзям боль, асцярожная ўвага да няўлоўных рухаў і выгібаў чалавечай душы.

У дзевятнаццаць год ён нікога яшчэ не кахаў. Былі, вядома, дзяўчаты, танцы, развітанні недзе ля ўскраіннай хаты, на мосце цераз ручай, але ўсё гэта рабілася таму, што сорамна было адставаць ад равеснікаў. Але ён яшчэ не кахаў з усёй паўнатою першай страсці, з усім усведамленнем таго, якая яна па-жаночы дарагая і блізкая, тая, што поруч з табой.

А між тым у родны гарадок прыйшла вясна, і пасля крыві, пасля галадовак і бруду, вочы ў Андрэя як быццам упершыню раскрыліся на прыгажосць зямлі, быццам ён зноў нарадзіўся, быццам толькі тут свет набыў усё мноства сваіх фарбаў.

І з непатоленай прагай цягнулася, ляцела да гэтага свету гвалтоўна затрыманая калісь у сваіх імкненнях, усхваляваная і шырокая душа.

Дастаткова было штуршка, каб тое, сапраўднае, рынула на Грынкевіча, як ураган, і сам ён у пошуках паратунку кінуўся да яго, як да прыстані.

І нарэшце прыйшоў дзень.

На раённым фізкультурным свяце Андрэй толькі што адстраляўся і, адышоўшы ўбок, абыякава слухаў нараканні трэнера:

- Душа ты цёмная. Колькі можна парад не слухаць, у цябе ж залатое вока. Трошкі стараннасці - і сёння быў бы першы разрад. А там, праз год, з тваімі дадзенымі стаў бы майстрам.

Андрэй абняў трэнера, каб той не крыўдаваў. Самому яму было ўсё адно. Пасля таго што здарылася ў Заходняй, ён не любіў страляць, хіба што на паляванні. Яму значна больш балела тое, што на беразе Дняпра, у Прароўскай затоцы, ён павінен быў праз якую гадзіну скакаць з вышкі.

З вышкі ўсё і пачалося.

Гамарня натоўпу, газетныя капелюшы, ляск падбадзёрваючых апладысментаў. І імпэтная страла вышкі, узнесеная над затокай, над зеленаватым Дняпром, над дубамі, што шырока растрэслі на процілеглым баку свае зялёныя шапкі.

На гэтай страле раптоўна з'явілася танюткая, таксама ўзнесеная ў неба, дзявочая постаць, і гурт раптоўна сціхнуў у адным імкненні да таго, што яна збіралася зрабіць.

Яна адарвалася ад апоры, зрабіла паўкола ў паветры, быццам яшчэ думала, дзе лепей - у ззяючым майскім небе ці ў таемных глыбінях вады, - і потым плаўна, з той лёгкасцю, якая прымушае людзей верыць у палёт, памкнулася ўніз.

Рукі - ластаўчыны крылы, прыгожы выгіб ног - сімвал палёту.

Дзяўчына ляцела над ракой.

Дома Андрэй доўгі час сядзеў у кветніку, не ў змозе забыць гэтай дзівоснай з'явы. І ён амаль не здзівіўся, калі нехта адчыніў веснічкі. Куртаты Джэк ускінуўся быў брахаць, але адразу стаў і з цікавасцю пачаў разглядаць цемнавокую асмужаную дзяўчыну, якая стаяла на сцежцы.

- Прабачце, гэта дом Грынкевічавых?

- Калі гэтая халупка - дом, то так, гэта дом Грынкевічавых.

- Гэта не халупка, гэта вельмі прыемны сціплы домік. Хоць, вядома, ваш даваенны, на Замкавай быў большы.

- Праходзьце... Адкуль вы ведаеце дом на Замкавай?

- Андрэй... вы мяне не пазнаяцё?

- Н-не, - пачырванеў Андрэй, - хіба што толькі мне здаецца, гэта вы сёння ляцелі ў паветры.

- Ну, - засаромелася яна, - не будзем параўноўваць ваш скачок з маім. Я таму і прыйшла, што пасля гэтага спытала пра ваша імя.

- Прабачце, - сказаў Андрэй, - хто вы?

- Я Алёна Століч.

- А... Алёна, бож-жа мой! Маці! Маці! Глядзі, хто да нас прыйшоў. Алёна, вы зусім непадобная да той.

- Ды і вы... таксама.

Яна была сапраўды зусім не тая. І калі параўноўваць людзей з іншымі істотамі, дык першае ўражанне было праўдзівым: ластаўка. Цемнавокая, уся неяк выгнутая туды, уперад, высокімі грудзьмі і злёгку закінутым тварыкам. Маленькія далоні, светлыя буяныя валасы пры цёмных вачах. Агульнае ўражанне чагосьці дзёрзкага, імпэтнага, смелага не па сіле.

...Увечары яны ўцяклі ад кампаніі, з якой прыйшлі ў парк. Недзе далёка ўздыхалі за плячыма і паступова паміралі ў цемры трубы гарадскога аркестра. Шапталі ледзь апераныя майскія шаты дрэў.

Далей. Далей. Усё далей.

Горад застаўся ззаду. Злёгку плёскала ў сне рака. І аднекуль з-за ракі, разам з маленькім язычком вогнішча далятала тонкая, бы ўздых, песня некалькіх галасоў:

Зялёны дубочак

На ель пахіліўся.

І ў страсным юнацкім голасе гучалі цяга, і журба, і шырокі смутак душы, узгадаванай на гэтых паплавах.

- Чорт, - сказаў Андрэй, - улаена кажучы, не вельмі разумныя словы, а слухаеш - і сорам бярэ за сябе, за свае вершы. Так усё бездапаможна, так бяздушна.

- Прачытай што-небудзь адпаведнае, - сказала яна.

- Добра.

Андрэй павольна ішоў поруч з ёю па ўбітай сцежцы. Было халаднавата, парывамі дыхаў лёгкі ветрык, але дубы не хацелі дрыжаць, не хацелі шалахцець нованароджанымі лісцямі - зашмат было гонару.

Усплыў месяц над сінім Дунаем.
Празрысты зялёны рог,
І цені ад хмар набягаюць
На вербы наўсцяж дарог.
Цішыня над сінім Дунаем.
Сціхлі шолахі ўсе:
"Каханая, дарагая,
Ногі твае ў расе".

Ён змоўк і потым з халоднай жорсткасцю сказаў:

- Дрэнна.

- І сапраўды, слаба, - з уздыхам сказала яна, - не кладзецца на ноты ракі, ночы, песні. Нешта ва ўсім гэтым не тое.

Яму спадабалася яе шчырасць.

- І што толькі рабіць, не ведаю, - сказаў ён.

- Нічога, навучышся. У твае гады і Някрасаў, бадай што, не лепей пісаў. Ты перачакай ноч, а потым усё-ўсё будзе добра, Ведаеш, часам лілеі выплывуць з вады насустрач сонцу, раскрыюцца, а адтуль вылятае ў весняе неба мушка. Папалася ўвечары і начавала пад вадой, у шчыльна сціснутых пялёстках.

Памаўчала.

- І ляціць яна, уся залатая, з пылком на лапках: Мне думаецца, так і паэту трэба, вельмі трэба, каб сонца і вецер. Ноч не для яго...

І раптам ускрыкнула:

- Ану, даганяй.

Ссунулася з адхону, ляцела, ледзь дакранаючыся нагамі да зямлі. Ён бег за ёю, бачыў яе развеяныя валасы - і раптам яна кінулася ўбок, затрымалася, учапіўшыся рукамі ў малады дубок. Андрэй не стрымаўся і па інерцыі пакаціўся далей, пад адхон, уздымаючы нагамі пясок.

Унізе ён пахіснуўся, упаў і застаўся нерухомы.

Устрывожаная, яна спусцілася да яго, села над ім на кукішкі, паклала далонь на каштанавы чуб.

- Андрэй, Андрэй! Андрэй! Што з табой?

Ён раптам ускінуўся і злавіў яе за запясці.

- Н-ну, - прагрымеў ён, - якое пакаранне прыдумаць паненцы за гэта?

Але Алёнка зноў стала ранейшай. Яна спрытна крутанула пруцікі запясцяў паміж вялікім і ўказальным пальцамі яго рук, вырвалася і, адскочыўшы на сажань убок, сказала:

- Няхай пан у якасці пакарання прачытае пару ўласных вершаў.

Андрэй з ільвіным рыкам кінуўся за ёю...

...Назад яны ішлі ўжо больш сур'ёзныя.

- Вось, - казаў Андрэй, - заўтра ў сталіцу. Праз якія два тыдні скончу другі курс. А каб я ведаў, куды мне ісці, хто я, на што здатны - гэтага няма. І невядома, калі будзе.

- Што такое? - яна ўзняла на яго смелыя дзіцячыя вочы.

- Разумееш, мне цяжка прызнацца, але я неяк выломліваюся з асяроддзя. І з вялікім болем... Разумееш, скажам, я вельмі люблю Ясеніна, Буніна. Мяне ледзь з універсітэта не папёрлі за тое, што я іх чытаў.

- Пэўна, на лекцыях чытаў? - спытала яна.

- На лекцыі. Надта ўжо сумная была.

- Ну і дурненькі, - з усмешкай сказала яна, - дома іх трэба чытаць.

- Вось і рэктар мне так сказаў. Пад дзвярыма студэнты слухаюць, а ён мне гэта сказаў, а потым павярнуўся да акна і настаўляць пачаў мяне, ды так голасна. А сам усміхаецца...

- Харошы чалавек, - сказала яна.

- Анёж не. Самы лепшы.

- Ну, а далей. Хіба толькі ў Буніне справа?

- Вядома, не. Бачу, скажам, што ў курсавых сакратарах не Янка ходзіць, добры, разумны і, галоўнае, чысты, а нейкі Каўтуновіч, палена, палена няструганае, баязлівец і падхалім. А я гляджу ў яго вочы і ведаю, што ён першы ўцёк бы, калі б на нас банда пад Ракшанамі навалілася. А ён гучныя словы гаворыць, а я ведаю: словы гэтыя хлусня і здзек. А доказаў няма.

Андрэй аж здрыгануўся ўвесь. Потым змоўк.

Пад адхонам шаптала рака, звінела ніцымі галінкамі вярбы.

- Ведаеш, Алёна, - ціха сказаў Андрэй, - мяне гэта вельмі мучыць.

- Нічога, - сказала Алёна, - усё павінна змяніцца. У няшчырасці нядоўгі век. Памятаеш, у цара Саламона на пярсцёнку быў надпіс: "Усё праходзіць".

...Так, усё праходзіць. Прайшла і тая вясна. Як прайшло потым і лета.

А тады здавалася, што гэтаму не будзе канца.

Неяк вечарам, якраз калі чэрвень увабраўся ў сілу, у рэдкую - не па лету - маладзіковую ноч, яны, тры хлопцы і чатыры дзяўчыны паехалі на чаўне за Дняпро, лавіць рыбу.

Не да рыбы, вядома, там было. Але затое, калі зніклі за дзесяткам лукавін агні горада, - колькі там было жартаў і смеху!

І ноч. Едзе ноч над зямлёю на чорным кані. Плашч у ночы чорны, кудлы чорныя. І твар у ночы таксама чорны. Бязгучна варушыць у паветры капытамі стомлены чорны конь.

Потым, калі яны сядзелі на беразе ля зыркага вогнішча, закрытыя ад астатняга свету густой сцяною лазы, нехта папрасіў, як маленькі:

- Андрэй, казку...

Грынкевіч пачаў. Ён умеў расказваць казкі. А гэтая, таемная, як абшары лясоў над межытокамі, асабліва добра клалася на ноч, вогнішча, месяц над вадой.

Можа, асабліва добра таму, што поруч была Алёна. Гэта была народная легенда пра вужыную каралеву. Ноч, пратокі, човен, заплецены белымі гарлачыкамі, браты, што катуюць дзяцей сястры, дапытваючыся, дзе іхні бацька. Сухая вярба над затокай. Ляжыць пад вадою юнак у залатым каптане.

Цішыня. Месяц, прабіўшыся праз лістоту лазы, кінуў на пясок тысячы срэбных месячыкаў-адбіткаў...

...Алёнка асцярожна зайшла ў ваду і паплыла. Плыла брасам, прыўзняўшы над паверхняю закінутую галоўку. Ён плыў поруч, бачыў, як рукі і ногі яе размерана рухаюцца, блакітна серабрацца пад вадой.

Калі яны выйшлі на бераг, ён працягнуў ёй руку, і яна раптам сказала яму:

- Ты... дарагі.

Андрэй скора заснуў на пяску, наўздалёк ад вогнішча, і прачнуўся таму, што добра прыпякло высакаватае сонца - у вачах кругі хадзілі, - і яшчэ таму, што на грудзі ўпала некалькі сцюдзёных кропель вады. Гэта Алёнка нахілілася над ім у мокрым блакітным купальніку.

- Уставай, глуптасю, напячэшся.

А ён сказаў ёй:

- Ты... каханая.

І пайшлі дні, поўныя толькі Алёнкай, сонцам, вершамі і вадой. У адзін з такіх дзён, праўдзівей, вечароў, Андрэй вельмі раззлаваўся на дзяўчыну: яна зусім без тармазоў скацілася на веласіпедзе са стромай Лешчыцкай гары, уз'язджаючы на якую дзядзькі падкладалі пад колы вазоў калодкі.

З Андрэя быў дрэнны яздок, але тут ён, забыўшыся, што сам неадменна разаб'ецца там, дзе гэтае малое чарцяня праскочыць без усякай шкоды, ляцеў за ёю і... не мог дагнаць. А яна, ластаўка, ляцела так, што валасы і сукенка аж пялёскаліся на вятры, і спявала нешта, і рагатала... рагатала.

Нарэшце яна, зусім ужо ўнізе, на пад'ёме, збочыла і звалілася ад смеху ў куст ядлоўцу ля дарогі. Устала, усё яшчэ смеючыся, і пабачыла яго страшны, збялелы ад гневу і жаху за яе, твар.

- Дурная, - сіпата крыкнуў ён і моўчкі таргануў веласіпед з яе рук.

Так яны і ішлі моўчкі - ён каціў два веласіпеды - да самага горада. А там, калі ён паставіў свой і яе веласіпед у сенцах хаты сябра, яна вінавата сказала:

- Ну прабач... Пойдзем зараз на Дняпро... Паходзім.

Ён усё яшчэ быў раззлаваны, калі яны прыцемкам выйшлі на адхон і паселі на траву ў бярозавым гаі.

- Дурная. Ты нават не ведаеш, што ты для мяне.

І прыцягнуў да сябе. Яна прыціхла. Сядзелі моўчкі.

- Вось, - сказаў ён пасля паўзы, - я за цябе ўвесь час так дрыжаць буду. Таму выходзь ты лепей за мяне замуж.

Яна хацела была, як заўсёды, пажартаваць, але адчула, як грозна і палка стукае яго сэрца. І таму, закрыўшы вочы, ціха сказала:

- Добра. Я не буду мучыць цябе. Добра, дарагі. Восенню, у верасні, калі хочаш.

...У жніўні, незадоўга да вяселля, яны з'ездзілі да бацькоў Алёнкі, у Мінск. Адтуль іх, разам з Алёнчыным бацькам, узяўся падкінуць дамоў палкоўнік, друг бацькі. Іван Століч сядзеў поруч з палкоўнікам, які кіраваў. Алёнка і Андрэй - на заднім сядзенні.

Неўзабаве іх чакаў вялізны тлум: вяселле ў хаце Андрэя, паразоў гасцей да цёткі, у якой часта гасцявала і жыла гэтае лета Алёнка, потым зноў дарога ў Мінск, зноў вяселле, зноў перазовы. Але Андрэя, хоць яму і хацелася быць толькі разам з Алёнкай, гэты тлум не палохаў, а захапляў. Гэта ўсё быў шлях да яе.

Якое шчасце сядзець поруч з ёю ў загсе, якое шчасце ехаць адтуль, якое шчасце, калі крычаць "горка!".

І якое шчасце, што зараз так бліскавічна ляціць насустрач дарога, так мільгаюць дрэвы, знікаючы з вачэй, так пругка б'е ў твар цёплы, напоены пахам чабору, палыну, верасоў і яшчэ чагосьці, ветрык!

Ох, гэты водар канца лета! Усё аддадзена, спакой, арабіны яшчэ не чырвоныя, а каралавыя, на палях спакой і мір, і першая павуцінка на вяршыні цяжарнай яблыні часам трапеча, як доўгі белы вымпел.

Машына была адкрытая, і таму валасы Алёнкі аж ляцелі па ветры. Поўніла ветрам рот, раздзьмухвала шчокі.

І Андрэй адчуваў, што любіць усё на свеце. Нават камені, якія трапляліся часам наўсцяж дарогі і нагадвалі парсюкоў, што зарыліся ў траву, нават сухую, астрыжаную патыліцу старога ваякі, які сядзеў за рулём.

Машына пайшла ўніз, мільганула таблічка з надпісам: "Рака Бобр".

Андрэй і раней ведаў гэта месца, бадай што, самае прыгожае на шашы Мінск - Масква. Але зараз ён з нейкім новым, цёплым замілаваннем аглядаў нешырокую рэчку, паплавец над ёю, стромыя берагі, сосны над адхонам і з правага боку каламутна-сінія зануранья шаты лясоў.

Іван Століч павярнуўся да іх:

- Ну як, дзеці? Хораша?

- Хораша, - адным уздыхам адказалі абое.

Іван адкінуўся на спінку сядзення, зажмурыў вочы, з насалодаю ўдыхаючы па-жнівеньску сыты, цёплы вецер.

- Мы сабе некалі пабудуем тут маленькую хату, - шапнула Алёна Андрэю, - са звычайных дошак. Каб летам заўжды быць удваіх.

Ён моўчкі хітнуў галавою на знак згоды.

Аўтамабіль рынуў угору і зноў вырваўся на дарогу, сціснутую з двух бакоў сценамі разамрэлага пад сонцам невысокага лесу. У адным месцы, справа, гэты лес падступаў да самай шашы. Сэрца імчала яму насустрач.

І тут Андрэй убачыў, як наперадзе - літаральна ў дваццаці кроках - выкаціўся на шашу, напярэймы іхняй машыне, вялізны зялёны грузавік. Андрэй толькі паспеў убачыць доўгі радыятар і доўгі кузаў.

"Газ, - недарэчна адзначыў мозг, і яшчэ: - Чорт, хоча праскочыць, ды яшчэ на такой хуткасці. П'яны, ці што?"

Гэта думка прамільгнула за нейкую долю секунды. Потым проста перад вачыма развярнуўся і ўздыбіўся бок зялёнай пачвары. Узвылі тармазы.

У наступны момант, пасля жахлівага, сакрушальнага ўдару, неба з трэскам разарвалася ў вачах Андрэя, і цемра запаланіла ўвесь свет. Ён не чуў, як штосьці выдрала яго з машыны і кінула цераз кювет проста галавою ў жвір.

Апрытомнеўшы, ён убачыў, што неба калышацца перад ім, бы ў спякотны дзень. З цяжкасцю прыўзняўся і пабачыў асколкі шкла на асфальце, змятыя ў гармонік радыятары дзвюх машын і зыркі дымны агонь, які абдымаў кабіну грузавіка і радыятар іхняй машыны.

Быў страшны боль у левым плячы - Андрэй ледзь не крычаў ад яго, - і ўсё ж ён кінуўся да машыны, перш за ўсё да грузавіка, таму што - мозг з дзівоснай яснасцю адмеціў гэта - ягоная кабіна ўся ў агні.

Тарганўў дзверцы. Кулём вываліўся на рукі непрытомны шафёр. Андрэй аднёс яго за кювет.

- Зусім яшчэ хлапчыска, - білася ў галаве думка. - Перавысіў хуткасць пры выездзе на галоўную магістраль... Сабака сучы...

Шкляное паветра калыхалася над радыятарамі. Цягнучы праз борт сухое цела Івана Століча, Андрэй заўважыў, як праз ружовы туман, хлопчыка-веласіпедыста, які спыніўся наводдаль і глядзеў на катастрофу вачыма, поўнымі цікавасці і жаху.

- У вёску катай! - крыкнуў яму Андрэй.

- А дзядзечка, кроў! - нема залямантаваў той.

Андрэй і сам адчуваў, што па лобе плыве нешта цёплае, але пра гэта не было часу думаць.

- Гані за дапамогаю! - зароў ён.

Хлапчыска зразумеў - хутка пакаціў кудысь. Вецер надзімаў на яго спіне ружовую кашулю.

Божа, яшчэ толькі двое ляжаць за кюветам. Андрэй адчуваў, што ў яго падломваюцца ногі... Зараз трэба ўзяць нешта лёгкае... Алёну. Каб хоць трошкі адпачыць. Але ён адразу злавіў сябе на думцы, што гэта не таму, што Алёна лёгкая. І ён да таго ж убачыў, што полымя дабіраецца ўжо да рук палкоўніка, што застыгнулі на баранцы руля, да лысай галавы, якою той схіліўся на рукі.

Адцягнуўшы Алёнку на якіх пяць крокаў, - каб не так было небяспечна ў выпадку выбуху, - Андрэй кінуўся да палкоўніка, тарганўў дзверцу - яе заклінавала, - выбіў яе, літаральна асатанеўшы ад раптоўнага вострага болю ў плячы, пацягнуў чалавека на сябе.

Палкоўніку сплюскала рулём грудзі. Андрэй цягнуў яго, адціскаючы ўбок баранку, бачачы, што ўсяго ў якіх дзесяці сантыметрах ад вачэй бруднымі рагамі плыве ў кабіну расплаўленая фарба. Стогнучы ад напругі, адчуваючы, што валасы, бровы і веі трашчаць ад жару, ён цягнуў і цягнуў.

І нарэшце выдраў чалавека з жалезных абдымкаў.

Ён цягнуў яго з апошніх сіл і з жахам бачыў, што ў палкоўніка пачала выступаць на губах ружовая пена. Але ён не мог яму дапамагчы: не ведаў чым, ды і Алёнка ляжала зусім блізка ад машыны, перад якое палаў, як паходня.

Хістаючыся, як п'яны, Андрэй на карачках пералез кювет, з цяжкасцю выпрастаўся.

Алёнка ляжала бледная і зусім нерухомая. Толькі грудзі - ці, можа, гэта здалося яму? - ледзь уздымаліся. І Андрэй з нечаканай лёгкасцю ўзняў на рукі яе абвіслае цельца.

Штохвілінна дзьмухаючы ёй у закрытыя вочы, - а можа, будзе лягчэй, - ён пайшоў да кювета, стараючыся не хістацца. Дзве-тры кроплі крыві ўпалі з яго галавы ёй на грудзі.

- Дзякуй божа, - цьмяна падумаў ён, - гэта мая кроў. У яе нідзе не відаць крыві.

Калі ён пералазіў кювет, ззаду грымнула. Нехта як быццам падштурхнуў Грынкевіча ў спіну, і ён упаў на Алёну, у апошні момант перакруціўшыся на спіну, як маці, калі яна падае ў галалёд з дзіцёнкам на руках.

Прытомнасць з'яўлялася і зноў знікала - хвалямі, то крывавымі, то чорнымі. І ўсё ж Андрэй дацягнуў дзяўчыну і паклаў яе трохі наводдаль ад трох нерухомых. Пачакаўшы хвіліну, пакуль праяснела ў галаве, ён пачаў думаць, як дапамагчы ўсім.

Іван Століч Ляжаў з заплюшчанымі вачыма і ціха стагнаў. Дзіўна, ён жа сядзеў на месцы, якое шафёры завуць "смяротным". Шафёр і палкоўнік ляжалі нерухома, але Андрэй чамусьці не непакоіўся - надта ўжо спакойна яны ляжалі.

Затое супакой Алёны здаўся яму падазроным. Амаль адразу.

Ён апусціўся каля яе на калені.

- Занадта спакойная... Нязручна павернутая галава... Кроў на грудзях - гэта мая кроў.

Але ўсё ж ён увесь міжвольна халадзеў, пачынаючы аднекуль з пальцаў, ад страшнай здагадкі, якая ўсё больш авалодвала ім. А потым ён узяў галаву Алёнкі ў далоні, павярнуў і пабачыў на скроні, на левай скроні, невялічкую ранку.

Тады здагадка стала ўсемагутнай, запаланіла ўвесь свет.

Андрэй закрычаў.

А потым ён ужо не чуў, як зусім поруч жахлівым, стальным голасам ўзвыў гудок машыны "хуткай дапамогі".

Шафёр і палкоўнік сканалі ў бальніцы - адзін праз дзве, другі праз чатыры гадзіны. Століч абышоўся лёгкім зрушэннем мазгоў. У Андрэя была рассечана скура на галаве і выбіта ў плячы рука.

Дзіўна, але Андрэй, апрытомнеўшы ад таго, што здарылася, стаў мала падобны сам на сябе. Людзі пачалі заўважаць, што ён амаль не мяняецца вонкава. У дваццаць год

яму давалі дваццаць чатыры, у дваццаць восем - усё тыя самыя дваццаць чатыры. Ён як быццам застыў у сваім шчасці і горы.

З чужога погляду ён жыў гэтыя дзесяць год звычайным жыццём звычайнага чалавека. Вучыўся, скончыў універсітэт, працаваў, пісаў вершы, дабіўся некаторых поспехаў - і толькі знаёмыя, блізкія сябры маглі бачыць, што вочы яго часам робяцца пустыя, і ўсё расце і расце ў іх тая пустэча і незадаволенасць сабой.

Мучыў успамін. Як тады, у той пусты верасень, ён, Андрэй, сеў на замшэлы валун і раптам падумаў, што дрозд, які вось тут, перад вачыма, у захапленні цалуе чырвоны куст каліны, значна шчаслівейшы за яго, чалавека.

Былі і дзяўчаты. Многім падабаўся ён, некаторыя падабаліся яму, - а дрозд на каліне быў усё ж шчаслівейшы, хоць не ведаў ні працы, ні думак, ні пазнання.

І што дзяўчаты? Была на зямлі адна. Адспявала сваю каратусенькую, бы ў ластаўкі, песню, вырвалася ў неба, як залатая мушка з лілеі, і адляцела кудысь у зеніт, куды яму, бяскрыламу цяпер, няма дарогі.

### **Р а з д з е л IV**

Рэзкі гук даляцеў аднекуль з цемры праз расчыненую фортачку: недзе далёка загрукатаў, вырваўся з начнога завулка, запознены трамвай.

Грынкевіч здрыгануўся ад нечаканасці і, глыбока ўздыхнуўшы, пацягнуўся замлелай спіной. Адклаўшы ручку, паглядзеў у акно.

Масква засынала. Згасалі бліскаўкі начных агнёў, радзейшым і больш гучным стаў шолах тралейбусаў пад вокнамі. І, як заўсёды ўначы, стала сумна і захацелася кудысьці ехаць, каб крычаў цягнік і пасмы пары засноўвалі мільгаценне зор.

Гудзіць ад стомы цела. З учарашняй ночы ані хвіліны спакою.

Спачатку вестка аб нараджэнні сына ў Вайвадса, потым доўгі расказ аб тым, што адбылося дзесяць год таму, потым, раніцай, гадзіна адпачынку ў крэсле. А ўдзень дыскусія аб паэзіі, на якой ён, Андрэй, зрэзаўся амаль з усімі галоўнымі спрачальнікамі. Нават з Янісам трошкі.

А потым, украй знерваваны, хоць, як заўжды, вонкава спакойны, ён прыйшоў да сябе, сеў і восем гадзін не ўставаў з

месца, імкнучыся самой сутнасцю, самой формай верша давесці супрацiўнiкам, што праўда ўсё ж на яго баку.

І вось зноў дрэнна. Чаму? Ён жа ўсім жыццём упэўнены, што ён мае рацыю. Можа, таму не атрымалася, што вершамі нельга даводзіць, што вершы заўсёды ад гарэння, ад сэрца, ад таго, чаму ніхто і ніколі не дасць наймення. Або, можа, таму, што ён бяскрылы паэт? Сапраўды, вось ужо два гады ён піша горш. Два гады, якраз з таго часу, калі пачаў радзей успамінаць аб Алёнцы.

Не, не таму ён горш піша. Проста раней яго вершы былі бясхмарнымі, - як басанож па траве прайсціся, - патыхалі нейкай чыстай яснасцю і халаднаватасцю. А гэта смерць для паэта.

І ён зразумеў гэта, і зараз стаіць на ростанях, не ведаючы, што і як пісаць. Сапраўды, "што"?, "як"? Нясцерпна. І разумееш, што горшай бяздарнасці за цябе няма на свеце.

Што? Як? Ат, усё адно сёння не дадумаешся. Яніс, пэўна, таксама не спіць, трэба пастукаць.

Андрэй працягнуў руку і злёгку стукнуў пальцамі ў сценку. Праз імгненне адтуль даляцелі два лёгкія ўдары ў адказ - знак, што Яніс вольны. І тады яшчэ чатыры ўдары "та-та-та-там" - першыя такты пятай сімфоніі Бетховена, пазыўныя Андрэя. Прастукаўшы іх, Грынкевіч выйшаў на калідор і адчыніў Янісавы дзверы.

Пакой Вайвадса тануў у сутонні: гарэла толькі настольная лямпа. Яніс сядзеў у крэсле натапыраны, глянуў спадылба на Андрэя сярдзіта і весела.

- Заходзь, чорт, - сказаў ён. - Прыйшоў каяцца?

- Біць цябе прыйшоў.

- Добра. Сядай, пі каву. Якраз толькі заварыў.

І амаль з жаночай пяшчотай зліў Андрэю самую лепшую частку, "вяршок, з каймаком".

Абодва не спяшаліся, прыхлёбваючы гарачую рудую вадкасць.

- Што ж, - сказаў нарэшце Вайвадс, - я да цябе пасля ўчарашняга стаўлюся асцярожна, як да хворага. Таму паспрабуем лагічна, амаль па-нямецку аднавіць ход дыскусіі, у якой ты плявузгаў розныя глупствы.

- Асцярожнае стаўленне.

- Не вяжыся да слоў. Я буду казаць за нашага паважанага Паўла Пятровіча Пружыніна, якога я, зрэшты, не люблю больш,

як ты, але... лічу, што ён мае рацыю. Справа ідзе пра самае існаванне паэзіі, ты згодзен?

- Так. Бязглуздая спрэчка паміж "фізікамі" і "лірыкамі" гэта давяла.

- Дык вось, яго асноўныя тэзы... Яшчэ ў 20-х гадах адзін вядомы паэт сцвярджаў, што галоўныя наватары - гэта Хлебнікаў, Маякоўскі, ну... і іншыя.

- І іншыя, - згадзіўся Андрэй. - Ён яшчэ сказаў, што паэты падзяляюцца на "изобретателей" і "приобретателей".

- Потым, - з няўмольнай логікай вяртаючыся да спрэчкі, сказаў Вайвадс, - ён сказаў, што тая старая ісціна не памерла яшчэ і зараз.

- Якая?

- Ну, падзел верша на скдаданаасацыятыўны (Маякоўскі, Лугаўской, Асееў) і ясны, пазбаўлены складаных асацыяцый і метафарычнасці (Ісакоўскі, Твардоўскі). І што паміж іхнімі "спадкаемцамі" дагэтуль існуе ўзаемнае непрызнанне.

- Я ведаю, нашто яму спатрэбілася гаварыць пра гэта, - сказаў Грынкевіч. - Ён хацеў стукнуць па гэтых маладых людзях з інстытута. Хацеў сказаць, што яны чхаць хочуць на Маякоўскага, а ідуць за Хлебнікавым і іншымі. Памятаеш, крычаў, што яны, са стараннасцю "приготовишек" і з "ЛЕФаўскай пагардаю" накідваюцца на назіцыі Маякоўскага і Твардоўскага, прапагандуючы свае погляды, як погляды пакалення... Змяшаў божы дар з яешняй.

- Я не разумею, - паціснуў плячыма Яніс, - чаму ты так абурыўся Пружыніным? Хлопцы сапраўды праз меру захапляюцца занадта дробязнай тэматыкай, сапраўды адмаўляюцца ад дакладнай рыфмы, сапраўды "стыляюць" гэтым. Усё гэта ў дастатковай меры непрыемна. І ўсё ж, дзе праўда?

- На баку жывых, - рэзка сказаў Грынкевіч. - На баку тых, што ідуць, што шукаюць. Дайце дзейнічаць жывым.

- Пружынін і прапануе "абнаўленне верша ў класічных рамках".

- Ясна, - іранічна сказаў Андрэй, - "росквіт індывідуальнасці дзіцяці ў матчыным чэраве". Не, калі ўжо нарадзілі, - дайце дзіцяці развівацца, як яно само хоча... І ведаеш, Яніс, я паверыў бы ўсім, толькі не Пружыніну. Я не веру бяздары, якая брэша на талент. Памятаеш яго словы: "Еўтушэнка, што прыкідваецца разнастайным". А Еўтушэнка пры ўсіх сваіх недахопах у дзесяць разоў больш таленавіты, чым

Пружынін, - душачка, якая на чыіх толькі каленях не сядзела. Ды яшчэ і паскудзіла ўсім сваім апекунам, калі яны больш не маглі апекаваць.

- За што ты яго так ненавідзіш? - неўразумела спытаў Вайвадс.

- Чалавек павінен быць шчырым. І верным свайму сэрцу. А значыць, і вершу. На ўсё жыццё.

- Ага, - зларадна сказаў Яніс, - а сам яўна адыходзіш ад яснага верша. Куды?

- Не ведаю, - сказаў Грынкевіч. - У нетры пустаслоўя не кінуся. Скажу табе толькі, што хлусіць не буду, куды б ні прыйшоў. Людзям патрэбна праўда. Пакуль што я не ўспрымаю крайнасцяў ні ад тых, ні ад другіх.

- Ну вядома, - сказаў Вайвадс, - адны дурэюць, а другія хочуць абуць усіх у лапці.

- Можа, і так... Не, не так... Але ў тым-сім твая праўда. Маладыя падкупляюць мяне тым, што яны ваююць, часам выкідваюць дурыкі, але ад чыстага, добрага сэрца. Яны вельмі жывыя... Гэта рэакцыя не супроць паэтаў "яснага верша", а супроць газетных вершаў пра пачатак новага года... А другім трэ было б быць больш памяркоўнымі. І, прабач, менш трымацца за Беднага. Беднаму быў свой час, нам - свой. Разумееш, паэзія стала чымсьці накшталт запаветнага месца. І палясоўшчыкі там жарсткаватыя, хоць у іх ёсць і слава і пашана. А там, дзе палясоўшчыкі такія, - там маладыя людзі займаюцца браканьерствам... Назнарок... І задача: пабачыўшы гэта, не дазволіць адным забіваць другіх.

- Так. Паэзія - гэта табе не сварка на блінах у цешчы.

Абодва маўчалі. За клятчастымі латышскімі парцьерамі, недзе зусім непадалёк, гарэў чырвоны агеньчык на страле вежавага крана. Часам недзе ў цясніне вуліцы шалахцела машына: Масква спала неспакойным сном вялікага, стомленага працай чалавека.

- І ўсё ж ты нарабіў глупстваў, - разважліва сказаў Вайвадс, - крычаў, як хлапчына: "Не ўсё стрыжы, што расце!" Ну нашто ты абазваў крытыкаў акуламі?

- Не ўсіх крытыкаў, - зморана сказаў Грынкевіч, - толькі аднаго.

Андрэй нервова закурыў, потым пачаў гаварыць, горача і пераканана:

- Адно мяне толькі здзіўляе, Яніс, чаму ніхто не заўважае, што і "стылянне", і пошукі гэтых хлопцаў маюць карэнні.

- А Езус-Марыя, справа ж не ў гэтым! Маладыя стаяць за недакладную рыфму, вось і ўсё.

- Не. Ты думаеш, чаму Твардоўскі і іншыя нічога па сутнасці не сказалі. Яны вельмі разумныя людзі, яны разумеюць, што не да ладу ў нашай паэзіі. Адны крычаць душою: "Супакоіліся!", а другія: "Зарваліся!" Адны крычаць: "Вас мяшчане падтрымліваюць!" Другія: "З высотнага будынка людзей не бачыце!"

- Ну, а ты што думаеш?

- Не ведаю, я буду пісаць не так, як яны ўсе. Але скажу толькі: трэба больш увагі да людзей. У маладых яна ёсць, праўда, трошкі скажоная. Таму што на іх пакрыкваюць - яны часам аддаюць сэрца, няхай на дзень, такому мастаку, які гэтага зусім не варты... Але ім абрыдла мяшчанства.

- А Пружынін крычаў, што мяшчане іх і падтрымліваюць.

- Хіба нашы студэнты - мяшчане? Ну не, братка. Проста яны наеліся па горла фільмаў з багатаю жратвою ў канцы.

- І за якую ты рыфму?

- Я за дакладную рыфму і за ўсякую рыфму. І зусім без рыфмы - абы добра.

- Ну, у гэтым я з табою вораг, - сказаў Вайвадс.

- Дарэмна, Яніс. У адным мы з табою сябры і паплечнікі. Я лічу, што адзіная ерась - вольны верш без рыфмы і рытма, амаль зліты з прозай. Паэзія, ці бачыш, не музыка, паўзай слова замяніць нельга.

Уздыхнуў. Устаў.

- Проста трэба ісці да людзей, да іх пачуццяў і адносін.

Яніс падышоў да яго, успёрся моцнай рукою на плячо Андрэя.

Масква ляжала перад імі, начная, сціхаючая. Гледзячы на пустыя рэчышчы вуліц, на снегаачышчальнік, які поўз маладым бульварам, ссоўваючы брудны апошні снег, Яніс сказаў:

- Ведаеш, братка, я стаў з табою зусім іншым, не такім дубаватым.

- А я з табою - не такім крыклівым і свалачным.

Абодва засмяяліся.

- І вельмі хачу табе шчасця, - сказаў Яніс. - Я сёння ўсю ноч думаў над тым, што ты мне расказаў. Палюбіць табе трэба, вось што.

- Не магу.

- Ну і натурачка,- пакруціў галавою Яніс.

- Каго любіць? Марыю Крат? Вось я ўспомніў старую гісторыю - і не магу я да Марыі ісці. Брыдка. Сёння зноў не быў... Ведаю, што заўтра мяне скандал чакае. Ат, за ўсе грахі адна паляндра ўчамярыцца.

Яніс наліў яшчэ па кубку кавы.

- Я вось думаю, што табе вельмі павінна спадабацца адна жанчына.

- Хто такая? - ускінуў галаву Андрэй.

- Ірына Горава. Вось гэта жанчына, вось гэта чалавек!

Грынкевіч раптам утаропіў вочы кудысьці ў кут, задумаўся:

- Чакай, чакай... Горава... Аднекуль я памятаю гэта імя... Даўно памятаю і -не ведаю. Мо ад маці? Што яна, старая?

- Што ты, наадварот. У тваіх гадах, можа, на год ці два старэйшая. А выглядае такім дзяўчом.

- Кажаш, не старая, - абыякава сказаў Андрэй, - тады я і не ведаю, дзе я мог пра яе чуць.

- Схадзі на лекцыю, паглядзі. Можа, успомніш.

- Ну не, - махнуў рукою Грынкевіч. - Што я, не чуў гэтых занудаў?

- А што ты пра іх ведаеш? - усхадзіўся Яніс.

- А тое, - на твары Андрэя адразу з'явілася схаластычная міна. Тонам вельмі вучонага і трошкі грэблівага да аўдыторыі лектара ён вымавіў: - У апошняй сваёй навуковай працы пад назвай "Уздзеянне рускага флоту на рост грыбоў" я ўжо распавядала вам, шаноўныя слухачы, аб прынсіпах пабудовы твора... Дык вось, мікеланджэлаўскі "Давід" ёсць кангламерат прагрэсіўнага і рэгрэсіўнага ў творчасці аўтара... Адным плячом ён падаўся назад, бы прыкуты да традыцый італьянскага кватрачэнта, а другім пагражае праклятаму мінуламу ў асобе Галіяфа... Мастакі ж таго часу вызначаюцца незвычайнай тонкасцю лісіроўкі, гжэчнасцю і, я б сказала, мілагучнасцю ў кожным руху, гарманічнай гамай колераў... I ўсё гэта - "фумата", "сфумата"... Што ж датычыцца беларускіх кампазітараў, то ў іх, якраз як у Глінкі, менавіта і не больш, чым два вуха. Падабенства гэта ўзрастае яшчэ больш, бо іхнія оперы і песні таксама магчыма слухаць... Я скончыла.

Яніс не вытрымаў і зарагатаў, трымаючыся за бакі.

- Ну і свіння ж ты, Андрэй.

- Гэта нічога, - сказаў Андрэй, - нейкі недурны паляк сказаў год трыста таму, што чалавек - "не найгорша сьвіня". Лепей я замест таго, каб хадзіць на лекцыі, буду прыбаўляць па

жмені ў скарбніцу дыяментаў беларускага прыгожага пісьменства.

Яніс раптам пасур'ёзнеў.

- І ўсё ж ты схадзі. Вось заўтра якраз... У дванаццаць гадзін.

- Добра, - без асаблівага энтузіязму сказаў Андрэй, - давай схаджу разок.

- Тады - марш спаць. Трэба адпачыць. І без таго дзве ночы амаль не спалі.

## **Р а з д з е л V**

Бронзавы Пушкін пасівеў.

Мокры снег ляжаў на яго кучаравай галаве, на вянку жывых кветак ля п'едэстала, на галінах ліп. Ён быў вельмі чыстым, гэты апошні снег.

Андрэю не хацелася ісці на лекцыю. Ён затрымаўся ля помніка, лянiва перайшоў вуліцу, доўга купляў папяросы ў ларку.

Снег пырхаў паміж белымі дрэвамі бульвара, снег ператварыў у белыя карункі краты агароджы перад інстытутам.

Андрэй неахвотна праміну́ў браму і адразу ўбачыў, што насустрач яму рухаецца худая фігурка Марыі Крат.

Яны былі ўдваіх у заснежанай алеі. Чырвоная, строга па таліі футра Марыі была абсыпана снегам. І зноў зусім чужымі здаліся Андрэю халаднаватыя блакітныя вочы і светлыя, з залацінкай, валасы.

- Дзень добры, - сказала яна, - ты, аднак, не спяшаешся. Ні на лекцыі, ні да мяне.

- О Пацімат, - жартам, на ўсходні манер, адказаў Грынкевіч, - і як ты можаш добра ставіцца да мяне, апаганшчыка грабніц і мячэцяў.

Марыя ўскінула носік.

- Я не жартую. Я нервавалася. Учора сядзела ў крэсле і ўяўляла сабе розную лухту. Што было?

- Справы, - Грынкевіч паспрабаваў абняць яе за плечы.

Яна адхіснулася:

- Я вельмі зайздрошчу твайму ўменню за справамі забываць тую, каго кахаеш.

- Я заходзіў, - сказаў Андрэй, - ты спала.

Твар Марыі стаў іранічны.

- Няўжо табе ўпершыню заходзіць да мяне, калі я сплю? На тое ў цябе і ключ. Месца на ложку хопіць.

- Мне не падабаецца, як ты гаворыш, - сказаў Андрэй. - Я ніколі не казаў табе, што я кахаю. Нам проста добра адно з адным. Мы не дзеці. Мы проста сябры.

- Аднак... я нешта забыла. Ці, можа, нехта другі ўмаўляў мяне стаць яму жонкай?

Андрэй з сумнай усмешкай глядзеў на яе:

- Я працаваў абедзве ночы, Марыя. Нельга заўжды быць разам.

- Гм... А ты спытаў, што я рабіла ў гэтыя ночы?

- Ну, ты ў мяне разумніца. Я табе веру.

Марыя зрабіла іранічную міну:

- О, мой даверлівы друг! А я вось не такая даверлівая. У тваім пакоі было цёмна.

- То, пэўна, я сядзеў у Вайвадса.

- Ну як жа... у Ванвадса. Нягоднік твой Вайвадс. Збівае цябе з панталыку.

Грынкевіч упершыню выйшаў з сябе. Узяў Марыю за запясце і сціснуў руку:

- Ты не руш Яніса. Ён добры друг. Не руш яго, калі хочаш быць мне другам.

- Балюча, - сказала яна. - Ты што, забыў?

Андрэй адпусціў яе.

- Ты меў сустрэчу з кімсьці, з нейкай жанчынай. На цябе глядзяць усе жанчыны. Мне брыдка.

- Марыя, - умольна сказаў Андрэй, - ты не горш за мяне ведаеш, што я не свіння. Я. быў з табою. Толькі з табою. Сорам табе казаць такое. Я не кахаю, але я вельмі добра стаўлюся да цябе. І я не хацеў бы гэтым засмучаць цябе.

Жанчына прыкусіла губу:

- У мяне неўроз сэрца ад кахання. А ты... Божа мой. Я ўпершыню адчуваю сілу кахання і рэўнасці. Мне жыцця не хопіць для кахання. Я баюся, што цябе ў мяне адбяруць. Я ўсё аддала табе. Я да цябе стаўлюся вельмі сумленна.

Яна казала гэта, напэўна, амаль шчыра, але манера вымаўляць словы была вельмі тэатральнай. Бываюць людзі, у шчырасць якіх менавіта з-за гэтага нельга паверыць.

Грынкевіч узяў яе пад бараду і павярнуў да сябе.

- Ты толькі дарэмна мучыш сябе, Маша. Нічога такога няма. І не будзе. Табе проста падабалася спачатку, што я так смешна апраўдваюся. А цяпер ты прывыкла. Ты проста катуеш

мяне гэтымі вечнымі падазрэннямі. Я цяпер нават думаю, што, калі я ажанюся, ты ператворыш маё жыццё ў пекла. А я хачу жыць. У жыцці і без кахання досыць многа добрага.

Яна раптам ударыла кулачком па камлі маладзенькай бярозкі. Воблачка снегу асыпалася з галін, укрыла ім плечы, іскрамі заззяла ў яе валасах.

Але яшчэ больш заззялі яе вочы:

- Ну вядома, цяпер яшчэ і гэта. Шукаеш прычыны, каб пазбавіцца ад мяне? О, вядома! Я гэта даўно заўважыла!

- Марыя, - пакутліва прамычаў Андрэй, - ну нашто ты так. Дарэмна ж гэта ўсё. Хто на мяне паглядзіць?

- Маўчы, - амаль віскнула яна. - Хлусня ўсё.

Грынкевіч уздыхнуў.

- Як мне ўсё гэта абрыдла, - сказаў ён. - Ведаеш, яшчэ дзве такія сцэны, і я сапраўды завяду сабе другую. Каб хоць недарэмна падазравалі..

- Добра, - сказала яна, - я, здаецца, зраблю такі самы ўчынак.

Знерваваны да апошняга, Андрэй рэзка павярнуўся і накіраваўся прэч ад яе, да маленькага будынка курсаў, які стаяў у глыбіні двара, непадалёк ад ампірнага дома інстытута.

Завярнуўшы за рог будыніны, ён злосна плюнуў і ўпершыню падумаў, што, бадай, сапраўды думка аб шлюбе - лухта і што, калі Марыя будзе і далей катаваць яго рэўнасцю, - трэба канчаць.

З гэтай думкай ён тарганула дзверы, падняўся па сходах на другі паверх і на хвіліну спыніўся перад уваходам, адчуваючы, што спазніўся.

Верх вялізнага акна на пляцоўцы быў вітражны: нейкія дэкадэнцкія лілеі, сітнягі, яблыкі, качкі ў палёце. Каляровыя плямы святла ляжалі на фігуры Андрэя.

Бадай, не варта было заходзіць. Але ў скверыку перад інстытутам была Марыя, а бачыць яе зараз было горш за смерць.

І ён ірвануў дзверы.

У вялікім пакоі для адпачынку стаяў пах тытунёвага дыму. Прыбіральшчыца выкідвала з попельніц недакуркі ў вядро.

Грынкевіч павесіў паліто на вешалку і толькі пачаў прычэсвацца, як з канцылярыі выглянула Галіна Іванаўна, завуч. З камічным непакоем пляснула далонямі:

- Андрэйка, ты што ж гэта сабе думаеш? Лекцыя пяць хвілін як пачалася. Якая нядобрасумленнасць. Сорам, і яшчэ раз сорам.

Яна была толькі трошкі старэйшая за яго, надта зграбная, цёмнавалосая і цемнавокая, з вельмі добрым і здаровым румянцам на шчоках.

Андрэй усміхнуўся: ён любіў завуча.

- Прабачце, Галіна Іванаўна, - сказаў ён, - затрымалі абставіны.

- Ну вядома, Марыя Крат. Андрэйка, дзяўчаты цябе да дабра не давядуць.

І міжволі ўсміхнулася: зубы так і заззялі. Яна была вельмі цікаўлівая. І яна любіла Андрэя. Ён нагадваў ёй малодшага брата.

- Зусім мой Віктар. Такі самы хударлявы і такі самы расцяпа.

Зноў ссунула бровы:

- Марш, марш на лекцыю.

- Не злуйцеся. Дальбог, не буду, - сказаў Андрэй.

Усё яшчэ ўсміхаючыся - Галіна Іванаўна вярнула яму добры настрой, - ён прайшоў маленькім калідорам і адчыніў дзверы ў аўдыторыю.

У аўдыторыі было зусім цёмна. На сцяне, у светлым чатырохкутніку плаваў адбітак аднаго з рэльефаў Пергамскага алтара. Бойка багоў з тытанамі.

- Дазвольце прысутнічаць? - спытаў Андрэй.

- Калі ласка, - адказаў з цемры жаночы голас.

- Андрэй, сюды, - гукнуў голас Вайвадса.

Праходзячы на месца, Андрэй спаткнуўся аб провад, што змяіўся ў праходзе. Ледзь не ўпаў.

Вайвадс пасунуўся і даў яму месца.

- Ну як? - шэптам спытаў Андрэй.

- Думаў, не прыйдзеш... Слухай.

І вось з цемры загучаў голас.

- ...і вы трапляеце ў самую сярэдзіну жахлівай, смяротнай сутычкі. Вы адразу пазбаўляецеся слыху, аглушаныя выццём, ровам, скрыгатам. Вы адчуваеце нават пах потных цел. Дзеці Геі-зямлі - волаты і багі (таксама дзеці Геі) пачалі біцца. І малодшыя перамаглі старэйшых. Хутка такі самы лёс чакаў і Афіны. Але нават і ў загібелі сваёй дух Афін быў прыўкрасным.

Яна сціхла на хвіліну. Андрэй дарэмна намагаўся разгледзець яе. Чуў толькі голас, дзівосны па мяккасці і глыбіні. Ды яшчэ, калі яна паказвала нешта на экране, бачыў вузкую руку з доўгімі, тонкімі на канцах пальцамі.

Зноў загучаў голас жанчыны.

- У другім стагоддзі Рым захапіў Грэцыю. Скончылася залатое дзяцінства, пачалася пакутлівая сталасць. Захапленне будучыняй, вера ў яе - загінулі. Рым, які спачатку быў падобны на Грэцыю, які верыў у свабоду, скончыўся разам з перамогамі рымлян і патокам золата. Вайна давала багацце. Таму ўся ўстаноўка была на заваяванні, а рэжым Рыма стаў таталітарным рэжымам. Гэта адбілася і на светапоглядзе рымлян. Яны свята верылі ў сваю гістарычную місію, у вайсковае прызванне. Анхіз сказаў: "Няхай іншыя выводзяць мармуровыя аблічча. Прызванне рымлян панаваць і бурыць гарады".

- Ну як? - спытаў Яніс.

- Пакуль нядрэнна. Голас прыемны.

- Фу, - сказаў Яніс.

Голас сапраўды быў вельмі прыемны.

- Дух ваеншчыны абумоўліваў усё. Нават планіроўку гарадоў. Іх зрабілі падобнымі на казармы. Улады ўсялялі рымлянам усведамленне безумоўнай перавагі над усімі народамі, даводзілі, што свет трэба перарабіць на свой капыл.

Ці было гэта духам рымскага народа? Не. Гэта было проста актыўнае, свядомае скарыстанне ўсіх сродкаў ідэалагічнага ўздзеяння на свядомасць людзей. Гэта ўпершыню была прапаганда. Упершыню ў гісторыі ў Рыме адбываюцца народныя сходы з платнымі аратарамі. У пышных урачыстасцях сцвярджаецца ідэя кесарскай улады. Бразганнем зброі імкнуцца адцягнуць народ ад асабістага жыцця.

І народ верыў у гэтыя догмы, бо яны апелiравалі да яго духу, да яго рэспубліканскіх традыцый. Гэта была спекуляцыя на пачуццях народа.

Але што б ні вярзлі дыктатары, чалавечая свядомасць развівалася сваім шляхам... У рымлян ніколі не было такой прысягі, як у грэкаў: змагацца супраць тыраніі заўсёды, нават тады, калі ты адзін супраць усіх. І таму ў грэкаў іронія і сумленне былі толькі ў перыяд элінізму. У рымлян - заўжды. Толькі ў іх удачлівы палкаводзец думае аб тленнасці, толькі ў іх на гулянцы думаюць аб смерці.

Фактычна рымлянін пазбаўлены права голасу. Ён не прыйшоў на форум, а апафеоз Цэзара ўсё адно адбыўся. Рымлянін пакінуты самому сабе. Яму застаецца толькі барацьба за існаванне, напружаная і ўтрапёная.

Яны ўмелі жыць і будаваць. Іхнімі мастамі людзі карыстаюцца і зараз, іхнія акведукі і дагэтуль даюць ваду. І ў гэтых умовах ідэальнай рэгламентацыі жыцця кожнага чалавека

рымлянін быў цалкам адзін. Да бога яго вёў толькі рытуал. Ды і што гэта былі за багі: бог удачы, бог шчаслівага выпадку. Фактычна яны былі атэісты.

І нават у сваіх камедыях яны адвучыліся ўздымаць вялікія праблемы. Дробныя пачуццейкі. Дробязнае, вартае жалю, абывацельскае. На тварах статуй, калі яны не афіцыйныя, - самота, разгубленая ўзрушанасць, неўраўнаважанасць.

І поруч з гэтым - аркі, пад якімі не праходзіць войска, якія існуюць толькі для прапаганды. І поруч з гэтым будынкі, якія ўражаюць не высакароднасцю прапорцый, а памерамі. А. поруч з гэтым ваўчыха, Этрурыя, адлітая з бронзы ваўчыха, якая стала сімвалам Рыма, жорсткага, ненасытнага і прагнага.

- Волчица, ты их вскормила, - не вытрымаў Андрэй.

- Так, - сказала яна, - ваша праўда.

Волчица, ты их вскормила,
Ты помнишь ли их, когда,
Рыча от бранного пыла,
Сжигали они города.

У гэтую хвіліну зазвінеў званок. Успыхнула святло, прымусіўшы Грынкевіча на хвіліну заплюшчыць вочы.

Калі ён глянуў, жанчына стаяла ля стала з дыяпазітывамі, перабірала іх.

Андрэй па голасу ўяўляў яе зусім не такой. Невялічкага росту, яна была вельмі худзенькая, але так падабраная, што нагадвала яму балерыну.

Можа, гэтаму ўражанню дапамагала і клятчастая спадніца званочкам, і шэрая кофтачка з нейкага там нейлону.

Вельмі худзенькая, як дзіцятка. Але вось пераступіла з нагі на нагу, адкінула непакорлівыя валасы няўлоўным рухам, і гэты жэст выявіўся споўненым такой прыгажосцю кожнага руху, што лёгка і весела стала глядзець на яе.

Звычайны твар. Мяккія шэрыя вочы пад зламанымі бровамі, густыя вейкі. Валасы попельна-залацістыя, сабраныя на патыліцы ў вялізны вузел. І растрапаныя злёгку, аніяк не хочуць ляжаць у прычосцы.

Такая растрэпка!

Велікаваты, усмешлівы рот. Вось глянула на Андрэя, усміхнулася. Зубы не вельмі добрыя, але ўсмешка ўсё адно такая, што аж святлей стала.

Вельмі прыгожыя ногі, вельмі прыгожыя рухі. І ўсё гарманічна - хоць малюй. Андрэй не заўважыў, што вочы, нягледзячы на ўсмешку, насцярожаныя. Проста яму стала

весела: вось і яшчэ адзін добры і разумны, відаць, гарманічны чалавек стаў на шляху.

Пушыстая, як галінка вярбы з коцікамі.

І ён шырока ўсміхнуўся. Яна ўсміхнулася ў адказ.

- Што ж гэта наш такі добры знаўца паэзіі не ходзіць на лекцыі па мастацтву?

Грынкевіч пашкроб патыліцу:

- Ды я думаў, што вы зусім не такая.

- А якая?

- Ды я думаў, што вы чытаеце аб уплыве рускага флоту на рост грыбоў, - шчыра прызнаўся ён.

Яна засмяялася. Грудным, цёплым кантральта.

- Ну і як цяпер?

- Цяпер буду хадзіць. Абавязкова.

- Спадабалася хоць трошкі?

- Лекцыя з думкай. І з пачуццём.

- Ну, і то добра. Калі ласка. Рада буду вас бачыць.

Андрэй выйшаў у калідор. Закурыў. Вось, здаецца, і нічога не адбылося, а адразу неяк лягчэй стала жыць на зямлі. Добра стала жыць.

Марыя стаяла ля акна і нервова курыла. Калі ён падышоў бліжэй, - скамечыла муштук папяросы, ружовы ад губ, і кінула ў попельніцу.

- Ты прабач, - сказала яна, не ўздымаючы павек, - я пагарачылася. Вядома, ні з кім ты не быў. Проста я дурное, раўнівае дзяўчо. Не злуйся. Проста я вельмі-вельмі цябе кахаю.

Андрэй засмяяўся.

- Чаго там, - сказаў ён, - вядома, глупства. Ну, пакінь злавацца.

Яму чамусьці хацелася быць вельмі добрым.

- Мне кожны дзень без цябе - пакута, - сказала яна.

- Дурнічка, я ў бліжэйшы час табе яшчэ такі сюрпрыз падрыхтую. Так што давядзецца звыкаць.

- Чаму? - з трывогай спытала яна.

- Еду дадому, у Востраў. На некалькі дзён.

- Чаго?

- Бацька нешта захварэў.

- Перадай прывітанне, - сказала Марыя.

Андрэй паглядзеў на сад за акном, увесь белы, пульхны, молада чысты і радасны, і зноў шырока без прычыны ўсміхнуўся.

## Раздзел VI

Гарбаты віядук перакінуўся цераз пуці ад агнёў станцыі кудысьці ў цемру. У цемры глуха шапацелі галіны таполяў з рэдкімі жоўтымі кроплямі агнёў, што заблыталіся ў іх.

Пасля Масквы ціша здавалася асабліва гучнай, снег - асабліва белым, паветра - асабліва мяккім. На маленькай плошчы за віядукам было пуста. Толькі ў адным акне аўтобуснай станцыі ледзь свяціўся цьмяны агеньчык.

Было далёка за поўнач, і таксі ўжо не хадзілі. Андрэй падумаў хвіліну, ці не вярнуцца на вакзал, каб чакаць раніцы, але потым успомніў, што да горада ўсяго пяць кіламетраў, што начны марозік такі свежы і калючы, што так добра рыпіць пад чаравікамі снег, і вырашыў ісці пешшу.

Ён ішоў вулкаю прадмесця паўз сонныя дамы ў замрэяных садах і ўсё думаў аб той лёгкасці, якая спадарожнічала яму апошнія два дні перад паездкай.

Цёмная сцяна сонных хат і садоў толькі зрэдку перарывалася больш светлымі плямамі: асветленым будынкам чыгуначнага клуба, станцыённым упраўленнем - і зноў цягнуліся сады і хаты, хаты і сады.

Нейкая машына дагнала яго. Андрэй азірнуўся, убачыў будку кузава і падумаў быў, што гэта нейкі рэфрыжаратар. Галасаваць не варта было, і ён спакойна ішоў далей, але машына дагнала яго і спынілася.

- Сядай.

Андрэй пабачыў, што машына міліцэйская і, відаць, вяртаецца з нейкага начнога аб'езду.

- Сядай.

- Дзякую вам, я яшчэ трошкі пачакаю. Нешта пакуль не хочацца, - сказаў Андрэй.

Міліцыянер, што сядзеў поруч з шафёрам, засмяяўся.

- Ды сядай, Андрэй, чаго там.

Грынкевіч паціснуў плячыма: тут яго ведалі ўсе, у Маскве - амаль ніхто, і, абышоўшы машыну, сеў у кузаў, думаючы, што гэта ён упершыню робіць такое падарожжа.

Дзверцы з маленькім акенцам ляснулі за ім. На лаўцы сядзеў стары знаёмы, старшына Рожкін, і ўсміхаўся на повен рот.

- Куды паедзем, у працвярэзнік ці прама ў КПЗ? - спытаў ён.

- Вязі ў КПЗ, - сказаў Андрэй.

- Чаго?

- Бліжэй да дому.

Яны селі поруч і закурылі.

- Я жартую, - сказаў Рожкін, - ты ў нас ганаровы грамадзянін, цябе ў КПЗ нельга... Вершы новыя ёсць?

- Ёсць.

- Ты б працягнуў Пятра Зарубу. Такі агіднік. Скардзіўся нам на амбулаторыю, што яны прыбіральню проста перад яго вокнамі паставілі. Ну, нельга ж так адразу разбурыць. Разабрацца трэба, Дык ён чакаў-чакаў і ўначы пайшоў і сам сякераю ўсё парушыў... Дальбог, напішы.

- Гэта ўжо Гогаль зрабіў. І лепей за мяне.

- Ну глядзі.

Рожкін высадзіў Андрэя ля самай яго вуліцы, вузкай, вельмі правінцыяльнай. Вуліца адным канцом упіралася ў галоўную вуліцу, другім - у Дняпро.

Андрэй ішоў вельмі павольна, здзіўляючыся, як кожны раз, якімі маленькімі сталі дамы, якімі высокімі, у параўнанні з імі, сады.

Яшчэ здалёк, за чатыры хаты, пачуў усхваляваны, радасна-залівісты брэх куртатага Тобса, незаконнага нашчадка таго Джэка, што калісьці першым прывітаў ля гэтай хаты Алёнку Століч. І ўспамін, замест таго каб балюча крануць па сэрцы, проста сціснуў яго няжорсткай лапай і адразу адпусціў.

Пэўна, і сапраўды ўсё праходзіць.

Калі ён штурхнуў фортку і прайшоў алейкаю да ганка, у адным акне загарэлася святло: маці пачула брэх, адразу зразумела і ўстала. Ён не паспеў нават пазваніць, як дзверы адчыніліся.

Маці стаяла перад ім у пуховай хусціне, накінутай на плечы. І ён пераступіў парог, падхапіў яе на рукі і ўнёс у перадпакой. Паставіў на ногі, абняў, амаль з жахам адчуваючы, якая яна нізенькая (а была ж такой высокай!), якая высахлая (а была ж такой па-жаночы мажнай), якія ў яе сівыя валасы, якія цёмныя, спрацаваныя рукі.

"Усё вайна", - падумаў ён.

Але адразу ўспомніў, як рэдка ён ёй піша, як блізка яна прымае да сэрца ўсе ягоныя трывогі, і ў думках пераклаў палову правіны на свае плечы.

- Дзень добры, бацька, - сказаў Андрэй, уваходзячы ў спальню.

І ён таксама здаў. Сівыя валасы парадзелі. Сядзеў на ложку і неяк разгублена глядзеў на яго. Здавалася, вось-вось заплача: нервы пасля інфаркту зусім саслабелі.

- Я прыехаў, - сказаў Андрэй.

- Сынок... - толькі гэта і вымавіў бацька.

Андрэй успомніў, як гэты чалавек калісьці сам-насам паваліў у Сафіёўскіх лясах мядзведзя-бадзягу, і яму стала вельмі прыкра і балюча за жыццё, за яго жарты з людзьмі.

...Позна ўначы, засынаючы ў сваім пакоіку, ён доўга слухаў подыхі начнога ветру, сачыў, як святло вулічнага ліхтара цьмяна скача паміж яблынь, пахаваных у снезе.

Нягледзячы на ўсё, гэта была радзіма, роднае гняздо, тое, што нельга ўзяць ад чалавека, хіба толькі разам з жыццём.

Ён змежыў вочы. У зіхаценні вогненных плям паплылі перад ім абліччы. І яны таксама былі - радзімай: усе тыя, што адышлі, усе тыя, што яшчэ ідуць поруч, усе тыя, што будуць.

Твар бацькі... Маладога бацькі... Бацька трымаў на руках маці і нёс яе квітнеючым, ружова-белым яблыневым садам. Алёнка... Праплыла - да яснага неба, да палкага сонца, да чыстых зор вадзіць карагод; праплыў яшчэ чыйсьці ўсмешлівы твар.

Апошнім урыўкам думкі, якая знікала і ўхілялася кудысь, ён сказаў сабе:

"Што яшчэ? Што яшчэ трэба ўспомніць?.. Ага, абавязкова трэба спытаць маці, адкуль такое знаёмае мне адно прозвішча..."

Дадумаць ён не паспеў.

...Раніцою бацька выйшаў на гадзіну ў сад, пагуляць па расчышчанай Андрэем сцежцы. Маці і сын былі адны ў хаце.

За вокнамі стаяў іскрысты, блакітна-белы, з сінімі ценямі ад гурбаў дзень. Праменні сонца прабіваліся праз невялічкія вокны, пялёскаліся ў карафцы з вадою, рабізною скакалі па стале.

І гэтыя вясёлыя скокі праменняў зноў напомнілі Андрэю тое спакойнае ўзрушэнне, якое валодала ім апошнія дні перад ад'ездам.

- Ма, - спытаў ён, - ці ведаеш ты такое прозвішча: Горава?

- А чаму ты так думаеш, што я ведаю?

Маці цыравала панчохі ў крэсле і не ўздымала вачэй на сына.

- Нешта ж вельмі знаёмае. Здаецца, мяльком чуў ад цябе нешта такое.

- Чаго гэта табе ў галаву ўлезла?

- У нас адна Горава лекцыі чытае...Ірына Горава.

Маці ўзняла на сына зацікаўленыя цёмныя вочы:

- Магчыма...

Адклала панчохі. Андрэй добра бачыў, што яна чымсьці заклапочана.

- Добра, - сказала яна, - бадай, і праўда, што досыць абыходзіцца намёкамі... Я раней проста пабойвалася распавядаць табе пра гэта падрабязна. Ты і без гэтага марыш пра паветраныя замкі, а гэта ў тваім узросце не пасуе... Хадзі сюды.

Прыўзнялася і пайшла ў кут, да старой скрыні, укрытай самаробнай клятчастай посцілкай.

- Усе гэтыя рэчы Марцэля зберагала. Аж дваццаць год.

Марцэляю звалася старая нянька Андрэя і яго старэйшага брата, які загінуў на вайне. З трыццаць сёмага года яна жыла ў вёсцы ў дзяцей, карыстаючыся невялічкай дапамогай бацькоў Андрэя і рэгулярна прыходзіла да іх на ўсе святы, і яшчэ на дзень нараджэння Андрэя, і дзень загібелі брата.

Магчыма, гэтыя прыходы былі і не без задняй думкі: Марцэлінай сям'і жылося цяжкавата. Маці некалькі разоў прапаноўвала ёй пераехаць да іх у горад, але тая заўжды адмаўлялася: шкада было ўнукаў.

Яна прыходзіла, сухая, цёмная, як ікона, з такімі добрымі, заўчасна стомленымі вачыма, прыносіла немудрашчыя вясковыя гасцінцы па сезону - гарэхі, крашанкі або пражаны гарох, глядзела на Андрэя, уздыхала, што ён такі хударлявы, плакала аб старэйшым выхаванцы і зноў знікала, нагружаная гасцінцамі.

А Андрэй усё ўспамінаў яе цёплыя рукі на галаве, яе блытаныя, бязладныя казкі над яго дзіцячым ложкам, сотні слоўцаў, пачынаючы ад "ёлупа хвашчоўскага" і канчаючы "цёмна, хоць мышэй лаві", і адчуваў, што без яе, пэўна, яго нясцерпнае, да болю, пачуццё радзімы зусім не было б такім поўным. Быў бы сабе звычайны гарадскі хлюпік, без мовы,без водару зямлі, які кожнай вясной хвалявалў яго.

Марцэля зрабіла сваю справу. Коштам гэтых загрубелых у мазалях рук, коштам стомленых вачэй выпакутавала яго, Андрэя, такога, як ён ёсць, непрыкметна, сама не ведаючы гэтага, нарадзіла ў ім душу, - і вось цяпер носіць у клуначку пражаны гарох.

Каб ён мог, ён бы пабудаваў ёй крыштальны палац.

А пакуль ён проста, нічога не кажучы бацькам, дасылаў ёй частку грошай з кожнага ганарару. Ён не ведаў, што тое самае рабілі бацькі.

- Чаго гэта ты іх Марцэлі аддала? - спытаў у маці Андрэй.

Маці паблажліва ўсміхнулася:

- Бо трэба было. Памятаеш, як бацька "саслаў" у камору старыя партрэты і кнігі з "яцем"?

Андрэй усміхнуўся.

- Памятаеш, ма, як я ўначы туды прабіраўся ў адной кашулі, забіраўся з нагамі ў старое крэсла і чытаў... А на падлозе яблыкі ляжалі. На аўсянай саломе. А партрэты глядзяць, глядзяць.

- І я цябе там аднойчы заспела на гарачым. І не выдала.

Яны зарагаталі.

- Ну вось, - сказала маці, - я тады найбольш каштоўнае па ўспамінах аддала Марцэлі. Мала, думаю, што.

Яна адкінула вечка скрыні і дастала з яе даволі вялікі скрутак, загорнуты ў дзіцячую коўдрачку, таксама саматканую ў шашачкі.

- Твая, - сказала яна, - бачыш, як Марцэля зберагла.

- Ма, - сказаў Андрэй, - я думаю вось што. Палову ганарару за кнігі трэба аддаць гэтым унукам. Усё ж старэйшы ўжо амаль трактарыст. А Марцэлю трэба ўзяць да нас.

- Добра. Пагамонім яшчэ пра гэта.

Яны селі ля століка. Маці разгарнула скрутак.

- Мала што засталося, - уздыхнула яна.

На коўдрачцы ляжаў нейкі пажаўцелы рукапіс, некалькі дагератыпаў і фотакартак, бронзавы медаль, другі бронзавы медаль, батлеечная лялька - цар Ірад, жалезны пярсцёнак, яшчэ нейкія паперы, срэбны мёдальён.

Андрэй перабіраў іх. Адзін медаль быў "За ўціхаміранне", другі - інсургенцкі, са зламаным крыжам і пагоняй. Неяк дзіўна было браць іх у рукі.

Пацьмянелыя сведкі даўніх страсцей, якія нікога зараз не абыходзілі.

- А вось гэта добра, - сказала маці, трымаючы на руцэ распяленага "цара Ірада", - гэта была адзіная рэч, якую твая прабабка павезла ў Сібір. Адзіны напамін аб роднай зямлі.

Ірад тапырыўся на яе руцэ, злаславы, з чорнымі вусамі, што амаль вылезлі, у выцвілай царскай вопратцы, ён варушыў рукамі і схіляў галаву.

- Яго ледзь не адабралі ў тваёй прабабкі. Нейкі дурань з чыгуннымі мазгамі палічыў, што гэта антыдзяржаўны намёк.

Яна наблізіла Ірада да сябе і зараз глядзела яму проста ў шкляныя вочы. Ірад замахнуўся на яе рукой.

- Бач ты, які злосны, - маці раптам зусім па-маладому засмяялася. - Трэба будзе яго, Андрэйка, пасля мяне ў музей здаць. Разам з усім. Мне гэта яшчэ патрэбна, а вы... вы зусім другія, новыя. Вам да гэтага бараxла няма справы.

Андрэй падумаў, што ён не здолее так па-маладому смяяцца ў матчыны гады.

- Глядзі, - сказала маці, - зусім выцвіў дагератып.

На матавым, вясёлкава-цьмяным срэбры сапраўды толькі з цяжкасцю можна было разгледзець двух маладых мужчын, амаль юнакоў. Адзін, моцна складзены, з грубавата-гожым тварам і доўгай грывай цёмных валасоў абдымаў другога, значна вышэйшага, за плечы.

- Каліноўскі, - здагадаўся Андрэй.

- Так, і амаль у тым узросце, што і на тваім дагератыпе. А гэта твой прадзед, мой дзед. У Пецярбурзе зроблена.

- Шкада, што аблічча разгледзець нельга.

Маці расчыніла медальён.

- Сапраўды, шкада. Добра, што хаця мініяцюры з часам не псуюцца. Хіба на сонечным святле. Але ў медальёне гэта ім не пагражае. Глядзі, гэта прадзед і прабабка.

У прадзеда быў звычайны, даволі мужны твар. Каштанавыя валасы, жаўтаваты колер скуры, уладная складка ля вуснаў. І недзе, толькі ў зморшчынках ля вачэй, дабрыня.

Затое на прабабку Андрэй глядзеў на поўныя вочы. Крылатыя цёмныя бровы над агромністымі цёмнымі вачыма, маленькі рот, магчыма, занадта доўгая - бо так тады любілі маляваць мастакі - шыя, прамы невялікі нос. Мастаку добра ўдалося перадаць нейкую мяккую жаночую пакорлівасць у спалучэнні са сціплай, але ўладнай цвёрдасцю.

- Бог ты мой, якая жанчына! - уздыхнуў Андрэй. - І падумаць толькі, што я атрымаўся гэткай пачварай.

Ён яшчэ паглядзеў на партрэт, прыўзняў вейкі на маці:

- Ты падобная на яе трошкі... А я - не.

- Ты хутчэй на прадзеда падобны, - сказала маці, - але скардзіцца табе няма на што... У цябе... зусім яе вочы. І веі таксама яе. Толькі ў прабабкі вочы былі цёмныя.

Маці і сын моўчкі глядзелі на партрэты ў медальёне..

- Урэшце, добра, што ты аддала ўсё гэта Марцэлі, - сказаў ён, - усё іншае пагарэла разам з домам... Нічога не шкадую, толькі карцін і кніг шкада.

Маці засмуцілася:

- А мне - не гэтага. Мне Джэка шкада. Бацька, перад тым як у партызаны ісці, сцягнуў з гары яму ўсе шынкі: піруй, брат. Меркавалі яшчэ вярнуцца за ім, ды не атрымалася. Так, пэўна, і згарэў з хатай.

- Так, сабакі палаючы дом не пакідаюць.

Маці пакруціла галавой, быццам адганяючы думкі.

- Глядзі, вось пярсцёнак. З ланцужнага звяна катаржнік скуў для бабкі. Яе там вельмі любілі, на пасяленні. Яна была вельмі харошы чалавек.

- А гэта што? - Андрэй паказаў на рукапіс.

- А гэта самае галоўнае: успаміны бабкі пра паўстанне і Сібір. Прачытай зараз. Акрамя вельмі своеасаблівага стылю, - мне здаецца, яна магла б быць надзвычай цікавым пісьменнікам, - там шмат звестак аб людзях і паўстанні. І зусім не так, як у кнігах. Шчыра.

Яна развязала рукапіс:

- Асабліва прыглядзіся да парома ў вераб'іную ноч. Сапраўдны трагізм.

Тонкая рука маці прыкрыла вочы:

- Можа б, ты з'еў чаго?

- Не, не хочацца нешта.

- То тады ідзі... Чытай... Трэба ж табе, урэшце, ведаць гэта падрабязна.

І яна зноў патэпала да крэсла, да штодзённых панчох.

...Увечары Андрэй спусціўся ў галоўны пакой узрушаны, з чырвонымі павекамі. Рукапіс ён пакінуў у сябе, перачытаць уначы.

Маці толькі што прымусіла бацьку легчы адпачыць. Сядзела з кнігаю пад лямпаю. Мяккі жаўтаваты круг падаў на старонкі, на вузкую руку, на пасму калісьці цёмных, а зараз напалову пасівелых валасоў.

Прыўзняла на сына цёмныя, зусім яшчэ маладыя вочы.

- Прачытаў?

- Так, - Андрэй моўчкі сеў у другое крэсла, - гэта жахліва, ма.

- Што ж, яны ведалі, на што ідуць.

- І я іх вельмі люблю за гэта, - глуха сказаў Андрэй.

- Мне здаецца, - не слухаючы яго, сказала маці, - усё гэта ад хворага сумлення. I я вельмі баюся за цябе. Ты занадта іхні. I зусім не стрыманы. Бацькавай сілы ў цябе няма. Ты знойдзеш нешта. Яму можна будзе аддаць частку сваёй душы. А ты аддасі ўсяго сябе. Да канца... Усё адно, што гэта будзе: справа, вершы. А можа, жанчына.

- Не трэба, - сказаў Андрэй. - Алёнка ўсё ж была калісь.

Маці маўчала.

- Ты тады быў амаль хлопчыкам, - сказала яна, - а зараз ты мужчына. I гэта значна больш складана.

- У мяне былі другія, - сказаў Андрэй.

- Ведаю. Але ты нікога не кахаў. Ты сілком затрымаў сябе. I зараз, калі гэта выбухне, - будзе вялікі пажар. Дай бог толькі, каб гэта была дзяўчына, вартая кахання. Толькі гэтага і прашу ў жыцця... Часам я думаю, што добра было б, каб ты ўсё жыццё кахаў тую бедную дзяўчынку. Знайшоў бы сабе дзяўчыну-друга, якая паважала б тваю памяць пра яе, і спакойна пражыў бы з ёю век.

У адным кутку яе рота з'явілася раптам зморшчынка: цень лёгкай усмешкі.

- Але потым я ўспамінаю, што лёс даў мне такое няшчасце, як сына-паэта. I я разумею, што ўсё гэта - марныя думкі.

Андрэй і маці сядзелі моўчкі. Вецер, што ўзняўся надвячоркам, зараз ужо добра свістаў і роў за сцяною. Было чуваць, як пепінка, сілячыся ўцячы ад яго пякуча-халодных абдоймаў, часам ціха скрабалася ў акно, у марнай надзеі схавацца ад зімы, счакаць на вясну, адчуць, як той самы вецер стане пяшчотным і мяккім.

- Ма, - перарваў маўчанне Андрэй, - можа быць наша Горава нашчадкам таго чалавека на пароме?

- Наўрад ці, - абазвалася пасля паўзы маці. - Цёзак па прозвішчу шмат... Да таго ж, нават калі гэта так, - яна не можа памятаць гэтага.

- Чаму?

- Мімалётная сустрэча на пароме, магчыма, нават цень кахання - пра гэта не расказваюць дзецям... Мы запомнілі таму, што для нас гэта было... як абвал. Ён разбурыў усё наша жыццё, аддаў майго бацьку ў чужы дом, дом ворага. Ты ведаеш, у бацькоў-паўстанцаў адбіралі дзяцей.

Маці памаўчала.

- Не, вядома ж, не памятае, - сказала яна.

## Раздзел VII

Вясна з'явілася ў Маскву зусім нечакана. Здавалася, яшчэ нічога не было, толькі цяклі струменьчыкі бруднай вады з-пад наздраватых куп снегу на газонах, ды цяплейшы стаў адбітак вячэрняга сонца на мурах дамоў. Усе гэтыя няўлоўныя прыкметы магло заўважыць толькі чуйнае вуха ды відушчае вока: больш звонкі, чым зімой, стук дзявочых абцасікаў па асфальце, блакітнае сонейка, якое павісла на вострым кончыку ледзюка, прамені, якія пачалі грэць праз шкло вокан.

А потым пайшло.

Зіма не адступала тут павольна, як у вёсцы, у размераным чаргаванні сонечных дзён і марозных начэй. У горадзе з зімою вялася жорсткая, злая, па-гарадскому, вайна.

Зіму скідвалі з дахаў, як з муроў крэпасці. Яна ляцела ўніз і цяжка ляскалася аб камені. Яе тленныя рэшткі грузілі на самазвалы і вывозілі прэч, ачышчаючы поле пабоішча.

Яе воіны грувасціліся ўжо за горадам, але зіма, подых яе, усё яшчэ існаваў, усё яшчэ гуляў вуліцамі, усё яшчэ наступаў белымі палямі на гарадскія прадмесці.

І раптам...

...дзяўчынка ў зацішку, за рогам дома, пачала гуляць у "класікі", скакаць на адной ножцы па клетках, накрэсленых крэйдай.

- Мак-мак-мак... дурак.

Чамусьці ўсе дзеці з першым подыхам абнаўлення гуляюць у "класы". Дзяўчынка скакала па клетках, і каленкі ў яе былі голыя.

Гэта і была вясна.

А потым пачалася падземная вайна. Сапёры-карэнні вялі падкопы, каб захапіць абшар для жыцця.

І аднойчы выбухнуў мільёнамі салатных пупышак Цвярскі бульвар. Нават тут, у гэтай цёмнай аўдыторыі, Андрэй адчуваў, як за парцьерамі, што завесілі вокны, сваволіць і бяжыць між дрэў, уздымаючы лёгкі зялёны пылок, гарэзлівы вецер.

Вельмі хацелася кудысьці ў пушчу, дзе лазорава сінеюць беларускія пралескі, дзе ў нетрах такуюць цецерукі. Сядзенне ў аўдыторыі было б зусім нясцерпным, каб не Яніс, які соп поруч, з некаторым здзіўленнем разглядаючы "Данаю" Рэмбранта, ды не мяккі грудны голас, які гучаў у цемры.

Пасля таго, аб чым ён даведаўся ў маці, Андрэю было неяк асабліва добра слухаць гэты голас. І зусім не хацелася ні аб чым

пытаць Гораву - а раптам яна нічога не ведае, а раптам гэта толькі супадзенне. Няхай сабе нічога не ведае.

Яна зусім не падабалася яму як жанчына. Але аднойчы ён на хвіліну даў сабе волю і спытаў, а што б ён, Андрэй, адчуў, каб яна знікла. І шчыра адказаў сам сабе, што гэта было б дрэнна. Непрыкметна ён проста прызвычаіўся, што кожны тыдзень будзе бачыць яе, чуць яе голас, сачыць за ходам яе думкі, смяяцца з яе жартаў.

Ён разумеў, што яе лекцыі не проста лекцыі, што гэта яшчэ і нейкі новы, пакуль мала зразумелы для яго, погляд на жыццё, на яго колеры і гукі, на чалавечыя пачуцці, на мастака і мастацтва.

І яму зусім не хацелася згубіць гэтую крыніцу. Ён ведаў, што кожнага чалавека, які сустрэўся з табою па дарозе і ідзе ў той самы бок, што і ты, - трэба вельмі-вельмі берагчы і не губляць з вачэй.

- Ты аб чым задумаўся, - шгурхнуў яго Яніс і пажартаваў, - слухай, пра генія размова ідзе. Пра цябе.

- Ціпун табе на язык, - шапнуў Андрэй, - я пакуль мошчамі быць не збіраюся.

Голас у цемры стаў іранічным:

- Зноў магутна прадстаўленая Беларусь размовы вядзе?

- Прабачце, - сказаў Андрэй, - Яніс кажа, што "Цыганка" Хальса вельмі падобная на яго жонку.

Адчувальны штуршок пад рэбры:

- Свіння.

- Зайздрошчу ,- сказала яна, - вы, Вайвадс, з самага пачатку лекцыі думаеце пра гэта?

- Ён хлусіць, - забурчаў Яніс, - ён проста сказаў, што не хоча быць геніем.

- Супакойцеся, - сказала яна, - гэта небяспека, здаецца, нікому з вас не пагражае.

- З'еў? - спытаў шэптам Вайвадс.

А голас гучаў зноў. І Андрэй пастпова зноў забываў аб вясне, паглыбляючыся ў яго мяккія хвалі.

- Саскія штурхнула Рэмбранта на той шлях, па якім ён пайшоў пасля яе смерці. Да гэтага пералому яго любілі ўсе, ён ледзь спраўляўся з заказамі, у яго было трыццаць вучняў... Але толькі ў апошнія гады жыцця з ёю, а асабліва пасля яе смерці ён зразумеў, што бюргеры хочуць золата і мармуровых калон, хочуць карцін, якія прыемна казычуць нервы, а перад ім другі

шлях - выяўленне ўнутранага жыцця чалавека. І на гэтым шляху ён адзін... Прымірэння не было.

Андрэй раптам убачыў, што яна ўзяла нешта з сумачкі, паднесла да вуснаў і глытнула. Потым, пасля паўзы, казала далей голасам, які стаў трохі больш глухім:

- Спыніцца на шляху ён не мог. І з гэтай хвіліны карцінам яго было суджана заставацца з ім да смерці... І гэта пасля славы.

Яніс, які ўсё яшчэ не мог забыць крыўды, нахіліўся да вуха Андрэя:

- Гэта пра цябе, - з'едліва сказаў ён.- Вершы застануцца з табой.

- Сціхні, бандыт, - сказаў Андрэй.

- І першай з гэтых новых карцін стаў "Начны дазор". Ні сучаснікі, ні мы не здолелі зразумець, што малюе на ёй мастак.

Проста на Андрэя рухаўся знаёмы з дзяцінства натоўп. І сярод гэтага натоўпу схілялася светлая фігура дзяўчынкі з пеўнем у руках.

- Гэта - трывожнае пачуццё чагосьці, што вось-вось можа адбыцца. І людзі ідуць змагацца з гэтым "чымсьці", у імгле і цемры. Яшчэ поўныя сілы, а праз гадзіну, магчыма, аддадзеныя невядомаму.

Андрэй разумеў усё, што яна кажа, нейкімі падсвядомымі глыбінямі, і ўсё гэта было блізка яму.

- Няўжо Рэмбрант з'явіўся адзін? Няўжо ніхто не шукаў разам з ім? Не... Не маглі ўзняцца да яго, але шукалі. Вось Вермеер з Дэльфта. Прасцей і натуральней нельга выявіць чалавека. Але яго цікавіў толькі гэты, толькі адзін чалавек, а Рэмбрант агульначалавечы, як кожны геній.

І боль Рэмбранта быў знаёмы многім. Але ў іх гэта быў проста безвыходны боль, а ў Рэмбранта - туга па еднасці чалавечай, туга па тым, як цяжка, мудра і нясцерпна жыць кожнаму на зямлі.

Глядзіце, вось - "Яўрэйскія клады" Рэйсдаля.

Яна сціхла на хвіліну. Андрэй бачыў, як ускінулася на светлы прамакутнік экрана яе тонкая рука. Адбіткі дыяпазітыва кладіся і на яе, і праз гэтую руку з плоці і крыві, тонкую белую руку, здавалася, бачна было тое, што на экране. Рука была празрыстай.

- У Бахчысараі, поруч з Чуфут-Кале, - казаў далей голас, - ёсць даліна смерці, могілкі, на якіх хаваюць караімаў з усяго свету. Нашы клады не прыгнятаюць, а гэтае будзе сніцца, як кашмар. Нагрувашчанне каменных грабніц, паміж якімі часта

нельга праціснуцца. Усё гэта пераплецена гліцыніямі, якія чапляюць вас за ногі і адзенне. А на грабніцах адно імя, без прозвішча і года. Быццам чалавек не варты іншай памяці. Глядзіце, хіба не такія могілкі тут, перад вамі?.. Ніжэй апусціцца нельга. А Рэмбрант добра ведаў цану чалавека, нават у безвыходным адчаі. Ён ведаў: дрэнных няма. І адзінае, што можа ўзняць чалавека, які апусціўся, гэта мастацтва. Мастацтвам гуляць нельга. Гэта не заказ і не гульня ў бірулькі, гэта сумленне зямлі... Вось "Давід перад Савулам". Хлопчык, што сам здзівіўся дзіву, якое адбываецца пад яго пальцамі. І Савул, які забіваў і атручваў, азірнуўся на жыццё, і яму стала страшна і шкада сябе.

- Бог ты мой, - сказаў ціха Андрэй, - гэта тое самае, што я думаў.

- Значыць, ты не памыляўся, - шапнуў Яніс.

- Ён ведаў, яму будзе цяжка. Ён ведаў, яму не даруюць "Асура, Амана і Эсфіра". Ён ведаў, нельга бяскарна ўзрошчваць у сабе такое. Але праўда пачуццяў была вышэй золата... у яго няма вучняў, імёны яго і Хендрыке абліваюць брудам, ён непатрэбен сябрам. У яго адбіраюць усё, акрамя карцін - карціны нікому не патрэбны, нават крэдыторам. Паміраюць усе, каго ён любіць. І ўрэшце памірае ён сам, пакінуўшы няскончаным "Вяртанне блуднага сына"...

Голас гучаў такой глыбінёй, што Андрэй адчуў, як яму перахапіла подых..

- Ён пераможаны, але ён перамог. Таму што нават у апошняй сваёй карціне давёў, што мастацтва можа быць такім жа складаным, як жыццё... І нават нечым больш, чым яно. Блудны сын прайшоў усе стадыі прыніжэння, ён не можа нават прыпасці да рук бацькі, бо развучыўся любіць. І ў сыне, галаву якога з'ядае парша, мы часам угадваем саміх сябе, калі нам цяжка і патрэбна рука, што можа апусціцца на тваю галаву. Нам неабходна гэта.

Рука Янісава дакранулася да Андрэевага пляча.

Калі запалілі святло, Грынкевічу здалося, што з пачатку гэтай лекцыі прайшлі, пэўна, стагоддзі і што тая вясна, якая шуміць за акном, зусім іншая вясна, а сам ён глядзіць на яе другімі вачыма.

Ён устаў, адчуў са здзіўленнем, што злёгку хістаецца на нагах, і падышоў да яе стала.

Людзі паступова пакідалі аўдыторыю. Урэшце яны засталіся адны. Ён стаяў і глядзеў на яе бязважкую фігурку, на

шэрыя вочы пад зламанымі бровамі, безабаронныя і насцярожаныя вочы.

- Дзякуй вам, Ірына Сяргееўна, - чамусьці ціха сказаў ён.

- Вам спадабалася? Я рада гэтаму. Вельмі.

- "Спадабалася" не тое слова. Разумееце, у кожнага бываюць свае сполахі. І часам прыходзіць хвіліна, калі здаецца, што ты нічога больш не можаш, што хоць пяро з'еш, атрымаецца лухта... І гэта, сапраўды, пасля вялікіх страт.

Ён бачыў яе апушчаныя павекі з цёмнымі веямі. Яна сказала:

- Не шкадуйце аб гэтым. Пакуль вы не давядзеце адваротнага, усе людзі будуць ведаць, што вы на пераломе, і будуць чакаць. Старое не вяртаецца. Пэўна, вы сапраўды на парозе чагосьці новага... І не пакутуйце: часам гэта цягнецца вельмі доўга і надта балюча. А ў сапраўдных паэтаў - праз вялікую тугу, праз абавязковую страту чагосьці вельмі дарагога.

Эпідыяскоп падзяляў іх: маленькая чорная гармата, накіраваная ў сцяну.

- Такое са мною было.

- Ведаю, - проста сказала яна, - я чытала вашу "Смерць на світанні". Але вы пакуль не знайшлі сябе. Значыцца, гэта ўсё яшчэ прыйдзе.

- Я адшукаю гэту дарогу, - сказаў Андрэй, - магчыма, дзякуючы вашаму Рэмбранту.

- Ну, гэта занадта, - сказала яна, - вы з тых, што знаходзяць дарогу самі.

Яна прыўзняла жоўтую сумачку і дадала:

- Толькі не бойцеся, калі на вас будуць шыпець. Ва ўсіх вас ёсць толькі адзін жорсткі суд - суд над сабою.

- Ну, яшчэ раз дзякуй, - сказаў Андрэй, - вы добры чалавек, вас радасна слухаць.

Ён выйшаў на калідор. Вясна глядзелася ў вокны празрыста-зялёнымі шатамі дрэў. Ля акна стаяў бялявы Яніс і глядзеў уніз, на кветнік.

- Ты чаго там затрымаўся, падонак? - спытаў ён. - Унь з Марыйкай Крат ледзь з-за цябе радзімчык не стаўся.

- А чаго ёй злавацца? - неўразумела спытаў Андрэй. - Што, я забіў кагосьці на яе вачах?.. Дзе яна?

- Там за рогам стаіць.

Грынкевіч паціснуў плячыма і накіраваўся за рог. Марыя стаяла там, успёршыся на падваконне, і твар яе здаваўся зеленаватым і зменлівым ад празрыстага ценю весніх дрэў і

зараз, пакуль яна не бачыла яго, нават добрым. Ва ўсіх астатніх выпадках Андрэй ведаў толькі тры выразы на яе твары: раздражнення, насцярожанага чакання і яшчэ - млявай пяшчоты.

Ён падышоў да яе і стаў поруч.

- Вясна, родная. Добра жыць, праўда?

Яна не адказала. Твар адразу стаў напружаным, абцягнуліся скурай і пачырванелі скулы.

- Што з табой? - спытаў Андрэй. - Сарока пярсцёнак украла?

- Ты ведаеш, што са мной.

- Дальбог, не. Я ж не чараўнік. Зноў нейкае глупства.

- На гэты раз не глупства. Ты хутка пакінеш мяне.

- Вядома. Паеду на канікулы. Калі толькі ты не запросіш мяне да сябе.

- Не запрашу.

- Што ж, тваё права. Тады паедзем да мяне.

- Шлюха да цябе паедзе, вось хто. Іх запрашай.

Андрэй усміхнуўся. Яму ні на каго не хацелася злавацца:

- Ты, аднак, і лаяцца можаш. Гэта я ад цябе ўпершыню чую.

- І не тое пачуеш.

Грынкевіч узяў Марыю за руку.

- Слухай, - сур'ёзна сказаў ён, - што, уласна, сталася?

- Ты закахаўся ў гэтую... там, на лекцыі, - тон Марыі быў невымоўна гідлівы.

Андрэя як быццам хтосьці ўдарыў па галаве. Ён стаяў аслупянелы ад гэтай дзікай думкі, не верыў сваім вушам.

- У Гораву? - спытаў ён нарэшце голасам, што прарваўся аднекуль знутры.

- Не вымаўляй яе імя пры мне.

Тэатральная фраза вярнула Андрэю раўнавагу і здольнасць жартаваць:

- І якія ж гэта прыкметы, што я такі закаханы? Ты растлумач, а то я нешта не бачу.

- Ты пачаў хадзіць на ўсе яе лекцыі.

- Што ж, гэта святы абавязак слухача, - сказаў ён.

- Глядзіш на яе сабачымі вачыма, гатовы мастом перад ёю расцягнуцца.

Голас лектара, яе спагада, яе словы аб Рэмбранце, нарэшце, тое, што, магчыма, яе продак быў там, на пароме,

патрабавалі неадкладнага адказу. Гэтай дарэмшчыны нельга было вытрымаць, нават калі б гэта сказала маці.

- Слухай, такімі словамі не кідаюцца. Гэта ўсё адно як гноем кідаць.

- Я кахаю, таму і кідаю, - плечы яе затрэсліся.

Андрэй, як заўжды, не вытрымаў. Шкадаванне да гэтай жанчыны рабіла яго вельмі слабым, і яна гэта ведала.

- Марыя, - сказаў ён, - гэтак жа ж нельга. Нельга так крыўдзіць людзей. Мяне і яе. Я вельмі яе паважаю. Але гэта ўсё.

- Няпраўда, - строга сказала яна, - ты закахаўся, ты, магчыма, нават недзе сустракаешся з ёю. Іначай адкуль такі тон у сённяшняй вашай размове?

- Табе мала майго слова гонару?

- Мала. Калі чалавек закахаецца, ён губляе гонар.

- Калі з чалавекам здараецца такое, ён набывае гонар, - сказаў Андрэй, - проста ты вельмі дрэнна думаеш аб каханні, Маша. А я думаю аб ім высока. І таму слова табе даю, што я ні разу і не думаў ні аб чым іншым. Ані...

- Важнасць, - тарганула яна плячом.

- Слухай, - сказаў ён, - я слова даў.

І прыбавіў глуха:

- Бадай, і не варта было.

- Не варта? - разгублена спытала яна.

- Не варта. Таму што, калі я даю слова, я яго даю.

Але яна ўжо зноў не слухала:

- І яна. Яна на цябе якімі вачыма глядзіць?

Андрэй збялеў.

- Не руш, - глуха сказаў ён, - не руш чалавека. Пра мяне можаш казаць, што хочаш. Іншых - не чапай. Колькі ж гэта вас развялося - майстроў чапаць чалавека за жывое?

- Бачыце вы, які рыцар.

Андрэй маўчаў, адвярнуўшыся ад яе і гледзячы ў акно, бо ў горле хадзіў нейкі камяк. Потым ён глынуў яго і сціснутым голасам сказаў:

- Я, здаецца, пачну цябе ненавідзець. Каб я так псаваў камусьці жыццё, я не спадзяваўся б ні на што, акрамя гэтага.

Адразу ўстрывожаная, яна пасунулася была да яго, але ён адступіў на крок.

- Не падыходзь. Не падыходзь, пакуль я не звыкну да цябе - новай. Я думаў, тут толькі рэўнасць, толькі злосць да мяне. А тут з'явілася незычлівасць і да другіх людзей... Мне раптам стала брыдка з табою.

Ён рэзка павярнуўся і пайшоў ад яе прэч. Размовы, здаецца, ніхто не чуў. Бог ты мой, як брыдка. Не, з гэтым, мабыць, трэба канчаць.

Яніс усё яшчэ стаяў на ранейшым месцы і нервова паглядваў туды, адкуль павінен быў з'явіцца друг. Убачыў. Усміхнуўся.

- Яніс, - сказаў Грынкевіч, - за што?

- А за тое, - змрочна сказаў Яніс, - за тое, што істэрычка. Як што не па іх, дык адразу сімпаты-ычны такі скандальчык... Кінь, Андрэйка, што зробіш, калі ў іх мухі ў носе.

Памаўчаў.

- Ах выдра. Я ж памятаю, як яна да цябе першыя два месяцы ставілася. Проста анёл, з блакітнымі крыльцамі. Я яшчэ, грэшны чалавек, зайздросціў. Не, брат, горшыя за іх толькі дактары.

Грынкевіч закурыў, адчуў, як дымок пякуча пацягнуўся ў лёгкія, і раптам сказаў:

- Продкі ў такіх выпадках дапіваліся да божай плешы.

- Нельга дапівацца, - сур'ёзна сказаў Яніс, - Галіна Іванаўна толькі што аб'яву давала, што заўтра нас павязуць маляваных угоднікаў глядзець.

- Куды?

- Ну, быццам па розных там Уладзімірах ды Суздалях. У мэтах набліжэння да жыцця.

- Гэта добра, - сказаў Андрэй, - я ўсё адно заўтра ў гэты калідор не змог бы прыйсці. Агідна... Хто хаця павязе?

- Кажуць, быццам Горава.

- Што ж, і тое добра. Будзем аптымістамі.

## Раздзел VIII

Аўтобус імпэтна вырваўся з гарадскіх муроў, пакінуў за сабою прадмесці і рынуў у мора блакітнага святла. І яно, разам з зелянеючымі палямі, паглынула яго, зрабіла маленькай кропкай на бязмежным улонні зямлі.

Андрэю нішто не перашкаджала: ні анекдоты на задняй лаўцы, ні гульня вясёлай кампаніі ў карты, ні нават казлятон Баранаўскаса, які нейкім назнарок брыдкім, наўмысна "блатным" голасам спяваў пра "сталіцу калымскай старонкі". Спяваў па-беларуску.

Ён ведаў: усё гэтае блазноцтва было таму, што людзі ап'янелі ад вясновага паветра, ад палёў, ад бязмежных зялёных абшараў, што ляжалі вакол.

Непакоіў трошкі толькі суровы і адчужаны твар Марыі, што сядзела ў самым хвасце аўтобуса і, адвярнуўшыся, глядзела ў акно: вусны сціснутыя ў нітачку, вочы прыжмураныя і халодныя.

Яніс штурхнуў Андрэя ў бок.

- Кінь глядзець, кажу. Замнога гонару. Падумаеш мне яшчэ: каралева Пятра Вялікага.

Яніс быў такі легкаважна-вясёлы, што Андрэй таксама ўсміхнуўся яму ў адказ. Тым больш што жыць было сапраўды добра: такія стаялі вакол празрыстыя і халаднаватыя дні канца мая, з размытымі хмаркамі, з рэдкім сонейкам, што прыгравала там-сям паўночную зямлю, яе бедныя кветкі і спакойныя рэкі.

Вялікі горад застаўся далёка за спіной. Там былі правільныя ўстаноўкі, любоў да бліжняга з пажаданнем дабра яму, змястоўныя і ўдумлівыя даследаванні. А тут была проста палявая купель, дзе халодныя ветры звіняць маладой травою.

Акуніся, акуніся ў мяне.

І ад жыцця амаль нічога не трэба было, хіба што толькі вылезці з аўтобуса і ісці пехатою, трымацца за руку друга пры пераходах цераз ручаіны ды піць прыгажосць весняй зямлі, разлітую вакол.

Аўтобус быў усё ж часткай гарадскіх вуліц. А хацелася, каб травы цалавалі ногі, каб вакол ляжала зямля, каб яна сінела медуніцай, звінела званочкамі белазорыка, цямнела лясамі, крычала па начах таемным крыкам звяроў і адбівалася ў валавокіх, трывожных вачах мудрага лелякa.

Горава сядзела насупраць, поруч з Галінай Іванаўнай, размаўляла аб нейкіх сваіх жаночых справах, і на яе таксама добра было глядзець.

Проста глядзець.

Адарвала вочы ад суседкі, сустрэла позірк Андрэя і ўсміхнулася яму:

- Добра, Андруша, праўда?

- Надзвычай добра жыць, Ірына Сяргееўна, - сказаў Андрэй.

Раптам яна злёгку спахмурнела.

- Так, - і пасля паўзы дадала: - Жыць надзвычай добра. Напэўна, ніхто гэтага не разумее так, як я.

Ад гэтай лёгкай зморшчынкі між броваў, ад суму ў голасе Андрэй яшчэ больш адчуў, што моцная сувязь дружбы звязвае іх, яшчэ нядаўна зусім незнаёмых. Дружбы спакойнай, дружбы, якая гарыць роўным і цёплым агнём.

Гэта была радасць, што яны жывуць на зямлі, што часам яны бываюць поруч. І гэта было зусім не так, як з другімі, бо гэтаму не трэба было канчацца інакш... і горш.

Проста расла ў грудзях хваля ўдзячнасці: у яго да гэтай добрай спадарожніцы, а ў яе - Андрэй амаль цвёрда ведаў гэта - да яго.

Грынкевіч працягнуў ёй цыгарэты.

- Я наогул... але добра, давайце, - сказала яна.

Курылі. Дым парывамі цягнуўся ў прыспушчанае акенца.

- Рублёва будзем глядзець? - спытаў у Горавай Яніс.

- Дзеля гэтага і едзем: ды яшчэ дзеля Нерлі.

Яніс пашкроб у патыліцы:

- Адкажыце вы мне, Ірына Сяргееўна, чаго гэта на старажытных абразах твары ў святых нейкія не рускія? Не славянскія.

- А нашто гэта вам спатрэбіўся мой адказ?

- Яны візантыйскія, гэтыя твары... Грэчаскія.

- Ну дык і што?

- Можа, і мастацтва гэта не рускае. Запазычанае.

Яна ўсміхнулася куточкамі пяшчотных вуснаў:

- Не, Яніс. Гэта ўсё ж чыста наша мастацтва. А аблічча здаюцца чужымі таму, што сам этнічны тып славяніна змяніўся за стагоддзі... Арабскі падарожнік, які ўпершыню пабачыў русаў, пісаў, што яны, увесь натоўп, станістыя, як пальмавы гай. У іх сапраўды былі доўгія ногі, вузкія тулавы, гожыя кісці рук... Зараз старажытнаславянскі тып, бадай што, лепей за ўсё збярогся там, дзе не было татар: на поўначы, а лепей за ўсё - на Беларусі. Паглядзіце вось на нашага Андрэя: ногі доўгія, нос праменькі, вочы вялізныя, як на іконах.

Андрэю стала няёмка, ён быў самай дрэннай думкі пра сваю знешнасць. У гэтым заўсёды пераконвала яго і маці.

- Вочы ў мяне, як у саламандры, пукатыя, ногі - з-пад пахаў растуць. Не трэба, Ірына Сяргееўна.

Яна засмяялася:

- Няпраўда, Андрэй. Я не хлушу. Вы сапраўды... як анёл са старажытнай іконы. Гэтым і адрозніваецеся.

Яніс паглядзеў на іх, выцягнуў папяросы і пайшоў курыць у хвост машыны, да маленькай Анкі, якая замрэяна глядзела ў акно.

Вакол Андрэя і Ірыны стварылася невялічкая "зона пустаты",

- Давядзецца мне, відаць, вам паверыць, - ціха сказаў Андрэй, - таму што гэта вы не першая кажаце мне.

- Тая, што ў "Смерці на світанні"?

- Тая.

- Яна была харошы чалавек?

- Вельмі.

- Гэта жахліва, - сказала яна, - я калісь таксама страціла вельмі блізкага чалавека. Так па-дурному прыйшла смерць... Амаль хлапчукі... З вінтоўкамі супраць танкаў.

Яна знобка павяла плячыма:

- А я яшчэ думала, чаго гэта вы не ажэніцеся... Па тыпу вы зусім не належаце да старых кавалераў.

- Ну, а што б вы мне параілі?

- Не жаніцеся. Мастак павінен быць незалежным. Горшыя ворагі мастаку - хатнія яго.

- А калі каханне?

- Ну, вялікае пачуццё - гэта зусім іншая справа, - сумна сказала яна. - Але такое прыходзіць рэдка... І, на жаль, не да ўсіх.

Сцежка мільгнула ў баку ад дарогі, прытульна пацягнулася кудысьці ў лес, быццам запрашаючы пайсці па ёй.

- Добрая сцежка якая, - сказаў Андрэй. - Вось так бы і пайсці па ёй, каб вялікі груз быў на тваіх плячах, а маленькі - на плячах другой.

- Адам і Ева? - прыўзняла яна зламаныя бровы.- Але ж яны пакінулі рай даўно.

- Нічога, - сказаў Андрэй, - шлях яшчэ цягнецца. І невядома яшчэ, куды ён прывядзе.

Галіна Іванаўна ўбачыла вузкую стужку рачулкі і паляпала да шафёра:

- Спыніцеся, Косця. Пабудзем тут хвілін дваццаць.

- Бачыце, - сказала Горава, - вашы жаданні збываюцца.

- Толькі Евы няма, - збянтэжана сказаў Андрэй, засаромеўшыся яшчэ больш, і з нейкай ненатуральнай фацэтнасцю прыбавіў: - Прысутнасць Еў робіць норавы больш мяккімі і высакароднымі.

Яна засмяялася:

- Божа, як велягурыста! Нельга ж дазволіць, каб чалавек, ды яшчэ паэт, гібеў у жорсткім і невысакародным стане.

...Аўтобус спыніўся. Хлопцы і дзяўчаты рассыпаліся па беразе. Хто смяяўся, хто спяваў, хто проста шпурляў у ваду каменні.

Баранаўскас з энергіяй, вартай лепшага ўжывання, адразу залез на бярозу і крычаў нешта дурнаватым голасам.

- Баранаўскас, злазце адтуль, - хвалявалася Галіна Іванаўна, - хто вы такі, нарэшце?

- Снежны чалавек. - Баранаўскас сеў на галіну, звесіўшы ногі. - Я аднойчы выказаў меркаванне, што снежны чалавек - гэта здзічэлы вясковы настаўнік. Чамусьці ніхто гэтым асабліва не захапіўся.

Горава засмяялася, ідучы поплавам да невысокага ўзгорка на беразе. Андрэй пайшоў поруч з ёю. Яны раз-пораз нахіляліся: ён, ірвучы кветкі, яна - вузкія лёзы светла-зялёнага шчаўя.

Сцежка ўзбегла на пагорак, з яго адкрыліся выгібы рачулкі, а за ёю замрэяныя, зажураныя, бясконцыя лясы.

Ветрык адтуль варушыў растрапаныя пасмачкі на скронях жанчыны.

- Глядзіце, крумкач, - сказаў Андрэй.

Крумкач сядзеў непадалёку, у траве, згорбіўшыся і схіліўшы галаву з невідушчымі вачыма, змрочна-панылы, вугальна-чорны і вялізны, як птэрадактыль. Гарбатая, з нарасцямі ад доўгіх год, дзюба была ўнурана ў зямлю.

- Старажытны які, - задумліва сказала яна, - як вы мяркуеце, Андрэй, аб чым ён думае?

- Гм... бадай што, і скажу... Учора быў дзень яго анёла. Яму мінула чатырыста год.

- Чаго ж ён такі сумны? З пахмелу?

- Не, ён проста думае, што слабеюць птушкі на зямлі, што не дажыць яму да мафусаілавых год бацькі, які бачыў май пяцьсот разоў.

- Бог ты мой, - сказала яна, - колькі разоў з тае пары плакала і зноў смяялася зямля. Колькі людзей адышло ў нябыт... Крумкачову бацьку, пэўна, добра было жыць у тыя гады. Людзі толькі яшчэ прыходзілі з Чарнігаўшчыны, з Кіева, з вашага Прыдняпроўя. Галадалі і паміралі.

- І ўсё ж ішлі. А што выдумаеце, усходнеславянскі мужык - гэта рэч... Але хіба толькі пасля перасялення паміралі тут людзі? З другога боку таксама якая страшная сіла ішла... Тут на Сіці

нашы людзі навалам ляжалі: продку гэтай пачвары хапала, пэўна, і вачэй, неакрытых забралам.

Крумкач павольна распасцёр адно крыло і застаўся сядзець.

- Што мне ў галаву прыйшло, - нявесела ўсміхнуўся Андрэй, - а што, калі гэта бацька нашага крумкача прынёс на вежу да княгіні Агаф'і руку забітага мужа?.. Жылаватую, з залатым пярсцёнкам...

- Вядома, ён, - сказала жанчына. - Галасіла ж, пэўна, бедная.

Андрэй заўважыў сум у вачах спадарожніцы і са злосцю шпурнуў у крумкача камлыгай зямлі,

Той узляцеў над зямлёю чорным касым крыжам, зрэдку завальваючыся то на адзін, то на другі бок, быццам не мог трымаць раўнавагі.

- Нічога, - сказаў Андрэй, - яны пайшлі ад нас, добра зрабіўшы сваю справу.

- Нашто вы яго так? - з дакорам спытала яна,

- Ён - ад загібелі. А вы - жывая. Вы вельмі жывая. І каля вас не павінна быць нічога цёмнага, нічога - ад смерці. Гэта вы памятайце.

З прасветленымі вачыма яна павярнулася да яго:

- Добра, спадзяюся, што гэта так. Хадзем. Нас клічуць.

Ад аўтобуса ўжо сапраўды махалі рукамі сябры, запрашаючы ехаць.

...Уладзімір адкрыўся вачам неяк зусім нечакана. Толькі што змяілася пад нагамі шэрая дарога, толькі што ківалі галовамі наўздагон машыне кветкі, толькі што яна частавала яго шчаўем - і вось ужо з'явіліся ўдалечыні белыя, як трошкі запылены цукар, Уладзімірскія саборы.

Хлопчык сядзеў, задзёршы кашульку, ля канавы. Закінуў у яе нітку на лазінцы: вудзіў. Па манамахавым вале гуляла фанабэрыстая каза. Вочы яе, зялёныя, д'ябальскія, з прамакутнымі вузкімі зрэнкамі, глядзелі на людзей, як на істот ніжэйшай пароды, а выгляд быў надзіва разбэшчаны і пыхлівы.

- Калялітаратурная дама, - сказала Горава, і абое засмяяліся, быццам сапраўды было сказана нешта разумнае.

Вецер гнаў праз Залатую Браму лёгкі пыл, гладзіў расплаўленыя купалы сабораў, гуляў з манетамі абдуванчыкаў у траве.

Усё было добра. І Клязьма, і абшар зарэчча, і дзівосныя муры Успенскага сабора. Але, вядома, лепей за ўсё былі фрэскі

Рублёва: іхнія вялікія вочы з роздумам, з такім глыбокім спакоем, з такой трывогаю на дне.

І ранішняе ззянне вакол іхніх галоў. І заглушана-сіні, падобны на ваду ў канцы жніўня, сум, што залёг у складках іхніх хітонаў.

Андрэй амаль не чуў, што гаварыла яна. Ён толькі ведаў, што гэта вельмі добра, што гэта значна, ды яшчэ адчуў, калі яна скончыла, што яна вельмі хвалюецца, што яе плячо, павернутае да яго, дрыжыць злёгку, ці то ад знобкасці, ці то ад узбуджэння.

І тады, шкадуючы яе, ён паказаў ёй вачыма на тое месца, куды глядзелі вочы праведнікаў,

І яна зразумела яго. Удзячна ўсміхнулася.

На тым месцы леў, падобны на горнага аўчара, ляжаў поруч з гарбатым, занураным мядзведзем.

Леў быў сапраўды смешны.

- Лаяўся мастак пэўна, - сказаў Андрэй. - Адкуль яму было таго льва бачыць?

Горава аж жахнулася, узмахнула рукой:

- Што вы, што вы. Рублёў быў манах. Яны да жывапісу іства падыходзілі.

- Не веру, - сказаў Андрэй. - Не-е, такога дзіва не чакайце. Гэта каб наш чалавек, ды не лаяўся. Няхай ён нават манахам-разманахам будзе.

Памаўчаў. Прыбавіў:

- Але ж глядзіце, як гэты мой цёзка добра ведаў, што толькі два звяры ў свеце ходзяць спачатку дзвюма правымі нагамі, а потым дзвюма левымі.

- Што за звяры?

- Конь-інаходзец і мядзведзь... Так і намаляваў.

- Ого. А я заўсёды думала, што гэта ўмоўнасць або памылка.

Дзіўна, але Андрэй амаль бачыў, як Рублёў пісаў гэта. Ясна, ледзь не да галюцынацый.

Грынкевіч ведаў: такі стан, як у яго зараз, будзе ўвесь час абвастрацца. Ён будзе да болю выразна бачыць усё тое, аб чым будуць размаўляць людзі вакол. Гэтыя праявы будуць яскравець, будуць усё больш набываць крыві і плоці, ператварацца з думак у жывыя карціны, нават у сны.

А потым прыйдзе цяга да вершаў, такая непераадольная, што ён кіне ўсё і будзе пісаць з тым самым болем і неспраможнасцю думаць аб іншым, як жанчына, якая нараджае...

...Рублёў стаяў на рыштаваннях, сухі, зарослы лёгкай каштанавай барадой. Валасы ў яго былі падхоплены раменьчыкам. А вочы былі вельмі маладыя.

За мурамі сабора дагарала на купалах сонца, круціліся вакол іх у ружовым вячэрнім паветры стрыжы, а ў саборы цямнела, гусцелі і наплывалі цені.

У Рублёва балелі стомленыя вочы, балела шыя, пальцы зводзіла сутаргай. Святла было мала, і працаваць было нельга. Але ён не мог не працаваць. І не таму, што сохнуў тынк. Проста нельга было адкінуць шалёную прагу работы.

І тады пальцы рукі, што трымала кісць, успыхнулі ад гэтага жадання і асветлілі фрэску мяккім, як апошнія праменні на купалах, святлом.

І вось гэтае святло засталося на скляпеннях і застанецца ў векі вякоў...

- Андрэй, - кранула яго за рукаў Ірына Сяргееўна.

- Ведаеце, - сказаў Грынкевіч, - мне здаецца, я яго бачыў.

- Я пачынаю вас баяцца, - сур'ёзна сказала яна.

...Аўтобус зноў памчаў усю кампанію. На гэты раз па гасцінцы. Да палаца князя Андрэя ў вёску Багалюбава.

- Шанцуе мне сёння на цёзак, - смяяўся Грынкевіч.

- Вы не смейцеся, - сказала яна, - зараз будзе вам, бадай што, страшнавата з вашай уразлівасцю.

- Чаго гэта, - спытаў Андрэй, - тут восемсот год таму было весела - ветразі падалі на захадзе, лёталі цюкі з шоўкам, бачонкі з сонечным віном. Людзі сабе ў лугах лебедзяў стралялі. Чаго ім было не жыць?

- Куды ўжо весялей, - іранічна сказала яна, - крамола, нашэсці, мячы. Татары пад мурамі.

Падумала:

- І ўсё ж нічога. Яны тады толькі пачыналі думаць, і ім гэта, напэўна, падабалася.

- Яны, мне здаецца, шырэйшымі былі па натуры, больш памяркоўнымі. А потым пачалася татаршчына і ламанне хрыбтоў.

- Ну, ламання хрыбтоў і тады было досыць... І заўсёды. Багалюбава страшнае не гэтым. Справа ў тым, што тут усё ў мінулым. І яшчэ тое страшна, што тут мастацтва гарэла цьмяна, жудасным нейкім святлом.

- Чаму? - спытаў Вайвадс.

- Таму што фарбы не размешваюць на крыві...

Яны выйшлі з аўтобуса. Нехта пайшоў за вартаўнікам, які павінен быў адамкнуць палац. Ад палаца засталася толькі вежа ды яшчэ галерэя да старой царквы. Зеляніна палыну, быццам кранутая марозам, горка і сумна ліла свой пах у вокны белых палат.

Горава адышла ўбок разам з завучам, і ўпершыню за дзень поруч з Андрэем апынулася Марыя.

Яны стаялі трохі наўздалёк ад усіх: Марыя, Андрэй і, кроках у чатырох, Яніс, расчулены Рублёвым ледзь не да ўздыханняў сардэчных.

Марыя глядзела на Грынкевіча прыжмуранымі халоднымі, як лязо брытвы, вачыма. Перавяла позірк на Яніса. Зноў на Андрэя.

Адчуваючы, што зараз адбудзецца нешта зусім недарэчнае, Андрэй усміхнуўся ёй.

- Кінь глупствы, - сказаў ён, - давай мірыцца, ці што?

Яна хмыкнула:

- Брыдка глядзець на вас. Завіхаецеся каля... гэтай, як два кабялькі. Ні сораму, ні гонару. А ўжо яна над вамі панствуе. Дарвалася.

Андрэй раптам адчуў, што нейкая гарачая хваля кінулася яму ў твар. Ён ведаў, што за гэтым прыйдзе выбух несамавітага, страшэннага гневу, такога, які ён перажыў за ўсё жыццё разы тры, і таму баяўся. Ён хацеў устрымацца, але не мог. . Мора чырвонага святла ўстала ў вачах.

- Ты... ты, - глухім голасам сказаў ён і сарваўся на страшны шэпт, - не руш чалавека.

Быў ён жахлівым у гэту хвіліну. Жахлівым, як прадзед у баі пад Зверынам. Прарвалася-такі старая кроў.

- Не руш яе!!!

На іх азірнуліся, убачылі ўстрывожаны твар Яніса, збялелы ад жаху твар жанчыны.

Ускінула насцярожаныя вочы Горава.

Але Андрэй, адчуўшы, што яшчэ адна хвіліна і здарыцца непапраўнае, ужо бег да ўвахода ў царкву, за рог палаца.

Дзіўна, але ўсе, хто наглядаў за гэтай сцэнай, падумалі, што ён крычаў на Яніса.

...Знайшлі Андрэя толькі хвілін праз дзесяць. Ён сядзеў у царкве, што амаль напалову ўрасла ў зямлю, сціскаў кулакамі скроні.

Горава ўзяла яго за плячо, падвяла Вайвадса:

- Ну што за дурыкі. Адразу ж мірыцеся.

Андрэй паспеў ужо прыйсці да свайго заўсёднага добразычлівага настрою:

- Мы не сварыліся.

Усе падумалі, што гэта гонар, але настойваць не сталі.

Андрэй агледзеў вачыма сяброў і пабачыў, што Марыі сярод іх не было.

Гэта было лепей. Ён не мог зараз бачыць яе.

Экскурсія ішла пад арку брамы, і Андрэй ішоў наперадзе, спіной адчуваючы позірк жанчыны. Ён ведаў, позірк гэты дапытлівы і пільны.

Галубінае пяро павольна, бы ў водавароце, падала перад Андрэем на высокую, густа-зялёную траву. Ён падставіў руку і злавіў яго, сціснуў у пальцах. І раптоўна яму здалося, што пяро гэтае нябачна, але моцна звязала яго з закінутай вёскай, з сумам і цішынёю белых палат.

У вузкім акне - ён зноў пачаў летуценнічаць наяву - мільгануў перад ім падазрона вялікі твар, чырвоны, налíты крывёю твар ягонага цёзкі, князя. І потым ужо ўсё, аб чым расказвала Горава, жывымі карцінамі ўставала ў яго вачах.

Ад базедавай хваробы ў Багалюбскага былі шалёныя і ярасныя вочы, ад уроджанай акасцянеласці шыйных пазванкоў - ганарлівая пасадка галавы. Ён не мог яе апусціць, а калі трэба было, - ён нахіляў яе разам з тулавам, як воўк.

Таму яго з дзяцінства лічылі ганарліўцам, і ён сам звык лічыць сябе такім, і жорсткасць ягоная стала пачэ меры цярпення чалавечага. Ад маці-палаўчанкі ягоныя дзікія вочы мелі косы разрэз, і ён сумаваў па стэпах, дзе імчаць шалёным намётам гарбаносыя дзікія коні. Але ён закілзаў сэрца, таму што быў уладаром. Толькі ханская жорсткасць прыжывалася паўсюль, і таму нават тут пачалі ламаць хрыбты. І ён не прыдбаў сабе сяброў вялікім і мудрым жыццём.

Яны ішлі пераходамі палаца, і Андрэй бачыў трапяткі агонь паходні і чалавека з барвяным тварам, з папярочнай, узбухлай жылай на лобе, які з нечалавечай сілай адбіваўся ад шасцёх змоўшчыкаў, узброеных дзідамі і мячамі, раскідваў іх і рыкаў, як паранены леў. А яны зноў і зноў кідаліся на яго, шматавалі, цягнуліся за ім па падлозе.

Вось вырваўся, бяжыць, кідаюцца па скляпеннях, размаляваных травамі, калматыя цені. Сплываючы крывёй, ён бяжыць, і ногі заносяць яго ў бакі, як п'янага. Наперадзе ўратаванне, але ён страціў сілы і розум, свісцячае дыханне вырываецца з яго вуснаў, ногі яго ведаюць толькі, што ўніз

бегчы лягчэй, і ён збочвае, бяжыць па вінтавых каменных сходах. Праз вузкія вокны ў шырокіх нішах, чаргуючыся з пыльнай цемрай, слізгоча па яго твары святло зорак. З інстынктам зайца, які хоча схаваць галаву, чалавек шукае нары.

Ён забіваецца ў нішу акна.

Чуюцца крокі, якія... вось-вось, здаецца пайшлі далей. Не, бліжэй.

- Тут ён!

Страшэнны крык абудзіў Андрэя.

Спусціўшыся па сцёртых прыступках, ён убачыў у пыльнай нішы, дзе дабілі князя, два цёплыя, ружаватыя галубіныя яйкі.

Калі маладыя людзі зноў выйшлі на траву, Андрэй амаль хістаўся. Нервы, напружаныя цэлы дзень, не вытрымлівалі, здавалі. Ён адчуваў сябе няздольным успрымаць, аб чымсьці думаць, нешта любіць. Адбывалася нешта падобнае на тое, як бы ты пабачыў чалавека, зарэзанага машынай, тое, што медыкі-псіхолагі называюць заразай смерці.

Нешта шчымела і варочалася ў горле.

- Што з вамі? - спагадліва спытала Горава.

- Так, Успомніў, што Хронас жор уласных дзяцей, што на месцы Кіева пасля татар трыста год раслі дрэвы.

- А жыць трэба, Андруша, - сумна сказала яна. - Сапраўднаму чалавеку заўжды трэба жыць. Каб множыць дабро.

Яны ледзьве цягнулі ногі, цягнулі толькі таму, што трэба было яшчэ пабачыць царкву Пакрава на Нерлі. І ім зусім не хацелася гэтага, але ногі ішлі аўтаматычна. Трэба ж ім было кудысьці ісці.

Заржавелыя цыстэрны ля чыгуначнага палатна, бетонныя трубы, матляецца на ветры бялізна. Нерэалістычны пейзаж.

Хто ж ты ёсць, чалавек?!

Цьмянае сонца выплывала з-за хмар. З моста над галавою падалі ржавыя кроплі. І калі людзі прайшлі яго, уздых, як у дзіцяці пасля слёз, пашырыў лёгкія Андрэя.

Бясконцыя-бясконцыя лугі з лесам на ўскраіне далягляду ляжалі перад ім. Гусцела іхняя трава, як у тыя часы, калі выязджалі сюды на паляванне з празрыстым гукам рагоў і сакаліным палётам.

Зялёная трава, кураслеп рассыпаў па ёй сваё тлустае золата, і маленькія браткі падміргваюць сінімі вачыма. Але гэта не галоўнае. Там, на краі лугоў, зліўшыся з гэтым, молада-зялёным і залатым, уросшы ў гэты просты пейзаж, відзён

зграбны-зграбны белы прамакутнічак са сціплым зялёным купалам.

Яны мімаволі паскараюць крокі. Царква плыве да іх, адрываючыся ад зямлі, як кветка, раскрытая небу, як неапалімая купіна, палаючая белым агнём.

Там-сям купы ліп падступаюць да яе. І вось бліжэй, і вось бачна ўжо сухая бяроза, што схілілася над старыцай.

- Што гэта? - уражана спытаў Андрэй.

- А гэта і ёсць тое, дзеля чаго варта жыць. Дзіва чалавечага генія.

Яна ішла поруч з ім, невысокая, з мяккімі шэрымі вачыма, у якіх ззяў зараз добры і чысты агонь захаплення.

Царква набліжалася.

Пэўна, нехта заўважыў іх маленькімі мурашкамі ў лугах і проста, бы ў свой дом, адчыніў ім дзверы. Быццам сама яна даверліва адчынілася ім.

Два вузкія перашыйкі паміж Нерлю і старыцай вялі да яе, і ў яснай, як сляза, вадзе старыцы плавалі струхлелыя чаўны, якія нельга было адрозніць ад старажытных.

Простая, зграбная, дасканалая на дасканалай зямлі, яна чакала іх, і вакол не было ані душы, быццам яна сама вырасла з гэтых лугоў і, зажурыўшыся, стаяла над княжычам, што загінуў тут на паляванні восем стагоддзяў таму.

"Пяшчотная мая!" - падумаў Андрэй, і камяк падкаціў яму да горла.

Ён не мог не думаць цяпер. І думкі былі балюча добрымі і ўзвышанымі.

"Я чэрствы і грубы, - думаў ён, - я не верыў, што можна плакаць, гледзячы на каменні. Я веру ў гэта цяпер. Птушкай ускінуся перад табою. Сірынам заспяваю, прыжмурыўшы вочы сярод маладых дрэў, Феніксам згару і ўваскрэсну з попелу".

Яны зайшлі ў сярэдзіну царквы. Нічога не было там: чыстыя белыя сцены, цішыня, святло, што падала невядома адкуль, квадратны алтарны камень.

Ніякіх украс, толькі львы з чалавечымі лікамі глядзяць з верхавін чатырох квадратных калон, і на іхніх вуснах застыла таямніча-сумная, хітраватая і зажмураная, усёразумеючая ўсмешка.

- Божа, - сказаў Андрэй, - я шукаў яе паўсюль, а адшукаў тут.

Праз вокны глядзеў у царкву дзень, спявалі пад ветрам лугі, а тут, зусім поруч, стаяла тая, што паказала яму ўсё гэтае

дзіва, добры-добры друг, чалавек з растрапанымі валасамі, скручанымі на патыліцы ў вялізны цяжкі вузел.

Аб чым вашыя летуценні? Га, недарэчныя ільвы?

Строгі халадок даходзіў да самага сэрца, снежнае святло выціскала вільгаць з вачэй.

І гэтыя шэрыя вочы побач.

"Вось стану на дыбачкі, - думаў Андрэй, - адарвуся ад зямлі, павольна палячу туды, пад купал, купаючыся ў слупах белага святла. І гэты добры-добры чалавек поруч".

"Куды знікла зараза смерці? - думаў Андрэй. - Не, чалавек не звер на зямлі, калі можа стварыць такое. Стократ варта паходзіць ад такіх продкаў. Усім жыццём імкнуцца стварыць вешта падобнае. Можа, і не атрымаецца, але імкніся".

А жанчына поруч узняла руку і паправіла пасмачку валасоў.

"Усё паўторнае на зямлі, і толькі ты адна непаўторная, - думаў Андрэй. - Тысячы разоў яшчэ будуць праліваць кроў і крыўдзіць, але хто, хто наважыцца пырснуць чалавечай крывёю на гэтыя белыя камені, запэцкаць тваю белую нявіннасць і чысціню?"

Яны зноў перайшлі парог і пабачылі бязмежныя залатыя лугі.

І Андрэй доўга яшчэ глядзеў на яе з лугоў.

І здарылася дзіва. Быццам нябачны горад явіў позіркам самы дасканалы свой твор, схаваўшы ўсё астатняе.

І заззялі вакол лугі, і вясёлка абаперлася пятой у ваду ля царквы, запрашаючы дзіва ўзысці на аблокі і явіць сябе ўсім людзям.

"Не, продкі не адышлі, - думаў Андрэй, яны тут і заўжды будуць тут: як песня, якую мы атрымалі ад іх, як іхнія радасць і боль. Яны расквітаюць усмешкай на нашых вуснах, і іхняя журба - гэта наша журба.

І калі мы плачам - мы плачам іхнімі слязьмі.

Бо ніхто не ўцячэ ад іх, як не ўцячэ ад сябе. І ніякая хмара не заб'е майго імкнення да неба ў слупах святла, таго святла, што залівае храм на Нерлі.

Продкі мае, любыя мае, мір вам.

Мір вам з вашай тутою, з думамі, якія зніклі, з клопатамі, якія не датычацца вас.

Прыйдзе дзень, і мяне не будзе. Але свет не застанецца без слоў.

І давеку будуць гучаць пацалункі пад старымі вязамі.

Прыйдзе дзень, і мяне не будзе. Але будзе вечнай зямная цеплыня.

І давеку ля кіёскаў, ззяючы вясёлкаю на сонцы,будзе асядаць са шклянак на шчокі дзяўчат пяшчотны вадзяны пылок.

А на цёплай зямлі ў буркатлівых галубоў лапкі ў вякі вякоў будуць каралавымі.

Дзякуй табе, белая".

Ён ішоў і ўсміхаўся сваім думкам,

"Калісьці я памру. І калі я памру, калі рот мой, які спяваў і цалаваў, калі рукі мае, што рабілі і песцілі, будуць тлом і прахам, - мой нябачны подых застанецца ў гэтых белых мурах, як уздыхі тысяч забытых продкаў.

І я буду ўдзячны табе за тое, што, як яны, я не схіліў каленяў у гэтых мурах, што я, быццам яны, проста пастаяў тут і выйшаў абноўлены і ўсёразумеючы, цвёрда абапіраючыся на меч".

Яны ішлі лугам, а за іхнімі спінамі згасала ў сяйве майскага дня вясёлка над белым дзівам.

- Як свечачка, - ціха сказала Горава.

Яна, Грынкевіч і Галіна Іванаўна ішлі наперадзе, далёка адарваўшыся ад усіх.

- Вось, - сказала Галіна Іванаўна, - а вы са сваімі сваркамі. Што вам зрабіў Вайвадс?

Андрэю не хацелася вяртацца на зямлю. Таму ён адказаў неахвотна:

- Я не на Вайвадса.

- На каго ж? Няўжо на Марыйку Крат?

- На яе.

- Ды што яна такое сказала?

- Яна можа казаць што хоча. Але крыўдзіць людзей я ёй не дам.

Горава ўважліва паглядзела на Андрэя. Грынкевіч падумаў, што яна ўсё зразумела і што ўсё гэта дрэнна.

...Аўтобус ляцеў праз ноч. Міргалі і хаваліся ў цемры рэдкія агні вёсак. Андрэй схаваў аўтаручку і заклаў галубіным пяром тую старонку ў запісной кніжцы, на якой з'явіліся зараз новыя радкі.

Ён адчуваў сябе добра спустошаным і шчаслівы амаль да слёз. Большасць сяброў спалі, стомленыя вялікім і цяжкім днём. Андрэй шчасна пацягнуўся і заўважыў строгі і ўважлівы позірк Ірыны Сяргееўны.

- Новыя вершы? - шэптам спытала яна.

- Так. Новыя вершы.

- Нерль?

- Нерль.

- Прачытайце.

Андрэй таксама амаль шэптам прачытаў.

- Добра, - ціха сказала яна, - вельмі дакладна па настрою і вельмі палка. Можа, гэта і ёсць пачатак вашага выйсця.

Вочы Андрэя вільготна блішчалі.

- Ірына Сяргееўна, - сказаў ён, - я сягоння шчаслівы. Я вельмі... вельмі шчаслівы. Быццам нанова нарадзіўся на свет. І ён такі прамыты, такі зіхатлівы. Дзякуй вам за гэта.

- Што вы, Андруша, мілы. За што мне? Дзякуйце таму, невядомаму.

- Не, - цвёрда сказаў Андрэй, - і яму і вам. Таму што вы адкрылі мне вочы на гэта.

Яна маўчала. Потым прыўзняла сур'ёзныя вочы.

- Андруша, - ціха сказала яна, - вы раззлаваліся на Марыю з-за мяне.

- Так, - неахвотна сказаў Андрэй.

- Не трэба. Не як выкладчык, як жанчына кажу вам: не трэба. Чым яна вінаватая?

- А чым вінаватая вы? Тым, што добрая?

- І ўсё ж не трэба.. Дзеля мяне.

- Добра.

Яны моўчкі сядзелі ў аўтобусе, які ляцеў у ноч.

- Раскажыце што-небудзь, - папрасіў Андрэй, - што-небудзь з таго, што ўразіла вас больш за ўсё.

- Добра, - мяккім голасам сказала яна. - Я была тады маленькая, і гэта было да вайны. Некаторы час я жыла ў сям'і славутага кампазітара, вучылася ў яго. І вось аднойчы ён узяў мяне ў Ноўгарад. А там мы пайшлі ў царкву Спаса Нярэдзіцы... Немцы ў вайну знішчылі яе... А тады яна была ва ўсёй сваёй прыгажосці. І фрэскі ўсярэдзіне: страшны суд. Густая чырвань, дымнае золата і чарната. Паказваў нам дваім царкву маленькі бедны попік. Раса зашмальцаваная, валосікі хвігай тырчаць на патыліцы. Але вось ён даведаўся, хто са мною. "Пачакайце, - кажа, - я вас чымсьці паспрабую здзівіць. Для гэтых фрэсак патрэбны і словы адпаведныя". Дзіўна, што ён так добра зразумеў сутнасць царквы. Але ведаеце, што ён зрабіў? Ён пакінуў толькі адну свечку. І пры яе святле, пад усімі гэтымі фрэскамі, пачаў чытаць пакаянны псалом. Цень, маленькі

язычок агню, пагрозлівыя твары фрэсак. І гэтыя жахлівыя, старажытныя словы. Цяжкія, як праклён... Я ніколі гэтага не забуду... Мой спадарожнік потым сказаў, што больш не прыйдзе сюды, каб не псаваць уражання.

Зноў яны маўчалі. Імчалі ім насустрач і знікалі цьмяныя абрысы дрэў.

- Раскажыце пра сябе, - сказала яна, - пра сваю радзіму.

- Яна прыгожая, - сказаў Андрэй, - яна лепшая ў свеце.

- А балоты?

- Што ж, і балоты бываюць прыгожымі. Уначы па іх скача прывідная кавалькада: дзікае паляванне караля Стаха. Так кажуць народныя паданні. Коні не пакідаюць слядоў, а над галовамі коннікаў гарыць самотная зорка.

- Раскажыце мне якую-небудзь казку.

І Андрэй пачаў "Вужыную каралеву".

Човен, заплецены белымі лілеямі... залёты вужынага караля... замак на выспе... пакуты дзяцей... крывавая пена на хвалях... юнак у залатой світцы пад вадой.

І толькі потым, толькі расказаўшы ўсё, Андрэй спахапіўся, што ўпершыню за гады ўспомніў казку, якую ненавідзеў яшчэ з тых, яшчэ з Алёнчыных часоў.

- Бог ты мой, - ціха сказала Горава, - якая прыгажосць, які дзіўны склад фантазіі.

- Так, - сказаў Андрэй, - фантазія незвычайная. І незвычайны лёс.

Зусім паблізу ад сябе ён бачыў яе вялікія шэрыя вочы, вузел валасоў. І яго, у які ўжо раз, здзівіў той пакорліва-нявінны, разумны выраз, які быў неадрыўны ад усяго аблічча гэтай незвычайнай жанчыны.

Яны сядзелі і размаўлялі шэптам, а аўтобус усё ляцеў і ляцеў у ноч.

- Вы як небудзь заходзьце да мяне, - сказала яна, - пакажу карціны.

- Добра, - адказаў Андрэй, - але ж вы днямі едзеце за мяжу, потым у нас вакацыі.

- Ну то заходзьце пасля вакацый.

- Абавязкова.

Няскора яшчэ ўдалося Андрэю выканаць сваё абяцанне. Але тады ён не ведаў гэтага. Ён проста сядзеў поруч з жанчынай і глядзеў на яе.

А аўтобус ляцеў і ляцеў, і наперадзе чакала яго ноч.

## Раздзел IX

На пачатку ліпеня сябры раз'ехаліся па хатах. Андрэй пажыў тыдні тры дома, а потым скарыстаўся запрашэннем дзядзькі, па-паходнаму хутка сабраўся і раніцою наступнага дня ўжо выходзіў з цягніка на перон невялічкай станцыі.

Гарадок гэты быў той самы Сухадол, ля якога ў памятную вераб'іную ноч адбылася "паромная трагедыя". Большасць Грынкевічаў з гэтай прычыны не любіла Сухадол, але дзядзька прыжыўся тут, пусціў карэнні і не хацеў нават думаць аб іншых мясцінах.

Жыў ён у вялізным напаўпустым доме, што пабудаваў яшчэ дзед, жыў разам з жонкай і маці, амаль глухой бабуляй, што любіла Андрэя як роднага, хоць і даводзілася маці Андрэя мачыхай.

Толькі вялізны сад аддзяляў дом ад Дняпра, вельмі шырокага ў гэтым месцы і вельмі пустога.

Дно Дняпра хавала шмат цікавага: дзядзька, напрыклад, паліў печ мораным дубам, паспяхова выцягваў дубовыя падводныя палі з моста, які калісь навёў Напалеон.

Андрэй любіў Сухадол, такі ціхі і павольны, любіў дзедаўскія тры клёны і таполю, што абапіраліся на дах, любіў вулкі, зарослыя рамонкамі - адвечны выпас усіх гусянят, любіў клады над дняпроўскім адхонам.

Клады ў спёку мрэялі верхавінамі дрэў, у непагоду шумелі векавымі хвоямі. Яны былі агульныя, праваслаўна-каталіцкія.

Ужо ідучы са станцыі, ён пачуў у кветніку лянівую размову нейкіх двух дзядзькоў.

- Чаго гэта ты плот свой не падпіраеш? Глядзі, самне ён тваё яблыні.

- Не, - адказаў лянівы бас, - ён на бок суседа хіліцца, хай сусед і падпірае. Даўно, чорт на яго, пастаўлены плот. Пры нэпе, відаць, каб яго...

І Андрэй засмяяўся. Увесь Сухадол быў такі, прыдатны хутчэй да таго, каб дажываць, чым жыць.

Хлопец быў сустрэты ахамі і вохамі, атрымаў вялікі пакой (два акны ў сад, два - на вуліцу), расклаў на стале рукапісы, - і пайшлі дні ў чаргаванні працы і адпачынку, вершаў і рыбнай лоўлі.

Дзядзька быў адмысловы рыбак, а садаводам быў такім добрым, што выводзіў у Сухадоле вінаград.

Але Андрэй любіў дзядзьку не толькі за гэта. У дзядзькі быў рэдкі гумар, такі сонечна-вясёлы, такі смачна-з'едлівы, што каля яго людзі смяяліся да знямогі з раніцы да вечара. Дзіўна, як ён мог яго зберагчы на працягу свайго страшнага жыцця.

А жыццё ў яго было сапраўды страшнае. Яшчэ дагэтуль часам яго пачынаў біць цік. Аб паходжанні яго дзядзька расказваў неахвотна:

- Другі дзень стаю ў гестапа тварам да сцяны. Сабакі ў спіну хакаюць. А сволачы гэтыя кожныя трыццаць хвілін страляюць у сцяну ля галавы. І кожны такі стрэл можа быць апошнім. Ну, аднак злаўчыўся, уцёк ад іх. Дагэтуль сам сабе не веру...

Для рыбалак падабралася добрая кампанія: дзядзька, настаўнік Мікалай Якаўлевіч і яшчэ Пятро, звяга, які заўжды смешна лаяўся з астатнімі.

Імя па бацьку ў Пятра было Трыфанавіч, але дзядзька, карыстаючыся ім як асновай, зрабіў з яго нешта такое непрыстойнае, што пры бабах хоць і не кажы.

На рыбалку дзядзька ездзіў у вастраканечным саламяным брылі, Мікалай Якаўлевіч - у матроскай бесказырцы, парыжэлай ад часу, Пятро з непрыстойным імем па бацьку - у фуражцы.

Рыззё на ўсіх было страшэннае: інтэлігентная кампанія нагадвала хаўрус бандытаў.

І ўсё ж падчас гэтых вясёлых эскапад (а ездзілі на рыбу далёка, кіламетраў на пяцьдзесят па рацэ) Андрэй адчуваў часам нейкі сум, нейкую невыразную незадаволенасць жыццём.

А між тым ён ніколі яшчэ не пісаў так многа і добра, ніколі так поўна не адпачываў.

У канцы ліпеня прыехаў зусім нечакана Іван Століч, бацька Алёнкі. У яго было толькі некалькі вольных дзён. Два з іх вырашылі "забіць" на рыбалцы. Дзядзька падрыхтаваў маторны човен. Выехаць пастанавілі на золку.

Напярэдадні Андрэй і Століч доўга сядзелі ў начным садзе, дыхалі халаднаватым росным паветрам з нясцерпна салодкім водарам адцвітаючай мацёлы, якая невыразна бялела ў цемры.

Конікі стракаталі ўтрапёна. Зрэдку цішу ўспорваў крык драча. За ракою палала вогнішча: касцы на зарэчных паплавах гатавалі вячэру,

І так добра дыхаў у цемры начны сад, што рабілася шкада чагосьці незваротнага, шкада болю, які прайшоў.

- Добра, сынок, - сказаў раптам Іван.

Андрэй не мог без пакутлівага шкадавання глядзець на гэтага чалавека. Ён ведаў: той нічога не забыў. Сведчылі аб гэтым зусім сівыя валасы.

- Я думаю часам, - казаў Століч, - як гэта цяжка заставацца аднаму, без тых, каго любіш... Чаму не загінуў я - невядома... Цяжка аднаму.

- Я гэта ведаю, добра ведаю, дзядзька. Я вельмі кахаў яе, - глуха сказаў Андрэй.

- У вас зараз былі б ужо дзеці... Прайшло восем год. Хлопчык быў бы падобны на яе, дзяўчынка - на цябе.

Гэта яны ўпершыню загаварылі пра нябожчыцу. І гэта было непатрэбна. Непатрэбна было ўсё гэта.

- Дзядзька, - сказаў Андрэй, - не трэба. Вы бачыце, я столькі год захоўваю памяць пра яе, зберагаю кожны яе рух. Але я пачаў забываць яе голас. Гэта - як кашмар... Але я помню, я ніколі не забуду. Толькі не трэба дакранацца да старых ран.

- Бадай, твая праўда, - сказаў Століч.

Ён маўчаў яшчэ хвілін пяць, потым устаў.

- Я пайду.

І, сівы, сагнуты гадамі і цяжарам даўняга гора, пашыбаваў у дом.

Андрэй глядзеў яму ў спіну. Нясцерпна шкада было гэтага чалавека...

...Раніцой дзядзька ледзь не за нагу сцягнуў Андрэя з ложка. Шырокі твар дзядзькі расплываўся ад усмешкі, у цёмных вачанятах скакалі чэрці.

- Уставай, барэмбус. Жонка сказала, каб пайшлі панюхалі. А куды пайшлі і чаго панюхалі - не сказала. Дарогай скажа.

Выявілася, што панюхаць запрашалі маласольныя агуркі. Пахнулі яны, сапраўды, адмыслова: кропам, вішнёвым лісцем і сонечным днём.

Андрэй выліў на сябе цэбар вады ля студні, спехам паснедаў і пачаў грузіць на каляску сець, сцяблы, якар, кошык з правізіяй. Дзядзька, прынцыповы лайдак, глядзеў на мітусню Андрэя і Століча і забаўляў іх:

- У школе вучні пісалі твор на тэму: "Славутасці Сухадола". Адна напісала: "Бывае кіно, часам прыязджаюць артысты, а па суботах у сінагозе бываюць танцы".

- Брэшаш ты ўсё, - азваўся Століч.

- Чаго брашу? Сапраўды, сінагогу зачынілі. Зрабілі клуб... А тут яшчэ няшчасце. На сеансе адчыняюцца дзверы, і нехта крычыць у цемру: "Не, вы паглядзіце толькі, што робіцца на

беленькім свеце! Шайкевіч, чаго вы тут седзіцё, калі ў вас удома пажар?" Ну, той толькі "уф-уф", за сэрца схапіўся - і канцы.

І хоць Андрэй ведаў, што ўсё гэта брахня, - яму стала трошкі весялей.

Яны выйшлі на высокі гліністы адхон над ракой тады, калі сонца паказала над зарэчнымі паплавамі чырвоную патыліцу. Жамчужна-блакітная рака ледзь шалахцела млявымі хвалямі, якія на пяску здаваліся зусім ружовымі. Пах сена адчуваўся нават тут, за ракой, густы, добры, як сама прыдняпроўская зямля.

Ніжэй па плыні чарада кароў пераплывала Дняпро, на пашу. Пастух плыў за імі, стоячы ў чаўне.

Нарэшце - толькі арліны зрок дзядзькі мог пабачыць гэта - дзядзька паказаў рукою на плынь, дзе рухаліся дзве кропкі. Гэта веславалі Мікалай і Пятро. Пад'ехалі яны толькі праз паўгадзіны.

Да кармы вялізнай маторкі прывязалі абодва чаўны, нацягалі са стагоў сена і намасцілі яго на дно маторкі. Дзядзька зноў успомніў нешта.

- А то яшчэ вось што было. Дзед Казыра намасціў вось так сена ў човен са стога, які ў лагчыне стаяў. Вяслуе сабе, і раптам, кажа, здарылася нешта незразумелае: заварушылася раптам там, дзе трыццаць год нічога не варушылася... Вужака... А порткі ў яго падраныя былі. Дык ён бег адтуль аж да рынку, пакуль каля рынку не агойтаўся, што портак няма. Згубіў. Пайшоў падбіраць. Дык што вы думаеце, адну калашыну падабраў, а другую - не.

Пятро пачаў адпіхвацца ад берага. Але перад гэтым амаль з пяшчотай агледзеў зношанае вясло і сказаў салодкім голасам:

- Во, брат, у мяне вясельца якое. Тандэт.

Скора ўсе яны ўжо ляжалі на сене, на дне чаўна, а Андрэй стырнаваў, седзячы на карме. Вусы пены расплываліся за кармою, табакаў матор, плылі вакол нізкія берагія. затокі, зарослыя гускай.

Тэніску ён скінуў. Спіну прыемна прыпякала сонца, грудзі абвяваў ветрык, кідаючы зрэдку на скуру кроплі вады.

Такая была цішыня. І, аднак, нейкае тамленне не пакідала душы. Пайшоў справа высокі адхон. Злева ўсё яшчэ цягнуўся нізкі бераг.

Коршак ганяў над вадою кулічкоў-пясчанікаў. Заўважыўшы коршака, тыя ляцелі стайкаю на другі бераг, чыркаючы па вадзе. А калі ён пералятаў за імі, - зноў ляцелі на ранейшае месца.

Дзядзька раптам прыўзняў галаву.

- Глядзі, Андрэй, - ціха сказаў ён.

На правым ад іх беразе ўзвышаўся самотны пагорак, зарослы чорнай альхой. Можна было яшчэ разабраць, дзе быў спуск да вады. Больш не было нічога.

- Месца, дзе быў паром, - сказаў дзядзька і зняў брыль.

Моўчкі, з суровымі тварамі, праплывалі яны міма месца даўняй трагедыі.

- Вось табе, ваша сіяцельства, - буркнуў дзядзька. - Ты даўно ўжо косці парыш, імя тваё забылі. А праўнук забітых жыве. А мы жывём. Нас так проста з зямлі не скалупнеш, кашы вы яшчэ мала елі.

Андрэй ведаў некаторую схільнасць дзядзькі да меладраматызму і таму маўчаў. А Століч, дык той глядзеў на дзядзьку нават з павагай.

- Гораў... Гораў... Горава, - думаў Андрэй.

І раптам з неверагоднай яснасцю зразумеў, адкуль было тамленне.

Не хапала яе. Не хапала гукаў яе голасу, не хапала растрапаных пасмачаў, шэрых рахманых вачэй, пяшчотнай выразнасці рухаў.

Не хапала да болю. Хоць крычы.

"Што са мной?" - падумаў ён.

І раптоўна падмываючая хваля радасці ахапіла яго.

"Здаецца... здаецца, гэта прыйшло... Нарэшце гэта прыйшло... Няўжо?!"

Дзядзька паглядзеў на Андрэя дзіўнымі вачыма, так змяніўся той.

Ну вядома ж, гэта было так. Вядома, не хапала яе. Ён проста быў упэўнены, што не можа болей пакахаць, таму і не думаў пра яе... А зараз як быццам амыліся вочы. І свет такі шырокі. І вецер дыхае новым жыццём. Ну не, жыццё яшчэ не скончана. Жыццё яшчэ можна пачаць спачатку, вось тут, на гэтай вялікай рацэ, у гэтую хвіліну.

Ён падбавіў матору абаротаў. Цяпер човен ляцеў, як вялізная белая чайка, і, плаўна разгортваючыся, плылі міма яго рачныя берагі.

Дзядзька глядзеў на постаць Андрэя вачыма, поўнымі радасці за яго і болю за сябе.

- Архангел. А я вось і не заўважыў, як стаў старым хрэнам.

Дзень быў на схіле, калі яны пад'ехалі да вёскі Кручы, што ўтульна ўстаткавалася на стромых адхонах Дняпра.

Добрай спёкай дыхалі цёмна-кучаравыя сады. На самай высокай кручы, над могілкамі, стаяла магутная сасна. Верхавіну яе разбіла перуном. І там прымасціўся бусел. Стаяў зараз на гняздзе і размаўляў сам з сабой на незразумелай, пэўна, афрыканскай, мове.

І цямнеў пад гэтай кручай вялізны стары памешчыцкі парк.

- Кручы, - сказаў дзядзька, - тут Ахонька жыве. Вось яшчэ з ім было. Паехаў ён красці лес. Падбіў на гэта двух шафёраў. Адзін з іх кажа: "Ты глядзі, калі лес крадзены, - я не паеду". Ахонька пакрыўдзіўся. "Што ты, - кажа, - вось квітанцыя". І паказвае квітанцыю, якой два гады. Ну, прыехалі. "Вось гэту, - кажа, - палясоўшчык дазволіў. Гэту. Гэту..." Ну, пляжаць. Аж бачаць, шыбуе палясоўшчык. Давай запісваць нумары машын. Ахоня тады руку ў кішэнь і на яго. Той бегчы. Ахоня за ім. Той бегчы. Ахоня за ім. Загнаў аж за Тошчыцу. Той ужо і бегчы не можа. Спыніўся. Ахоня руку з кішэні - раз. Той аж вочы закрыў. Потым адкрывае, а Ахоня яму рыўцом да носа. "На, - кажа, - дзвесце рублёў". Той толькі сплюнуў. "Цьфу, - кажа, - свіння". Аднак грошы ўзяў.

Андрэй слухаў яго, бессэнсоўна ўсміхаючыся сваім думкам. На зямлі было добра. І зусім яшчэ нічога не было страчана. І ўсё было для Ірыны. І Дняпро, які яна, вядома, палюбіць, і Кручы, дзе ён можа пабудаваць ёй дом, і бусел, які не абміне іхняй хаты сынам і дачкой.

Свет быццам увесь споўніўся музыкай. Звінелі нават кучаравыя аблокі, плывучы на ўсход, да яе. І нават засуш, якая ў тое лета катавала палі, здалася не такой ужо жахлівай.

Вядома, дождж прыйдзе. Ён не можа не прыйсці, як не можа не прыйсці каханне ў змучанае смагай сэрца.

Андрэй ведаў: дождж прыйдзе.

Цяпер яму здаваўся нясцерпным той месяц, які ён правядзе без яе. Сум зваліўся так нечакана, што ён не паспеў падрыхтавацца. На шчасце, прыступ быў кароткі, а потым зноў вярнулася радасць.

...За Кручамі яны спыніліся. Наторгалі гусцёрак. Дзядзька да іх злавіў яшчэ два акуні і зараз сваячэннадзейнічаў над юшкай. Расклаў цяпельца з сухіх лазовых галін, каб юшка прыпахвала дымком, паклаў рыбу, некалькі бульбін, чатыры цыбуліны з не да канца абдзёртай жоўтай лушпайкай (каб юшка была прыемнага бурштынавага колеру), паклаў перцу, а потым асцярожна ўліў у юшку дзве лыжкі гарэлкі.

Астатнія тым часам адплылі рыбаліць. Андрэй застаўся ля дзядзькі адзін.

- Юшка, брат, будзе першы гатунак. Нават Трыфанавіч (ён сказаў іначай) будзе задаволены.

Андрэй маўчаў. Гэта не было галоўным. Галоўным было тое, што на свеце жыла яна.

"А Алёна? - варухнулася думка. - Што ж Алёна, - адказаў другі голас, - была б жывая, кахаў бы яе. А зараз нічога не зробіш..."

Але ўсё ж яму стала сорамна. Асабліва чамусьці перад Іванам Столічам. Быццам ён, Андрэй, здрадзіў нечаму вялікаму, што яны кляліся любіць, знайшоў святло, у той час, як у бацькі няма, і яшчэ і не можа быць суцяшэння.

Юшку з'елі з насалодай... Пасля гэтага дзядзька застаўся ля маторкі, а астатнія паплылі па плыні. Дзядзька павінен быў дагнаць іх пасля. Андрэю не было чаго рабіць, і ён сказаў дзядзьку, што пойдзе да Кручаў пехтурою і там пачакае ўсіх.

Ісці трэба было праз лес. Андрэй натрапіў на глухую лясную рачулку.

Чорная, з зялёнымі адценнямі, як пяро качкі, яна змяілася паміж карчоў, варушыла павесмамі водарасцяў, быццам хтось у вадзе павольна часаў зялёны лён. Чырвоныя мухаморы гдядзеліся ў чорны лак вады.

Андрэй перайшоў раку па аксамітным бервяне і лёг у пульхны зялёны мох. Ён не баяўся змей, ён цяпер наогул нічога не баяўся. Калі ў сэрцы небасхіл, - чалавек не можа памерці. Яго нельга забіць. Смерці няма. Яе выдумалі. Яе зусім не будзе.

Радасць ахапіла ўсю істоту Андрэя. Радасць з той прычыны, што ён малады, здаровы, што вакол яго родная зямля, што зрынутыя дрэвы ляжаць поруч з ім, жывым, што ён кахае.

Дрэвы варушылі галінамі над яго галавой.

...І потым, калі ён стаяў на кручы, пад буслянкай, шум дрэў зноў падпяваў ягоным думкам.

Ён стаяў на адхоне, і магілы кладоў былі ззаду, а наперадзе была далячынь, адкуль ляцеў вецер толькі для таго, каб устрапаць яму чуб.

Бусляняты спрабавалі лётаць. Яны нязграбна плавалі ў вячэрнім аранжавым ззянні, дыбалі нагамі ў паветры, плылі над ракой, над светам, які цяпер зноў належаў яму.

Андрэй не бачыў, што Іван Століч, сышоўшы на бераг, ускараскаўся на строму і стаіць непадалёку, разумнымі вачыма разглядаючы пададзеную наперад, імпэтную постаць хлопца. Ён

страпянуўся толькі тады, калі рука Івана апусцілася яму на плячо.

- Што з табою, сынок?

І з той вышэйшай праніклівасцю, якою адрозніваюцца людзі, што многа пакутавалі, спытаў:

- Зразумеў, што кахаеш кагось?

- Здаецца, так, бацька, - проста адказау Андрэй.

Століч павесіў попельна-сівую галаву.

- Прабачце, - сказаў Андрэй.

- Чаго ўжо там... Ты добры хлопец, Андрэй. Ты і так памятаў вельмі доўга. Усё мае канец. Прорвы і тыя заплываюць. Прыйшоў і твой час.

- Бацька, - сказаў Андрэй, - я не вінаваты.

- Ніхто не вінаваты. Ні я, ні мая бедная дзяўчынка, ні тая, твая... А ты вінаваты менш за ўсіх... Добрая хоць жанчыша?

- Вельмі.

- Добра. Толькі вось аб чым я прашу цябе. Не забывай мяне. Наведвай... з ёю. Ты знаеш, усё маё жыццё - гэта была Алёна. І ты застаўся для мяне часткай яе. Апошняй часткай.

- Я не забуду... дзядзька Іван. Гэтага не забываюць.

- Ну добра... "Ныня адпушчаешы"... Бывай шчаслівы, сын.

І ён пайшоў уніз да чаўна. Пайшоў ненатуральна прамы, відавочна імкнучыся не хіліцца пад цяжарам забыцця, таго, якое парушыла апошнюю сувязь яго Алёны з зямлёй.

Грынкевіч успомніў мінулае. Ён прымусіў сябе ўспомніць яго. Але ўспамін не мучыў.

- Мір табе, Алёнка, - ціха сказаў ён, - даруй мне.

Прыцемкі заснавалі зямлю. Чырвоны шчыт месяца выплыў за ракой. І ў паўзмроку ўсё яшчэ чуліся ўсхлёпы крылаў, пошчак буславых дзюб і віск.

Пад вялізным месяцам чынілася справа жыцця: буслы рыхтаваліся ў вечна новы палёт.

## Раздзел X

Яе не было ў Маскве ўвесь верасень. Кожны дзень Андрэй прыходзіў у знаёмы будынак з надзеяй яшчэ да таго, як пачуе голас, нейкім шостым пачуццём, усёй істотай адчуць, што яна тут. І кожны раз нясцерпным было расчараванне: пусты дом, пустыя калідоры, пустая аўдыторыя.

І галоўнае, няма адказу на дасланую кнігу.

Ніколі яшчэ чаканне не было такім вострым. Нават потым. Ён проста прагнуў хутчэй пабачыць маленькую постаць з жоўтым партфелем у руцэ. А постаці не было і не было.

Андрэй неяк відавочна падзічэў. Нават Яніс здаваўся яму зараз занадта шумлівым. Хацелася цішыні. І ён палюбіў Архангельскае. Не Архангельскае экскурсіённых дзён, а Архангельскае будняў, калі пачынаюць падаць лісты і парк журботна скідае сваю прыгажосць.

Дзіўна, але ў гэтым бясконцым роздуме нават каханне яго зрабілася слабейшым. Ён радзей думаў аб ёй, менш бачыў яе ў сне. Ён не ведаў, што каханне проста зайшло ўглыбіню, што чалавек заўжды ідзе на такую бессвядомую маскіроўку пачуццяў, калі каханага доўга няма поруч, што чалавек супраціўляецца дарэмнаму раскіданню кахання або нянавісці.

А Масква была ў тую восень, як назнарок, нечувана прыгожай, пакорліва-мяккай. Паркі спакойна аддаваліся зазімкам. З кожным днём меншала сонца на вуліцах і большала затое ў садах. Падмаскоўе мякка гудзела электрычкамі ў сумна-прыбраных, прасторных гаях. А глыбокай ноччу ў парках паміралі пад белай пудрай намаразі вялікія кветкі апошніх вяргінь. Малыя кветкі вяргінь яшчэ трымаліся і сяк-так зносілі начную шэрань і дзённыя дажджы.

І вось аднойчы ён, падымаючыся па сходах, адчуў, што нешта змянілася. Нешта было не так. У самім паветры, у мурах будынка, ва ўласным сэрцы.

Ён зайшоў у калідор, назнарок не заглядаючы ў канцылярыю. Назнарок спіною да дзвярэй пайшоў да вешалкі. Ён ведаў: яна сядзіць у крэсле ля акна. На ёй неадменна кофтачка жаўтаватага колеру і цёмная, званочкам, спадніца. Але нешта яшчэ павінна было быць, чужое, іншае, тое, чаго не было.

Па дарозе Андрэй зірнуў у расклад заняткаў, нічога ў ім не пабачыў, акрамя чорных радкоў, і нарэшце зайшоў у пакой.

Яна сапраўды была там, сапраўды сядзела ў крэсле, сапраўды была апранута так, як яму ўяўлялася. І сапраўды было ў яе абліччы нешта чужое. Ён нават не адразу заўважыў, Ага, замест вузла валасоў - іншае. Валасы сабраныя пад патыліцай у завіткі... хвост ці што? Андрэй не ведаў, як гэта завецца. Але яму гэта не спадабалася. Гэта было таксама вельмі прыгожа, але неяк знішчала асноўную прыгажосць яе аблічча: выраз высокай разумнай чысціні.

Дарэчы кажучы, ён потым паспрабаваў гадзіны дзве паўтараць сам сабе: "Не трэба гэтага, патрэбен стары вузел, ён робіць вас высакароднай, падобнай на старажытную грачанку". І сапраўды, у наступны раз яна з'явілася са старым вузлом. Магчыма, праўда, што яна заўважыла чыйсьці насцярожаны позірк і зразумела, што старая прычоска ей больш да твару.

Але гэта было потым, а зараз Андрэй быў уражаны, і гэта адабрала ў яго рэшткі разважлівасці і смеласці. Толькі тут ён адчуў, што ён дурань, што каханне нікуды не ўцякло, што яно проста было ў засадзе і зараз возьме яго без бою.

Пакутліва адчуваючы ўласную дурнаватую ўсмешку, адчуваючы, што ўся кроў кінулася яму ў твар, ён падышоў да Галіны Іванаўны і зрабіў чарговае глупства: пацалаваў ёй руку. Немагчыма ж, немагчыма было цалаваць руку той, другой. І тады ён склаўся амаль напалам (крэсла было нізкім) і пацісну вузкую руку з тонкімі пальцамі:

- Дзень добры.

- Дзень добры, Андрэй. Я атрымала вашу кнігу. Але мяне не было ў Маскве.

Андрэй ведаў, што гэта няпраўда. Але гэта было ўсё адно. Яна магла рабіць усё. Яна была вышэй усяго такога.

- Ну і як? - задаў ён дурное пытанне.

- Пагаворым пасля, - сказала. яна.

Грынкевіч ведаў: тон яго і выгляд не належаць да лепшых. Хутчэй да горшых. Ён усё разумеў, і ў гэтым была ягоная кара.

Ён сустракаўся з многімі, ён меў вопыт, ён ведаў жанчын (у той меры, у якой гэта, наогул, даступна мужчынам). Але тых ён не кахаў. Перад сапраўдным каханнем мужчына - безабаронны.

І тады ён вырашыў проста сядзець і маўчаць Слухаць і прызвычайвацца. Гэта дало пэўныя вынікі, як любіў гаварыць староста курса. Але Андрэй з жахам адчуваў, што яму ўсё горш і горш. Знікла некуды таварыская вольнасць у размовах, жахлівей за ўсё здавалася падысці і сказаць пару простых слоў. Ён бачыў часам, што яна кідае на яго неўразумелыя позіркі, але нічога не мог з сабою зрабіць.

Ён ведаў, адносная свабода можа вярнуцца толькі пасля рашаючай размовы, а на гэта яму якраз не хапала мужнасці. Ён адразу прыпамінаў, што ён пачвара, што ў яго доўгая постаць, непрыгожая пасадка галавы, занадта ганарыстая, што надае яму падабенства з пеўнем. Рукі здаваліся яму жаночымі, вочы - зіркатымі, ногі - нязграбнымі, манеры - дрэннымі. Адукацыя ў

яго была - непатрэбная, моў ён не ведаў, акрамя польскай ды лацінскай, ды яшчэ трошкі нямецкай. Але які дурань будзе размаўляць з жанчынай па-латыні. А нямецкая - гэта ж груба, як бурчанне ў жываце. Што на гэтай мове пісаў Гётэ - неяк не прыходзіла яму ў галаву. Тым больш не прыходзіла ў галаву, што ёсць нядрэнная свая мова.

Словам, усё давала падставу для вартых жалю меркаванняў аб сваёй асобе. А між тым усё гэта было не так. Нічога асабліва брыдкага ў ім не было. Чалавек як чалавек.

З Марыяй яны пасля вакацый віталіся - і толькі. Яна пачала чагосьці прыпадаць да Горавай, і Андрэю гэта не вельмі падабалася. Мала чаго можа наплявузгаць. Потым даводзь, што ты не вярблюд.

Яніс пачаў нешта заўважаць. Аднойчы голасна выказаў дурное прыслоўе, што каханне і асла вывучыць скокам. Словам, адусюль былі адны непрыемнасці.

І ўсё ж Андрэй не верыў у горшае. Не верыў таму, што яна, дасціпная, як мала хто з жанчын, была ў адносінах з ім зусім не такой, як з другімі. У слоўных баталіях з хлопцамі яна любіла не пакінуць ад апанента (а сярод іх былі дасціпныя і сапраўды разумныя людзі) каменя на камені. І толькі да аднаго Андрэя ставілася з выключнай мяккасцю, ніколі не закранула яго нават ценем рэзкага слова. Ён адчуваў гэта і таксама як мог абараняў яе ад непатрэбных сутычак.

Яе курс хацелі ўрэзаць. Андрэй арганізаваў петыцыю супраць гэтага. Было і другое. Але яна не павінна была ведаць аб гэтым. Гэта было без патрэбы. Яна была вышэй гэтага.

Грынкевіч баяўся прыцягнуць увагу другіх да сваёй зацікаўленасці гэтым чалавекам. Таму ён ніколі нікога не распытваў аб ёй, старанна ўнікаў размоў з сябрамі на гэту тэму. Ён не ведаў, як яна жыве, хто з яе сваякоў дарагі ёй і ці ёсць яны наогул. Тое-сёе ён высветліў сам, напрыклад адрас яе бацькоў (па тэлефоннай кнізе). Ён некалькі разоў хадзіў ля гэтага будынка і ў думках насяліў яго самымі прыемнымі людзьмі. Потым высвілася, што вокны выходзяць не на вуліцу, а ў вузкі, падобны на студню, двор і ў вокнах, якія ён умоўна выбраў для яе, жылі, цалкам, магчыма, зусім дрэнныя людзі.

Ён чытаў яе кнігі і ведаў, што ў яе ёсць стрыечная сястра. І тое і другое было горш за яе.

І вось усё.

Тым не менш ён жыў ад сустрэчы да сустрэчы. А цяга ўсё расла і расла.

Ён ведаў, што ўсё гэта можа задушыць яго, штурхнуць на дзікія ўчынкі. Таму ён цвёрда вырашыў у бліжэйшыя дні пагаварыць з ёй.

Быў канец верасня. Залацістая празрыстасць гэтых асенніх дзён, а можа, і тое, што ён вось-вось вырашыць свой лёс, трошкі супакоілі Андрэя.

У гэты дзень Грынкевіч і Вайвадс адшукалі ў раёне Астанкіна старыя могілкі і сядзелі там на лаўцы ў адной з далёкіх алей. Спрачацца яны амаль кінулі, кожнаму было не да таго. Але нават думаць і маўчаць разам было прыемна. Так вось, рука да рукі, яны з'явіліся і ў інтэрнат.

Андрэй ледзь паспеў скінуць паліто, калі адчыніліся дзверы і ў пакой увайшоў Баранаўскас, а за ім з'явілася цяжкаватая постаць Вайвадса. Грынкевіч добра ведаў яго, што адразу здагадаўся: здарылася нешта няладнае.

- Што такое? - тон пытання быў цвёрды і насцярожаны.

- Бачыш... Словам, табе трэба быць мужным...

Яны хоць каго маглі давесці да вар'яцтва сваімі падыходамі.

- Хто? - спытаў Андрэй.

Баранаўскас працягнуў яму прамакутнічак тэлеграмы. Дзіўна, у Андрэя нават не калаціліся рукі.

"Бацька памірае. Прыязджай. Маці", - прачытаў ён.

Далей быў правал. Ён не траціў прытомнасці, ён, як сказалі потым, вельмі разумна і холадна адказваў на пытанні сяброў. Але помніў ён ужо толькі канец збораў: зачынены чамаданчык і паліто, у рукаў якога аніяк не жадала трапляць рука.

- Ціха, ціха, - супакойваў яго Баранаўскас.

- Я спакойны, - адказаў ён.

...Ноч была пеклам. Цягнік, грукочучы, імчаў, глытаючы кіламетры. А ён ляжаў на верхняй паліцы, тварам угору, і думаў толькі аб адным: "Толькі б паспець. Толькі б ён выжыў".

А колы запаволена грукаталі:

- Па-спе-еш ці не? Па-спе-еш ці не?

А потым раптам пераходзілі ў паскораны ляск:

- Спяшай-ся, спяшай-ся!

Кроплі наўкос паўзлі па шкле. Грынкевіч ляжаў і думаў аб тым, што за чалавек яго бацька.

Успаміны плылі перад вачыма. Зрэдку лёгкія і ружовыя ад часу, часцей - такія, якім нават час не мог дапамагчы.

- Спяшайся! Спяшайся! - спявалі колы.

Калі ён сядзеў у таксі на прывакзальнай плошчы, - твар ягоны быў такі, што шафёр пасунуўся бліжэй да сваёй дзверцы. Машына шалёна імчала вулкамі, правальвалася на спускі і пад віядукі, узлятала на масты і зноў нырала з іх. Мільгалі дамы. А Андрэй сядзеў і пад штуршкі колаў па бруку падлічваў удары пульса, якія там, зусім блізка, здавалася яму, усё слаблі і слаблі.

Машына моцна села ў каляіну, паблізу ад былога лабаза. Разлічыўшыся з шафёрам, Андрэй пабег. Бегаў ён добра, але тут, як уяўлялася яму, рухі яго былі не хутчэйшымі за рух слімака на лісце капусты. Ён кінуў свой груз на ганак нейкага дома, ірвануўся наперад і выскачыў на галоўную вуліцу.

І тут насустрач яму трапілася пляменніца. Ішла, сціснуўшы ў кулаку нейкія паперкі.

- Што? - аднымі вуснамі спытаў ён. - Жывы?

- Ты што, не ведаеш? Памёр яшчэ раніцай.

Яе маладзенькі свежы тварык яшчэ не прызвычаіўся за кароценькае жыццё адлюстроўваць на сабе гора. Таму выраз гора на яе твары быў хутчэй выразам халоднай пагарды, і Андрэй спачатку не паверыў ёй.

- Іду даваць тэлеграмы, - сказала яна, і толькі тады сэнс таго, што яна сказала, увайшоў у свядомасць.

Калі яна знікла за рогам дома, яму захацелася сесці на зямлю і не ўставаць як мага далей. Але страшэнным намаганнем волі ён прымусіў сябе ісці. Дома заставалася маці. Ён не меў нават права плакаць, адзіны мужчына ў сям'і.

Ля дома стаяў народ. Нейкія людзі змянялі адзін аднаго. Бацька ляжаў галавою ў кут у сваім старэнькім гарнітуры. Аблічча было спакойнае, бровы трохі прыўзнятыя, быццам ён зазірнуў кудысьці за край і пабачыў тое, чаго нікому не дадзена ўбачыць.

Маці падышла і прынікла галавою да грудзей Андрэя. Не, ён дарэмна думаў, што яму давядзецца падтрымліваць яе. Яна не магла дазволіць сабе слёз. У хаце таму, што яна была гаспадыня - маці ўсіх тут. На могілках - таму, што не хацела, каб слёзы бачылі аматаркі бясплатных прадстаўленняў.

Далейшае праляцела бы ў сне. Дзесяткі людзей, што ўспомнілі аб чалавеку тады, калі ён перастаў ім быць... распухлы ад слёз тварык пляменніцы, дзядзька, разгублены ўпершыню ў жыцці... прамая постаць маці, машына, якая павольна паўзе, пакідаючы за сабою калматыя лапкі ялін.

Могілкі былі старыя: беластвольны бярозавы гай на беразе Вастроўкі і зялёная драўляная цэркаўка з гонтавым купалкам.

Калыхаліся ў вадкім блакітным небе галіны бяроз з пустымі шапкамі грачыных гнёзд. Паветра было халоднае, як кветка астры пад восеньскім дажджом.

На шляху да магілы, калі Андрэй хацеў падтрымаць труну, нейкі дбайнік старых звычаяў паспрабаваў адцягнуць яго:

- Нельга. Сыну нельга.

Перад ім устаў раптоўна дзядзька, адсунуў крыкуна магутным плячом і сам паклаў на плячо Андрэя кепку.

- Нічога. Ён цябе безліч разоў на плячах насіў. Пранясі і ты яго... раз.

Ля магілы граў аркестр, чыталі прамовы. Новы начальнік установы быў на пасадзе зусім нядаўна і двойчы зблытаў імя нябожчыка па бацьку.

І ўсё гэта было не так, як трэба трымаць сябе, калі памёр чалавек. Падтрымліваючы маці, Андрэй глядзеў на верхавіны бяроз, каб не глядзець на натоўп, і думаў: "Людзі адыходзяць. І хоць мне нясцерпна цяжка, я веру, што жыццё яшчэ ёсць. Таму, што маці абаперлася на маю руку".

Працяг думкі ён хацеў быў адкінуць, але потым мужна дакончыў яе.

"І таму, што ёсць на зямлі яна. Пакуль яны ёсць - жыццё яшчэ не скончана".

Труна ўваходзіла ў нетры зямлі.

### Раздзел XI

Толькі тут, толькі ў пакоі Яніса праз два тыдні, Андрэй даў сабе волю.

Яніс сядзеў у крэсле занурыўшыся, як цяжка натапыраная птушка. Ён ведаў, што тут нічым не дапаможаш, што словы марныя.

Андрэй ляжаў на скамечаным ложку, прыкрываючы вочы рукой.

- Разумееш, Яніс, я ніколі, ніколі яшчэ не разумеў, як гэта ненавісна, - смерць, каб ёй безгалоўе, каб. Гэта брыдка, гэта агідна, гэта супраць усяго добрага на зямлі: працы, вершаў, кахання, музыкі... І так несвоечасова. Я не паспеў нават зрабіць так, каб ён мог пажыць добрым жыццём, з'ездзіць у падарожжа. Разумееш, усё гэта будзе ў мяне год праз дзесяць, але на д'ябла мне ўсё гэта тады будзе, калі яго няма са мной?.. Нашто смерць?

- Смерць - натуральная штука, - сказаў Яніс, - ты супакойся. Я ведаю, табе цяжка. Але, на жаль, ніхто яшчэ не пазбег яе. Усе смяротныя.

Андрэй ускінуўся на рукі з нейкай імпэтнай ярасцю. Вочы яго блішчалі.

- Не, - сказаў ён, - не. Смерць ненатуральная, як і вайна. Войны таму, што чалавек пакуль што дрэнны. Смерць - таму, што чалавек неразумна жыве. Думаць, што мы паміраем таму, што смяротныя, - папоўшчына, лухта. Складзіце, маўляў, ручкі і цярпіце.

Яніс усміхнуўся:

- Гэта не папы сцвярджаюць. Гэта - жыццё.

- Жыццё?! - Андрэй горка ўсміхнуўся. - Ты проста не ведаеш анатоміі. Мы ўсе, разам з сэрцам, разам з вачыма і слыхам - мы варожыя смерці. Мы ўсе для жыцця, мы ўсе, каб ламаць смерці хрыбет. Што, можа, скажаш, што матэрыя створана для смерці?

- У пэўным сэнсе так... - Яніс замяўся.

Андрэй пільна паглядзеў на яго вялізнымі вачыма.

- Баішся мяне пакрыўдзіць? Кажы.

- Бачыш, браце, мы расцём. І кожнае пакаленне трошкі вышэй мінулага... На вышыню магільнага капца... Як кажуць, дыялектыка.

- Лягчэй мне было з дыялектыкай, калі ў мяне памерла нявеста?

- Я не кажу пра заўчасную смерць.

- А смерць у старасці? Нашто? Новых форм чакаць на зямлі не трэба. Фізіялагічна вышэй за нас людзі не будуць. А кожнае новае пакаленне выдаткуе дваццаць год, нават трыццаць год, каб дарасці да ўзроўню папярэдняга.

Ён нервова закурыў:

- Нас забівае жыццё, подласць моцных, вайна. Але калі-небудзь мы ўстанем... І тады божаму наканаванню смерці прыйдзе канец.

Яніс спытаў з відавочным сумам у голасе:

- А нам? Можа, і будуць некалі старэць у пяць тысяч год. Але што рабіць нам?

- Не ведаю. Нам давядзецца выпіць чашу ў семдзесят... Як бацькам. І, магчыма, для нас ёсць толькі адзін выхад. Адзіны шлях. Жыць кожную секунду. Думаць, рухацца, рабіць кожную хвіліну. Тады, напэўна, за семдзесят год пражывеш, не менш за

дрэва, якое трыста год стаіць на месцы... Варта паспрабаваць ва ўсякім разе.

Андрэй усміхнуўся сваім думкам: "І яшчэ кахаць.Той, хто кахае - бессмяротны. Ён у кожную хвіліну перажывае стагоддзе. І ён - вораг смерці. Таму, што смерць не для кахання, не для маці тваіх дзяцей. А ўжо для дзяцей, для твайго бяссмерця - менш за ўсё... Толькі кахаць".

За акном увесь далягляд, аж да паловы неба, зацягнула грыфельна чорная хмара. Яна насоўвалася трывожна, з жахлівай павольнасцю, веяла на свет мёртвым холадам. Подых яго адчуваўся нават у пакоі, праз адчыненую фортачку. На пагрозлівым фоне хмары здаваліся белымі нават шэрыя будынкі ўдалечыні.

- Будзе снег, - знобка сцепануўся Грынкевіч.

Яніс не зводзіў з хмары ясных блакітных вачэй.

- Страшная якая хмара, - сказаў ён, - як вайна... Вось яшчэ чаго я не магу зразумець, Андрэй, - вайны. Праўдзівей, таго, што людзі яе забылі.. Нядаўна рэдактар не ўзяў маёй паэмы аб вайне: гэта, кажа, мінулае.

- Добрае мінулае. Сіроты і інваліды дагэтуль ходзяць.

- І не ў тым справа, - сказаў Яніс, - у душах яна ў нас, ва ўспамінах, у сэрцы. Характары нашы трыклятыя ад яе, дагэтуль яна нас б'е. Забыць нельга.

- Так, - сказаў Андрэй, - не дае забыць. Ды яшчэ і "на потым" пагражае. Сусветнае свінства.

Андрэй устаў і пачаў апранаць паліто, што вісела на біле ложка.

- Прабач, Янка, - сказаў ён, - мне час.

- Куды?

- Па справах паеду... Слухай, гэта вельмі брыдка, што я ў цябе спытаю?

- Што?

- На могілках я падумаў, што... пэўна, не скончылася яшчэ жыццё, пакуль існуе маці і яшчэ адна жанчына.

- Не Марыя, спадзяюся? - з іроніяй спытаў Яніс.

- Не.

- Тады не брыдка.

І з уздыхам прыбавіў:

- У гэтым - жыццё.

Андрэй амаль бег па сходах.

Справа была ў тым, што ўчора Горава зноў папракнула яго, што ён не заходзіць да яе, і сказала, што звычайна бывае дома апоўдні.

- Заходзьце, калі захочаце, Андруша.

...Горад быццам застыў у чаканні, калі Грынкевіч, пакінуўшы ўтульную і строгую станцыю метро, выйшаў на плошчу.

У прадчуванні таго, што павінна было здарыцца, забіліся ў капітэлі калон галубы. Людзей на вуліцах было мала.

Бронзавы Маякоўскі пасярэдзіне плошчы горда ўздымаў насустрач хмарам прыгожы грубаваты твар.

Узняўшы каўнер паліто, ён накіраваўся ў напрамку яе дома.

Першыя мокрыя сняжынкі ўпалі на асфальт, калі ён спыніўся перад парадным.

Дом гэты быў адным з тых дамоў, што будаваліся ў гады "мадэрну" праз меру ўзбагацелымі біржавымі дзялкамі. Высокі, блакітны з крэмавым, нядаўна, відаць, пафарбаваны, ён з нейкай нават вясёлай пагардаю глядзеў на шумлівую вуліцу, на чалавечы натоўп, на аголены сквер, на недарэчны сілуэт высотнага будынка непадалёк.

Андрэй памарудзіў хвіліну і, быццам у халодную ваду, нырнуў у парадны.

Там было ціха і цемнавата. Бязгучна плылі за вокнамі дзвярэй чалавечыя постаці. Драмала ў крэсле вахцёрша з тварам, які, здаецца, падазраваў усіх нават у сне.

Узабраўшыся на другі паверх, Андрэй спыніўся перад дзвярыма, за ліфтам, і страшэнным намаганнем волі - рука ўсё абрывалася ўніз - націснуў званок.

Зараз. Зараз яна павінна была выйсці насустрач, усміхнуцца яму, прапусціць у просты светлы пакой, сесці насупраць і сказаць:

- Доўга ж вы збіраліся, палескі лайдак.

За дзвярыма забрахаў сабака, тоненькім галаском, быццам прасіў прабачэння. У цішыні пачуліся крокі. Ляснуў запор.

Андрэй пабачыў мужчыну, цёмнавалосага, з высокім, трохі залысым лобам. Постаць цяжкаватая, пагляд вачэй разумны і шчыры. Выраз аблічча - з той добрай, трохі занадта інтэлігенцкай іранічнасцю, якую Андрэй і любіў і не любіў у людзях свайго асяроддзя. Ён лічыў яе занадта гарадскою. А ён хоць і інтэлігент, хоць і праўнук інтэлігента - быў усё ж правінцыял і любіў добрыя якасці менавіта правінцыяльных

інтэлігентаў: павышанае пачуццё сумлення, амаль дзіцячую чысціню помыслаў і поглядаў на свет, бязмежную, трохі наіўную веру ў людзей - якасці ў тым-сім старамодныя.

- Што вам? - спытаў мужчына.

Чорны кудлаты сабака махаў хвастом, гледзячы на Андрэя. Дзеці і сабакі наогул ніколі не баяліся яго.

- Ірыну Сяргееўну.

Чалавек усміхнуўся:

- Жонкі няма. У іх тэрміновая кансультацыя. Пайшла яшчэ ў дзевяць гадзін.

- Добра, - сказаў Андрэй, - бывайце.

- Бывайце, - сказаў мужчына.

Спускаючыся па сходах, Андрэй пачуў, як за спіною ляснулі дзверы, быццам прыхлопнуўшы ўсё тое, што было.

Паставілі кропку.

Ён выйшаў на вуліцу з пачуццём такога несамавітага болю ў сэрцы, якога ён ніколі не чакаў.

Усё было ясна.

Ля газетнага кіёска боль стаў такім, што Андрэю здалося: ён памірае. Прыхіліўшыся да мокрай чамусьці сцяны, ён паспрабаваў быў зірнуць назад, дзе засталася надзея, але нічога не ўбачыў.

Толькі нешта мокрае плыло па шчоках.

І толькі тут ён зразумеў, што сапраўдны ўраган імчыць прорвамі вуліц, што мокры снег наўскасок ляціць у вочы вокан, штурмуе муры дамоў, заляпляе карнізы, смерчамі ўецца ў зацішку, за дамамі.

Ён роў і свістаў, сеяў паўсюль імклівыя белыя пчолы, сівіў валасы Андрэя, халадзіў на газонах ледзь жывую ад зазімкаў траву. Мірыяды белых хлапякоў ляцелі ўздоўж вуліц.

Гэта быў канец.

## Раздзел XII

## ПЛОШЧА МАЯКОЎСКАГА

Брыдкі, халодны асенні дзень.
Таксі прыцішаюць бег.
Над горадам неба, як шэры цень,
Над горадам мокры снег.
Снег на карнізах бялее палоскамі,
Снег ляжыць на плячах Маякоўскага.

Мокры снег,
Мокры снег,
Мокры снег
Растае на асфальце, на газонах ляжыць,
Шэры асфальт і сівы газон.
Мне да болю, да болю хочацца жыць,
Хочацца жыць,
Хочацца жыць,
Як не хоча снег,
Як не хоча трава,
Як не хоча бронзавы - ён.
Снег зіхаціць на апушчаных веях,
Без капялюха іду, бы ў сне,
А ў валасы мае вецер вее
Мокры, мокры снег.
Мокры снег.
Снег.

**I**
Любая, помніш?
Была вясна.
(Вясна? На гэтай зямлі?)
На машыну проста ляцела сасна,
Ў неба ўзняўшы крылле галін,
І клаксона гук абуджаў лясы,
Іх празрысты зялёны дым,
І была паўсюль неабдымная сінь:
І ў небе, і ў сэрцы маім.
Ап'янелы ад паху пралесак шафёр
Мог зблытаць дарогу з ракой.
Нават дрэвы цягнулі галіны да зор,
Нават пні гублялі спакой.
І чакалі нас тысячы гарадоў,
З мільёнам людзей і слоў,
З белымі вежамі, з пенай садоў,
З золатам купалоў.
І чакала нас на лугах цішыня,
Месяц, адбіты ў вадзе,
Белыя песні, што ціха звіняць
У вушах дарагіх людзей.
І ты мне была, як святло на вадзе,
Як подых, як верш, як хлеб.

Дзе мне было на рукі глядзець?
Я кахаў, - а значыць, аслеп.
Боль шчаслівы сэрца маё звязаў.
Лёгка жыць было на зямлі.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Я нічога, нічога табе не сказаў,
Побач суседзі былі.
Развітанне. Зноў горад. І зноў агні.
Бязладны гоман сяброў.
І хутка мы будзем зусім адны,
Паасобку ў цемры дамоў.
- Ну скажыце што-небудзь. Горад у сне.
Хвіліна - і сам-насам.
- Калі-небудзь заходзьце дамоў да мяне,
Метро "Маякоўская".
Там...
О, як лёгка май у палон бярэ!
Хто паверыць, што ён адзвінеў?
Я не з тых, я прыйшоў да родных дзвярэй,
Я прыйшоў да самых родных дзвярэй,
І тут
Забілі мяне.

**II**
На вуліцы неба, як пыльнае шкло,
Снег мокры дае і дае.
Бегчы, бегчы, бегчы трэба было,
Бегчы прэч ад яе.
Як я мог не заўважыць,
Што пралеска другому цвіце?
Як я мог не заўважыць
Пярсцёнка на тонкай руцэ?
Як я мог не заўважыць,
Што розны нам шлях у жыцці?
Як я мог не заўважыць?
Не заўважыў!!!
Плаці!
Зноў перон.
У дальнім яго канцы
Жалеза, цэгла, бетон.
Рамонт.
Нержавеючую сталь

І тую здаюць у рамонт.
А сэрца маё не сталь, не бетон, -
Ад пяшчоты трапеча і мук.
Як гільяціна, дзверы ў вагон:
Мёртвы, халодны стук...
Блытаніна дратоў.
Вагоны мільгаюць,
Абыякавы ляск,
Агні, агні.
Пасажыры ў вокнах
Сябе разглядаюць:
Больш нікога ў жыцці не бачаць яны.
Дратоў блытаніна.
Вагоны. Вагоны.
Часам нейкі далёкі вой...
Дзе ж ты, дзе ты, зямля зялёная
З белаю-белаю песняй сваёй?

**III**
Уначы плыве папяросны дым,
Я сам-насам з кяліхам віна.
Ў мяне размова мужчынская з тым,
Каго кахае яна.
- Сигареты?
- Дзякуй, куру "Беламор".
- А в Минске?
- "Нёман" куру.
- Закуры маіх.
- Закури моих.
- Дзякуй.
- Благодарю.
- Прости мне, братец.
- Даруй мне, браток.
- Крепкий.
- Ды й твой не трава.
Каб ты спазніўся на пару год,
Я б цябе не пашкадаваў,
Як ты мяне. І значыць, язык
Мне замкнуць і цягаць з сабой.
- А я, ты знаешь, просто привык,
Что она всегда со мной.
- Чуеш, не смей,

Ты аб гэтым - не смей,
Ты проста кахай і жыві.
Ніхто на свеце,
Дальбог,
Ніхто
Не варты большай любві.
Кахай яе,
Да скону кахай,
І ў радасці і ў журбе.
Калі ты паспрабуеш яе не кахаць,
Я проста заб'ю цябе.
- Как же тебе?
- Пражыву адзін.
Але помні:
Кахай і маўчы.
Нельга крыўдзіць рускіх жанчын.
- А белорусских мужчин?
- А мы такія ж, як на Русі:
П'ём гарэлку і лаемся ўсмак.
І любім цягнуць, і любім касіць.
І любім працу. Так.
І верым сэрцу свайму ўвесь час,
І любім кахання дары.
І калі пакрыўдзяць каханыя нас, -
Мы з хвалою ідзём на крыж:
Ave, Regina,
Ззяй між людзьмі
Тысячы тысяч вякоў,
Ave, родная,
На, вазьмі,
Гэта самы моцны з цвікоў.

**IV**
Ноч прыйшла на змену гэтаму дню.
Я ў пакоі ўседзець не мог.
Ззянне неонавага агню.
Плошча.
Канец дарог.
- А мы такія ж, як на Русі.
Як сказаць мне хапіла сіл?
Я мог табе і ёй нахлусіць,
Але ночы нельга хлусіць.

Маўчы.
Маўчы хоць тысячу год.
Чуеце?
Я маўчу.
Я пальчатку разам з суставамі - ў рот,
Каб брэху ніхто не пачуў.
На плошчы ціха ўмірае крок.
Нікога ім не кранеш.
І слёз няма, і ў глотцы камок,
І лепей памерці мне.
Я стаю каля цяжкіх тваіх дзвярэй.
Я хаджу пад цёмным акном.
І вось у аблогу мяне бярэ
Садовае кола агнём.
Падступае бліжэй, і бліжэй, і бліжэй:
"Мы сябры, павер нам, павер.
Здавайся! Чуеш, здавайся нам...
Тысячам цёплых кватэр.
- Я не горшая, вер,
Пабудзь са мной..."
- Пакіньце!
Таму, што мяне
Цягне акно хаты адной.
І цемра ў гэтым акне.

**V**

На бронзе адбітак агню залаты.
Вецер пяе і пяе.
Я, кажуць, ростам амаль як ты,
І вочы амаль як твае.
Мы з табою на плошчы гэтай адны,
Дай руку тваю мякка вазьму.
Мы крылы спалілі ў адным агні,
Толькі розныя назвы яму,
Уладзімір, чуеш?
Хадзем са мной,
Вып'ем шклянку віна.
Не ў шалмане,
Што тут, за тваёй спіной.
Тут можа прыйсці яна.
З плячэй, што аплакаў сваёй тугой,
Паліто бязважкае скінь.

І мужчынскія рукі пагладзяць яго,
Чужыя рукі пагладзяць яго,
І іншым стане "Пекін".
І стане іншай, - як майскі вянок, -
Зала, дзе лыжкі бяруць,
Дзе ў вочы глядзяць, дзе жлукцяць віно,
Дзе галатурый жаруць.
Зала загразнула ў ліпкім віне,
Але тут узнясецца да зор...
Як мне цяжка, мой родны, як цяжка мне.
Лепей бы я памёр!
Цяжка табе, а мне - ўдвая,
Таму і прыйшоў. І стаю.
Тваю гісторыю ведаю я,
Паслухай лепей маю.

**VI**

У атамны век, у пластмасавы вёк,
Век нянавісці і любві,
Жыў сабе на зямлі чалавек, -
Не з пластмасы, а з плоці й крыві.
Лічылі паэтам. У ранг узвялі.
Ён жыў. Спрабаваў пісаць.
І ён пакахаў, як на гэтай зямлі
Не кожны ўмее кахаць.
І была яна, хай далёка не першая.
І сонца агонь яе залаціў.
Многа вершаў, дурацкіх вершаў
Добрай гэтай паэт прысвяціў.
Ён з ёю плыў за сіняе мора,
Ў глыбіні вякоў накіроўваў свой спеў.
І нават пад зоры, чыстыя зоры,
Не ўмеючы лётаць, з ёю ляцеў,
Прыпомніўшы вочы, шэрыя, сінія,
Ён змяць не мог бы нават травы.
Ён за яе пад скаламі гінуў,
Стократна мёртвы і зноў жывы.
Людзі, людзі, розныя людзі
Пачуйце глухія словы мае:
Нічога, нічога такога не будзе.
Будуць зоры - не будзе яе.
Другу жанчына сказала: "Канец".

Ён доўга моўчкі сядзеў
І сказаў: "Не хочаш глядзець на мяне?
На партрэты будзеш глядзець".
Ён сказаў - а мяне забівае туга,
Памерлі песні мае,
І сэрца, як птушка у мокрых снягах,
Зламанымі крыламі б'е.
За сонцам ляцеў праз дождж і буран,
За сонцам імкнуў свой бег,
За сонцам.
А сонца спавіў туман
І мокры завеяў снег.
Бронзавы мой, заснежаны, белы.
Зноў да мяне самота прыйшла.
Ў снежны,
Ў чорны мой панядзелак.
Кастрычніка, дванаццатага чысла.

**VII**
Ўспамінаю мой цёплы дом,
Думак халодны пажар
І над пісьмовым сталом
Сікстынскай Марыі твар.
Да цябе, да цябе адной
Палёт маіх зблытаных мар,
Злітуйся, дай мне спакой,
Кахання чыстага твар.
Не ведаю, ты ці яна
З'явілася ў гэты дом,
Не ведаю, ты ці яна
Над маім бяссонным сталом?
Калі ты - прыгажосць, якой молімся мы,
Калі рухаеш ты зямлю,
Вызвалі з гэтай бясконцай турмы,
Зрабі мяне моцным, малю.
І калі не можаш такога зрабіць,
Каб мяне кахала яна,
І калі не можаш такога зрабіць,
Каб вярнулася зноў вясна,
І калі не можаш такога зрабіць,
Каб пагладзіла мне руку, -
Зрабі, каб яна нарадзіла сынка

Або найлепей дачку.
На руках насіў бы, не помнячы зла,
Каб яна шчаслівай жыла,
Каб расла, каб на маці падобнай была,
Каб на маці падобнай была.
Адшукаў бы добрага хлопца ёй,
Каб падобны быў на мяне,
І глядзеў бы, і цешыўся іхняй гульнёй,
І гісторыі быў бы канец.
Я кожнаму галаву бы разбіў,
Хто захоча за нейкі барыш
Яе падмануць,
Яе ашукаць,
Ці яго пацягнуць на крыж.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
За дзвярыма дома кватэра твая,
Снег шалёны ў вочы б'е.
Вы, прадажнікі!
Чуеце, гэта я
Стаю на варце яе.
Зныня да веку,
Памятайце і верце,
Я стаю,
Я сціскаю меч і трубу.
Для подласці,
Гора,
Для самой смерці
Гэтыя дзверы будуць - табу.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Хмары над горадам праплываюць,
Над плошчаю прыцішаючы бег,
І ў валасы мае навяваюць
Снег,
Мокры снег, мокры снег,
Мокры, халодны снег.

**Р а з д з е л XIII**

- Чаму вы не назвалі сябе, Андрэй?
- Нашто? - суха спытаў ён.
- Я... пакінула для вас запіску. А яе не аддалі. Не ведалі.

Яна перапыніла яго на сходах і стаяла зараз насупраць яго, ціхая, задумлівая, у шэрай канадскай куртачцы з капюшонам.

- Гэта праўда?

- Вядома,

- Я не магу верыць. І мне хочацца верыць.

Нельга было зразумець, сінія яе вочы або шэрыя. Але нават суддзя не мог бы западозрыць, што яны хлуслівыя: з такой ціхай, ласкавай прыязнасцю яны глядзелі.

Мокры інстытуцкі сквер ляжаў за акном. Снег растаў, з рынаў, захлынаючыся, цякла вада, і недзе паміж грыфельнымі хмарамі на хвіліну праяснеў незвычайным для восені блакітам лапік неба.

- Як ваш муж?

- Нічога.

- Вы ніколі не казалі аб ім.

- А каму гэта цікава, акрамя мяне?

Здаецца, не здагадвалася ні аб чым. Здаецца, шукала звычайнага прыяцеля, з якім можна пагаманіць аб усім і ні аб чым.

- Я вінаватая. Калі можаце, заходзьце сёння да мяне а палове сёмай.

А можа, і здагадвалася. І тут Грынкевіч зразумеў: тое, што здарылася, нічога для яго не мяняе. Калі ён адчуе, што хоць трошкі дарагі ёй, ён пераступіць цераз усё: працу, уклад жыцця, любоў да волі.

Ён адчуваў, што пачынаецца нешта новае, магчыма, нядобрае. Уся яго існасць пратэставала супраць таямніцы, недагаворак, міжвольнай хлусні, якую нясе каханне да замужняй. Але ён яшчэ адчуваў, што ўсё гэта нейкім чынам не датычыцца яго, што маральнае толькі адно каханне, а астатняе непатрэбна нікому і, значыцца, само па сабе стае хлуснёй.

- Добра, я зайду.

Яна пайшла, а Андрэй выйшаў на вуліцу, каб яшчэ раз абдумаць усё.

Вядома, не варта было ісці. Але хіба ён не вырашыў, што ўсё адно яна дарагая яму, што ён, не парушаючы яе спакою, усё адно будзе моцнай падпорай для яе рук? Добра, няхай у гэтым была частка маны, няхай не прымусіш сябе так лёгка любіць мужа каханай. Але ж ён будзе маўчаць, будзе маўчаць, калі яна сама толькі не прымусіць яго гаварыць. А гэтага не будзе.

І ўсё ж, у душы ён не толькі спадзяваўся, што яго прымусяць гаварыць, ён ведаў гэта тым самым падсвядомым,

што ніколі не падманвае. Ён ведаў, гэта было паскудна. Але ён ведаў яшчэ і тое, што часам цаміж мужчынамі ідзе вайна, і ён быў падрыхтаваны плаціць у гэтай вайне ўсім, акрамя яе шчасця, нават жыццём.

Урэшце, проста не мог без яе.

Таму, колькі б ён ні вагаўся, у палове сёмай ён званіў ля яе дзвярэй. Адчыніліся дзверы, і ён убачыў яе постаць, якая здавалася яшчэ меншай з-за таго, што адбівалася ў дзвюх далёкіх люстрах.

Усміхнулася:

- Заходзьце.

Яна правяла яго ў пакой, сцены якога цалкам, зусім без прасветаў, былі завешаны карцінамі той плыні, якая завецца "маньерызмам". Адусюль глядзелі праз дымку карычняватыя твары і рукі, ліловыя плямы адзення, нейкія дзівосныя вадаспады і дрэвы, якіх не бывае ў жыцці, а толькі на старых карцінах.

Горава пасадзіла Андрэя ў кутку, і сама села непадалёк, аддзеленая ад яго столікам, на якім стаяла лямпа пад абажурам з рускіх самаробных карункаў. Плылі па ім стылізаваныя кокі, дзяўчаты з каромысламі і спляценне дзівосных траў.

- Сядайце. Курыце. Маўчыце.

Яны сядзелі, разглядаючы адзін аднаго даволі доўга. Недзе ў глыбіні паўзмрочнай кватэры пачаў біць гадзіннік, біць меладычным абыякавым звонам. Яму адказаў яшчэ адзін.

Каб не прысутнасць гэтай жанчыны, кватэра здавалася б халаднаватай і нежывой.

- Цяжка ў Маскве, Андруша?

- Цяжка. А хіба вы ведаеце?

- Я шмат ведаю пра вас. Вельмі спачуваю вашаму болю.

- Ён ужо не востры. Так, нешта варочаецца тупа пад сэрцам.

- Ведаю. А ў Мінску?

- А ў Мінску таксама дрэнна. Абазвалі блазнюком, які лічыць, што слова яго - чыстая сляза з арфы, што за маім мудрагельствам шмат пустаты і што ўсё гэта ад занадта вялікага розуму.

- Ну і добра, - мякка сказала яна. - Працуйце, не звяртайце ўвагі.

Яна падабрала ногі ў крэсла, і гэта зноў дало адчуванне холаду ў кватэры, быццам нябачная пройма прабегла па нагах.

Андрэй раптам зразумеў па гэтым бязвольным руху, што спачуваць, пэўна, трэба не яму, а ёй. І памыліўся.

- У вас разброд думак і пачуццяў, - сказала яна. - Няважна, хваляць ці не, ёсць у доме ўсе гэтыя нейлоны і машыны ці няма. Саскія памірае, а Рэмбрант ідзе... Я ведаю занадта добра, як знішчае талент хвала і слава. Жыць на чорным хлеба з чаем і працаваць - астатняе лухта. І зусім ужо не варта ўвагі - друкуюць цябе альбо не. Трэба толькі выказваць, выяўляць сябе. І нават пакуты і радасці людзей перажыць праз сябе. Каб быў Я, выяўлены.

- Я разумею, - сказаў Грынкевіч пасля паўзы. - Словы бязлітасныя, але вы шмат у чым маеце рацыю.

- Вы не баіцёся жорсткіх слоў?

- Не.

- Тады ўжо слухайце да канца. Вы чалавек моцны. Выслухайце самае дрэннае, што я пра вас думаю, каб больш не вяртацца да гэтага.

Яна курыла, гледзячы паўз яго. Цыгарэта часам уздрыгвала ў яе пальцах.

- Ну. Не бойцеся. Мае плечы вытрымаюць.

- Я нічога не баюся. Я павінна сказаць вам пра гэта, бо жадаю вам дабра больш, чым каму з вашых сяброў, і хачу зрабіць, каб вам было ясней жыць. Пастараюся зрабіць... калі паспею.

Аблічча яе ў святле лямпы стала амаль суровым, і раптам яна глянула на Андрэя, быццам душу выцягнула на святло адным гэтым пільным позіркам.

- Я за вас баюся, - сказала яна. - Вы занадта бурхліва ўварваліся ў жыццё. Быццам з мячом у варожы строй. А сказаць слова, каб усе здрыгануліся, вы пакуль што не можаце. І таму па-пустому гарыцё. Пачакайце, пакуль здолееце сказаць. Біць і лашчыць трэба раз, калі гэта да канца неабходна і напэўна. Каб той, каго б'еш, лёг, калі гэта сапраўдны вораг. І трэба ўсяляк берагчы сябе, бо не для сябе жывеш, а для літаратуры. А пісаць трэба аб тым, што ўласціва толькі табе і нікому больш.

Яна прыгасіла цыгарэту, спляла вузкія пальцы.

- Дарэчы, і з жанчынамі. Вы ведаеце, што Марыя прыходзіла да мяне?

- Не ведаю.

- Якой вы думкі пра яе?

- Я ніколі не кажу дрэнна пра жанчын, якія былі са мной.

Жанчына ўважліва паглядзела на яго:

- А ўсё ж?

- Я думаю, што я размяняўся.

- Магчыма. Не буду вас расчароўваць, але ёй былі патрэбны не вы, а цеплыня поруч з сабою... І яшчэ гэты жах самоты... У яе цяжкі лёс, Андруша, так што глядзіце самі і памятайце толькі, што не вы ў яе першы, ды і яна ў вас - таксама.

- Я ведаю, разумею, - сказаў Андрэй. - Студзіш сабе сэрца, губляеш адчуванні. І абыякавасць позніх год наступае таму, што губляеш смак, і табе ўжо ўсё роўна, што адчуваеш. Як усё адно старому сабаку, якім ветрам пацягнула. І няма той радасці, як у дзяцінстве ад паху пачкі з каляровымі алоўкамі.

- Гэта вы добра сказалі наконт алоўкаў... Я калісьці таксама дзякавала за ўсё, што адчувала. Радасць або такі боль, што ўся душа адрываецца, - усё адно, усё адно дзякуй, дзякуй табе за ўсё, жыццё. Сэрца абліваецца крывёй - дзякуй. Паміраю - дзякуй... Зараз прывучылася трохі літаваць сябе, берагчы сілы.

- Што ж вы мне параіце?

- Нікому нічога не параіш. Жывіце. Дзеля яснай, вельмі далёкай мэты. І калі ўжо кахаеце кагось, то трэба, як матылю ў казцы, ляцець не на газавы ліхтар, а да далёкай зоркі. Кожны дзень ляцець і вяртацца, толькі калі смяротна стомяцца крылы.

- Раптам не даляціш, што тады?

- Усё адно. Рана ці позна, а яна злітуецца з вечнага імкнення, сама пачне набліжацца да матыля. І астатнія зразумеюць: яны дарэмна ляцелі на ліхтары,

- А калі зоркі няма?

- Калі яна была і згасла? Што ж, запалае новая. А не запалае - лепей быць самому. Не выпадкова Мікеланджэла і Леанарда былі самотнымі. Гэта закон. Любі тое, што робіш, вышэй за ўсё.

- Гэта цяжка.

- А што лёгка? Можа, лягчэй наогул жыць? Жыццё ідзе да лепшага. Фільм быў такі, недзе ў Канадзе махляры будавалі грэблю, нішчылі гэтым біясферу. І вось... З грэблі, што трымае пачуцці і думы, выпаў кавалак бетону, і стала зразумела: вады не спыніш. Жыццё ідзе, і мэта яснее. І таму жахліва, калі чалавек лічыць, што галоўнае - бачыць сябе на старонках друку. Праца - пакута. І недарэмна той, каго завуць Хрыстом, сам цягнуў свой крыж. Не голас бога асудзіў яго на гэта, а проста тое, што ён не мог іначай. Як усе сапраўдныя...

Уздыхнула.

- Гэта незвычайны час, у якім жывём мы. Адзіны варты здзіўлення нашчадкаў. Трэба памятаць гэта.

- Час, - сказаў Грынкевіч задумліва. - Вядома, нашчадкі будуць дзівіцца добраму. Але, напэўна, больш будуць дзівіцца злому.

- Я ведаю, пра што гэта вы. Пра вайну і пра тое, што было пасля. Не тое, - задумліва сказала яна. - Я думаю пра людзей, якім гэта ламала хрыбет, пра тое пакаленне, якое ў трыццаць сёмым ляжала ўначы з адкрытымі ў цемру вачыма, а ў сорак першым добраахвотна пайшло на фронт. Магчыма, варта было маўчаць, не забіваць веру ў гэтага чалавека.

І тут Грынкевіч раззлаваўся:

- А вы не думаеце, што праўда лепшая за гіпноз. Нельга шкадаваць людзей. Мне іх таксама шкада да болю, але я веру, так лепей. Хоць бы таму добра, што ніхто не паспрабуе зноў паставіць такі дослед.

Яна глядзела на яго, бачыла пасму каштанавых валасоў, чырвоныя рэфлексы святла на рашучым твары, разлёт броваў, увесь яго непрыгожы, зменлівы воблік.

- Бог з вамі. Харошы вы чалавек.

Апусціўшы вочы, яна сказала:

- Хадзем, я пакажу вам карціны.

Другі пакой быў трохі святлейшы. Наборны італьянскі стол, глянсава-белы, з чорнымі, быццам гравіраванымі малюнкамі. Нізкія, трохі вышэй калена, шафы для кніг, на іх - статуэткі.

Бронзавая старажытнакітайская карова ляжала на жываце і касавурылася на Андрэя.

А над шафамі, быццам дзесяткі вокан у свет, свяціліся карціны. Цяжкія, нават на выгляд, дошкі старых абразоў ззялі барвяным, густа-сінім, прасвечвалі ружовым праз блакітнае, як жывое цела праз тканіну.

Цяжкаватымі, трошкі чыгуннымі фарбамі і незвычайнасцю ліній стракацелі палотны мадэрністаў.

Цёплым празрыстым лакам, быццам вадой карычневай лясной ракі, былі ахутаны цьмяныя чалавечыя фігуркі на даўніх італьянскіх і нідэрландскіх карцінах. Гэтыя фігуры былі такімі цёплымі, што, здавалася, працягні руку і нават вобмацкам адчуеш жывую плоць.

І адна карціна ззяла нават сярод іх нейкім блакітным, месячным сяйвам. А на гэтым сяйве вымалёўваліся постаці людзей, што сыходзілі па сходах у сад.

- Наша жамчужына, - сказала яна. - "Выхад у Гефсіманскі сад".

- Хто? - спытаў Андрэй, здагадваючыся ўжо аб усім.

- Малады Рэмбрант.

Захутаныя блакітныя людзі ў дзівосных цюрбанах сыходзілі ў сад. А наперадзе ішоў чалавек, і вочы яго глядзелі проста на Андрэя з нейкай пранікнёнай, усёразумеючай прагай ахвяры. "Я ведаю, - казаў позірк. - Ніхто не дапамог мне і не дапаможа. Але я іду. І яны, вучні, абяцалі быць са мной паўсюль, а самі заснуць усе як адзін, пакінуўшы мяне аднаго. Я не скарджуся. Лепшыя заўсёды ішлі так, не ведаючы заўтрашняга дня, але пранікаючы ў градучае. Я і зараз адзін сярод вас, хоць вы не спіцё. Нічога. Нічога не зробіш. Заўсёды знойдзецца той, хто адзін не спіць, сам-насам са сваімі думкамі і адчаем, якога, на шчасце, не бачыць ніхто".

Андрэй правёў далонню па вачах. І толькі тут адчуў, што яны не адны ў пакоі, што нехта за гэты час адчыніў дзверы, увайшоў і нават паспеў павесіць на вешалку паліто.

Яна не прадстаўляла іх аднаго аднаму, думаючы, што гэта будзе непрыемна Андрэю, хоць Андрэй чамусьці зусім не адчуваў рэўнасці да таго, другога. Гэты другі быў тым, што называюць "іншай справай".

І ўсё ж Грынкевічу стала так цяжка, што, калі чорны сабака падышоў да яго і стаў лашчыцца, Андрэй не вытрымаў, паторгаў яго за калматае вуха і ціха сказаў:

- Жывеш, брат? Ну, жыві.

Яны стаялі ўжо ля дзвярэй, і яна ціха сказала яму:

- Я не затрымліваю вас, таму што сама зараз пайду.

Андрэй не ведаў, праўда гэта ці мана з літасці, таму што нельга было аддаць галоўны для яго вечар жыцця яшчэ камусьці другому, але быў удзячны і за праўду, і за ману.

## **Раздзел XIV**

Наступных тыдняў ён амаль не памятаў. Яны падзяляліся на дні. Адны з гэтых дзён цягнуліся нудна, як панядзелкі, і доўга, як крымскі палон. Другія ляцелі хутка - гэта калі яна была поруч.

У гэтыя хуткія дні таксама было мала падзей, але можна было ўвесь час глядзець на смешны рух вуснаў, якім яна здзьмухвала бязважкую пасмачку попельных валасоў са шчакі, на светла-жоўтыя пальчаткі, на калматы цёмна-шэры берэт.

Аднойчы ён дапамог ёй выйсці з аўтобуса, і Андрэю, як хлопчыку, было патрэбна так мала, каб шчасця хапіла на цэлы дзень: няўлоўны цяжар рукі, якой яна абаперлася на яго моцную далонь.

Ён як быццам чакаў выпадку, хоць ведаў, што яго не можа быць. І толькі аднойчы выдаў сябе.

Ездзілі ў Каломенскае. Глядзелі царкву Уваznясення. Яна была прыгожай, але Андрэй не мог любіць яе, як Пакроў на Нерлі. Магчыма, таму, што там было віраванне і звон светлага смутку напрадвесні, а тут прыгажосць стаяла на прагна расстаўленых белакаменных ганках, і гэта было толькі ўсталяванне ўлады, уласцівае для часоў "трэцяга Рыма".

Галіна Іванаўна пачала, відаць, заўважаць нешта. Глядзела на хлопца цёмнымі спачуваючымі вачыма, часам клала румяную шчаку на далоньку і сумна, па-вясковаму, па-бабску, пахітвала галавой.

І тут, на жоўтай лугавінцы над адхонам, яна не вытрымала, адвяла Грынкевіча ўбок і заўважыла, што ён страшэнна змарнеў, стаў падобны на мумію і, напэўна, закахаўся ўшчэнт, і гэта, аднак, зусім яго не прыкрашае.

Андрэй стаў разупэўніваць, і пасля гэтага яму стала здавацца, што нават руды конь, які скуб непадалёку сухую, забітую зазімкамі траву, зразумеў яго і мае ласку глядзець на яго паводзіны з сарказмам і іроніяй.

Трэба было берагчы імя Ірыны. А яна, як назнарок, сама лезла на ражон. Калі ішлі ў прыказны і ў палату гадзіннікаў, - казала, што курсанты-грузіны быццам бы не пайшлі таму, што знайшлі непадалёку шашлычную і што Грынкевіч сумны таму, што не адважыўся ўцячы з імі. А калі спусціліся ўніз і выявілі, што дзверы нехта замкнуў, - яна, гарэзуючы, выказала меркаванне, што гэта таксама зрабіў Андрэй - з цягі да моцных уражанняў.

Зноў палезлі па вінтавых сходах шукаць другі выхад. Сходы былі стромыя, і Грынкевіч, каб развеяць няёмкасць, сказаў завучу, якая ішла наперадзе, каб яна спакойна сабе падала, спадзеючыся на яго. Тая заявіла, што ў яе няма намеру быць гэткай легкаважнай.

І тады Андрэй пабачыў, яшчэ вышэй, вочы, якія смяяліся.

- Што вы, Галіна Іванаўна, няўжо вам было б непрыемна ўпасці ў абдоймы беларускай паэзіі?

Зарагаталі ўсе, а Андрэй у апраметную праваліўся б, абы не чуць такога.

І ўсё ж ён выдаў сябе, нягледзячы на няёмкасць. Мёртва чарнелі ў паўдзённым прысмерку кастрычніцкага дня дубы. Бетон, заліты ў іх дуплы, здаваўся белым і халодным, як лёд, быццам дрэвы заледзянелі да сэрца. Там-сям жаўцелі яшчэ на верхніх галінах скручаныя ў трубачку моцныя лісты. Але туман стаяў між дрэвамі, укрываў дробнай халоднай імжою сцяблінь бадзякоў і варсінкі на шапачцы Ірыны. Выплыў з гэтага туману бярвенчаты домік Пятра, і адчыніліся дзверы, і людзі апынуліся ў пакоі з вузенькімі вокнамі. Тут змрок здаваўся яшчэ гусцейшым, таму што сцены былі чорныя, цвёрдыя ад куродыму, як косць.

І ў паўзмроку Андрэй убачыў яе вочы, удвая большыя, чым на самай справе.

Ён адчуў, што пайшоў бы з ёю нават у курную хату, цяжка карчаваў бы ляды, толькі каб вечарам ляжаць пад валакавым акенцам і пры святле лучыны ў лучніку глядзець, як яна прадзе. Усё было лепей, чым быць паэтам, але без яе.

Напэўна, на хвіліну ён перастаў трымаць на твары маску абыякавасці. А можа, вочы яго таксака былі ўдвая большыя і таму страшныя. Але ён убачыў, як шырыліся ў цемры яе зрэнкі, як злёгку адкінулася назад, бы ад спалоху, яе галава і як адначасова ўся яе постаць пацягнулася да яго, нават злёгку дакрануўшыся плячом і потым зноў адхіліўшыся.

Астатнія дзве гадзіны яна не жартавала. Глядзела кудысьці паўз яго, думаючы аб нечым, і маўчала. Маўчала і яшчэ некалькі дзён, часам кідаючы на Андрэя вельмі дапытлівыя і як быццам спалоханыя позіркі з-пад густых веек. Маўчала і потым. Маўчала, пэўна, цэлую вечнасць. Маўчала нават тады, калі ездзілі глядзець Круціцкае падвор'е, і Андрэй, асабліва расчулены, бо ведаў з рукапісу прабабкі, як любіў Круціцкі церамок той Гораў, здольны быў ледзь не плакаць ад замілавання, гледзячы на яе.

Ён паспрабаваў быў нават расказаць ёй, што будавалі церамок майстры і дойліды, вывезеныя з яго радзімы, з яго роднага Вострава, але яна сказала яму, нават з нейкай злосцю:

- І як гэта яны здолелі?

- Сам здзіўляюся, - спрамогся знайсці ў голасе іронію Андрэй.

Забіць сябе варта было за гэтыя словы! Трэба ж было бачыць, што злосць была толькі ў словах, а вочы былі звычайнымі вачыма лясной касулі, калі яна ідзе на саланчак, бо

не можа іначай, ідзе, цвёрда ведаючы, што недзе тут сядзіць паляўнічы.

- Прабачце, - сказаў ён. - Я дорага даў бы, каб не сказаць апошніх слоў.

Гэта было яшчэ горш. Быццам чалавек гуляў у асаблівую высакароднасць. Але выпраўляцца не было калі, і ён ціха сказаў Ірыне:

- Вам не трэба гэтага. Нашто абражаць гэтую чырвоную цэглу, небывалыя купалы і гульбішчы? Вы лепшая за ўсё гэта, а хочаце здавацца горшай.

І дадаў:

- Вам ніхто не паверыць, Ірына Сяргееўна. У гэтым вам ніхто не паверыць. А я - першы. І вы дарэмна так з намі.

Яна змоўкла. І маўчала зноў усю дарогу, сядзела на першым ад яго сядзенні. Андрэй глядзеў на яе і зусім непадалёк бачыў яе валасы, скручаныя цяжкім вузлом, яе тонкія плечы і ўласцівую ёй, непаўторную сумную ўсмешку.

Гэтая ўсмешка згасала па меры таго, як усё гусцей абступалі вуліцу і грувасціліся адзін над адным цагляныя дамы, як усё мацнеў грукат трамваяў і ярасны спеў горада.

Яна згасала, і вусны цвёрда сціскаліся ў рашучай і халаднаватай складцы.

Ужо сыходзячы з аўтобуса, яна павярнулася да яго.

- Заходзьце дваццаць сёмага, у дванаццаць гадзін.

Потым яе маленькая рашучая постаць, усё змяншаючыся, звярнула ў завулак і згубілася ў шалёным віраванні натоўпу, у грукаце гарадскога дня.

...Усе дні да дваццаць сёмага Андрэй думаў, ці ўзяць яму да Горавай сваю паэму. Яна і падабалася яму і не падабалася. Гэта было лепей за бясхмарныя ранейшыя вершы, але здавалася яму бездапаможнай лухтой нават пры адным успаміне пра голас Ірыны, пра музыку і сэнс яе слоў.

Для каханай нельга складаць пасрэдныя вершы.

І ўсё ж ён узяў паэму з сабой. Перш за ўсё таму, што ведаў: гэта не будзе непрыемна ёй.

Калі ён ехаў на таксі, выгляд у яго быў такі, што зубастая баба-шафёр, высаджваючы яго, сказала:

- Катай, хлопча. У мяне рука лёгкая.

І ад гэтага спачування невядомай, зусім чужой маскоўскай жанчыны нават хвіліна чакання, перад тым як пазваніць, здалася ўпершыню лёгкай.

Няўпэўнены брэх сабакі, цьмяная худзенькая фігурка ў паўцемры, лёгкі крок, якім яна плыла перад ім у пакой, рука, якая пасадзіла яго на канапу, аддзяліўшы ад сябе італьянскім сталом - усё гэта плыло перад Андрэем бы ў тумане.

Грынкевіч адчуваў, што ён любіць шэры дзень за вокнамі, любіць таршэр, зроблены з алебастравых, трывожна-зламаных трохкутнікаў, любіць самое паветра ў гэтым доме.

Сабака паклаў яму на калена галаву, - і гэта была таксама захапляючая радасць.

Адчуваючы, як хваля любові да ўсяго на свеце перапаўняе грудзі і вось-вось задушыць, цвёрда ведаючы, што не мог быць падманам пагляд шэрых вачэй у каломенскім доміку, адчуваючы, што яму нельга не сказаць, што нават вочы сабакі чакаюць ад яго гэтага, ён адкрыў рот і сказаў раптам зусім не тое:

- Вы ведаеце, што я чакаў вашай лекцыі, яшчэ ні разу не ўбачыўшы вас.

Яна аж галавой страсянула:

- Даволі раптоўна. Вы жахлівы чалавек. Ніколі не ведаеш, чаго ад вас чакаць. Што здарылася?

Андрэй палез у кішэнь, дастаў адтуль лісток з прабабчынага рукапісу і працягнуў ёй. Здзіўлена прыўзняліся бровы:

- Гэта што?

- Чытайце.

-"І зараз, стоячы на парозе апошняй мяжы, прайшоўшы нясцерпны доўгі і цяжкі шлях, я, страціўшы надзею і яшчэ многае, не губляю веры ў будучыню і жыццё толькі таму, што была ноч на пароме, дзе суайчыннік у неразумнасці забіў наша жыццё, а вораг паспрабаваў дапамагчы і, стоячы пад кулямі, да канца бараніў годнасць і сумленне чалавека. Юрый Гораў з Масквы. Хай бясхмарным будзе яго шлях. І, магчыма, унукі мае цеплынёю і адданасцю дапамогуць яго ўнукам, калі толькі звядзе іх на гэтай зямлі халодны лёс..."

Аблічча Ірыны было бледнае, і вусны трохі дрыжалі.

- Што гэта?

- Ці не быў ваш дзед або прадзед афіцэрам падчас паўстання шэсцьдзесят трэцяга года?

Апусціліся вочы. Потый, ледзь чутна, яна сказала:

- А што?

Грынкевіч, пільна гледзячы на яе дрыжачыя веі, расказаў ёй аб падзеях на пароме. Яна слухала моўчкі і толькі па нервова

сплеценых пальцах можна было заўважыць цень нейкага хвалявання.

...Ён скончыў...

- Гэта добра і прыгожа, - сказала яна. - Але я не ведаю, ці быў тады на Беларусі мой прадзед.

- Думаеце, што гэта не ён?

- Чаму не, думаю. Проста нічога не ведаю аб ім.

- Як было імя па бацьку вашага дзеда?

- Н-не тое... Пэўна не тое.

Дзіўна, але Андрэй адчуў разам з расчараваннем і некаторае заспакаенне.

- Што ж, - сказаў ён. - Гэтае няведанне ўсё адно збліжае нас. Усё магло быць. Я веру.

- І я.

Андрэй пабачыў на сцяне партрэт жанчыны, напісаны ў адценнях зялёнага колеру. Нешта нагадваў яму гэты партрэт, асабліва характэрным прыкусам вуснаў. Каб існаваў "зялёны Пікаса" і каб гэта быў не Пікаса, а правінцыяльны выкладчык мастацтва, які працуе "пад Пікаса", то атрымалася б нешта падобнае на гэту карціну. Магчыма, ён, Андрэй, проста нічога не разумеў, але гэтая зялёная жанчына, напісаная пэндзлем, на якім не ляжала пячаць генія, здавалася яму ненатуральнай і асабліва брыдкай. Брыдкай таму, што кагосьці няўлоўна нагадвала.

- Вы хацелі штосьці прачытаць мне, - адарваў яго ад думак голас Горавай. І таму, што яго захапілі знянацку, таму, што пачыналася тое, самае важлівае, чаго ён чакаў восем год, ён адчуў, што сэрца яго захаланула і абарвалася ўніз.

- Толькі не перабівайце мяне.

Рука з рукапісам дрыжала, і добра было, што жанчына не бачыла гэтага за сталом, бо стрымаць сябе ён не мог.

Брыдкі, халодны асенні дзень.

Таксі прыцішаюць бег...

Мужчына чытаў, апусціўшы вочы, не маючы змогі ўзняць іх. Ён баяўся ўбачыць яе аблічча, прачытаць на ім іншае, непажаданае. Потым ён шкадавау аб гэтым, яму хацелася бачыць усё. Але тады ён не мог.

Толькі на палове рукапісу ён авалодаў сабою. Хвалява нне ставала ўсё мацнейшым.

Кроў кінулася яму ў твар, а голас загрымеў, запаланіўшы пакой.

Ён скончыў, і настала цішыня, доўгая, гнятучая.

І раптам ціхі голас, у якім недзе глыбока на дне гучала штосьці падобнае на балючую пакорлівасць лёсу, сказаў:

- Нашто вы гэта, Андруша?

- Я сам ведаю, што дарэмна. Але я больш не мог. Цяпер мне лягчэй.

- Вы ж мяне зусім-зусім не ведаеце.

- Я ведаю вас лепей, чым вы самі.

- Я чалавек цяжкага лёсу. Вайна зачыніла перада мною дзверы ў тэатр. Абмарожаныя ў сорак першым рукі - у музыку. А я... мне гэта было даражэй за жыццё. Што мне засталося? Пісаць кнігі і тлумачыць другіх. Нешта накшталт прычотніка пры храме мастацтва. Нашто вам гэта? Нашто вам я?

Сківіцы мужчыны рухаліся цяжка, і голас быў глухім.

-Усё яшчэ будзе, - сказаў ён. -Пачнём разам... Вы дзівосная. Няўжо вы не падумалі, што гэтым яшчэ больш прывязваеце мяне да вас. Я кахаю не толькі за душу, за вашу прыгажосць і розум. Я не ведаю, што вас вяжа да гэтага чалавека, але паверце разумнаму сэрцу, гэты дом не для вас. А наперадзе столькі дзён, столькі сапраўднага жыцця!

Плесkanуўся па яе твары затоены боль. Зябка скалануўшыся ў крэсле, яна сказала:

- Я вам зараз скажу тое, чаго нікому яшчэ не казала. І паверце, гэта вялікая ахвяра з боку жанчыны... Асабліва ў такі момант. Калі ласка, прынясіце мне цыгарэты з гасцінай.

Ён прынёс і сеў на сваё месца. Насцярожана цягнуліся хвіліны. Гадзіннік адбіў чарговую палову гадзіны.

- Што ж, - сказала яна, - вы, вядома, самі ведаеце, як было ў сорак першым. Немцы ў кастрычніку ўзялі Валакаламск, іхнія танкі ўварваліся ў Мажайск. Пятнаццатага кастрычніка Масква пакідала Маскву...

- Але. Я ў той час таксама быў у Маскве... І апалчэнцаў бачыў - хлопцы ў акулярах і дзяўчынкі з танюткімі рукамі.

Андрэй бачыў, што ёй нясцерпна цяжка гаварыць, і таму даваў ёй час на роздум і мужнасць.

- Страшны быў горад, - сказаў ён. - Надаўбы стынуць. Кожнае акно распята на папяровым крыжы. Касыя, белыя... Пасля - сібірскія палкі. І апалчэнцы...

- І я была сярод іх, - сказала нарэшце яна, зацягваючыся цыгарэтай. - Мне ўдалося прыбавіць сабе гады... Разам з адным хлопцам...

- Вы... кахалі яго?

- Бадай што, - сказала яна. - Своеасабліва, як можна кахаць у пятнаццаць год.

- А ён?

- Ён таксама. І не толькі ён... Быў у нас камандзір аддзялення, Міхал. Сапраўдны дзед у параўнанні з намі. Яму было дзевятнаццаць.

- Якія яны былі?

- Розныя... Зусім... Камандзір быў вясёлы, уладны, жарсткавата-ўпэўнены. А з другім, з... Віцем, мы пазнаёміліся за тры месяцы да вайны. Ён пераехаў да нас, у Замаскварэчча, з Пісцовай...

Памаўчала.

- Я пачала забываць ягоны твар... Але вы... чымсьці нагадваеце мне яго... Мы сталі на пазіцыю ў раёне Нара-Фамінска, усе нашы хлопцы і дзяўчаты... Чакалі. У гібель не верыў ніхто, хоць вінтоўка была адна на дваіх. Ну і яшчэ бутэлькі з запальнай сумессю... Гэта было не шаснаццатага, а васемнаццатага...

Ёй цяжка даваліся словы, і таму Андрэй памог:

- Я напярэдадні скідаў запальныя бомбы з дахаў. Наш дом стаяў за Зацэпе... Якраз каля разбуранага бомбай рынку. Раніцай спаў, а потым мы паехалі разам з дарослымі на акопы. Туды ж, пад Нара-Фамінск... Дзіўна, мы маглі б сустрэцца яшчэ семнаццаць год таму... А яшчэ ён які быў, ваш друг?

- Харошы. Часам я дзіўлюся, як апалчэнцы маглі стрымаць немцаў на дзень-два, да падходу сібірскіх палкоў. Але потым успамінаю яго. Вось такія - пяшчотныя, чыстыя - яны страшныя былі, калі закранулі дарагое для іх. Такі быў і Віця. Ён мне аднойчы расказваў, як яны кралі з ледніка лёд, увесь у апілках: У адным кавалку быў карась. Замёрз і ляжаў у крыштальнай труне... Лёд растаў, і карась аджыў. Ён выпусціў карася ў Чыстых Прудах...

Зацягнулася:

- Яшчэ напярэдадні вайны мы нічога не ведалі, хадзілі з ім каля Чырвонага Клімента. Сонца сядала за дрэвы. І лёталі галубы... Ён даў мне, падабраўшы, адно пяро.

- Што ж здарылася ў той дзень? - спытаў Андрэй.

- Пачалося з абстрэлу. Калі ён скончыўся, усё поле было перакапанае, быццам тут цэлы тыдзень рылася свіння. Вялікая, са слана. А потым немцы пусцілі супраць нас пяхоту і танкі. Цяжкія танкі "Валянцін"... І тут здарылася дзіўнае. Нас было дзве сотні амаль дзяцей. І мы адбілі танкавую атаку... Віця

спаліў адну з машын... А нас асталося пяцьдзесят чалавек... І такое ап'яненне - маўляў, вось варта было нам прыйсці - і вораг уцякае, - што гэтыя пяцьдзесят кінуліся ў контратаку... Дурныя, харошыя былі хлопцы... Камандзірам удалося іх затрымаць... Віцька падабраў нямецкі аўтамат і прыкрываў чэргамі тых, што адступалі да сваіх акопаў. Я была непадалёк. І тут... тут міна трапіла якраз у тое месца, дзе стаяў ён... Я яшчэ паспела ўбачыць: высокі такі, чорны, маслісты слуп дыму і зямлі... І потым цемра... Мяне падабралі хлопцы. Міхал сам адправіў мяне ў медсанбат... Але што яны маглі тады? Асколак сядзіць у калясардэчнай сумцы і цяпер.

Андрэй сядзеў моўчкі і глядзеў туды, у куток, дзе гусцела цемра і дзе нерухомая, са сплеценымі на каленях пальцамі сядзела яна.

Зноў аддаўся меладычны звон у глухіх пакоях. І зноў стала цішыня.

- Ясна, - сказаў Андрэй.

Насцярожаныя людскія вочы глядзелі на яго са сцен.

- Ён памёр, - сказала Ірына. - Пяць год я жыла і не жыла...

- А камандзір аддзялення? - спытаў пасля паўзы Андрэй.

- Гэта мой муж.

І, як быццам апраўдваючыся, сказала:

- Я чакала, і ён чакаў. Не стамляўся чакаць. І казаў, казаў мне словы... Што мне было да жыцця пасля той смерці? Жыццё адабрала любы шлях, жыццё адабрала любага чалавека... Я згадзілася.

- І няўжо нашы медыкі нічога не могуць зрабіць?

- А што яны могуць? Зараз усё запушчана. У сумцы стварыўся рубец. Чым гэта можа скончыцца, вы ведаеце.

Андрэй маўчаў. Потым сказаў амаль бязгучна:

- Можа, мне варта было б маўчаць. Але маўчаць я не магу. Я кахаю вас. Нават больш чым гадзіну таму.

- Ды няўжо вы не разумееце, - успыхнула яна, - няўжо вы не разумееце, што праз год... заўтра... сёння можа быць канец? Няўжо вы не разумееце, што я не хачу гэтага для вас, што я не хачу для вас яшчэ і гэтага гора?

Ох, як загарэліся яе шэрыя вочы! А рука шукала цыгарэту ў пачцы.

- Кіньце курыць, - жорстка сказаў Андрэй. - Я не дазволю гэтага больш.

- Усё адно, - яна ўдарыла сябе далонню ў грудзі. - Зразумейце, цень нада мною. Я не хачу, каб вы двойчы перажылі тое, што перажылі аднойчы...

Мужчына нахіліўся да яе ў цемры, паклаў пальцы на яе руку.

- Ведаючы, што няшмат мне дадзена год, што ўсё адно мне не жыццё без вас, - як бы я вас кахаў.

Яна сумна ўсміхнулася, трохі заспакоеная яго словамі:

- Гэтага мала. Я нават і як жанчына старая для вас.

- Вы - дзяўчынка. Божа, каб толькі ў гэтым была справа. Я б вас пераканаў.

- Андруша, мілы, не трэба. Вы паэт, і будучыня ў вас вялікая. Нашто гібець вашаму жыццю з-за паміраючай?

- Гэта даўно ў мяне, - быццам не пачуўшы яе слоў, сказаў Андрэй. - Я імкнуўся адужаць гэта, але забыць не мог, не магу, не хачу. Што мне да ўсіх гэтых слоў і прычын, калі мне нельга... без вас.

- Пачакайце, - сказала яна і задумалася.

У мёртвай цішыні кватэры чуўся толькі мяккі стук гадзінніка.

Сабака лашчыўся да ног Андрэя. І мужчына закрыў яму вочы калматымі вушамі, каб ён нават позіркам не парушыў цішыні.

- Я не скажу вам "не", - сказала нарэшце жанчына. - Пачакайце. Я павінна многа думаць. А як я да вас стаўлюся - пра гэта няма чаго і казаць.

Яна ўстала, даючы зразумець, што ёй трэба застацца адной. Андрэй устаў таксама. Яна ўзяла далонямі яго галаву і з дзіўным, нейкім пакутліва-лікуючым, засмучаным выразам пацалавала яго ў лоб. А ён узняў рукі і абняў яе, пяшчотна і амаль бязважка, адчуваючы пад далонямі ласкавую мяккасць тканіны і пад ёй нясмелую цеплыню спіны.

- Я не думаў, што змагу, як хлапчына, насіць вершы, мерзнуць на тратуарах, з трапятаннем чакаць серады і суботы, паміраць у астатнія дні. Не думаў, што ў мяне будзе падаць сэрца, калі ўбачу на вуліцы кагосьці падобнага, убачу падобнае паліто, падобны вузел валасоў. О-ох!

Нахіліўшыся, ён цалаваў яе вочы, адчуваючы, як уздрыгваюць веі пад яго губамі. А яго вялікія далоні трымалі і лашчылі яе кволыя і моцныя плечы, рукі, запясці рук.

- Будзьце лепшай са мной, - прасіў ён. - Кожны дзень - першая думка мая пра тое, што жыццё гожае, таму што ёсць вы.

Нясмела адрываючыся ад яго, яна нарэшце сказала перарывістым голасам:

- Ідзіце, ідзіце адсюль... Вашым каханнем прашу.

З цяжкім уздыхам ён апусціў рукі, зняў паліто з вешалкі, апрануў яго і раптам цалкам лагічна сказаў:

- Чорт, забыў... Гэта вам.

І, засунуўшы руку ў кішэнь, дастаў адтуль і падаў жанчыне вялізны барвяны гранат, велічынёю з дзіцячую галаву.

- Сімвал?

- Н-не ведаю... Які?

- Мадонна на старых карцінах заўжды трымала гранат у руцэ. Сімвал улады.

- Трымайце, - сказаў ён. - Як сімвал улады нада мной.

## Раздзел XV

Яніса амаль цэлы месяц не было ў Маскве. Быў у Рызе. Сам зняволіў сябе ў Доме творчасці і пісаў там новую паэму. Яму лепей за ўсё пісалася позняй восенню, у лістападзе, калі над зямлёю нізкае шэрае неба, туман ляжыць на верхавінах дрэў і нават апалая лістота паспела згубіць свой залаты колер і стаць грыфельна-шэрай.

Ён проста быў моцны і жыццярадасны чалавек. А такія любяць восень. І любяць працаваць увосень, таму што ў астатнія поры года жыць хочацца больш, чым пісаць.

І вось у гэты дзень ён уварваўся ў пакой Андрэя, не пастукаўшы, і яшчэ з парога загарлаў:

- Здароў, самотны рымлянін.

Андрэй скочыў, як бы яго шылам парнулі. Так яны і стаялі, абняўшыся: Яніс у мокрым ад лістападаўскага дажджу плашчы, а Андрэй - у трусах і майцы.

- Дружа мой. Сядай. Як пісалася?

- Геніяльна.

- Што напісаў?

- Напісаў, брат, сумную рэч. Паэму аб маці.

Яніс сеў:

- Быццам зноў прайшоў шлях. Уся гэтая гарота, нястача, слёзы... І тут яшчэ яе смерць... Цяжка было... І ў тон настрою Дзінтара юра[3] за акном шуміць-шуміць. Кожную ноч.

Ён выцягнуў руку з кішэні, расціснуў пальцы. І ў пакоі быццам адразу стала святлей.

На далоні ляжала некалькі янтарных кавалкаў: іржава-карычневых, шакаладных, празрыста-залатых - быццам ззяючых цеплынёй.

- Поўзаў, брат, па беразе для цябе. Хацеў табе Балтыку прывезці.

- А я што табе прывязу?

- Прывязі кавалачак Нарачы, - Яніс пачынаў дурэць. - Прывязі Белавеж або лепей бутэльку "Белавежскай".

- Зубра нованароджанага табе не прывезці?

- Прывязі зубрыху.. Буду вадзіць яе на пашу ў Астанкіна. Выпушчу на партэр і - "гуцю-гуцю, падласая!".

Андрэй палез у шафку.

- Белавеж самому патрэбна... А "Белавежскай" бутэльку разап'ём. Прыслалі.

- Братка ты мой. Ашчаслівіў ты мяне, ашчаслівіў. Цяпер я і ад тэрытарыяльных дамаганняў адмаўляюся. Месяц у рот не браў. Вось так працуеш, як дурань, а п'янка запушчаная.

Андрэй, сабіраючы на стол, усміхнуўся.

- Дрэнны з цябе патрыёт. Во Баранаўскас патрыёт дык патрыёт. Надоечы напіўся і раптам успомніў, што ён літовец. Спрадвеку з ім такога дзіва не было. Пачаў да мяне тэрытарыяльныя прэтэнзіі прад'яўляць. Кажа: аддавайце нам Гродна, Ліду, Ашмяны і Навагрудак. Я кажу: родненькі, бяры, бяры, калі ласка. Мне што, мяне не абыходзіць. Бачыць: вайны не будзе. Дзе, крычыць, Вайвадс? Давайце яго сюды. Чаму забраў у нас Даўгаўпілс?.. Тут я з лёту эпіграму:

Хотел дойти до Даугавпилса,
Но вместо этого напился.

Мы паклалі яго на ложак, укрылі абрусам, і ён захроп.

- Салодкае жыццё, - сказаў Яніс.

- Сядай за стол, падонак, - сказаў Андрэй. - Сядай, лэйбус.

За акном ляжаў пахмура-шэры свет. Нізкія, пашкуматаныя кімсьці хмары беглі над дахамі дамоў.

---

[3] Янтарнае мора

Ледзь праглядваўся недзе далёка паміж дамамі шпіль высотнага будынка, напалову схаваны ці то ў хмарах, ці то ў дыме.

Выпілі.

- Як лекцыі? - спытаў Яніс. - Як Горава?

- На нашым курсе ў яе добра. На другім - справа дрэнь.

- У нас хлопцы надзіва памяркоўныя, сумленныя і цікавыя, - сказаў Яніс. - Акрамя Стаўрова з Ліпскім, дрэнных і не ведаю.

- А чым яны табе назалілі?

- У мяне нюх на людзей. Стаўроў - прэтэнцыёзны невук, а Ліпскі наогул дробная дрэнь.. Чакай, яны яшчэ нам дадуцца ў знакі, каб іх долечка ліхая судасіла, каб іх...

- Я Ліпскага не разумею. Яму б год на дзесяць раней жыць.

- Ён і жыў... А што на другім курсе?

- А там проста Ліпскіх больш. Рагочуць з голых багоў. Адзін сказаў, што Афрадыта, якая ўстае з пены, наводзіць яго на думкі аб мацярынстве.

Яніс усміхнуўся:

- Таямніцы ўспрымання. У яго продка, відаць, гэтае ўспрыманне было яшчэ больш агрэсіўным. Нездарма Пётр, паставіўшы ў грамадскім садзе Венеру Таўрычаскую, поруч паставіў вартавога, "дабы оную не лапалі".

- І яшчэ адно. Нейкі псіхоз. Усе выказваюць ёй павышаную ўвагу.

- Гэта добры псіхоз.

- Чаму?

- Таму, што ты зачынальнік гэтага прагрэсіўнага руху.

- Свіння.

Андрэй раптам спахмурнеў. Ссунуліся доўгія цёмныя бровы.

- Што з табою, Андрэйка?

- Дрэнь у мяне справы, Янка.

- Бачу, - ціха сказаў Яніс. - За месяц, пэўна, і шчасця і гора набраў поўную торбу. Бачу, апавяданне будзе доўгае... Таму давай возьмем па адзінай... Кажы, браце.

- Ты ведаеш, што я сказаў ёй аб усім?

- Так. Бо я паехаў на другі дзень.

Яніс бачыў перад сабою змарнелы твар Андрэя. Нейкі зусім новы, амаль непазнавальны твар, а на ім выраз той мужнасці, якую можна назваць хіба толькі мужнасцю адчаю.

- Я так і не дачакаўся цвёрдага адказу, - сказаў Андрэй. - Яна кажа, што я неразважлівы, размаўляе са мною пра ўсё, абы не ўспамінаць таго, што было.

Ён усміхнуўся сумнай з'едлівай усмешкай:

- Шырокі дыяпазон. Ад канкрэтнай музыкі да Фрэйда. Ад антыматэрыі да лётаючых талерак.

Яніс сказаў са звычайнай разважлівай самаўпэўненасцю селяніна:

- Канкрэтная музыка - лухта: няма элемента адбору з усіх гукаў свету. І Фрэйд - лухта: іначай Буало не быў бы паэтам. А вось наконт лётаючых талерак - не ведаю.

- Табе гэта ўсё лёгка. А як быць мне, калі я чую такія размовы?

Яніс глядзеў у кут:

- Яна баіцца цябе. Баіцца даць сабе волю.

- Чаму?

- Не ведаю. Магчыма, шкада ламаць уладкаванае жыццё? .

- Хіба гэта сумленна, калі кахаеш?

- А ты менш пытай аб сумленні.

За акном гусцеў прыцемак. Андрэй устаў і рэзка адчыніў акно.

Адразу туман, што грувасціўся на ўзроўні шостых паверхаў, пацёк у пакой. Гэта быў такі туман - падстаў крысо пінжака і пабачыш сотні мікраскапічных крапінак вады.

- Мне дзіўна жыць, - сказаў Андрэй. - Дагэтуль усё было проста. Просты свет. Простая мэта. Простыя жанчыны і вершы. І сам я просты. А тут... Я не ведаю, чытаў я аб гэтым або сасніў у адну з прамінулых начэй... Тут так дзіўна, як у гэтым сне, быццам у Егіпце, у пясках Старажытнага царства адшукалі часткі механізмаў, нават кола дыяметрам у адзінаццаць метраў з незямных элементаў. Значыцца, прыляталі, пабачылі, што няма нічога цікавага - і паляцелі... Вось так і з ёю. Быццам зусім іншая, быццам з іншых светаў... Уся блакітная. А я, як той карычневы егіпецкі дзікун...

- Я разумею, - ціха сказаў Яніс. - Так і патрэбна быць. Але да дабра гэта не давядзе.

- Сказаў ёй рэзкасць. Доўга думаў, на каго падобны партрэт зялёнай жанчыны, што вісіць у яе пакоі... Потым зразумеў - яна. .

- Зялёная Ірына і фіялетавы Андрэй, - сказаў Яніс. - Ну і што?

- Яна сказала, што такой думкі аб ёй быў мастак.

- А ты?

- Я сказаў, што не дазволю нікому мецць аб ёй зялёную думку.

- А яна?

- А яна сказала, што мужу падабаецца. Што гэта ён заказаў партрэт.

- Бачыце, якая неверагодная адчувальнасць?

Андрэй з сілаю згінаў і разгінаў ключ ад пісьмовага стала.

- Я сказаў, што прыхільна стаўлюся да эксперыментаў, - жорстка вымавіў ён, - але за такі даў бы мастаку, хай сабе ён і італьянец, па мордзе... Малюйце ў гэтым стылі каго хочаце, нават мяне. Але так маляваць нельга двух чалавек: маці і каханую... Ніколі мастак, калі ён сумленны, не намалюе партрэт маці з аранжавых і сініх трохкутнікаў або як там яшчэ. І гэта сведчыць...

Вайвадс перабіў:

- Гэта сведчыць супраць усіх тэорый... Але ты дарэмна сказаў ёй аб гэтым. Не ўсё можна казаць каханай. А лаяць тое, што ёй даспадобы, - вельмі дрэнны метад спадабацца ёй.

- Гэта яшчэ не горшае... Яна запрасіла мяне на аўторак паехаць з ёю ў Кітай-горад на рэстаўрацыю храмаў. Я згадзіўся, паехаў і...

- І не застаў яе дома. Таму што прыйшоў нечакана муж, або маці мужа, або яе маці... І ты сустрэў там кагосьці іншага. І той іншы сказаў табе, што яна паехала. А ты ўзяў таксі...

- Так, - сумна сказаў Андрэй. - А я ўзяў таксі і паехаў у Кітай-горад, думаючы, што яна не дачакалася. Абышоў увесь раён - нікога... У царкве Анны - нейкая ўстанова. Царква Варвары... ат, ды што там!

- Закуры, - сказаў Яніс. - Я ведаю, табе было цяжка. Хадзіў, пэўна, як ашалелы.

- Так ашалеў, што ў Крывым завулку ледзь пад аўто не падляцеў.

Рука Яніса лягла на Андрэева плячо:

-Глядзі ты прасцей на справу. Яна баіцца, унікае цябе, і гэта дрэнна. Гэта можа не скончыцца дабром... Не прапаноўвай ёй пакуль што пайсці з табою ад мужа.

- Не магу. Або яна, або нікога.

- Добра, - сказаў Яніс, - чытай вершы. Паэму чытай:

- Якую.

- Я ведаю якую.

Андрэй маўчаў. І тады Яніс сціснуў далонямі яго скроні:

- Ты толькі не нарабі глупства, Андрэйка.

- Я кахаю яе, - сказаў Андрэй. - А яна... Я ледзь не памёр у гэтыя дні, Янка. Добра, што ты тут. Мне не так страшна.

## Раздзел XVI

## ГРУБАЕ І ЛАСКАВАЕ

### І. РОЗДУМ

Расплата за ўсё:
За чырвоныя макі,
За світанне жыцця,
За блізкі канец,
За тое, што быў,
Што смяяўся і плакаў,
За тое, што ўсе любілі мяне.
За Сірына, што заліваўся ў маі,
За лістападаўскі крык крумкача -
За ўсё, расплата, цябе прымаю
І, сціснуўшы зубы, буду маўчаць.
Ніщто не суцешыць,
Не дапаможа,
Таму, што не быў я спакойнай травой,
А быў удалым,
Як Ян Прыгожы:
Ў стрэмя нагой ці аб пень галавой,
Аб пень галавой!
З парванай папругай
Конь самотны тоне ў траве.
Спускаецца ноч.
І голас друга
Не заплача, не крыкне, не пазаве.
Я многія вочы і сэрцы трывожыў
І толькі перад каханай адной
Бляяў рахмана, як агнец божы,
Піў з капытка і цягнуўся струной.
Я ведаў, што трэба кахаць бязмерна,
Што не біць, а песціць павінна рука,
Што лепей ягня, чым тхор крыважэрны,
Лепей юродзівы, чымсьці кат.
А яна мне на шыю стужку ўзвязала,
Як ягня, барола мяне галавой,

І ў кучаравы лоб цалавала,
І гадавала зялёнай травой.

**II. КАЗКА**

Ну сядай, сядай са мной, калі ласка.
Навальніцы песня старая-старая.
Слухай казку. Апошнюю казку.
Яна на тваіх вачах памірае.
Ў гэтай казцы яліны лапы схілілі.
Візантыйскі захад у алым дыме...
"Зялёная сарока кашку варыла,
Зялёная сарока з дурнымі вачыма..."
У кулінарную кнігу глядзела,
Чухала патыліцу драўлянаю лыжкай,
І дзеткі кашку да лыжкі з'елі,
А нам з табой не далі ані крышкі.
Ты смяешся? Такога няма на свеце?
Не смейся, любая, свет шырокі.
Мы з табою толькі дурныя дзеці.
Нам добра з гэтай чубатай сарокай.
Сарокі розныя рэчы крадуць,
І, можа, ў гняздзе яе, з золатам поруч,
Ляжыць каханне, святло і радасць,
Што прынесла сарока з-за сіняга мора.
Аддайце, сарока. Няма ўжо сілы.
Яна ж не кахае мяне, хоць зарэжце.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Дай я цябе пацалую, мілая.
А каша?
Чорт з гатай кашай, нарэшце.

**III. СТРАШНЫ СУД**

Якія страшныя, шэрыя дні!
Апоўдзень - вячэрні змрок.
Без цябе, без сонца, без цеплыні.
Ў сэрцы - боль, на вуснах - замок.
Імжэў у чацвер халодны дождж.
Я ў ложак лёг і памёр.
Праляцеў праз туман, праляцеў праз буран
І пабачыў ільдзінкі зор.
Мае павекі цяжкімі былі
Ад непралітых слёз.

За мною былі абшары зямлі.
Наперадзе - быў Хрыстос.
І д'ябал сядзеў ля ног яго
На вугалях залатых,
І на ляжках калматых ляжала ў яго
Кніга грахоў маіх.
Уладзімір злева стаяў у карзне,
Справа - маці Хрыста,
І яны загадалі наблізіцца мне.
І я перад тронам стаў.
Паміж богам і мною стаяла сцяна.
Я на жанчыну глядзеў,
Мне здавалася: гэта стаіць яна,
Лепшая з лепшых людзей.
- Любая, што вы са мною зрабілі?
Чым асудзілі на страшны канец?
Чым варажылі, чым апаілі,
Чым, дарагая, забілі мяне?
Трызніцца ўсё мне ліловы вечар,
Вашы сляды на ліловым снягу.
Нават цяпер я чакаю сустрэчы,
Нават мёртвы без вас не магу.
Думаў, што ёсць забыццё у смерці,
І зноў папаў у квітучы твой сад.
Вазьмі маё сэрца,
Вазьмі маё сэрца,
Вазьмі майго сэрца
Чырвоны гранат.
- Досыць, - з усмешкай сказаў Сатана, -
Ты не змяніўся, герой.
Замест таго каб маліць і стагнаць,
Ты ўпадаеш за жонкай чужой.
Занядбаў ён, божа, твае дары,
Талент развеяў, як дым,
Ён гарэлку піў, ён кахаў і курыў,
Брыдка лаяўся ў доме тваім.
Воласа не аддаў за багоў,
Нюхаў дно ў бакалах, як Ной,
І нават памёр ад кахання свайго
Да зямной жанчыны адной.
Ты даў зямлі дзіўных песняў сям'ю,
Ты арган стварыў для яе.

Ён мог грымець у славу тваю,
А славіў адну яе.
І ён самачынна арган паламаў,
І песня знікла з мяхоў,
І ў кнізе чыстага месца няма
Ад яго бясконцых грахоў.
- А ён малайчына, - Ўладзімір сказаў, -
Любіць песню і сечы дым.
Гусляром бы яго я ў дружыну ўзяў, -
І стаў бы Царград маім.
- Я ведаю, - вымавіў рот Сатаны, -
Што ты бараніць яго рад.
Ты такі, як ён, ты - певень дурны,
Да крыжа меў трыста дзяўчат.
- З табой, Сатана, распраўлюся я,
Як мой дружыннік Ілья
Расправіўся з багамерзкай дачкой
Разбойніка Салаўя.
Выспятак суну табе пад зад,
І будзеш ведаць тады,
Што ўзялі маіх цёплых грэшных дзяўчат
У светлага рая сады.
- Панове, тут дама, - ўзмаліўся бог, -
Бярыце рот на замок.
А вы, маман, прыпадаю да ног,
Не рэгардэ ў той бок,
Як мне з такой камарыльяй жыць?
Лаюцца, бы ў піўной.
А ты... ты апошняе слова скажы,
Апраўдайся перада мной.
- Любая, што вы са мною зрабілі?
Чым асудзілі на страшны канец?
Чым варажылі, чым апаілі,
Чым, дарагая, забілі мяне?
Трызніцца ўсё мне ліловы вечар,
Вашы сляды на ліловым снягу,
Нават цяпер я чакаю сустрэчы,
Нават мёртвы без вас не магу.
І адказ. Цішэй скрыпічнай струны.
Голас маці Хрыста і маёй:
- Ён кахаў, і за гэта палову віны
Выкраслі з кнігі сваёй.

І душа яго была, як палі
Ў сонечнай майскай расе.
Ён кахаў прыгажэйшую на зямлі, -
Выкраслі віны усе.
Ён так кахаў, як ніхто з мужчын.
Свет паклаў на каханай далонь.
Жанчына я і стаю за жанчын.
Кідай лісты у агонь.
А ты, што душы можаш будзіць,
Ты, шалёная галава,
Уваскрэсні, на людныя вулкі ідзі,
Грашы, суцяшай, спявай.
Ёсць на свеце гор і лясоў краса,
Акіянаў сіняя соль.
- Але я не хачу, не хачу ўваскрасаць.
Там боль!
- І тут будзе боль.
Забыцця ў каханні і смерць не дае...
- Там змрок!
- І тут будзе змрок.
- Там яна!
- А тут не будзе яе.
Ёй горка,
Вярніся, дружок,
Помніш?
"Што вы са мною зрабілі?
Чым асудзілі на страшны канец?
Чым варажылі, чым апаілі,
Чым, дарагая, забілі мяне?
Трызніцца ўсё мне ліловы вечар,
Вашы сляды на ліловым снягу..."
- Досыць!
Хоць бы адну сустрэчу!
Ўваскрасіце!
Вярніце!
Я не магу!

**IV. ГОРАД І ЗАВУЛКІ**

Зараддзе. Будоўля. Магутныя краны.
Электразваркі мёртвы агонь.
Звініць у свежых цагляных ранах
Перфаратараў гучная звонь.

Бурацъ дамы. Для кіно раскоша:
На руіне вісіць чыгунны ліхтар,
Пад нагамі разбіты латок кніганошы
І сарваная "выбухам" шыльда "Бар".
Раяль бутафорскі вісіць ца калоне
(Усё зрабілі, як на вайне),
І струны, як змеі Мядузы Гаргоны,
Свісцяць на вятры і ловяць мяне.
Я ўваскрэс, але я гару, як салома,
На якую вецер іскру нагнаў.
Пажар у шэрым каменным доме:
Дым укрывае пляц Нагіна.
Крывы завулак.
Царква Варвары,
Ліпучы брук і вугальны дым.
Ва ўсіх дамоў непакояцца твары: .
"Чаму ён такі?
Што здарылася з ім?"
Завулкі, завулкі, завулкі змяяцца,
Усе падобныя, шэрыя ўсе,
І я падобны на лісцік акацыі,
Што вецер цяснінамі вуліц нясе.
Я хацеў бы рухаць пачварныя краны,
Класці цэглу.
А сам не магу стаяць.
Закон бы выдаць, каб закаханых
За сабатаж - без жалю страляць.
Людзі ў завулках, людзі ў кватэрах,
Людзі ў вокнах.
І ў гэтых людзей
Шчасце без меры і гора без меры,
Змрок безнадзейнасці, сонца надзей.
Інвалід бязногі спрытна і ўмела,
Падабраўшы раменьчыкам чуб з ілба,
Ладзіць абцасікі туфлікаў белых,
У якіх дзяўчына пойдзе на баль.
Флюгер - леў на баярскіх палатах -
У дзённым прысмерку цьмяна згас.
Плача дзяўчо за шклом аўтамата,
І трубка каркае ёй у адказ.
Я б не дазволіў, каб горкія слёзы
Проста да трубкі з вачэй цяклі.

Яны ж -
нават моцныя -
трошкі мімозы.
Іх трэба любіць на гэтай зямлі.
Каб мая жанчына мяне пакахала,
Я б не каркаў, як гэты прывык,
А здарыцца так, што слова сарвалася, -
З коранем выдраў бы свой язык.
Не пакахае.
Не можа.
Світанне
Не прынясе мне новых надзей.
Але ёсць яно,
Але ёсць каханне, -
І люблю я больш
Зямлю і людзей.
Больш ні ў чым на зямлі мне няма патрэбы:
Толькі б шчасця болей яе сынам,
Больш любві, пяшчоты, сумленнага хлеба,
Менш хлусні, менш свінцу, менш агню палям.
Толькі б хлопцы былі да дзяўчат, як ветрык,
А дзяўчаты да хлопцаў, як сонца, былі.
Толькі б мукі зямлі ў зямныя нетры
Разам з целам маім навек адышлі.
Толькі б душы свяшчэнным гарэлі знічам...
І яшчэ адно,
І гэта канец:
Калі ты мяне ў бой за сябе паклічаш
І заглянеш пажарамі ў вочы мне, -
Я пайду на гэта з такім жаданнем
І з такою гарачаю верай зямной,
Як ляцеў у асенні дзень на спатканне
З жорсткай, светлай, добрай, харошай маёй.
Ўсіх Святых на Кулішках храм занядбаны
Поруч з плошчаю і тытунёвым латком.
Памалюся ў ім аб смяротнай ране
І аб мужнай славе перад канцом.
Аб трывожнай, крывавай, застрашлівай долі
Папрашу перад тым, як кінуцца ў бой,
Перад страшным полем, смяротным полем,
Куліковым полем любові маёй.

### V. ПЕРАД СЕЧАЙ

Над полем агонь бівачны згас.
Два страі. Скора звінець мячам.
Многа вас, вельмі мала нас, -
Літасці нашай не будзе вам,
Сілы зла, што пакінулі нам
Попел, і смерць, і асколкі ў грудзях.
Прыходзіць канец. Звінець мячам.
І ў душах вашых цемра і жах.
Вы каханне забілі у кожным з нас.
Тут кожны, кожны такі, як я.
Мы свядома клічам апошні час,
І на вуснах у кожнага песня мая.
"Коні грымяць капытамі.
Блізка апошні час.
Юры, градучы ў славе,
Будзь справядлівы да нас.
Моцнай не будзь дапамогай,
Стрэлы не кідай свае
І не давай перамогі, -
Самі возьмем яе.
Не нам дрыжаць і баяцца;
Нас раз'юшылі ўкрай,
Дай нам да іх дарвацца,
Моцнага ворага дай.
Яны нам жыццё зламалі,
Каханне, цяпло і дом,
У сэрца нявест плявалі
Сталлю, свінцом, агнём.
Над намі не будзе бога,
За намі - пажараў дым.
Мы не просім нічога,
Мы просім цябе аб адным:
У нас ні жонкі, ні хаты,
Ні дзяўчын, ні ніў, ні каня.
Дай, разграміўшы праклятых,
Смерць на полі прыняць.
Не нам каханых палацы,
Нам - абдоймы ночы пустой.
Нам немагчыма вяртацца.
Нас не сустрэне ніхто.
Няхай і кроку ў тумане

Не зробіць дахаты нага.
Не там, а з намі каханне,
На нашых гнеўных сцягах".
Вораг мой ляціць на кані вараным,
Над расістай травою заззялі мячы,
Мне перад войскам біцца з ім -
Зубы ў зубы і шчыт на шчыт.
Слухай, - прыходзіць апошні бой,
Я заб'ю ў паядынку ці ён заб'е, -
Перад тым як спаймаю стрэмя нагой,
Слухай, мілая, словы мае.
Не магу я ліць табе цёплых слоў,
Што квітнеюць, як макі на цёплай раллі,
Толькі думы светлыя, толькі кроў,
Толькі жыццё магу праліць.
Мы на смерць як адзін за цябе гатовы.
Мы гатовы грызці ваўчынай гурмой.
І кавыль схіляць пераможным ровам
Перад тым, як кінуцца з дзідаю ў бой.
І над строем тваіх абаронцаў суровых,
Над клінкамі, што п'юць гарачую кроў,
Будзеш ты лунаць
На харугвах пунсовых.
Залатое святло!
Прамаці любоў!
Чуеш - падковам час звінець.
Разышліся - ад пошчаку поле звініць.
Клінок
яму
і клінок
мне.
Два падзенні,
два сірыя ў полі кані.
І не плач, не магу ў вачах тваіх сініх
Бачыць слёз.
Даруй.
З жыцця адпусці.
За цябе так лёгка, так лёгка гінуць.
Бы ў абдоймы каханай нарэшце пайсці.
З перарывістым, лёгкім, шчаслівым уздыхам
Да грудзей прынікнуць і замаўчаць.
Ты не плач. Я скажу табе ціха-ціха,

Што цалую лязо чужога мяча.
Ён дабро мне зрабіў, пракалоўшы грудзі:
Я ўпэўнены ў гэты шчаслівы дзень,
Што цябе ні бог,
ні д'ябал,
ні людзі
Больш це змогуць вырваць з маіх грудзей.

**VI. MISERECORDIA[4]**
Стогне поле нясцерпна, няспынна,
Гасяць стогны крылом крумкачы.
Маці шукае забітага сына:
Чорны цень на захадзе алым,
Чорны дзень уначы.
Поле вячэрняе, поле сырое.
Плач плыве, як туман па вадзе.
Маці плачуць і над героямі,
Героі таксама пілі з грудзей.
Яны ж хлапчаняты, няхай з барадамі,
Яны ў калысцы плывуць пад гачком.
Што ж ты, калыска, такая свабодная?
Што ж зарасла ты травой-кавылём?
"Ой, да нары мышка,
Да нары,
Да сваёй залатой
Каморы.
Ў мышкі пад падлогай
Дзеткі спяць,
Хвосцікі толькі
З калысак вісяць".
Што ж, мышанятка маё, нерухомае,
Што ж ты не можаш узняць галавы?
Дзеці, дзеці, з якое стромы,
З якіх вяршынь абарваліся вы?
Ляжаць, раскінуўшы рукі белыя,
Кліч іх не кліч, заві не заві.
Ляжаць пасечаныя, пастрэленыя
З-за нейкай сваёй, невядомай любві.
Хоць бы пабачыць дзявочыя рукі,
З якіх яны выпілі чашу сваю,

[4] Меч, якім дабівалі параненых

З-за якіх з усмешкаю йшлі на мукі
І шукалі, як шчасця, смерці ў баю.
Іх не пабачыш.
Іх вочы сінія
Халадней сібірскіх спакойных зім.
Той, хто не быў у жыцці з маім сынам,
Ў смерці таксама не будзе з ім.
Мы - маці, і мы ад тугі згараем;
Але нават у смутку ўсё зноў і зноў
Мы на жыццё вас благаслаўляем,
Бо вы забілі нашых сыноў.
Таму, што лепей вісець на нажы,
Кахаць,
Праклінаць.
За каханне багоў,
Чым век пражыць,
І дзяцей нажыць,
І не дажыць да кахання свайго.
Маці, ты памылілася знову:
Ў час, калі ты пакінеш мяне,
Прыйдзе яна і вачыма суровымі
Ў самае сэрца мне загляне.
Пабачыць, што ў полі, крывёю палітым,
На якім заклалі мы нашу вясну,
Я адзін ляжу недабіты.
І гора забітых адзін цягну.
Ўстаюць з уздыхам змятыя травы.
Яны рыхтуюць сябе для жывых.
Чаму я павінен, палегшы са славай,
Слухаць адзін уздыхі травы?
Месяца сяйва ружовае, соннае.
- Гэта вы? Я чую. Вы - спеў зямлі.
- Я прыйшла. Вы шалёны,
Зусім шалёны,
Вы двойчы жыццё за мяне аддалі.
Нашто свае песні, іх ласку і сілу,
Іх сталь і шоўк аддалі на здзек?
Нашто вы сябе дарэмна забілі?
- Нашто?
Вы забылі:
Я чалавек.
Раб прыроды сваёй.

Уладар прыроды.
Зямная персць. І сонца зямлі.
Вы былі разумнейшай заўсёды,
Але я кахаў, і тыдні, як годы,
Над маёй галавою маршам прайшлі,
І абвяваў мяне пекла вецер,
І сэрца маё палала свячой,
І столькі я зразумеў на свеце,
Што сталі вы неразумным дзяўчом.
Слухай:
Закону гэтага сілу
Не заб'юць ні агонь, ні час,
Ні мячы:
Мужчына павінен гінуць за мілых,
Іначай не будзе
Жанчын і мужчын.
Не будзе пяшчоты,
Адвагі дзікай,
Стане зямля,
Як сіта, пустой,
Справы вялікай,
Песні вялікай,
Смерці вялікай
Не будзе на ёй.
Зроблена ўсё
Яшчэ напрадвесні,
Сказана слова для ўсёй зямлі,
Зроблены справы,
Скончаны песні.
Мортусы да мяне падышлі
Чалавечней дабіць.
І ў масках чорных
Чакаюць, на што ты асудзіш мяне:
Пальцы ўгору - жыццё падорыш,
Пальцы ўніз - падорыш канец.
Жыць?
Вышываць санеты на пяльцах?
Чакаць, каб агонь з гадамі згас?
Ну!
Апусці свае тонкія пальцы.
Кожны сам выбірае свой час.
Узрадуй апошнім мяне падарункам,

Грудзі мае прабі і знявеч,
Сэрца маё абпалі пацалункам,
Miserecordia
Літасці меч.

**VII REQUIEM**
Знічка ўпала - памёр чалавек,
Камень свой катаржны знёс пад гару.
Вечны спакой і святло павек
Сыну свайму, зямля, падаруй.
Не баяўся ён спяваць і любіць,
Жыццё ў няроўнай паліў барацьбе,
Быў такім, якім трэба быць,
Калі завуць чалавекам цябе.
Сонцам пяшчотным быў для дзяўчат,
Другам адданым для добрых сяброў.
Страшным для ворага, як набат,
Літасці богам - для бедных звяроў.
Што яму смерць і што яму змрок?
Смерці няма для людзей на зямлі.
Марш жалезны. Чыгунны крок.
Тысячы.ног за лафетам пайшлі.
Сонца ўстае над новай зямлёй,
Выбух апошнюю рушыць турму...
Вечнае шчасце любай маёй.
Вечны requiem сэрцу майму.

## Раздзел XVII

Раніцай яны былі з пахмелу.

Андрэю гэта было тым горш, што ён апошнія месяцы дрэнна спаў. Ён нават еў дрэнна ў тыя дні, калі не бачыў яе. Ік марфініст без морфію. Дзень праходзіў у напружаных думках аб ёй, ва ўпартай, але часта бясплоднай працы, у бязмэтных бадзяннях па горадзе. А вечарам чалавек клаўся ў ложак і гадзін да чатырох не мог спаць. Ліхаманкавыя думкі, уяўленні, часам нейкая блытаная сувязь слоў, знешне стройныя сказы, якія нічога не азначаюць. Потым - цяжкі сон, у якім ён ні разу не бачыў яе. А потым, гадзін у сем, быццам шокавы ўдар, калі прачынаешся, седзячы на ложку. Тое самае было і сёння.

І ўсё ж Андрэй не мог утрымацца ад усмешкі, калі зайшоў у пакой Яніса. У латыша быў, відаць, пахмельны настрой,

прыступ тых згрызот сумлення, калі не мілы белы свет і чалавек з агідай успамінае, што трэпанг, якога елі напярэдадні ў рэстаране, мае другую назву - "галатурыя".

Бр-р, брыдка!

Яніс сядзеў ля стала і амаль са слязьмі на вачах глядзеў на фотакартку сына. Сын, увесь пушысты, увесь, з лапкамі, зацягнуты ў пуховага "ведзьмядзёнка", з аптымістычнай усмешкай глядзеў на няшчаснага Яніса, у лікаванні раскрыўшы круглы раток з адзіным зубам.

Андрэй паддаў жару. Змрочна сказаў:

- Смяецца, не ведае, што бацька - мярзотнік.

У наступную секунду з грукатам упала крэсла, а Андрэй ужо ляцеў калідорам, а потым сходамі, ратуючыся ад раз'юшанага вярблюда Яніса.

А яшчэ цераз пяць хвілін яны рагаталі да слёз. Калі хтосьці скажа, што латышы - халодныя людзі, не верце. Ва ўсякім разе, Янісавым выбухам мог бы пазайздросціць і італьянец,

І толькі за сняданнем Яніс зноў спахмурнеў, раптоўна прыгадаўшы нешта.

- Што з табой? - спытаў Андрэй.

- Ведаеш... - цяжкі твар Яніса быў нібы каменна-нерухомы.

Андрэй чакаў. Яніс заўсёды нагадваў яму аднаго з тых жалезных стралкоў, аб лёсе якіх яны часам гаварылі, і таму Андрэй заўсёды чакаў ад яго чагосьці трывалага, хай не заўсёды абгрунтаванага, але свайго, сталага, далёкага ад хістанняў.

- Што? - спытаў Андрэй.

- Не трэба табе валачыся туды, - латыш хваляваўся. - Пабойваюся чагосьці я.

- Дарэмна, - сказаў Андрэй. - Ведаеш, што дарэмна. Усё адно павалакуся.

У той дзень ён павінен быў сустрэцца з Горавай каля выхаду з Крапоткінскага метро. Яна, як заўсёды, спазнілася амаль на дваццаць хвілін. Цямнела ўжо зусім рана, і калі яны ішлі бульварамі, на дрэвы, на аголеныя віцы хмызоў, на пабітыя ранішнікамі вяргіні клаўся ўжо бэзавы цень прысмерку.

Яна круціла ў пальцах апошні лімонны лісток клёна, узяты з бульварнай лаўкі.

- Нашто вы хацелі бачыць мяне?

- Потым, Андруша.

Яна была відавочна ўсхвалявана і, відаць, вагалася, вырашаючы ў думках, зрабіць ёй нешта або не. Андрэй адчуваў

гэта. Як яснаглядзец, ён мог за апошні час лавіць самыя неакрэсленыя змены яе настрою.

І тут ён адчуваў: яна задумала нешта такое, што можа паставіць іхнія адносіны пад незваротны ўдар.

А яна, відаць, адчула, што ён нешта падсвядома разумее, і, адцягваючы хвіліны, загаварыла зусім аб другім. І, як заўсёды, ёй удалося захапіць Андрэя спрэчкай і прымусіць яго забыць аб напружанасці. Праз некалькі хвілін яны ўжо спрачаліся.

- Гэта па-дурному, - казала яна. - Прыйшоў, нарэшце, час сусветнага мастацтва, аднолькава зразумелага для ўсіх: для швейцарскага гандляра і для рыбака з Палінезіі.

- Не думаю. Рана.

- Чаму?

- А таму, што, па звестках "ЮНЕСКА", на зямлі ледзь не палова людзей непісьменныя. Ёсць плямёны, у мове якіх пяцьдзесят слоў. Што ім да Суціна і Дос-Пасаса? Раней за ўсё трэба зраўняць гэтую прорву, вучыць людзей і мастацтву і ўсяму. А гэтаму лепш за ўсё вывучыш на сваім мастацтве... Можа, і сапраўды дурасць: у век, калі чалавек рве зямную цягу, трымацца за нацыянальныя адрозненні.

- Не думаю, - сказала яна.

- А я думаю. Школу нацыянальнага навучання павінен прайсці кожны. Яна - як фундамент. Гэта кажу вам я, грамадзянін зямлі, інтэрнацыяналіст.

- Адкуль такое? Нешта па вашых вершах я не заўважыла.

- Чалавек расце хутчэй, чым яго кнігі. Я за жыццё прайшоў тры такіх прыступкі...

- Першая?

- Артадаксальны патрыятызм...

- Ого! А другая?

- Абражаны нацыянальны гонар.

- Зразумела... А зараз?

- Я вельмі люблю радзіму. Вельмі. Часам да слёз. Але я не ведаю, чаму нягоднік-беларус павінен быць мне бліжэй за высакароднага іспанца.

На яе твары з'явілася хітраватая ўсмешка:

- Ну, а што вам бліжэй пры гэткіх касмічных парывах: негрыцянскія "спірычуэлс" ці свая "рэчанька"?

- Рэчанька. Але гэта ад прывычкі.

- Ну і вось. Усяму шкодзіць гэтая "во поле берёзонька". І ўвогуле атрымліваецца "чаму ж мне не пець?". З-за гэтага не

разумеюць адзін аднаго, і агульная культура не можа выйсці на прастор.

- Не разумеюць не з-за гэтага. Вы ведаеце... Тут і вы на правільнай сцежцы, і я. Але вы трохі не дадумалі. Калі б ваш Мусаргскі не ўварваўся ў культуру Захаду - яны дагэтуль лічылі б рускіх музычнымі дзікунамі, і вы не маглі б сесці за стол стварэння агульнай культуры, як роўная.

Спрэчка гэтая была непатрэбнай. І таму ён перавёў размову на іншае.

- Давайце лепей бананаў купім. Вось латок.

Абдзіраючы банан, ён не стрымаўся:

- А сапраўдная антонаўка ўсё ж лепей.

Засмяяліся.

- Вы прыгожа ясцё, - сказаў Андрэй. - Людзі рэдка прыгожа ядуць. Нават унутрана інтэлігентныя нагадваюць у гэты час то малпу з яблыкам, то тыгра над косткаю. А вы...

- У вас ружовы туман у вачах. Мастакам найбольш цяжка маляваць каханую.

- Па-мойму, глупства.

- Ну што вы заўважаеце ў каханай?

-Усё.

- Не. Нічога, Зусім нічога. Калі пачынаеце заўважаць нешта - гэта ўжо канец.

Яна спынілася ля вялізнага шэрага будынка. Стаў і ён.

- Вы не заўважаеце ні майго вялікага рота, ні худых плячэй - нічога. Вы загіпнатызавалі сябе, Андрэй.

Ён стаяў, упарта, па-бугаінаму, нахіліўшы галаву:

- Напляваць. Я ведаю толькі, што для мяне ўсё гэта падстава, каб захапляцца.

У яе вачах зноў быў той разгублены выраз боязі чагосьці і цягі. Але яна хутка справілася.

- Проста вы там у сябе рэдка бачыце такіх жанчын. Вы ведаеце толькі мяне і таму перабольшваеце мае сціплыя добрыя якасці. А такіх, як я, - тысячы. І калі вы зведаеце гэта асяроддзе - я паблякну сярод іншых і застануся звычайнай шэранькай жанчынай... Замужняй... Чужой... І вы забудзеце мяне.

"Вось яно, - штурхнулася ў галаве Андрэя, - падрыхтаванае".

- Зойдзем, - сказала яна.

- Не пайду... - змрочна сказаў Андрэй,

- Але я зайду з вамі, хоць буду нядоўга.

- Вы абяцалі аддаць тэты вечар мне.

- Нечакана з'явіліся справы. А я не хачу, каб па маёй правіне вы сумавалі цэлы вечар.

- Не.

- Ну... я вас прашу.

Андрэй акінуў яе постаць і цяжка ўздыхнуў:

- Добра. Толькі... ведайце, я знаю, нашто вы гэта робіце. І не ўхваляю.

Яна ўздыхнула нават з нейкай палёгкаю. Абое зайшлі ў пад'езд, падняліся на трэці паверх. Аксамітна праспяваў званок.

За дзвярыма чуліся мяккія спевы. Потым крокі. Потым ляснуў замок.

- Арынушка, - сказаў незвычайна пявучы голас. - Бог мой, заходзь. Заходзьце.

У прыхожай было цёмна, відаць, назнарок, і Андрэй не бачыў той, што адчыніла дзверы. У паўцемры ён адчуваў толькі шолах убору і гаркаваты пах нейкай невядомай парфумы, чуў толькі, як сяброўкі пацалаваліся.

- Андрэй, - сказала Горава, - гэта Ганна. Я яе выдам: яна мне ўсе вушы пратрубіла: "пазнаём" ды "пазнаём". Знаёмцеся.

У поўнай цемры Андрэй працягнуў руку, і тут раптам, быццам сам сабой, пачаў налівацца вадкім святлом матавы шар пад столлю.

Але перш чым убачыць, ён адчуў у сваёй руцэ моцную і вузкую руку гаспадыні, асабліва цёплую пасля знадворнага холаду. А калі ўбачыў - веі яго здрыгануліся. Перад ім стаяла нешта такое, што можна пабачыць... ды не, бадай, нідзе і нельга было такога пабачыць.

Валасы гаспадыні былі заплецены ў касу таўшчынёю з руку. Залацістыя, з адлівам у пшанічны колас, яны высокай каронай ляжалі на галаве. І амаль неверагодным пры такіх валасах быў янтарны румянец скуры, смаляныя бровы і чорныя вочы пад доўгімі, як стрэлы, веямі, такія чорныя вочы, што зрэнкі амаль зліваліся з райком.

"Напэўна, дурніца, - груба падумаў Андрэй. - Такая прыгажосць не можа быць разумнай".

- Мастак, - сказала Ірына.

"І тут пэўна нічога не разумее, - быццам назнарок падумаў Андрэй. - Жыве каля мастацтва ўвесь век, як кот з Траццякоўкі".

А на вуснах гаспадыні - ах, як яны былі абрысаваны! - з'явілася нечакана ласкавая, пры такіх жорсткіх зрэнках, усмешка.

- Распранайцеся, Андруша.. Дапамажыце Ірыне. Ах, як добра, што зайшлі, госцейкі вы мае.

- Я не магу, - сказала Горава, - я павінна бегчы.

Так, поруч з гаспадыняй яна здавалася чымсьці накшталт Золушкі Але Андрэй усё адно зірнуў у яе адразу паспакайнелыя вочы з выразам чалавека, якога пакінулі ў палонцы.

"Завабілі, - сказаў яго позірк, - кінулі, падманулі".

"Ну і добра", - адказаў яе позірк.

І тады Грынкевіч з невыразным пачуццём крыўды пачаў скідадь паліто.

- Бывайце, - сказаў ён.

Ляснулі за Ірынаю дзверы. А шчокі Андрэя гарэлі, ці то з марозу, ці то ад сораму. І адначасова нараджаўся недзе гнеў.

- Які вы румяны, - сказала Ганна. - Проста як макаўка.

- Я правінцыял. Мне належыць быць румяным і немудрашчым, як калатоўка. Або як граблі.

Зрэнкі яе пашырыліся:

- Прычэсвайцеся. Хадзем.

- Я правінцыял. Мне. належыць быць бахматым, як стог.

- Які вы правінцыял, - усміхнулася яна. - Вы проста акварэльны хлопец...

Яна разумела яго стан. Андрэй ведаў гэта, - але гэта яму не падабалася.

- Гэта звонку, - казаў ён дзёрзкасці далей, - а ў душы я лубачны... Такі сабе купідон з латкамі ніжэй спіны.

Ганна ўзяла яго пад руку:

- А ў душы вы разбойнік. І з'явіліся сюды з набегам. І таму вам нельга пайсці адсюль, не пашарпаўшы нашых душ, без здабычы. Вы ўшкуйнік і вараг, а таму вам належыць ваяваць з разумнымі мужчынамі, а не з паненкай, якая з першага ж погляду здалася вам дурной, аж круціцца.

Андрэй сумеўся.

- Ну пакіньце, - весела і лёгка сказала яна, - я ж ведаю, што вы гэта ў мэтах самаабароны. "...вяршка не аддамо".

Андрэй сумеўся яшчэ больш:

- Ды я ўласна нікому нічога.

- Ну вось і добра.

Яна расчыніла дзверы ў вялікі пакой, і адтуль адразу лінуў шум, галасы, музыка вялікай спрэчкі. Акно на ўсю сцяну глядзела ў ноч, ледзь завешанае збітай шторай колеру асенніх лісцяў.

Усё здавалася трохі пабляклым: і штора, і кілім, і стары вельмі добры раяль ля акна. Усё, акрамя пагрозліва яркіх карцін і малюнкаў на сценах, акрамя груба засунутага ў кут мальберта і гранітнай няскончанай статуі чалавека, які імпэтна крочыў проста на Андрэя. Як жывыя, пераліваліся мускулы на нагах, а галава была толькі намечана, быццам сякерай, і гэта надавала чалавеку нейкую пагрозлівую магутную сілу.

- Бацька не скончыў, - сказала Ганна. - Ён памёр год таму. Была б зусім адна, каб не сябры. Лаюцца вось... Кожны вечар за кулакамі свету не бачыш.

На руцэ ў чалавека, як плашч Апалона Бельвядэрскага, вісела чыёсьці паліто. А ля самых ног статуі мірна спаў мармурова-бледны юнак. Спаў, паклаўшы галаву на пальцы гранітнага ступака.

- Бачыце, які Марфей, - усміхнулася гаспадыня. - Гэта Аленін, бадай, лепшы з маладых мастакоў. Горачка маё! Узяў ды падпіты прыцёгся. Няхай праспіцца, не выганяць жа на холад.

Андрэй быў здзіўлены. На стале з ножкамі ў выглядзе гермаў стаяла толькі некалькі бутэлек сухога віна, але застолле выглядала ці то на парах, ці як злёгку ашалелае.

Мужчына артадаксальнага выгляду грузна сядзеў у крэсле, паклаўшы на падлакотнікі страшэнныя рукі. У жорсткіх, як дзікова шчэць, валасах першым снегам легла сівізна.

- Сюррэалізм, ташызм, - басіў ён. - Сорак год падыходзіць ваша новае цеста. А калі ж вы пекчы будзеце? Вы пакуль што толькі і дбаеце пра тое, каб не перабухаць солі або цукру.

Некалькі чалавек, седзячы вакол, слухалі шчэцістага, а насупраць яго стаяў на падэсце - на крэсле натуршчыцы - худы юнак з прыгожым нервовым тварам і гарачыўся:

- Не прыпісвай мне ташызм!.. А што да цеста, дык гэта ты, гэта Юпіцеры ад мастацтва перашкаджаюць нам. На дзесяць год замарозілі цеста, а цяпер раз-пораз штурхаеце. А цеста не любіць штуршкоў.

- Гэта ўсё інтэлектуальны снабізм, - басіў грузлы.

- У нас снабізм. А маляваць бяздарныя фотапартрэты - гэта не снабізм? І яшчэ горшы, бо кан'юнктурны снабізм.

- У вас кар'ерызм і зайздрасць да "абоймы".

- Не скажы, - іранізаваў юнак. - Добрую мы кар'еру зрабілі. А зайздросціць няма чаго. Старцам не зайздросцяць.

А ўбаку сядзеў насупраць гожай, зусім маладзенькай дзяўчынкі хлопец у акулярах з сумным прасценькім абліччам і казаў:

- Самае лепшае там - лотас. Гэта трэба самой бачыць. Тоўстая сцябліна, і на ёй, адарваўшыся ад смаляной гразі, вырастае масляністая, ружова-белая раскоша.

Дзяўчынка глядзела на яго спуджанымі спачувальнымі вачыма, раз-пораз кранала яго руку і ўмаўляла:

- Не скручыньвайся ты так. Не вартая яна. Не трэба.

Ганна ўсміхнулася Андрэю.

- Не бойцеся цыганшчыны, - сказала яна. - Гэта ўсе добрыя хлопцы. Проста патроху развіваюць лёгкія... Знаёмцеся, хлопцы, гэта Андрэй Грынкевіч.

Упала цішыня. Потым груздлы падаў Андрэю руку.

- Чулі. Гэта не вам давалі гэткага здаравеннага выспятка ў пяцьдзесят шостым? - І адрэкамендаваўся: - Яхненка.

- Мне, - сказаў Андрэй. - Нічога, і спіна і іншае, усё на месцы.

- Чулі, а зараз бачым і суцяшаемся, - хітравата ўсміхнуўся нервовы юнак. - І яшчэ тое-сёе ад кагосьці чулі... Я Пятроўскі.

Аленін, відаць, пачуў нешта праз сон, адарваў ад п'едэстала шчаку, на якой чырванеў, як поўха, выразны адбітак гранітнага ступака, і сказаў са змрочнай іроніяй:

- Узыходзячы Купала...

- Спі ўжо, узыходзячы Рэпін, - сказала яму Ганна.

- Не абражай, - сказаў ён. - Я позні Рэпін з ліловымі запарожцамі. А спаць - я магу. Хто спіць, той не піша карцін. І вершаў не піша. Не грашыць.

І, апусціўшы галаву, зноў заснуў сном немаўляці.

- Пакіньце спрачацца, хлопцы, - сказала Ганна. - Што, сапраўды? Як сыдуцца, так і за лаянку. Лепей спявайце. Зайграў бы што, Петрык.

Хлопец у акулярах сапраўды сеў за раяль. Пятроўскі, якога, відаць, цягнула да розных нязручных месцаў, сеў на раяль, выцягнуўшы ногі і абапіраючыся рукамі, адведзенымі за спіну!

- Бачыце вы, Іда Рубінштэйн, - кінуў яму Яхненка, усё яшчэ злосны пасля маральнай лазні. - Пачак, і з яго чатыры запалкі тырчаць.

- А ты архідыякан, - сказаў з кута нехта. - Ты метафізік і кіруючы жораў на балоце мастацтва.

Яхненка шчыра і горача зарагатаў.

- Пляханава начытаўся, - са з'едлівай усмешкай сказала ў кут Ганна. - Глядзі, застанешся са сваёй навукай у дзяўках.

Потым узяла бутэльку віна, дзве шклянкі і панесла ў кут, да глыбокай канапы.

- Сядайце, - сказала яна Андрэю, - калі хочаце, скідайце туфлі.

І сама скінула туфлі, забілася ў зручны куток. Андрэй з мужнасцю адчаю зрабіў тое самае.

- Піце,- сказала яна. - Расказвайце.

Асветлены толькі ніжнім святлом, спяваў недзе далёка раяль. Скупчыліся вакол яго маўклівыя постаці хлопцаў. Петрык граў Мендэльсона, тую самую яго рэч - Андрэй забыў назву, - дзе музыка быццам гаворыць праз светлы сум: "Нічога не зробіш".

- Ну, - сказала Ганна. - Што там дзеецца?

Непадалёку ён бачыў цяжкую, як золата, карону валасоў і вялікія вочы. Не, ён ніколі яшчэ не бачыў такіх прыгожых жанчын.

- Што расказваць? - сказаў Андрэй. - Я сапраўды правінцыял. Мы дагэтуль ваўчынага хваста баімося.

- А яны? - сказала яна. - Самыя таленавітыя з іх таксама прыйшлі з правінцыі. Лоск набыць лёгка. Вось і вы яго ўжо набылі. Толькі вам патрэбен апошні штрых. Баскскі берэт. З заломам налева. Ці направа? Не, лепей вам направа. Ды гэта глупства... Правінцыя!.. А правінцыя прыносіць сюды свежую кроў. І нейкае асаблівае сумленне, асаблівую цэльнасць мастака. Часта - талент. Сапраўдны талент, а не выкшталцонасць, як кажуць палякі.

Андрэй зірнуў на карціну, што вісела над іх галовамі. На карціне віхура стракатых, чырвоных з золатам лісцяў закруціла жанчыну з закінутым тварам. У гэтым смерчы ледзь вымалёўвалася яе постаць, але вочы глядзелі наўскос, паўзверх галавы гледача, цёмныя, пашыраныя. А павекі былі чорныя, і горка быў сціснуты гожы рот.

- Вы рабілі, - сказаў ён, узрушаны. - А кажаце: "талент правінцыі".

- А хіба гэта можна параўнаць з работамі бацькі? - сказала яна. - Той быў вялікі скульптар. І наогул... нешта робіцца на свеце. Бо сапраўдныя мастакі павінны быць настаўнікамі жыцця, а зараз многія толькі разнастайна "наддаюць". Той малюе блакітных балерын, той - сплаўшчыкаў - ружова так малюе, а той - сцэны ў шахтах, быццам гразёю.

- Ваш бацька быў з правінцыі?

- Так. А маці ў мяне была полька. Самая прыгожая жанчына ў свеце. Яна памерла, калі мне было сем год.

- Цяпер я ведаю, адкуль вы такая. Мужчыны-палякі рэдка бываюць прыгожымі. У іх проста разумныя,

характэрныя твары. Але жанчын такіх няма нідзе на свеце...

- Кіньце. "Сыны Будрыка" столькі іх панавозілі з Польшчы на сваю радзіму, што зараз, мабыць, шукаць трэба ў вас.

- Значыць, мне не зусім пашанцавала.

Запанавала маўчанне. Толькі Петрык граў. Цяпер - "Смерць Азэ".

- Маленькія гарадкі, - сказала яна. - Маці ніяк не магла прызвычаіцца да Масквы. І я. У нас быў такі снег у кветніку. Гурба была высокая, закручаная, як жамчужніца. І ў закруце снег быў перламутрава-ружовы. Бо адбіваў агеньчык з акна. Там было добра. А тут увесь час людзі, акрамя тых пяці гадзін, калі працую. Абрыднуць - іду ў пакойчык і замыкаюся.

- Там вы жылі?

- Так. А тут толькі мастацтва. Я і сама апошні час не ведаю, каму яно патрэбна, як ісці, каб быць патрэбнай? Блукаю, як у лесе. Зняверылася. Плюнуць бы на ўсё, знікнуць, жыць у якім гарадку. Падлога дубовая, аж вылізаная... Цёплая. Чыстая.

- Што ж вы, - сказаў Андрэй. - Няўжо толькі мастацтва. Пры вашай прыгажосці вам бы пакахаць трэба. Патрэбен спакой, добры муж. Дзеці.

- Што вы, - усміхнулася яна. - Я для гэтага занадта добра ведаю людзей.

- Гэта праўда. Я павінен прызнацца: вы здагадаліся, што я думаў аб вас.

- Гэта пра мае разумовыя здольнасці? Я не крыўдую. Вы ж, мабыць, ужо трохі пераканаліся ў адваротным?

- Так. Але як вы?..

- Я часта чытаю думкі людзей. Бо ведаю іх.

- І гэта перашкаджае вам у шчасці.

- Так. Напэўна, у мяне разумовы склад старой дзеўкі.

- Кіньце плявузгаць, - мякка сказаў ён. - Столькі людзей вакол... Не ў лесе жывяце.

- Людзі сталі рацыяналістычнымі. Мала хто можа аддаць сябе. Пажадаць стаць паветрам, якім дыхае другі.

- І каб не хапала паветра - дык Ёй не хапіла б яго апошняй.

- Праўда.

Ад горычы ледзянога віна ў целе разліваўся цёплы сум. Гучала музыка. Быў паўзмрок.

- Вы вельмі харошы і просты, Андрэй, - сказала яна. - Ірына казала праўду.

І, спусціўшы ногі, устала, такая прамая і ўзнесеная ў сваім гранатавым уборы, што Петрык заміргаў і збіўся з такту.

- Хадзем танцаваць, - сказала яна. - Запрасіце, Андрэй, тую, маленькую. Гэткі капрыз жаночай псіхалогіі. Не любіць мяне за Петрыка... А што я магу зрабіць, калі ніхто... ну... ніхто ніколі мне не падабаўся.

Петрык захістаўся, выбіваючы з раяля нешта заліхвацкі-бравурнае. А вочы яго былі сумнымі вачыма.

...Танцавалі за поўнач. І толькі тады зразумелі, што досыць, калі Аленін, устаўшы ад ног гранітнага чалавека, сказаў яму:

- Ну і свіння ж ты! Друг у ножкі яму ўпадае, а ён... Ну хопіць, хопіць паліто трымаць. Засeдзеліся. Апранайся і хадзем.

І разрыдаўся, абняўшы граніт.

- Не любяць нас, браце! Не цэняць! Гаі вы мае родныя, буралoмчыкі вы мае шышкінскія. Пагляньце, як спіць надзея сусветнага жывапісу.

## **Раздзел XVIII**

Зноў перад будынкам інстытута стаяў аўтобус. Збіраліся ехаць у Загорск. Чакалі толькі Горавай, якая нешта спазнялася.

Дзень выдаўся ясны і празрысты для сярэдзіны лістапада. Сквер, пабіты ранішнікамі, толькі сям-там трапятаў паасобнымі, счарнелымі ўжо, лісцямі. І ўмыта, прасветлена-сумна ляжала над белымі лужынкамі, над пацямнелымі з сонечнага боку храпамі шэрай мёрзлай зямлі, над нежывымі дрэвамі халоднае блакітнае неба.

У Андрэя было нялёгка на душы. Нялёгкай была нядаўняя гісторыя з Ірынай, шкада было Ганны.

- Дзень добры, Андрэй, - нечакана сказаў за спіной яе голас.

Яна стаяла і даволі суха глядзела на яго. А поруч усміхалася з-пад капюшона канадскай блакітнай куртачкі сумнае і вельмі прыгожае аблічча Ганны.

- Вось, - сказала яна, - угаварыла мяне Ірына. І чамусьці мне захацелася кінуць нават тэрміновую работу. Гары яна ясным гарам! Дзень які, Андруша!

Горава глядзела на яе пяшчотна і насцярожана. Злёгку насцярожана і вельмі пяшчотна.

- Я даволі лёгка ўгаварыла яе, - сказала яна.

- Ну і добра, - сказаў Андрэй. - Ах, дзень які!

-- Давайце па машынах, - сказала Галіна Іванаўна. Андрэй прапусціў жанчын. Потым, разам з Вайвадсам, палез у аўтобус.

- Браты-разбойнічкі, - прабурчаў за іхняй спіной Стаўроў. - Ушкуйнічкі. "Сарынь на кічку"...

Прабурчаў амаль тыя словы, што сказала Ганна, і гэта было непрыемна. Стаўроў наогул быў непрыемны Андрэю. Дабра складзены, трохі грузлаваты, з сівеючымі ўжо валасамі, з халоднымі вачыма за шклом акуляраў, з неяк непрыстойна, трохі па-бабску, прыгожым аблічам.

І горш за ўсё было тое, што завуч паслала Андрэя ў будынак з нейкімі паперкамі, а калі ён вярнуўся, Горава сядзела ўжо ў атачэнні другіх. Справа ад яе сядзеў Стаўроў, злева - Харунжы, данскі казак з вострымі вачыма і вострым тварам. У гэтага ўсё было вострым, нават характар, неўтаймаваны, шальны, рэзка-разумны. Ён мог цэлую гадзіну гаварыць лухту, а потым кінуць нешта такое, чаго і Саламон не сказаў бы.

Яшчэ ў дзевятым класе, - а было гэта ў канцы трыццатых гадоў, - ён трапіў некуды на Інту: хацеў "адарваць Дон ад Расіі". І вось выстаяў, і быў, нягледзячы на ўсе свае Адысеі, такі гарачы, што ў спрэчках яго з Андрэем ад абодвух ляцела пер'е.

Супраць яго Андрэй нічога не меў, а вось Стаўроў... Той і тут адразу пачаў з удаванай - а можа, і сапраўднай - тупасцю пытаць Ірыну "како веруе", плявузгаў нешта пра хазараў і вялікае перасяленне народаў. Вельмі хацелася надаваць яму каленкай пад зад. Аўтобус бы вельмі здзівіўся. Але цывілізаванасць не дазволіла.

Расчараваны Андрэй сеў поруч з Ганнай, даволі далёка ад Горавай, і стаў глядзець у акно.

Дзень быў цудоўны, а дарога зусім хуткаплынная. Паабапал стаялі пустыя і прасторныя, як храмы, лясы, кранутыя лёгкай сівізной трывалага ранішніка (такога, што і за дзень можа не заплакаць). А пад дрэвамі была прыпудраная срэбрам, хрумсткая на выгляд трава. Усё было добра, нават лёгкі пах гною з раскрытага сілоснага капца ў вёсцы, дзе на хвіліну спыніліся.

Цякла нейкая няспешная, вельмі разумная і цёплая размова з Ганнай. Ён не запамятаў з яе амаль нічога.

Толькі аднойчы яны разам прыпалі да шкла, так блізка галовамі адзін да аднаго, што Андрэй адчуў бязважкі дотык пасмы яе валасоў да сваёй скроні.

- Глядзіце, - чамусьці шэптам сказала яна.

Па залітай халодным сонцам руні, быццам закутай у блакітнае срэбра, раскрыліўшы вушы, гнаў зайца палымяны ірландскі сетэр, палымяны, як стручок чырвонага перцу.

І быў у гэтым такі імпэт, такая першабытна-звярыная сіла і радасць, што аж перахапіла подых.

- Як думаеце, дагоніць? - спытала яна.

Ён ведаў, якога адказу чакае яна:

- Ну вядома, не. Куды там. Яму гэта што - размінка. А таму справа жыцця. Дый, не ягоная, не рыжага гэта справа - ганяць.

А Ірына ўвесь час была спакойнай і халоднай, ані разу не затрымала на ім вачэй. Так, суха прабягала позіркам. І ад срэбнага дня і ад яе халоднасці ў душы нараджаўся нейкі лікуючы адчай.

"Д'ябал з ім!"

Потым з ружовага марознага дыму ўзнік Загорск - барвяны, залаты, стракаты, юонаўскі, глазурны, як пернік. Увесь як цяжкаватая, трохі гнятучая казка.

Так, гэта не Нерль. Там усё было - вясна, біццё, тут - усё ўлада, багатая крывёй.

Ірына старалася трымацца далей ад яго. Увесь час далей і ўвесь час поруч са Стаўровым. І ўрэшце Андрэй нават неяк прымірыўся, што яна далёка, што яна не чуе яго пытанняў або адказвае на іх двума словамі, быццам шэлег старцу кідае. Прымірыўся і стаў хадзіць з Ганнай, перабольшана мяккім тонам размаўляць з ёю. А сам, увесь напружаны, адчуваў, што гэты дзень скончыцца грандыёзным скандалам.

Шкадаваў толькі Ганну. Добрая, ружовая, з марозу, яна ўвесь час казала нешта таксама добрае:

- Глядзіце, духаўская царква. Як дзяўчына ў сарафане! І гэты кафляны паясок каляровы... якраз пад грудзьмі. Дзіва!

А над ракай Сергія ў вечным жоўтым зарыве свечак, пад нямоўчны спеў галасоў, схіляла галаву зусім як тыя, тут жа, на рублёўскіх абразах.

- Чуеце? "Нашэсце іншаплямённых"... Словы якія!

І хаця рукою махаць хацелася Андрэю на тое, што вырасла гэтага "Нашэсця іншаплямённых", - ён маўчаў.

Проста быў уражаны тым, што адбывалася. Нядобра гэта было, гульня з людзьмі. Ён разумеў гэта і, аднак, заставаўся пры сваім.

У дзверы плыло марознае паветра. І яго водар, водар заінелых дрэў, мяшаўся з водарам яе цёплай скуры.

...Па дарозе ў рызніцу Андрэй аскандаліўся. Ірына пайшла дамаўляцца ў дырэкцыю. Усе стаялі і чакалі яе. І тут нейкая дзяўчына, вельмі вытанчаная з выгляду, праходзячы паўз яго, упусціла кніжку. Ён нахіліўся быў, але дзяўчына, яшчэ шпарчэй, выхапіла кніжку з-пад яго рукі, сказала скорагаворкай:

- Бач ты, які прэндкі на чужое дабро.

Вакол зарагаталі. Андрэй ледзь не праваліўся на месцы. Каб неяк выблытацца з няёмкага становішча, ён сеў на прыступкі і, калі Ірына выйшла, сказаў басам, але ў наўмысна дзіцячым, дурасліва-слёзным тоне:

- Ірына Сяргееўна, мяне крыўдзяць.

Толькі тут на імгненне сухасць знікла з яе вачэй, і яна спытала:

- Ну што, ну што з вамі? Што?

І нейкая такая пяшчота была ў яе голасе, што Андрэю быццам цёплым крылом правялі па сэрцы.

А потым зноў халодная складка вуснаў. І зноў поруч Стаўроў.

У рызніцы міліцыянер з рэвальверам хадзіў, ледзь не наступаючы ім на пяты, відавочна мяркуючы, што пісьменнікі - гэта мазурыкі і авантурысты. "Неча сумленным людзям кніжкі пісаць!"

А Андрэю ўсё гэта зіхаценне золата было смешным. Ён ведаў: памяць учэпіста збераэжэ ўсё: ваздухі, аклады, цяжкія, як догма, кнігі. Але ўсё золата не варта было аднаго разьблення па сланавай косці работы безыменнага мастака.

І ўсё гэта разам не варта было не толькі яе, але нават аднаго імгнення радасці, якая жыла ў ім, калі ён бачыў гэтую жанчыну.

Скандал усё ж выбухнуў. Здаецца, чаго было Стаўрову чапляцца да Андрэя? А ён прычапіўся. Калі яны абедалі ў рэстаране. Нехта заўважыў, што Грынкевіч "усё з дзяўчатамі". І тады Стаўроў з непрыхаванай з'едлівасцю сказаў:

- Нічога. Ім у яго таварыстве бяспечна.

Грынкевічу было ўсё адно, але Стаўроў увесь час прыдзіраўся да яго. Таму гнеў абудзіўся зноў.

Выпрастаўшыся, - за сталом запанавала раптоўная цішыня, - ён сказаў халодным голасам:

- Шкада, што тут няма тваёй жонкі. А то вельмі хутка твая галава, акрамя даволі рэдкай чупрыны, была б упрыгожана яшчэ тым-сім. Неяк ужо ўгаварыў бы сябе, перасіліў.

Стаўроў апусціў галаву, таму што ўсе маўкліва адобрылі адказ. Але Андрэю гэта было хоць бы што. Добрай была толькі іскра раптоўнай павагі ў вачах Ірыны.

Ён раззлаваўся. Пазбягаў яе вачэй, назнарок пайшоў ад усіх шукаць "таварыша іераманаха" (цьфу!), каб той адчыніў ім трапезную. Ён усё жыццё не любіў "хлебных ідэалаў" і таму - маючы на ўвазе хутчэй стаўровых, чым духам богу віннага іераманаха, - шэптам сказаў Ганне:

- Сволачы! Не верацьь ні ў бога, ні ў д'ябла, не верацьь нават у бессмяротную душу... Сытыя, налітыя крывёй, абыякавыя да зямлі...

У Горавай быў надзвычай тонкі слых. Вось і зараз яна, стоячы наўздалёк, прыўзняла спуджаныя вочы. Але ён не мог ужо ўстрымацца і кінуў:

- І для такіх гнід дойліды будавалі ўсю гэту казку. Падмяніць трапезнай ахвярнасць і адданасць?

Ён назнарок не ўспамінаў пра баявое мінулае лаўры, пра Асляблю і Перасвета, як не хацеў помніць і тое, што сярод стаўровых здараюцца аб'ектыўна сумленныя хаця і абмежаваныя тыпы. Упершыню ў жыцці яму хацелася быць несправядлівым.

...Аўтобус ляцеў, заносячыся на паваротках. А на душы была спакойная адчайная пустэча, як там за акном, дзе ўзыходзіў круглы халодны месяц.

Замёрзлыя ставы адлівалі пад яго святлом, ружовым, як вада.

І па іх лёдзе, паміж безжыццёва чорных вярбовых шкілетаў, ненатуральна імпэтна імчалі па крузе надламаныя цені канькабежцаў. Ганна сказала праўду, усё гэта было падобна на тую кругавую віхуру, што імчала сярод іншых Франчэску і Паоло.

Ад зямлі ўздымаўся туман. Ганна сказала, што гэта на цяпло, і ён згадзіўся, хоць добра ведаў, што гэта наадварот, на холад.

У маўчанні, у дрымотнай цеплыні ён адчуў раптам пільны позірк суседкі.

- Вы кахаеце яе?

Ён маўчаў, і тады Ганна дадала шэптам:

- Яна вартая... Але вам не трэба. Не прападайце вы за ёй, Андруша. Не рвіце абаім сэрца. Яна вельмі нешчаслівая. Але ўсё адно: вам не трэба. Надарвецеся.

Падумала: "А можа, і трэба. Не мне раіць. Я толькі вельмі яе люблю. Вельмі". І раптоўна ўстала, пайшла кудысь на задняе сядзенне.

Ён сядзеў, гледзячы ў акно. Напэўна, усіх вясковых хлопцаў месяц выцягнуў у гэту ноч на вуліцу, Зноў прамільгнула ружова-срэбнае, аблямаванае фантастычна скрыўленымі чорнымі вербамі, люстра става. А па ім беглі, беглі, беглі цені. Не трэба было расплывацца гэтым ценям, не трэба.

Нехта сеў поруч з ім на сядзенне. Андрэй павярнуў галаву і ўбачыў яе.

- Дайце цыгарэту, - сказала яна ціха.

Наступнае з болем вырвалася з яе грудзей:

- Не кройце вы маю душу. Не кройце...

Ён маўчаў. І тады, быццам здаючыся, яна прашаптала горка:

- Заходзьце да мяне... Заўтра... У адзінаццаць...

## **Р а з д з е л XIX**

Халодная ракавіна. Гэта кватэра была проста цудоўнай халоднай ракавінай. Ён пачынаў ненавідзець гэтую кватэру. Асабліва таму, што тут і яна замыкалася сэрцам, быццам самыя сцены гэтага бастыёна маглі абараніць яе ад чагосьці. Яна сядзела супраць яго ля нізкага століка.

- Што ж вы, - сказала яна, - хіба можна быць такім? Нашто? Гэтая поўха Стаўрову, гэтыя словы! Адкуль вы такі?

Андрэй сказаў ціха:

- Мая бабка хварэла на сухоты. Лячыць іх тады не ўмелі. Не дапамаглі ёй аніякія Лазаны ды Ялты... Аднойчы яны з дзедам зайшлі далёка ад дому, і раптам пачала насоўвацца навальніца. Дзед ведаў: дождж смяротны для яе... Ён чатыры вярсты бег, несучы яе на руках. А вы думаеце, што я пакіну апошняе, што мне дадзена, для красуні? Няхай сабе і першай красуні Масквы. Дрэнна вы мяне ведаеце.

Шчырае, вельмі сумнае аблічча жанчыны. Пасмачка бязважкіх валасоў, што падала на лоб.

Яна ўстала, каб пагасіць цыгарэту, міжволі нахілілася над ім, і Андрэй лёгкім рухам адкінуў гэтую пасмачку з яе скроні. Калі яна стала ля яго, ён узяў яе руку і пачаў цалаваць далонь, кісць.

Амаль неўразумелая, зноў без сваёй ракавіны, свайго бастыёна, яна гладзіла яго валасы і гаварыла:

- Каб вы зналі... каб вы толькі зналі, які вы харошы.

Устаючы і абдымаючы яе (у яго круцілася галава, і зямля плыла з-пад ног), ён сказаў:

- Пацалуйце мяне... Што гэта са мною? Як абпаілі вы мяне чымсьці.

Ён не памятаў, што было далей, якія ён словы казаў. Ён толькі ведаў, што яго каханню няма мяжы.

І потым, у прыхожай, цалуючы яе вочы, ён сказаў ёй, каб яна не баялася яго.

- Я свойскі, ручны, - сказаў ён.

Ірына апусціла вочы.

- Такія больш страшныя, - сказала яна.

Потым, неяк асабліва паспешліва і неахвотна, узялася за замок.

- Ідзіце, мой родны... Ідзіце, харошы.

Напэўна, адчувала, што ўсё супраць яе, што ён пяшчотны і ўпарты вышэйшай сілай кахання.

...Цягнуліся дні. Поўныя гэтым, нечаканым. Сам свет стаў незвычайным у вачах Грынкевіча.

Домік у Кудрынскім завулку. Такі домік, у дзверы якога можца было прайсці толькі вузкім прамежкам паміж сцяной і дрэвам, што непамерна разраслося. Самы лепшы домік, бо яна калісь, паглядзеўшы на яго, сказала з усмешкай: .

- Таксама кватэра.

Лядашты студэнт Ліхачоў - асабліва сімпатычны Андрэю. Таму што ўвесь час жартаваў з Ірынай добрымі жартамі. А потым спазніўся на яе лекцыю, разам з другімі. Ішоў апошнім. І калі хлопцы пачалі пакепваць з яго, яна сказала:

- У Тургенева аб гэтым лепш: "Сучок замыкаў шэсце".

Андрэй пасля гэтага ўсё аддаў бы Ліхачову.

Але адначасова ў сэрцы яго нараджаўся неспакой. Ён не мог забыць другога дня снежня, паўзмроку і яе аблічча ў ім. Холад, нейкі ўнутраны холад пакояў. Ці там ёй было жыць? Яе дом павінен быць светлым, вялікім домам, шырока адкрытым сонцу і вятрам. Каб вакол былі добрыя людзі. Каб з гэтага дома, калі ў ім не працуюць, даляталі спевы, музыка, галасы дарагіх і адданых сяброў.

І нічога гэтага. Глядзяць удваіх у вузкае акно. Яму было шкада гэтага бясконца моцнага-моцнага і бязмерна слабага ў чымсьці чалавека. Ён адчуваў, што сам ён моцны якраз у тым, у чым яна слабая, у сваёй пагардзе да ўсякай сутнасці. Ён таму і кахаў яе, што адчуваў: разам з ёю іх ніхто не мог бы адолець.

Адзін у адным яны здабылі б такую неадольную сілу, што іх хапіла б навек.

Аднолькавая сіла шчасця і шкадавання рабіла яго нервовым. Ён і сам ведаў, што мэтанакіраванасці ў ім ані на шэлег, што гэта нікому не можа падабацца. І пакутаваў гэтым.

Магчыма, таму 12 снежня, якраз пасля лекцыі прафесара Кальцова, выбухнуў скандал. Кальцова любілі. Зямляк Андрэя, нізкі, каржакаваты, з чырвоным, як спечаным, тварам і сівымі валасамі, ён чытаў "Псіхалогію творчасці". Праўдзівей, не чытаў, а бязлітасна-лагічным ланцэтам аналізу рассякаў кожную думку, кожны вобраз. І пры гэтым быў вельмі палкі, рагатаў, граміў, саркастычна здзекаваўся, рыкаў, як леў, а ў гневе супраць апанента так наліваўся крывёю, што ставала страшна.

У той дзень ён граміў Аксінню з "Ціхага Дона".

- І вось, калі Грыгорый абліваўся крывёю на фронце, яна здрадзіла яму. Вядома, мужскі юр дае права называць такую жанчыну абаяльнай. Але розум яе рабскі, які слепа ідзе за плоццю. А жанчына - гэта і каханка, і маці, і сяброўка, і Асоба. Сляпую цягу трэба ўтаймоўваць, іначай - сусветны пажар і попел распусты!

І нізкім жорсткім голасам дадаў:

- Нават у каханні сваім спачатку яна толькі саступала, прымервала.: а што дасць гэта каханне. Сцяпан быў, але ён быў быдлам. І яна абрала каханне. Пераканаўшыся, што не губляе, а набывае - пайшла на гэта. Заўсёды каханне таго, які пакахаў спачатку - мацнейшае, а ў таго, хто пакахаў другім - больш эгаістычнае і незалежнае... Бо чалавек, будуючы ідэал свайго кахання, знаходзіць больш або менш падобную да яго і кахае больш за ўсё тое, што стварыў у сваім уяўленні. А той, хто пакахаў другім - кахае больш эканамічна, бо адкрывае паступова і знаходзіць толькі тое, што ёсць... І чым Асоба, што пакахала першай, мацней, тым недасяжней ідэал, створаны ёю.

Пакуль Андрэй раздумваў і ўнутрана не згаджаўся з некаторымі думкамі Кальцова, той перайшоў на праблему гуманізму і рэвалюцыі, на тое, што ў прынцыпе суіснавання чалавек бліжэй за ўсё падышоў да вырашэння гэтай праблемы.

- Мала таго, што мы чырвоныя і белыя, захад і ўсход, але забіваць адзін аднаго мы не намераны. Мы непрыяцелі, але гэта не азначае, што, змагаючыся з ідэяй другога, трэба знішчыць носьбіта той ідэі... А ў змаганні галоўнае - аб'ектыўныя факты! Погляд чалавецтва! А чалавецтва - гэта яго прагрэсіўная частка!

Андрэй пахітаў галавою.

- І найлепшая канстытуцыя Асобы - тая, якая спрыяе поступу грамадства...

"Не так сказаў, - падумаў Андрэй. - Найлепшая канстытуцыя псіхікі - гуманізм. Яму часам зусім не спрыяюць абставіны, якія пазбаўляюць яго магчымасці ўплываць на поступ грамадства. Але што з таго, калі да яго імкнуцца, калі аб'ектыўна менавіта ён рухае чалавецтва наперад. Хіба той самы Грыгорый мог спрыяць поступу грамадства? Але ён чалавек. Таму што адзін ён у цэлым рамане супраць разбою вайны, адзін ён верыць, што кожны рух наперад павінен быць максімальна гуманным. Ужо тады. І не дэкларацыйна, а на самай справе. І таму ён - чалавек-герой, чалавек-пакутнік. Ламалі яго двое жорнаў, біўся ён насмерць з падобнымі сабе. І ўсё ж аддаў сэрца Чалавеку. І менавіта таму мы любім яго. Не як прадстаўніка саслоўя ці нацыі. Як Чалавека, якімі ў вельмі далёкай будучыні павінны зрабіцца ўсе".

Кожны думаў аб гэтай лекцыі па-свойму. Думаў і тады, калі Кальцоў пайшоў і пачалася лекцыя Горавай. Андрэй нават не памятаў, у сувязі з чым яна перадала змест апавядання нейкага заходняга пісьменніка... Было гэта нешта накшталт гогалеўскай "Шынелі": жыў сабе ў гарадку стары, які ні ад каго не атрымліваў лістоў. Ну і гэтак далей. Шкада было гэтага старога - слёзна.

І тут аўдыторыя завіравала. Першым ускочыў востры Харунжы і пачаў раўці дубовым голасам:

- Трагедыя можа быць толькі з духоўна вялікім чалавекам!

- У акакіяў акакіявічаў гэта горш, - кінуў Андрэй. - Вялікі і сам за сябе пастаіць.

- Пастаяў, па-твойму, Грышка Мелехаў? З гарачкі ўсе несправядлівасць чынілі. А на яе адказвалі таксама несправядлівасцю. Вось і Грышка... Скруціў галаву - вось і ўсё.

Андрэй быў яшчэ спакойны. Толькі ўзбуджанне нарастала недзе ў душы:

- Пабілі, бо ведаў: барацьбу трэба весці па-джэнтльменску, а не хапацца за ўсялякае слабае месца, як хтосьці там - заўважце, не д'ябал, - у "Гаўрыліядзе"... А час быў не той. Кожны, хто не змог быць ні белым, ні чырвоным, быў біты з абодвух бакоў... "Ах, ты майго дарагога госця - на і твайму". - "Дык ты майго найдаражэйшага госця - хай і твайму перападзе". Былі, вядома, і дробныя, тыя хаваліся ад тых і ад другіх. А гэты быў сіла... І час паказаў, што праўда на яго баку... Людзі падумалі, дый сказалі Мішку Кашавому: "Хопіць, Міша.

Парубаў, і хопіць. Гэта табе не капуста, а людзі. Ты вунь вінаватых пацяпаў - узяўся за добрых, бо разумеў: пакінеш цяпаць - будзеш непатрэбным. Таму ты, Міша, і прыдумаў тэорыю аб абвастрэнні класавай барацьбы. Дык вось, ідзі ты, Міша, разам са сваёй тэорыяй на пенсію, а мы пачнём крыху думаць, хто цябе хваліў, каму час клубніку разводзіць. Што ты там нахамутаў..."

Харунжы ўспыліў:

- Сам супярэчыш сабе. Пры патуранні тваіх маленькіх вырастаюць гітлеры!

- Яны вырастаюць патураннем дужа сквапных і багатых. І ўціскаюць малых, Толя.

Толька развёў дрыжачымі рукамі:

- Ну, а каб ты пры Гітлеру жыў? Галовы сякуць вакол, а ты стогнеш аб адзінках, што не атрымліваюць лістоў. Так?

- Не трэба, Толя, - усё яшчэ спакойна сказаў Андрэй. - Я б не стагнаў, я б сам, першы, страціў галаву. Я таксама не з дробных і ведаю, што права здзекавацца з гонару і сумлення чалавека ні ў каго няма. І калі пачынаюць рабіць такое - чалавек, грамадства мае права ўзяцца за зброю і паўстаць супраць гэтага...

Ён памаўчаў.

- Але ты забываеш, што гітлеры сякуць галовы адзінкам, а астатніх прыдушваюць жахам і пагардай. І мне, чалавеку не зусім дробнаму, шкада тых, хто не можа заступіцца за сябе. Я шкадую і тых і другіх. Усе людзі.

- Нявартыя такія людзі шкадавання! - страсна кінуў Толька. - Страшна ім, баяцца яны зброі - ну і д'ябал з імі!

- Навучацца з часам, - сказаў Андрэй. - А ты, Толька, накшталт Авакума. Ніякай памяркоўнасці. Дай табе волю - ты б сам усіх нязгодных у Пустазерск загнаў і спаліў... І ўсё ж я люблю і цябе, Толька... Ты непадкупны. І ты з часам зразумееш.

Харунжы стаяў увесь чырвоны і гнеўны:

- Шкадава-аць, - і раптам выплюнуў: - Ідыёт ты! Князь Мышкін!

Аўдыторыя абурана загудзела. Тыя гады былі ўрадлівыя на нервовых людзей, ніхто асабліва й не здзіўляўся. Палоны, войны, блакады, лагеры, пажары - усё гэта капілася ў сэрцах і нервах людзей, каб часам выбухнуць.

- Дзякуй, Толенька, - з'едліва сказаў Андрэй. - Дзякуй, родны.

Яго пачалі ўмаўляць, каб ён не крыўдзіўся.

- Крыўдаваць на ўсіх людзей - лепей ужо з каменем на шыі ў вір, - сказаў ён.

І толькі тут ён, забыўшыся на ўсё ў запале спрэчкі, успомніў пра Ірыну і зірнуў на яе. Яе вочы, звернутыя на яго, ззялі нейкім асаблівым, цёплым агнём. Потым яна апусціла павекі.

- Вы не зразумелі яго, Толя, - сказала яна. - Ён укладваў у слова "шкадаваць" зусім другі сэнс. Вы ж ведаеце, слова "любіць" трапіла ў літаратуру памылкова. У кандовых вёсках і дагэтуль "любіць" азначае "любіць па гумнах". А калі чалавек з такой вёскі вельмі кахае жанчыну, ён яе "шкадуе". І чалавека таксама "шкадуе". Нічога ганебнага для жанчыны і чалавека тут няма... Напэўна, і на Беларусі так.

- Так, - сказаў Андрэй.

І тут Толька, быццам атрымаўшы падмацаванне ад адной назвы "Беларусь", зноў рынуў у казацкую атаку:

- Гуманіст! Маленькія людзі! Шынялі! Сорам стагнаць аб шынялях. Ты пра сваю Беларусь успомні! Два мільёны дзвесце тысяч з нечым людзей загінула.

І тут Андрэй упершыню ўзвысіў голас. Крыўда агнём разлілася па шчоках:

- Так. Бухгалтэрыя досыць дакладная. Два мільёны і дзвесце тысяч з нечым. І тое "з нечым" - гэта, прыблізна, насельніцтва майго горада. І сярод гэтых мільёнаў не ўсе былі вялікімі людзьмі. Былі і маленькія, што навучыліся. Быў сярод іх і мой брат. Ён не пісаў апавяданняў, як ты. Ён ніколі не думаў пра палітыку. Пра шынель ён, праўда, таксама не думаў. Але я памятаю, як ён збіраў на матацыкл. Шынель - даведзены да абсурду сімвал... Брат мой збіраў на матацыкл... Нічога больш. Потым, пэўна, узбіўся б і на машыну. Ён любіў. машыны. Цяпер ён ляжыць недзе там... Ён, ці бачыш, гнаў праз зону абстрэлу машыну з цяжка параненымі. Многія з іх выжылі. А ў кабіне знайшлі дзесяць прабоін... І жонка ў яго была недалёкая жанчына: праца, ды кіно, ды зрэдку госці. Прыгонных, як у прадзедаў, у нас не вялося. Заводаў - таксама. І вось гэтай жанчыне соллю пасыпалі ў гестапа раны на спіне. Той соллю, што яна несла партызанам у лес. Яна толькі і здатная была, што насіць соль, бо яна да смерці баялася стрэлаў... Там яна маўчала... Яна вельмі баялася стрэлаў і вельмі любіла кіно...

Вусны яго - ён ніяк не мог авалодаць імі - дрыжалі.

- І гуманізм вось для такіх. Каб і яны, каб усе сталі вялікімі, бо кожны аднолькава дарагі для зямлі і для мяне. Нават той, хто любіць кіно, баіцца стрэлаў і пакуль што не трапляў у гестапа.

Андрэй сеў, адвярнуўшыся да акна. У цішыні, што гнятуча навісла над аўдыторыяй, ён пачуў голас Горавай:

- Хопіць. Даспрачаецеся потым. Дык вось...

І потым ён ужо нічога не чуў, паглыбіўшыся ў свае думкі. Снег валіў за вокнамі. Потым перастаў. Кожная галінка на дрэвах была ўкрыта гурбачкай. Пэўна, калі расстрэльвалі партызан, кроў была вельмі чырвонай на такім снезе. Радзіма, чырвонае на белым, кроў на снезе.

Раптам вельмі захацелася туды. З асаблівай пяшчотай ён пачаў уяўляць ліловатыя зарасці зімніх хмызнякоў на круглых узгорках, пахучую ваду ў палонцы,ваўчыны след па загуменні.

...Ад успамінаў яго адарваў толькі зменены тон Ірыны. Пэўна, адказвала камусьці на нейкае пытанне "аб жыцці". Хлопцы любілі такое.

- Ну, гэта як для каго, - казала яна. - Вось я, напрыклад, чытала нядаўна раман. Ён - амерыканскі мастак. Яна - псіхіятр з Парыжа. Пакахалі. Так, як рэдка бывае. Што рабіць яму без скалістых гор, без узараных прэрый, без мамантавых дрэў? І што рабіць ёй без Парыжа, без клінікі, без справы свайго жыцця? І, як ні стараюцца, каханне гіне, бо кожны не можа даравацъ другому нежадання ахвяраваць сабой.

Яна не глядзела на яго, алё Андрэй разумеў. Адзін з усіх. І сэрца яго ўпала.

- Як гэта? - неўразумела абурыўся Баранаўскас.

Ірына ўзняла на яго вочы:

- Так. Уявіце сабе, што... я пакахала. Упершыню. Магло ж здарыцца, што раней не давялося, Але ён далёка адсюль вядзе сваю працу. А я таксама не магу жыць без працы, і яна магчымая толькі тут. Тут саборы і фрэскі, пра якія я пішу. Тут мая работа выкладчыка. Тут мае бібліятэкі і музеі.

- А ён дзе? - не зразумеў Харунжы.

Андрэй, гледзячы на Ірыну, дапамог ёй:

- Скажам, на Чукотцы.

Жэстам падзякаваўшы яму, яна сказала:

- І я не магу ехаць з ім. І крах спасціг маё каханне. Каханне маленькага чалавека.

"Ага, яны зноў гаварылі пра тое ж, - падумаў Андрэй. - Так, пра тое ж і не пра тое ж... Недарэчныя разважанні!"

І менавіта таму ён дачакаўся, пакуль усе пойдуць. Менавіта таму ўпарта сядзеў і слухаў яе бясконцыя размовы з завучам. Менавіта таму падаў ёй зялёную літоўскую хустку і футрачку, а потым выйшаў з ёю на сляпуча белы снег, які яшчэ не паспелі заплямiць сятчатымі слядамі галёш.

- А на мне гэтая хустка. Я не хацела сёння ісці з вамі.

- А што хустка?

- Ды я ў ёй на матрошку падобная.

- Вы ва ўсіх уборах добрая.

Чысты, бязмерна добры стаяў вакол снег. Сляпучы. Нявінны. І нават пахнуў ён вадкім водарам свежаразламанага сланечнікавага сцябла.

- Хачу кудысьці на снег, дзе дрэвы.

- У Сакольнікі?

- Далёка.

- Ну, тады на выстаўку. Там ёсць цудоўныя далёкія алеі. Па іх зараз ніхто не ходзіць.

- Згода, - кіўнула яна.

Ён махнуў рукою зялёнаму вочку, што бегла вуліцай. У таксі яна маўчала. Потым сказала, маючы на ўвазе Харунжага:

- Як Рэмарк. Толькі сябе шкадуе.

- Так, - сказаў Андрэй. - Гэта не Дастаеўскі: "прыйдзіце, п'яненькія..."

Глянуўшы на яго пушыстымі вачыма, яна сказала:

- Я думала, вы мяккі і добры.

Бачыла яго цёмны профіль. Потым доўгія вочы, што цяжка зірнулі на яе. Потым рот, што вымавіў:

- Добрыя і бываюць заўсёды цвёрдымі.

Сам ён у гэты час думаў аб тым, што жыццё - радасць. Як раптоўнае азарэнне, як цёплае залатое святло, пралілася на яго гэта думка. Была яна, тая, што поруч, а паратунку не было, ды ён і не хацеў яго. Ад шчасця, хай нават пакутнага, не ратуецца ніхто.

І таму ён увесь час папраўляў ёй пад хусткаю валасы (ёй бы вельмі пасавала квяцістая, кілімовая хустка). А яна, сама схіляючы да яго галаву, усё патрабавала:

- Не глядзіце на мяне, такую.

Ды хіба ён мог?

На выстаўцы яны селі ў мікрааўтобус і паехалі пад заснежанымі дрэвамі ў зону адпачынку, зусім пустую цяпер. Там была спрадвечная ціша. Павільёны пад дрэвамі былі па

вушы захутаны ў снег. Толькі аднойчы праехала маленькая снегаачышчальная машына. І зноў ні душы.

- Сёння раніцай я зусім была вырашыла не бачыць вас... І вось... не магу...

- Вам нельга ад мяне.

- Ну вось бачыце... Я ж з вамі...

У Андрэя ад гэтых слоў радасна падскочыла сэрца. І ён здзівіўся, бо гэта было як у дзяцінстве. І менавіта таму ён ведаў: гэта сапраўднае. І менавіта таму баяўся.

А дрэвы былі заснежаныя. І ён моцна патрос за сук клёна, пад якім яны ішлі. Іскрамётны, трохі нават звонкі снег сухім пылам пасыпаўся на іх з галін.

- Слухайце, - сказаў ён. - Спявае. Слухайце, давайце я вам сняжок за каўнер запхну... Або лепей вы мне...

Яна засмяялася і раптам зірнула на яго ногі.

- У туфлях. Ану марш з цаліку на сцежку.

- А вы?

- А я ў боціках. Я пайду тут.

Але ён так жаласна і камічна маліў яе не пакідаць яго, што яна згадзілася.

Крочылі сцежкай у заснежаным свеце. Алеі вялі кудысь. Ад марозцу пабялела пасмачка яе валасоў пад хусткай. Адчуваючы нават праз футру цеплыню і акругласць яе рукі, ён шэптам сказаў:

- Вельмі кахаю вас.

- Вы прыдумалі гэта, - яшчэ цішэй сказала яна.

- Не, - амаль бязгучна запярэчыў ён. - Ведаеце, усё адно вочы мае і мае вершы нікому не патрэбны, калі няма вас.

І гэта было сказана так упэўнена, што яна змоўкла. Потым сказала чамусьці:

- Ведаеце, чаго не хапае на гэтых сініх дрэвах?

- Ведаю. Снегіра. Чырвонай іскры.

- Так.

Ля аднаго з павільёнаў стаялі нейкія захутаныя паўднёвыя дрэвы. Захуталі іх добра - кожная галіна была, як падушка - ды яшчэ абшылі зверху бліскучай, падобнай на скуру, цёмнай цыратай. І абое адначасова падумалі, што гэтыя дрэвы падобныя на марсіянскія кактусы.

- Яны ловяць людзей, - страшным шэптам сказаў Андрэй.

- Не, - сказала яна, - яны да іх абыякавыя.

- Гэта страшней, - згадзіўся ён.

І яна зразумела яго. Павярнулася, жаласна спытала:

- Ну што б вы хацелі, што?

- Выходзьце за мяне замуж.

- Толькі?..

- Так.

- Андруша, - сказала яна пасля паўзы, - учора я чамусьці дала згоду на аперацыю. Мне раптам вельмі захацелася жыць. Не ведаю чаму. У студзені еду ў міжнародны шпіталь, у Вену. Калі не паеду - абяцаюць год жыцця. Таму не трэба пакуль пра гэта.

- Менавіта зараз і трэба, - сказаў ён. - Вы вернецеся адтуль здаровай, і мы будзем мець права адзін на аднаго. Таму - зараз.

- Ды нашто я вам, нашто я вам такая?

Андрэй з цяжкасцю разляпіў вусны:

- Ведаючы пра гэта, я яшчэ больш, яшчэ больш аддана буду кахаць вас. А жыць, не ведаючы вас, - канец.

- Жылі ж раней?

- Хіба гэта было жыццё?

Ён узяў яе за плечы:

- Ведаеце што? Гэты герой рамана, пра які вы сёння расказвалі, быў ідыёт. Яму варта было б, пры ўсёй нелюбові да лічбаў і разлікаў, сесці за стол і даведацца, колькі каштуе дом у прадмесці Парыжа або Нью-Йорка і машына, на якой гераіня магла б ездзіць у сваю клініку... А ён... загубіў вышэйшае на зямлі.

Яна глядзела на яго небывала сур'ёзна. Потым павяла вачыма ўбок і зноў унікла прамога адказу.

- Глядзіце, дзяцел.

Дзяцел бегаў па мядзянай сасне і стукаў.

- Чаго гэта ён?

- Дастае розную дрэнь з-пад кары. Абедае.

Уздыхнула здзіўлена:

- Божа, каб гэта нам так дзень пастукаць - потым вядро пірамідону спатрэбілася б.

А Андрэю было страшна за яе і шкада гэтага мілага, смешнага дзятла:

- Не трэба аб ім. Я ведаю, я, можа, горшы за іншых. Я, можа, нават сярод нашай брацii не з самых лёгкіх людзей. Але вас ніхто так не будзе кахаць.

- Жывіце для іншых. Хіба магу я строіць нейкія планы, псаваць вам жыццё.

- Мне абрыдла па кроплі праліваць на іншых суцяшэнне і пяшчоту. Я хачу аддаць вам усё. Кідайце гэты халодны дом, там як пройма па нагах цягне. Вам цяжка ў ім.

- Адкуль вам ведаць?

Сціснуўшы сківіцы,ён сказаў:

- Я настроіўся на вашу хвалю. Я заўсёды ведаю, калі вам бывае цяжка... Я нават ведаю, што ў дом гэты амаль не прыходзяць сябры мінулых год. І вам часта самотна. Так?

Яна глядзела амаль перапалохана.

- Так, - сказала яна.

- Ну вось. А хіба каханне гэта тое? Каханне - гэта як старое чэмбала. Яго на гару не выкінеш, як непатрэбшчыну. Яго любяць нават праўнукі за тое, што яно грэла дзядоў.

Абняўшы яе, ён спытаў:

- Дык як?

- Не ведаю.

- Забіце мяне, але я не магу без вас.

Прынікла галавою да яго грудзей:

- Я... не збіраюся вас забіваць. Прыходзьце да мяне сёння. У шэсць.

- Чакаць мне вас? Працаваць мне для вас?

- Чакайце, - выдыхнула яна. - Працуйце.

Прыціснуўшы яе да сябе, адчуваючы, як яна дрыжыць у яго руках, зусім як дзяўчынка, ён цалаваў на марозе яе халодныя вочы.

## Раздзел XX

Яны сядзелі ў адным глыбокім-глыбокім крэсле... У прыцемку пакоя лямпа ледзь прабівала праменні праз глухі абажур; са сцен, як праз цёмную ваду, глядзелі на іх размытыя твары. А за акном, за яго замарожанымі шыбамі, стаяў халодны поўны месяц і таксама глядзеў на іх праз зарасці алмазных пальм, зор, кветак дзівоснай чаканкі па срэбру.

- Ну што, мой родны, што, мой хлопчык?

Такой пяшчоты ў яе голасе ён яшчэ ніколі не чуў. І яго рукі, што дагэтуль падтрымлівалі цяжкі вузел яе валасоў, цяпер слізганулі ўніз і абнялі тонкія плечы. Яны былі такія жаданыя і маленькія і тонкія, гэтыя плечы, такія тонкія і маленькія і жаданыя былі яны...

- Кветка з шэраню, - бязгучна сказаў ён, глёдзячы на яе закінуты твар. - Месяц мой Месяцовіч... Пальцы мае.

Яму здалося, што яна вось-вось расплачацца.

- Пойдзем адсюль, - горача і ўмольна сказаў ён.

- Калі б у мяне, хоць пяць год... Пайшла б не думаючы, адразу.

- Буду чакаць. Усё адно не пайду. Няма ад вас дарогі.

- Гэта па-беларуску?.

- Гэта па-чалавечы, - ціха і ўладна сказаў ён. - І вы - лепшая за ўсіх.

Грудзі яе сутаргава пашырыліся, уся дрыжучы, яна адкінулася ад яго і абвяла дзікаватым позіркам сцены, лікі на іх, італьянскі стол. Словы, якія яна сказала потым, вырваліся, здаецца, з самага, сэрца:

- Андруша, мілы... Як я сябе ненавіджу за ўсё гэта, - і павяла слабай рукой: - Як ненавіджу.

- Не смейцё. Вы... дарагі чалавек. Ёсць вы ў свеце - і свет не пустыня.

У яго дрыжалі рукі, звінела ў галаве. А яна гладзіла яго валасы.

Дзіўна, але ён, абдымаючы яе ўсю, не адчуваў да яе ніякай цягі. Толькі ўсхваляванае заміранне ў грудзях і неймавернае шчасце, што яна поруч. Быццам была забарона на ўсё астатняе, пакуль месяц не ўпадзе на іх першым промнем. І гэта не здзіўляла яго.

Яе пашыраныя вочы глядзелі на яго мякка і спачувальна:

- Дык вы так мяне кахаеце?

Андрэй увесь здрыгануўся. І тады, з вільготнымі вачыма і небывалай ласкай у голасе, яна сказала:

- Ну што мне з вамі рабіць, мой родны. Відаць, нічога не зробіш.

Прыклала вузкую далонь да яго грудзей, злева, і сказала:

- Бедны... Ну, ідзіце ў той пакой... Ідзіце.

...Ужо лежачы на тахце ў суседнім пакоі, ён з заміраннем сэрца чуў гукі, што даляталі з гардэроба. Упаў туфель... Не, нешта здарыцца... Нешта перашкодзіць... Другі туфель... Гэта немагчыма... Шолах сукні.

А потым грудзі яго перарывіста ўзняліся. У цемры плыло насустрач яму нешта празрыстае, невыразнае ў косых праменнях месяца.

Прывід набліжаўся. І ён працягнуў руку ў цемру, насустрач яму з такім лікуючым чаканнем, што, здавалася, сэрца разарвецца ад шчасця.

Нахілілася. Дакранулася да яго нечым абвалакальным, як воблака. А потым прылегла, і Андрэй адчуў, як пабеглі па яго цёплым плячы яе валасы, як падаліся яе грудзі, адчуў усю пяшчотную прахалоду яе бязважкага цела аж да маленькіх, цвёрдых пальчыкаў ног.

Ён павярнуўся на бок і паклаў руку ёй на спіну. І ад гэтай прахалоды ток пабег па яго целе.

Убачыў блакітны, трохі больш за ўсё астатняе асветлены нос, цёмныя прадонні насцярожаных вачэй і пацалаваў...

...Свежы, як падснежнік, смак яе рота.

Адчуваў яе на ўсю даўжыню яе вузкага і моцнага цела, бачыў снежныя грудзі. І, адразу за мурашкамі ад яе прахалоды, усё нутро яго пакутліва пацягнулася да яе.

Быццам шукаючы ў яго паратунку, уся дрыжучы, яна прыціскалася краёчкам вуснаў і скроняй да яго пляча, і тады ён абняў яе так, быццам хацеў усімі грудзьмі ўвайсці ў яе грудзі.

Дрыжалі на шыбах бліскучыя іскры, і снежная папараць схілялася на іх, і такога не было ніколі і ні з кім, а яна была як першая і пажаданая больш за ўсіх.

...Уся цёплая, яна ляжала ў яго абдымках. Рукі лашчылі яго галаву. А ён у нямой і бясконцай удзячнасці цалаваў гэтыя рукі, і яны, ды яшчэ грудзі, уздрыгвалі пад яго пацалункамі. І яму здавалася, што гэтага больш ніколі не будзе, і таму ён спяшаўся.

- Ніколі ні з кім? - шэптам спытала яна.

- Ніколі.

- І я ніколі. Слухай таямніцу.

- Ну.

- У мяне агіда да мужчын. Яны занадта многага хочуць.

- А я?

- Ты не. Ты заўсёды робіш тое і так, як я хачу.

Цалавала яго. Кароткія пацалункі ў куточкі вуснаў і ў плечы, ад якіх яму хацелася плакаць, як юнаку.

Ён не ведаў, колькі мінула гадзін, але ён з захапленнем і болем адчуваў, як сплывае час. Быццам жадаючы абараніць яе ад цемры, ён трымаў яе ўсю моцнымі далонямі, як апошнюю надзею сваю. І яна, як разумеючы гэта, супакойвалася. Уздыхнула, прынікаючы да яго. Андрэй убачыў, як, дрыжучы, пачалі змяжацца яе веі. І тады ён прыпаў вуснамі да яе скроні - зусім блізка, каб яна адчула цёплы подых і заснула, як гэта робяць дзеці.

І яна заснула. Абапёршыся на руку, ён доўга глядзеў на яе. Гадзіннік мякка прабіў дзве. Блакітнае месячнае сяйва падала на закінуты, з выразам смяротнай мукі і шчасця, твар спячай.

Ён глядзеў доўга. Ірына ледзь чутна прастагнала ў сне. І тады яму здалося раптам, што яна памірае. У жаху ён прынік вуснамі да яе рукі, і адразу гэтая рука сутаргава працягнулася да яго і супакоілася, дакрануўшыся да яго грудзей.

- Дзякуй богу, - сказала яна. - Мне прыснілася, што гэта сон.

Яна змежыла вочы:

- Мне падабаецца, як ты робіш са мною. Калі мне лепей за ўсё - мне здаецца, гэтаму не будзе канца... Сэрца разрываецца, як у птушкі над морам... Ад радасці... А бераг бачны, але бясконца далёка... Пацалуй мяне. Тут. Я вельмі кахаю цябе.

Ён пацалаваў, правёў вуснамі ніжэй і прынік там, дзе шыя пераходзіць у грудзі, да ямкі.

- Тут жыве душа, - сказаў ён. - Вось я дакранаюся да яе вуснамі.

- Трымай іх лепей каля майго рота, каб часам яна не вырвалася, калі ты...

Гэта было нейкім насланнём. Пакой пачынаў круціцца, а потым знік некуды, і ўсё запаланіла срэбнае месячнае святло.

- У цябе зараз месяц быў паўсюль? - спытала яна.

- Паўсюль.

- І пакой знік? І ўсё было срэбным?

- Усё было срэбным.

Яна ўздыхнула:

- Усё срэбнае-срэбнае. Я памірала тройчы.

- І я.

- Нашто ты так?

- Я баяўся хоць на хвіліну выпусціць цябе з рук. Баяўся, што знікнеш.

- Вось як гэта, - шапнула яна. - І падумаць толькі, што так позна...

Ён схіліўся над ёю і дакрануўся вуснамі да яе дрыготкіх вей. Веі былі мокрыя.

- Цябе павінны вельмі любіць, - сказала яна. - Я ніколі не чула, каб нехта пра кагось гаварыў з такой пяшчотай, як пра цябе... Некалькі чалавек... А твой Яніс так хваляваўся, што запаліў цыгарэту з фільтрам не з таго канца... Сказаў, што адзіны чалавек, з якім я буду вельмі шчаслівай, - гэта ты. Ён любіць цябе. Напэўна, як усе.

- Мяне многія не любяць.

- Жанчыны. Тыя, што не з табой. Гэта нічога. Усё адно знойдуцца для цябе лепшыя, чым я.

- Нашто ты мучыш мяне, - казаў ён, цалуючы яе. - Лепшых не будзе.

- З цябе збудзецца паэт. І я, калі дажыву да старасці, буду радавацца.

- Я ім буду... Калі ты будзеш са мной. Тады ў мяне на ўсё хопіць сілы...

- Ты стаў лепшы. Раней у вершах была гэткая венявіцінаўская незасмучанасць, а зараз мора пачуццяў. Яго баішся... Як і ў жыцці. Вось тут.

У забыцці ён вадзіў шчакою па яе абліччы і грудзях:

- Ты прыўкрасная. Каб ты толькі была са мной. Я быў бы табе вельмі верны, вельмі пяшчотны... да канца.

- Я ведаю. Жанчыны заўсёды ведаюць, што іх чакае з мужчынам. Толькі часам ашукваюць сябе... З табою - я ведаю...

- А мяне не ведаеш?

- Я ведаю. Вясной, калі растане снег, - першая песня жаўранка. Яшчэ непрыгожая, яшчэ нязвонкая, але яна - першая... Жаўранак ты мой.

Лепей за яе вочы нічога не было на свеце.

- Так лёгка мне, светла, - бы ў забыцці казала яна.

І раптам прыўзнялася.

- Абяцай мне, што ніколі не здымеш са сценкі майго падарунка.

- Абяцаю.

- Я табе падару, рэпрадукцыю "Венеры" Бацічэлі. Усе кажуць, што гэта я... Праўда ж, гэта можна?.. Што б ні здарылася потым - гэта ж толькі фрагмент карціны.

- Добра... А ты ведаеш, на каго падобны я?

- Не.

- Хлапчук з карціны Пінтурык'ё. У дзяцінстве зусім быў падобны. У нас да вайны вісела гравюра з гэтай карціны. Гэта быў мой асабісты вораг. Я яго бачыць не мог і чыніў яму розныя паскудствы. Маці ўсміхалася: "Дурнік. Вы ж падобныя..." А мне дзяліць увагу з нейкай пачварай - вышэй сіл было... І вось я, калі нікога не было, зняў гравюру са сценкі і ўчыніў над ёй літаральнае аўтадафе: спачатку чвартаваў, а потым спаліў.

- А што маці сказала?

- А маці ўбачыла вынік экзекуцыі і кажа: "Не дзіцёнак, а гун нейкі. Вандал дзікі". А мне было добра: нікога трэцяга між

намі. Ды і яна... Пяшчота яе была пасля гэтага асабліва ласкавай. І вочы... здзіўлена-ўважныя.

- У яе якога колеру валасы?

- Як у мяне.

- Значыцца, цёмна-блакітныя... Няўжо ты раўнівы?

- Ды не. Пасля гэтага я ніколі нікога не раўнаваў так, як яе.

- Я люблю яе, - сказала яна.

- І я. Я люблю яе і цябе... Любі мяне хоць трошкі.

- Я нічога не ўмею рабіць напалову, - ціха сказала яна.

Запанавала маўчанне з яго бязгучнымі пацалункамі.

- Слухай, - нейкім дзіўным глухім голасам сказала яна, - калі я памру - ты будзеш памятаць мяне?

- Не смей, дурненькая мая, - сказаў ён.

- А я абавязкова. Нават там. І я згубіла два месяцы!

- Маўчы, не трэба, - маліў ён.

- Бачыш, я ўвесь час памятала пра цябе. Хацела, каб табе было добра. Не хацела, каб ты не помніў мяне вось так.

Каб не чуць гэтых слоў, не адчуваць боязі за яе, ён закрыў ёй рот сваімі вуснамі, прыціснуў да сябе, як нешта самае дарагое, што вось-вось страціш, і забыўся ў пацалунках і зіхоткіх іскрах месяца, якія былі вакол.

...Потым, праз сон, ён адчуў лёгкія пацалункі, якімі яна асыпала яго рукі і плечы.

- Уставай, уставай, любы. Скора пачне днець.

Ён расплюшчыў вочы. Пакой тануў у паўцемры. Аблічча глядзелі са сцен не такія, як вечарам, і ў сэрцы была заспакоенасць і пяшчота, як быццам пачыналася новае жыццё. Святло месяца перапаўзло ў кут ля акна. Іскры гарэлі толькі ў самым кутку верхняй шыбы.

- Стой, не цалуй маіх плячэй.

- А я не магу.

- Праўда, я добрая гаспадыня?

- Не магу. Потым...

Святло знікла. Яны выпілі віно і каву на краі ложка... У пярэдняй яна, разгладжваючы рукой паліто на яго грудзях, сказала:

- Ну вось. Як быццам ты муж і я цябе праводжу на работу.

- І так будзе заўсёды.

Яна схіліла твар.

- Так... заўсёды.

Андрэй глядзеў на яе. Такая кранаюча маленькая стаяла яна перад ім, такая каханая ў гэтым сваім халаціку, што ён тоўста абняў яе праз паліто, і ўся яна схавалася ў яго абдоймах.

Гэта было так, як ніколі, і таму ён стаў перад ёю на калені, прыціскаючы да сябе, і схаваў твар у цёплай тканіне. Яна ўзяла яго за скроні:

- Устань з каленяў, мілы. Прашу цябе, вельмі.

- Табе не падабаецца?

- Вельмі. Але не трэба... Не ляжы ў нагах. Табе нельга ляжаць ля ног.

Узняўшыся, ён зноў схаваў яе ў абдымках. Яна вызвалілася, амаль непрытомная.

- Ідзі, дарагі, ідзі. Бог з табой.

...На вуліцы неба сапраўды ставала бэзавым. Рыпеў пад нагамі снег. Першы тралейбус гулка прайшоў па вуліцы. Андрэй адчуваў сябе такім шчасліва-спустошаным і адначасова такім моцным, што скатаў сняжок і зашпурнуў яго да чацвёртага паверха.

- Эх, лёгкі. А то б і да неба...

Яму хацелася спяваць і здавалася, што гэта зусім не зіма, не снег, а белыя мятуліцы-эфемерыяды абляпілі ранішнюю халаднаватую зямлю. І на гэтай зямлі было ўсё: нават цёплая пара, што валіла з дзвярэй метро.

## Раздзел XXI

Сустрэліся перад самым ад'ездам. Яна сказала Андрэю, каб ён чакаў яе ў вестыбюлі гістарычнай бібліятэкі ў сем гадзін вечара. І ён з'явіўся і чакаў, вытрымліваючы цікаўныя позіркі дзяўчат і гардэробшчыц. Здзекуючыся, ён называў сябе ў думках Ленскім, Крэцьенам дэ Труа, Вертэрам, але падсвядома адчуваў, што так яно і ёсць, што тое, што блакітнае сяйва вакол, звязала яго з гэтай жанчынай нябачнымі повязямі, мацней якіх не было нічога.

Яна прыйшла не з бібліятэкі - яна і не была там, і ў вачах яе стаяла кранаючая блізкасць да яго і адначасова быццам засаромленасць нечым. Яны пайшлі завулачкамі старой Масквы. Стаяла адліга, вуліцы танулі ў асабліва сіняй цемры першых гадзін зімовай ночы.

Шляхі абаіх ужо з заўтрашняга дня, і на цэлых паўтара месяца, разыходзіліся. Яго чакалі снягі, сум і ўтрапёная праца, сапраўдны бой, у якім ён павінен будзе выйграць яе, ды яшчэ

страшэнная трывога за тое, небяспечнае, што яе чакала. Ён верыў у лепшае, але задушыць гэтую трывогу не мог.

І ад гэтага, акрамя звычайнага болю разлукі, быў яшчэ нейкі вышэйшы боль, падобны на прадчуванне разлукі вечнай. Андрэй гнаў гэтую думку, але ўсё адно яму - і ёй таксама - здавалася, што з усім, на што яны глядзяць, яны развітваюцца назаўсёды: вось сёння ёсць, а заўтра не будзе.

Таму і горад ляжаў перад імі ледзь расталы, з агнямі на голым лёдзе, змрочны.

- Заўтра? - спытаў ён.

- Заўтра.

- Барані вас маё каханне.

- Калі штосьці і ўтрымае мяне ў жыцці - дык гэта.

Ён пацалаваў яе скронь. Дзіўна, абое зноў перайшлі на "вы", і здавалася, так яно і трэба.

- Таму я і хацела быць з вамі, - сказала яна. - Вы - жыццё маё.

Маўчалі, спускаючыся завулкамі да плошчы Нагіна.

- Я ўвесь час думаю пра вас, Андрэй. Мне ўсё хочацца неяк дапамагчы вам, абараніць, нават на той выпадак, калі мяне з вамі не будзе. Ведаеце, як тая жанчына, што, паміраючы, наводзіць парадак у доме, каб муж хоць месяц не думаў...

- Навошта вы мучыце мяне?

- Маўчыце. Я доўга думала, як вам трэба пісаць "на потым". І вось знайшла адказ. Вы такі, што павінны пісаць аб тым, што вось-вось зашчымела і павярнула ў душы, не дбаючы аб стылі, а дбаючы аб тым, каб слова найбольш дакладна выражала тое, што адчуваеш. Хай нервова, няроўна, з фразамі, падслуханымі на вуліцы. Каб не лашчыла заспакоена, каб кожны паварот - як целам аб камяні, каб пасля чытання - бы на возе па лясной дарожцы праехаў: на ўсіх карэннях растрэсла.

- Магчыма, і так. Толькі я не магу зараз думаць пра гэта. Дайце надыхацца вамі.

- Вы не надыхаліся?

- І ніколі не змагу.

- Які вы... Усяго хочаце ад жыцця.

- Анягож не. Або ўсё, або нічога.

- Не кажыце мне больш аб гэтым. Мне добра, мне надзіва лёгка з вамі. І не трэба больш.

Андрэй змрочна крочыў поруч з ёю. Гэтага ад яго нельга было патрабаваць.

На вулках чамусьці амаль не было людзей. І таму ён раз-пораз схіляўся і цалаваў яе скронь. Раз нават спыніўся і доўгім пацалункам прынік да яе вуснаў.

Седзячы ў фортачцы, са здзіўленнем глядзеў на ўсё гэта вельмі пушысты кот.

- Не трэба, - шапнула яна, вызваляючыся.

Кот грэбліва падабраў лапы, але так і не выйшаў на вуліцу, пайшоў у цёплую кватэру - напэўна, дрыхнуць.

- Я памру там з трывогі за вас. Напішыце мне хаця некалькі слоў.

- Добра. Толькі вы не заставайцеся тут надоўга. Вы патрэбны маці. Цяпер - асабліва.

Ішлі па плошчы Нагіна.

- Вось гэты дом тады гарэў, - сказаў Грынкевіч..

- Той, што ў паэме?

- Так.

- А я думала, гэта метафара.

- Я ў той час быў няздатны на метафары.

Яна быццам замкнулася ў сабе. Толькі цясней тулілася да яго і нейкім новым, сумным і прасветленым, позіркам абводзіла дамы, руіны кітайгародскай сцяны, далёкія стрэлы кранаў у Зараддзі. Толькі на набярэжнай, пабачыўшы ўбаку купалок "Анны", што невыразна бялеў у цемры, раптам здрыганулася і сказала:

- Не, не магу. Пойдзем туды.

У змроку, каля празрыста бялеючых бязважкіх сцен, яна, прыціскаючыся да яго, казала:

- Мне страшна... Страшна... Трымай мяне мацней, дарагі. Калі ты трымаеш, мяне ніхто не адбярэ. Ты - абарона. Ты - надзейны.

Андрэй гладзіў яе галаву:

- Ну-ну, я з табою. Нікому не аддам. Дам табе палову жыцця. Усё будзе добра. Заваюю цябе. У цябе тады будзе дачка. Такая, як ты. А памром мы праз сто год. У адзін дзень і адну хвіліну.

Потым, заспакоеныя, яны ішлі па мосце над ракой, потым заглыбіліся ў вулачкі Замаскварэчча.

- Я апошнім часам больш успамінаю, чым думаю, - сказала яна. - Пэўна, гэта не на дабро, але я часта ўспамінаю даваеннае Замаскварэчча. Калі цвілі ліпы - цяжка было дыхаць, галава кружылася. У кветніках бэз, а на абочынах наўсцяж вуліц

адуванчыкі. Жоўтыя. Пэцкалі нос. Тады ў Замаскварэччы амаль не было транспарту.

Два цені беглі завулкамі, плылі па роўных сценах, кідаліся то ўперад, то назад ад ліхтароў. А ў начным небе над Масквою, злёгку аранжавым ад агнёў, плыла густа-барвяная з белым званіца царквы Клімента.

- Растрэлі, - сказаў Андрэй. - Як вызвалены дух. Увышыню.

- Тут усё маё, роднае, - сказала яна. - Мне так хацелася бачыць гэта сёння. З табою.

Пяшчотна схіліўшыся над ёю, ён шэптам сказаў: .

- Любае Замаскварэчча. Як жа гэта ты стварыла яе такую?

Яны зайшлі ў пад'езд і спыніліся пасярод глыбокай студні двара.

- Ну вось, - сказала яна, - тут жывуць бацькі. Тут я нарадзілася.

- Я ведаю. Гэтай вясной я некалькі разоў быў тут. Хадзіў уначы, каб лепей зразумець вас.

- Я проста баюся ўжо вас, - сур'ёзна сказала яна.

Яны стаялі, бы ў вузкай цясніне. Над імі ўздымаліся асклізлыя ад непагадзі камяніцы і, як водбліск паўночнага сяйва, якое недзе далёка-далёка і не можа прабіцца ў гэты змрок, з'яўляўся і знікаў на самым высокім брандмаўэры зялёны адбітак неонавай рэкламы.

- Гэта самы прыгожы з усіх брыдкіх двароў на свеце.

Быў час. І Андрэй, адчуваючы, што нешта непапраўна зменіцца, можа змяніцца, абняў яе.

- Пакіньце ўсё, - сказаў ён.

- Не турбуйся, любы. Я не змянюся да цябе. Я застануся ўсё той самай.

Дрыжучы ад халоднага адчаю і неўразумення - нашто так, каму гэта патрэбна? - ён абняў яе і стаяў доўга, не ў змозе ні пусціць і ні застацца. Вызваліўшыся, яна пайшла была, але раптам, толькі на хвіліну спыніўшыся, сказала:

- Будзьце разумны. Не ўбівайцеся так.

І знікла.

Ён пайшоў з двара і ўпершыню, бадай, за жыццё страціў адчуванне часу. Мокры снег, аранжава-цьмяныя паўколы мезанінных вокан.

Апрытомнеў ён у скверы ля доміка Астроўскага. Сядзеў, сціскаючы скроні, і слухаў цішыню. Было, відаць, вельмі позна, таму што сціх нават грукат трамваяў. І толькі непадалёк, у

мокрым завулку, мужчынскі голас спяваў, перакручваючы словы:

Эту женщину увижу и немею,
Как безумный, как безумный, день хожу.
Ни кукушкам, ни ромашкам я не верю,
И к гадалкам, понимаешь, не хожу.
Набормочут: - не люби ее такую,
Напророчат: - до рассвета заживет.
Наколдуют, нагадают, накукуют,
А она на нашей улице живет...

Андрэй сядзеў, а над яго галавою гола, трывожна і страшна шумелі мокрыя дрэвы.

## Раздзел XXII

Чалавек можа ўсё. Межаў яго сіле няма, калі наперадзе агонь надзеі. Гэта вельмі добра ведаюць гуманісты, фанатыкі і закаханыя. Што тады казаць пра тых, хто і першы, і другі, і трэці. Хвіліны адчаю трываюць у іх нядоўга. Бось, здавалася, стаяў на каленях, а праз хвіліну зноў трэба апускаць забрала і ісці на бой.

Ужо раніцай, седзячы ў вагоне, які імчаў яго да роднага горада, Андрэй ведаў: нельга губляць ніводнай хвіліны. Толькі адно ўратуе яго ад тугі па ёй: праца да апошняга, знясіленне рук, вачэй і галавы, цяжкі - як камень на дно - сон.

Гледзячы ў акно на заснежаныя паўстанкі, ён думаў. Як у кожнага, хто не спяшаецца выпускаць з рук напісанае, у яго было шмат амаль гатовых рэчаў. Іх трэба было скончыць, скончыць як мага хутчэй, за сорак пяць дзён, скончыць і аддаць у чужыя рукі. "Натхненне не прадаецца..."

Ён можа хадзіць насустрач ветру - ёй нельга. Ён можа глядзець у вочы небяспецы - яна павінна быць за яго спіной. І таму ён мог працаваць за яе не сем год, як той, з Бібліі, а ўсё жыццё, абы не падманулі, абы не падсунулі іншай...

Які шлях быў карацейшы? Раман аб паўстанні Каліноўскага? Раман быў напісаны на дзве трэціх. Адпадае. Доўга чакаць. Гэта потым. "Няхай другім разам", - як сказала адна шляхцянка сваёй паміраючай маці, калі тая папрасіла какавы.

Аповесць? Так, яна амаль скончана.

Ага, вось галоўнае, вось куды трэба ўбіць паўтара месяца! Ёсць п'еса, якую трэба толькі адшліфаваць, і яшчэ падрабязна

распрацаваны план кінасцэнарыя. Вельмі падрабязна распрацаваны. Больш паловы сцэн напісаны, і гэта найбліжэйшы шлях да яе. Усяго дзён дваццаць. Глупства! Хіба гэта подзвіг? Калі ўжо гаварыць пра подзвіг адданага каханка, дык вось гэта - подзвіг. Нейкі там даўні нібелунг зашыўся ў авечую шкуру і ішоў да замка каханай за трыдзевяць зямель год. І ўсё скончылася б выдатна, каб яго ля самага замка не з'елі сабакі, што не ўмелі адрозніваць зместу ад формы...

Яму здавалася зараз, што цягнік ідзе вельмі марудна. Трэба было хутчэй, зараз жа, застацца сам-насам з паперай, распачаць самую вялікую бітву жыцця.

Спаць чатыры гадзіны на суткі. Гэтага досыць, калі мэта так блізка. Хіба больш спаў Пётр Першы, або Маленькі кахетынец[5], або Каліноўскі ў апошнія гады жыцця. Скажам, праўда, яны спалі пяць гадзін, але ж тут не гады, а паўтара месяца. Яна - яго дзяржава. Хопіць чатырох гадзін. А стома - глупства. Існуюць лыжы і кава, на горшы выпадак. І яшчэ ёсць натхненне бітвы і шчасце пераадольвання самага цяжкага. Бо кожны мужчына - трохі ігрок...

І яшчэ жартаваць, жартаваць кожную хвіліну, здзекавацца з сябе, прымаць усё ўсур'ёз і не ўсур'ёз, бо нервы, бо сэрца, бо мозг могуць іначай не вытрымаць. Вайна за прыўкрасную Елену, вялікая траянская вайна... Ахіл з браніраванай пяткай і безабаронным сэрцам...

Працаваць. Інакш звар'яцееш ад тугі.

...Так пачалася вялікая вайна. Андрэй уставаў у шэсць гадзін раніцы, калі ў гарадку гарэлі толькі рэдкія агні і ранішні снег вішчаў пад лыжамі. З адхону на дняпроўскі лёд, потым на стромы адхон процілеглага берага. Праз дзесяць хвілін ужо не хочацца спаць, знікае некуды свінцовы цяжар стомы. Лыжы бягуць па зарэчных палях, перасякаючы ваўчыныя сляды і хітрыя зайцавы петлі.

Вялікі круг на поўнай хуткасці. Потым імпэтны, як падзенне, палёт дном яра, - мільгаюць хмызы над галавой. Можна спыніцца на хвіліну і ўмыцца пякуча-мяккай вадой з палонкі. Але толькі на хвіліну. Не больш.

Мезанін. Снеданне з моцнай кавай... Звычайна першыя радкі даюцца цяжка, быццам цябе ўвесь дзень напярэдадні білі па галаве валікамі ад канапы... Прымусь сябе. Сілком... І вось ужо цябе ўладна ўзяло ў рукі нейкае адчайнадушнае захапленне

[5] Патара Кахі – грузінскі цар Іраклій Другі

працай, калі шкада працягнуць руку за папяросай, калі ўспрымаеш як катастрофу тое, што ў ручцы скончылася чарніла. Хістайся, снягір, за акном - ты не той, якога мы бачылі, і мне няма да цябе справы... Ляці лепей да тых беларускіх паэтаў, якія параўноўваюць цябе з яблыкам. Работы хопіць, бо гэтым свежым параўнаннем дорыць няшчаснага чытача кожны другі...

...Адарвацца ад працы, глынуць нешта і зноў за стол. Але вось і ранні зімовы прысмерак. Ліловыя робяцца снягі, цяжкай стае галава... Кафейнік на агні. Вельмі салодкая вада яшчэ не пачынала кіпець, толькі драбнюткія бурбалкі ўзнікаюць па самых краях паверхні... Кава ў сталовай лыжцы, з коптурам... Яна пахне так, што прачнуўся б і мёртвы... Дзве шклянкі вады... Лыжка... Другая... Трэцяя... З таго боку, дзе агонь большы, паверхня пачынае ўздымацца, паўмесяцам наплываць на астатняе... Абы не перакіпела!.. Хопіць!.. І потым зноў лікуючае захапленне работай, падобнае на адчай. Менавіта ў такім стане псіхічна-хворы гебефрэнік зрабіў аднойчы дзікі ўчынак: кінуўся цалаваць агітатара па выбарах суддзяў... Падаюць са стала лісты: адзін... другі... трэці... І потым, у гадзіну ночы, вячэра і зноў лыжы: не больш чым на трыццаць хвілін. Гэта каб спаць. Яму вельмі трэба спаць. Заўтра зноў дзень працы.

І так дзень... другі... дзесяты... Сутарга зводзіць пальцы... Маці амаль у гневе на яго... Нічога... Гэта ўсё потым... Раз на тыдзень можна аддаць гадзіну на ліст да яе, на які яна не адказвае... Няхай... Думаць аб гэтым і крыўдаваць будзем потым.

Дзіўна, але паспех, з якім ён працаваў, зусім не адбіваўся на якасці напісанага. Наадварот, ён адчуваў, што ніколі не пісаў так добра. Яму ўсё ўдавалася: слова адразу ставала на месца - абцугамі не выцягнеш, памяць паслужліва, у першую ж секунду падсоўвала патрэбны вобраз, складаную аналогію, трапнае параўнанне. Ён ніколі не пісаў так афарыстычна і сцісла: на доўгія разважанні не хапала часу.

Як паказаць выскачку? Ага... Вярнуўшыся з вайсковых курсаў, дзе хапіў вярхоў навукі, малодшы лейтэнант падае рапарт: "Не хачу быць Іванам, хачу быць Ягуарам". Добрае імя па бацьку - "Ягуаравіч".

Як карацей ахарактарызаваць тленнасць пагоні за грашыма? Ага... "У савана няма кішэняў".

"Шум ападаючай восенню гліцы падобны на гук дажджу".

"Ваўчыха прынесла лабастым ваўчанятам костку, яшчэ ружовую, бо ўглыбіні жыло жыццё".

"Мяшчанскае свята: два браты напіліся і адзін другому адкусіў язык".

"Пляскаты, як высахлая жаба".

Як усё давалася. Пэўна, таму, што гэта было роўнае, на вечным уздыме, натхненне.

На сыходзе трэцяга тыдня ён упершыню пачаў заўважаць няладнае. Сцэнарый і аповесць былі скончаны, п'еса набліжалася да заканчэння, і ён ведаў, усё гэта зроблена добра. Але яму абрыдла папера, спіртавы пах чарніла, парыпванне аўтаручкі. Трэба было мяняць абстаноўку, трэба было падавацца некуды яшчэ глыбей, у суцэльную снежную цішыню, у вёску. Таму, калі да іх прыехаў унук нянькі Марцэлі, Андрэй сабраў паперы і паехаў з ім.

Драмаў у санях, усміхаўся праз сон, успамінаючы даўнюю бабчыну гісторыю... "Нахіляўся да захутанай у футра настаўніцы сівавусы дзед:

- Дык ці ела ты, паненка, сёння сыракватшу?

- Ела.

- Шкада. Давядзецца зусім ціха ехаць. Дарогі, хай на іх, хай..."

Усё паўтараецца на зямлі. Снягі, коні, туга...

Дарога была доўгая. Люты заносіў шлях бязважкім снежным пылком. Гурбы паўзлі, як дзюны, і дарога блукала сярод іх, выгінастая, як рэчышча. Захутаўшыся ў кажух, намасціўшы на ногі сена, Андрэй стараўся не думаць, слухаў толькі песню цалазоў, бачыў толькі пагойдванне конскіх крыжоў і зімнюю, заінела-калматую поўсць на іх.

Думаць было нельга. Хоць бы дзень. Нездарма ж ён уцёк ад тралейбусаў, асфальту і антэн у гэты сіні край, дзе вецер здзьмухвае са стрэх пяшчотныя снягі. Ён, Андрэй, стаміўся без гэтага: без жывога агню, без марознай пальбы ў бярвенчатых сценах, без гэтай роўнядзі, што зараз з такою суровай пяшчотай аддавалася бегу коней.

А потым, у вёсцы, ён зноў, як утрапёны, днямі і начамі сядзеў за сталом.

...Позна ўначы - ішоў трыццаць восьмы дзень яго бітвы - ён нарэшце паставіў апошнюю кропку. Стомы не было, толькі вочы нясцерпна, як нацёртыя, гарэлі, ды дрыжала правая рука,

Недзе на вуліцы, далёка, моладзь, відаць, ідучы з пасядушак, спявала даўнюю песню.

Ой, наехала Літва,
Заўтра будзе ў нас бітва.

Ад слоў там, відаць, перайшлі да справы: пачуўся рогат, беганіна, крыкі: "Таечкі, біце яго, снегу за каўнер". Ноч бралася на раніцу, вецер - на завіруху. Белае полымя лізала цені дахаў.

Андрэй дазволіў сабе слабасць, адпусціў лейцы, і сум адразу ахапіў яго. Чатыры лісты, і ні на адзін няма адказу. Ён ведаў, каб сталася дрэннае - Ганна напісала б яму. Значыць, нешта не тое. Яму стала шкада сябе: сядзіць тут, у снегавой калатэчы, як замшэлы стары хрэн, Усяслаў Полацкі. Палена ў печцы рассыпаецца жарам, а ў вёдрах ля дзвярэй лёд. За крэсам вёскі ваўчыны вой. Калматы цень галавы Андрэя спачывае на бярвенчатых сценах.

І хоць ён ведаў, што за царквою стаіць сіласная вежа, а за ёю, на плошчы, некалькі гадзін таму тукаў рухавічок кінаперасоўкі (ішоў новы фільм "У сцен Малабазі", то бок "У стен Малапаги"), яму хацелася думаць, што край гэты - усё той жа старадаўні, драўлянскі край зуброў, дрыгвы і завірух.

- Што ж ты робіш са мною? Дзе ты, мой горні звон?

...Праз дзень ён ужо быў у Мінску, спрачаўся, рассоўваў рэчы, настойліва прасіў, каб іх хутчэй прачыталі і далі ім раду. І ўсе са здзіўленнем разглядалі яго падталы, празрысты твар і нетутэйшыя, стомлена-глыбокія, утрапёныя вочы.

Выгляд ягоны быў такі, што людзі падсвядома разумелі: робіцца нешта няладнае. І таму кожны ішоў яму насустрач. Шчасце і тут не адхіснулася ад яго. Не магло быць іначай. Яму ўдалося ўладкаваць усё. Усё да апошняга радка.

...У матчыным доме ён ледзь дабраўся да ложка. Спаў і нават у сне адчуваў, як баліць галава і ўсё раптам саслаблае цела. Потым, пасля першых сутак, знікла і гэта, а сон стаў каменным. Ён спаў, як зрынуты стомаю ваяка-пераможца, на спіне, і правая рука яго ўздрыгвала: ён пісаў нават у сне.

За трыццаць восем сутак ён адрабіў шэсцьсот сорак шэсць гадзін.

## **Р а з д з е л XXIII**

Двое стаялі над адхонам. Адхон абрываўся ў іх з-пад ног амаль строма, так метраў на пяцьдзесят, пераходзіў у спадзістую лагчынку, а потым, нырнуўшы з уступа, цягнуўся ледзь не на паўкіламетра, увесь зарослы даволі частымі дрэвамі і хмызамі, пакуль не зліваўся недзе там, далёка, з ільдом Масквы-ракі.

Люты сям-там здзьмуў з ракі снег, і празрыстыя разводы лёду люстравалі блакітнае сонца.

Яніс, утоптваючы лыжамі снег, спытаў:

- Чаго ты апошнім часам такі няшчыры? Табе цяжка?

- Мне сорамна, - сказаў Андрэй.

- Тры тыдні, як вярнуўся, - непахвальна сказаў Яніс, - а хоць бы радок. Урэшце, ты для чаго жывеш, для кахання ці для сваёй працы?

- Для працы ў гонар кахання, - назнарок велягурыста сказаў Андрэй.

За ўсім гэтым Яніс пабачыў прыхаваны боль, і яго добры прасцецкі твар засмуціўся.

- З ёю што? - спытаў ён.

- Так. Нічога не змянілася. Аперацыю палічылі немагчымай.

- То ж бо я заўважаю, што ты разгублены і часам п'еш.

- Я знайшоў бы іншы паратунак. Але я не магу працаваць, Яніс. Нішто не лезе ў галаву. Я, відаць, induced... пeратаміўся. Мозг нейкі тупы. Ніводнага слова, ніводнай думкі.

- Адпачнеш.

- Я амаль не сплю. Ты ведаеш, я ніколі не скардзіўся. Але, напэўна, ніколі нічога не здолею напісаць.

- І ўсяго тае бяды?

- Не, брат. Галоўнае, што яна мяне зусім-зусім не кахае.

- Што-о?

- Так. Ты ведаеш, я зрабіў усё, што мог. І вось я пяць разоў сустракаўся з ёю, і яна кожны раз пазбягала размовы аб гэтым... Тройчы прызначала спатканне і падманвала, не прыходзіла. А я, здаецца, зусім страціў гонар. Прызначае на пяць. Я чакаю да паловы шостай, потым кажу сабе, што пераблытаў, пэўна, і спатканне ў шэсць. Чакаю да паловы сёмай і даю сябе ўмовіць, што, можа, у сем.

- Дурань, - сказаў Яніс.

- І твар, - казаў далей Андрэй, - часам добры, але часцей такі варожы. Увесь час гуляе маім каханнем, ведае, што я ўсё дарую. А бадай яно ўсё спрахла.

- Кінь, - сказаў Яніс, - зразумей адно: яна не герой, як ты, і не патрабуй ад яе замнога. Жанчына. І да таго ж вельмі слабая і безабаронная, нягледзячы на ўсю яе мужнасць, на ўвесь талент.

- Я ведаю, - сказаў Андрэй, - я не злапомны, я нікому не помсціў за сябе, але таго, хто можа пакрыўдзіць яе - гэткіх я

забіў бы, з зямлі сцёр... Таму што такіх, як яна, не крыўдзяць, на такіх моляцца, дый то яшчэ не кожнага нават у царкву пусцяць.

Вайвадс паклаў руку яму на плячо:

- Часам я шкадую, што я не прыгожая жанчына. Жыццё б паклаў на тое, каб адбіць цябе... Горка табе будзе...

- Пэўна, я зрабіў памылку, што пакінуў яе адну на столькі дзён. Не было гіпнозу прысутнасці, і за гэты час яна паспела ўзяць сябе ў рукі.

Секануў лыжнай палкай счарнелыя ружы татарніку.

- Але нашто, нашто яна расказала пра ўсё Ганне, ды яшчэ кожны раз прыдумвала ёй прычыны для такіх сваіх паводзін? То я "лёгкі" чалавек. То я "гуляка праздный". То "замкнёны ў вузкіх рамках Беларусі". Добра замкнёны! Па ўсім відаць, як я "замкнуўся". Доказам гэтаму ты, яна, Баранаўскас, тузіны з тры ворагаў на радзіме. Прычыны ўсё! Прычэпкі! Забараніла кожны чацвер праводзіць яе, бо пасля лекцый - бяседа аб міжнародным становішчы і мне "нельга ўцякаць". "Лепей дадому будзеце прыходзіць". Калі? Дый не вельмі запрашаюць... Нашто хлусіць? Скажы "не", дый канец.

Ён нервова ўздыхнуў. Потым сціснуў палкі і раптам - абурэнне патрабавала выхаду - рынуў проста з адхону: лыжы выбілі серабрысты снегавы пылок.

Ледзь не падаючы, ён імчаў проста ў блакіт. Але нават падзенне не магло прымусіць забыць: вялікі даўкі камяк стаяў і шчымяча варочаўся ў горле.

Андрэй праляцеў адхон, маланкава прамчаў лагчынкай і тут убачыў, што ўступ значна вышэйшы, чым ён меркаваў: метры тры. Але гэта не абыходзіла. Можна было і разануцца - усё адно. І толькі рукі самі сабою раскрыліся, а тулава нахілілася амаль да самых лыжаў, калі ўзляцеў проста ў неба, насустрач блакітнаму, ледзяному, абыякаваму да ўсяго сонцу.

Яніс ледзь не самлеў ад жаху, пабачыўшы гэты рывок. Але было позна, і дапамагчы было нельга. Заставалася толькі сачыць. А друг ляцеў, і здавалася, лёту гэтаму не будзе канца.

Але вось стаў, яго злёгку кінула. Памчаў, змяншаючыся, па спадзістым адхоне.

"Ды ці разумее ён што-небудзь?"

Андрэй імчаў проста на вялізнае дрэва. Імчаў, не змяншаючы хуткасці. Сто метраў... дваццаць... дзесяць...

- Ы-ых! - вырваўся з Янісавых грудзей дзікі гук.

І толькі за пяць метраў Андрэй крутануў убок, пятляючы, памчаў у зарасцях і спыніўся зусім далёка, у сетцы лазы над самай ракой.

Яніс зразумеў: абышлося. Зразумеў таксама, што сябра трэба пакінуць у самоце хаця на дзесяць хвілін. І таму ён не стаў кідацца ўніз, пайшоў навакольнай спадзістай сцежкай.

...Грынкевіч стаяў у мёртвых хмызах, глядзеў на блакітны лёд, што чаргаваўся з пульхным снегавым звеем, і, пакупова прыходзячы да прытомнасці, успамінаў.

...Вось першае спатканне пасля вёскі. Кватэра. Тая самая цішыня са звонам гадзіннікаў. У Ірыны карункавая кофтачка, аголеныя да плячэй рукі, футраная накідка на плячах. Нагавіцы - ці як іх там? - на моцных хлапечых нагах. Любы хлапчыска! Любыя рукі, пяшчотныя плечы, самыя блізкія ў свеце вочы!

А чорны сабака калоціць хвастом па нагах Андрэя. Сабаку нядаўна стрыглі, і таму ў яго грыва і калматыя заднія ногі.

- Ён у штанах, - сказаў Андрэй.

- Як і яго гаспадыня, - усміхнулася яна.

Хмызы. Ледзяное сонца. Андрэй стаіць так нерухома, што сінічка-пухляк сядае над яго галавой і здзіўлена, з вока на вока, глядзіць на яго прасянымі зрэначкамі. Яны цікаўныя, пухлякі.

...Так, Ірына і тады не гаварыла з ім аб галоўным. І толькі даведаўшыся, што ён паспеў зрабіць, здзіўлена і ўважна агледзела яго.

- Вы маглі забіць сябе, Андруша.

- Наўрад, - сказаў ён. - Людзі не паміраюць, калі ёсць мэта.

У той раз яна не мучыла яго. Але дні праз тры не прыйшла на спатканне... Потым ён зноў чакаў яе на станцыі метро ля касы. Зверху выплывалі ногі, спускаліся па сходах і ставалі людзьмі, а яе ўсё не было... Потым усю дарогу ў метро яна ўнікала галоўнай размовы, так спрытна пераводзячы гаворку то на подзвіг мастака Ласенкі, то на звесткі аб тым, чым "сапфірны" крышталь адрозніваецца ад простага, што ён слова не мог уставіць.

І так было потым усе тры тыдні. Нават у той дзень, калі яны ішлі Таганкай, яе старымі гандлёвымі радамі. А ў той дзень была адліга і так было добра вакол, нягледзячы на слату. Зграбалі снег, і верылася, што вясна скора прыйдзе. І нават верхавінам дрэў, здавалася, сніліся грачыныя гнёзды.

Ён сказаў аб гэтым Ірыне, а яна раптам занурылася:

- Нявесела быць жывой гісторыяй, памятаць першыя дуры-аўтобусы з чатырма прыступкамі... Асабліва вясной...

Ён засмяяўся:

- Ну і што? Я памятаю рамізнікаў у Востраве. Ці мала што памятаецца? Мы з табою маладзейшыя за шаснаццацігадовых, а ты яшчэ і прыгажэйшая за іх. А для мяне заўсёды будзеш лепшай і маладзейшай. Нават у шэсцьдзесят. Як старая квітнеючая яблыня... Дай табе бог доўгага жыцця... са мной.

Тут яна і сказала, каб ён не праводзіў яе ў чацвер. Святло стала зусім не вясновым, і дрэвы больш не снілі гракоў.

- Баіцёся? - спытаў ён.

- Не. Проста не хачу. Я, пэўна, усё ж пайду на аперацыю. Тут. Хай будзе што будзе.

Гэта, як заўсёды, абяззброіла яго, і ён прамоўчаў. Суцэльным уніжэннем быў гэты маўклівы шлях дадому - паасобку і поруч - міма Швівай горкі і царквы ў Ганчарах.

...Потым яна, здаецца, зноў палагаднела. Сказала аднойчы Янісу, каб Андрэй праводзіў яе. Была кранаюча пакорлівай, сказала, што, бадай, паедзе з ім у Мінск, калі ўсё будзе добра.

Грынкевіч меркаваў, што ўсё гэта таму, што выгляд яго стаў пужаць людзей. Худы, як цень, з вачыма, у якіх жыло нетутэйшае абыякавае святло, ён зусім перастаў смяяцца. Нервы былі так нацягнуты, што толькі тытанічным намаганнем волі ён, які не плакаў шмат год, стрымліваўся ад слёз, калі слухаў музыку.

...А потым прыйшлі апошнія маразы, калі снег аж лямантаваў пад нагамі. І ў адну з сустрэч яна, нават з нейкім азлабленнем, сказала яму, што ёй нядобра, калі ён з ёю, што ў яе могуць быць непрыемнасці і яна просіць не праводзіць яе больш.

- Сустрэнемся як-небудзь у мяне.

Ён адразу павярнуўся і пайшоў. Стаяў люты сівы мароз. Пякло падэшвы, калелі рукі, але ён не заўважаў гэтага. Дамоў вяртацца было нельга, і ён цягнуўся на людныя вуліцы, на вялікія плошчы. Пара валіла з метро, і гэта было як апраметная нейкая. І ён ужо не ведаў, да каго яму звяртацца за дапамогай, хто скажа яму хоць слова.

Пасля гэтага ён і паспрабаваў піць. Аднойчы, калі сядзеў за спустошаным сталом (Яніс толькі што пайшоў), у пакой без стуку ўваліўся п'яны Баранаўскас. Не кажучы ні слова, ён абмінуў Андрэя, падышоў да акна і цюкнуў кулаком у шыбу, нейкім дзівам не парэзаўшыся.

- Паэту патрэбна свежае паветра, - сказаў ён паважна і, не абмовіўшыся больш ніводным словам, зачыніў за сабою дзверы.

Гэта было як крывое люстэрка. І Андрэй адразу, як абрэзаўшы, вырашыў, што піць досыць. Сапраўды, як яна можа глядзець на яго такога? Як на бруд, нават горш.

...Ён стаяў у хмызах і не заўважыў, як да яго падышоў Яніс.

- Лясун палескі, - сказаў латыш, - бульбаед! Галаву скруціць захацеў? Набіць цябе да паўсмерці трэба. Вось.

- Нічога са мною не здарыцца, - сказаў Андрэй.

- Вядома, каму наканавана шыбеніца, той можа смела ставаць на лыжы. Свіння!.. Ану хадзем да электрычкі.

Яны моўчкі слізгалі снегавой цалінай. І Андрэй усё яшчэ думаў. Ён пачаў заўважаць у Ірыне і другія змены, якія яму не падабаліся. Яна хлусіла. І не толькі тым, што не прыходзіла на спатканні, але і другім, зусім недарэчным. Гаварыла аб сваёй дапамозе старому скульптару Ратманаву, спасылалася на другога скульптара, земляка Андрэя. А калі Андрэй, выпадкова сустрэўшыся з земляком, спытаў яго, выявілася, што той ніколі не чуў аб Ратманаве, што гэта наогул фікцыя. Нашто гэта было? Другі раз сказала, што яе муж з італьянцаў. Потым, што ён выхоўваўся ў сям'і вядомага пісьменніка Н. Калі гэта было можна сумясціць неяк, то трэцяя яе заява, што ён напалову рускі, а напалову паляк, ужо зусім не лезла ні ў якія вароты.

Ён прамаўчаў, хоць яму было брыдка: не хацеў прымушаць яе чырванець. Да таго ж ён ведаў, усё гэта было ад слабасці, ад прагі ўстаткавання самой сябе.

Аднойчы ён выпадкова пазнаёміўся ў дальняй электрычцы з прафесарам-псіхолагам, сівым, медзведзяватым старым, у якога валасы раслі нават з вушэй і, пад чужымі імёнамі, расказаў яму аб гэтай хлусні.

- Што ж, - сказаў стары, круцячы шышкаваты кій, - паспрабую даць адказ вашаму другу. Праўда, мае погляды даволі нямодныя і састарэлыя, але ўсё ж... Ці бачыце, ваш друг, гэты паэт, вельмі дзіўны і рэдкі па тыпу чалавек. Адначасова цыклоід (па Крэчмеру), то бок таварыскі, дабрадушны, разумее жарт. З ім лёгка мець справу.

"Ну і ўляцеў", - падумаў Андрэй. Ён не любіў, калі людзей раскладвалі па паліцах і класіфікавалі.

- Ён натуральны, - казаў далей стары, - шчыры, хутка ўступае ў прыяцельскія адносіны з другімі, у тэмпераменце нешта мяккае і цёплае. У яго ёсць гумар.

Ён гаварыў таксама ласкава і мякка.

- Гэта ўсё было б добра. Такія людзі шчаслівыя. Але ваш друг у адрозненне ад цыклоіднага тыпу не прымае жыццё такім, якое яно ёсць. Ён адначасова гіперэстэтык, то бок усякі жыццёвы штуршок успрымаецца ім з падвышанай хваравітасцю, хоць ён і не замыкаецца пасля ўдару, а зноў ляціць на агонь, на апёкі. Ён не навучаецца жыццю. То бок, ён не навучаецца для сябе, хоць можа ведаць яго лепей за ўсіх іншых. Такім людзям бывае вельмі цяжка жыць Я мяркую, што ён па складу цела не пікнік.

- Што гэта?

- Памеры цела ў яго не шыротныя? У цыклоідаў пікнічны склад цела.

- Не, ён хутчэй худы.

- Ну, вядома. Значыць, па складу цела ён шызоід. Гэта так званы лептазомны, або доліхаморфны (доўгі), склад цела... Можна, я апішу, як я ўяўляю яго сабе?

- Калі ласка.

- Грудная клетка і плечы не вельмі вузкія, - стары глядзеў Андрэю проста ў вочы. - Канечнасці і шыя хутчэй доўгія і ладныя. Тлушчавая тканіна развіта слаба. Мускулісты, але косці і скура далікатныя і тонкія. Так?

- Так.

- Ну вось. Да.такіх належалі Саванарола, Рабесп'ер, Дантэ. Яшчэ Мейерхольд і Блок (гэтых я ведаў асабіста). Самі ведаеце, якое салодкае жыццё выпала на іхнюю долю.

- А яна? - спытаў Андрэй.

- Яна таксама цыклоід і гіперэстэтык. Але яна здатная замыкацца пад ударамі лёсу. Тут розніца. Яна ўвесь час хістаецца паміж весялосцю і сумам. Я яшчэ не ведаю прычыны гэтага. Нешта здарылася з ёю. Вельмі цяжкае.

- А мана?

- Не ведаю, ці так гэта жахліва. У цыклоідаў вельмі багатае развіццё фантазіі. Гэта часам прыводзіць нават да своеасаблівай хлусліваcці. У нас гэта завецца pseudologia phantastica.

Ён мякка ўсміхнуўся:

- Сцвярджае сябе, дурнічка...

Грынкевіч цяпер ведаў усё, і востры цёплы жаль ахапіў яго сэрца. Усё можна было даравацъ Ірыне. Усё да канца.

А прафесар, устаючы на адной станцыі, дакрануўся да галавы Андрэя і, гледзячы яму ў вочы, сказаў:

- Вам трэба быць вельмі мяккім з ёю, юнача. Яна забудзе ўсё і аджыве. І вы будзеце вельмі-вельмі шчаслівы.

...Седзячы зараз з Янісам у электрычцы, Андрэй успамінаў гэтыя словы і чырванеў. Як гэты стары мог здагадацца? І добра яму было казаць аб шчасці, не ведаючы пра мужа і пра асколак. "Забудзе", "аджыве". Забудзеш пра гэта, як жа.

Раптоўная думка ўразіла яго. А раптам і асколак мана, раптам яна выдумала сабе жыццё, раптам і асколак толькі прычына, каб застацца ва ўпарадкаваным звыклым гняздзе, не пайсці насустрач неўладкаванаму каханню з яго навальніцамі?

Але ён з гневам адагнаў гэтую думку.

Пералескі слаліся за вокнамі. Яніс глядзеў на Андрэя і думаў, што яму, Янісу, таксама цяжка да смерці, але ён ніколі не скажа гэтага сябру, не ўскладзе на яго плечы яшчэ і свайго цяжару. Досыць для яго. І адначасова ў яго душы накіпаў гнеў, і ён паступова ўсё больш пераконваўся: без размовы з Ірынай не абыдзецца. Ён не дасць ёй глуміць сябру жыццё.

З вакзала ехалі на таксі, бо стаміліся. За вокнамі бегла начная Масква: агні кранаў, вясёлкавыя дамы паўднёва-заходняга раёна.

Вялікія будынкі, горад, заліты электрычнасцю, шпілі высотных будынкаў, ланцужок агеньчыкаў электрапоезда, што вырываўся з тунеля метро на мост, - і, аднак, усяго гэтага было мала, вельмі мала для шчасця. Таму што можна ніколі ў жыцці не бываць у верхніх паверхах "высоткі", у вочы не бачыць метро, не ведаць, што такое сучасныя паэты і мастакі, але шчасце патрэбна чалавеку штодня, сёння, і заўтра, і да смерці.

Таксі вырвалася на Красную плошчу, Тут, на каменнях Лобнага месца стаяла ферма, унізаная сотнямі электрычных лямпачак. Ферма ўзносіла над сабой вогненную касмічную ракету. З дзюзаў ракеты безупынна беглі да камянёў струмені, віхуры электрычнага агню.

- Ты паляцеў бы? - спытаў Яніс.

- Хоць сёння. Гэтая самота, гэты боль, - куды хочаш ад іх. Часам мне здаецца, ад адной зямной непрытульнасці чалавек можа... туды...

- Ну і ад гонару, - сказаў Яніс. - Ад мужнасці.

Не быў бы ён самім сабою, каб не падправіў.

- Вядома.

З нізкага акна машыны ракета, здавалася, імчала ўжо вышэй муроў.

- На парозе стаім, - сказаў Яніс. - Яшчэ год-два.

- На парозе, - сказаў Андрэй. - Хутчэй бы туды. Што датычыцца мяне, то я хаця й зараз, Проста адсюль. Нават пяра не беручы.

...Увесь вечар Яніс спрабаваў жартаваць. Яны сядзелі за вячэраю. Андрэй выставіў на стол мочаныя яблыкі, паўбутэльку хатняй настойкі (учора перадаў ад маці праезджы зямляк), бразнуў бохан вясковага хлеба, цяжкага і чорнага, як зямля. Калі адкроілі лусту - у пакоі пачуўся такі пах, якога ніколі не бывае ў гарадскім хлебе. Яніс узважыў бохан на руцэ.

- Н-да, - сказаў ён, - цяпер я разумею, чаго гэта беларусы ў свой час адны адбіліся ад татар.

- Што, сілу дае такі хлеб?

- Крый божа. Проста яны гэтым хлебам адбіваліся. Як кінуць такі жарон, дык дзесяцёх татараў на конях як не было.

Андрэю не елася. Апусціўшы вочы, ён шчыкаў хлеб і таму не бачыў, як цяжка і Вайвадсу таксама.

А калі Яніс пайшоў у свой пакой, ён лёг у ложак, і нечакана хутка праваліўся ў цяжкі, дурны сон...

...Прачнуўся недзе каля дзесяці гадзін вечара. Прачнуўся, дрыжучы ад адчаю. Нешта такое страшнае бачыў у сне, што халодны пот высыпаў на лбе.

Седзячы на краі ложка, ён аднаўляў усё, што сніў, і перад ім уставала жудасная ў сваёй вар'яцкай лагічнасці карціна. Так, снег... так, віядук над чыгункай... так, вагон з гэтым страшным надпісам на шыльдачцы...

...Ён сам не памятаў, як з'явіўся на стале ліст паперы.

"Ідзі на вакзал, ідзі на вакзал..."

Гэта гучала ў яго вушах. Рука пачала ліхаманкава бегаць па паперы.

На вуліцах горада ў цёмны час
Не размова, а лёгкі канкан:
- Якая, дзяўчына, футра у вас?
- Французская. "Soukine sine".
Не хачу з імі. Не прымушай.
У іхніх вачах каламуць.
У тумане, змрочным, як іх душа,
Яны, як рыбы, плывуць,
Да д'ябла!!! Збочыў. Завулкі ў сне.
Снег згінае дрэвы. Туман.
І горад простых чакае мяне,
І слядоў на снезе няма.
- Адкажыце, куды маё шчасце пайшло,

Вы, што йдзяцё ўначы,
Гаечны ключ, або дрот, або лом
На сагнутых плячах несучы?
І ў адказ галасоў бязладны харал,
Як спеў, што вецер даруе дратам:
- Ідзі на вакзал. Ідзі на вакзал.
Пра ўсё будзеш ведаць там.
Чаму на вакзал? Чаму? Чаму?
Нельга хіба без яго?
Хіба растопіць у сэрцы зіму
Зыркай топкі агонь?
- Ідзі на вакзал. - Ну што ж, пайду.
Ноч. Завулкі. Снег, як карцеч.
Пусты вакзал. Пусты віядук.
Ні праводзінаў. Ні сустрэч.
Ведайце! Без гудкоў, без агню,
Адтуль, дзе звычайна тупік,
Адыходзіць, сёння ў гадзіну нуль-нуль
"Масква - Вечнасць" цягнік.
Без білета залез я ў цёмны вагон.
Маўчаў змярцвела цягнік.
Ніхто не ведаў, што рушыць ён,
І мяне не сустрэў праваднік
...Дзед і ўнучка ў пустым купэ,
Маўчанне, цемра і сон.
У дзеда слёзы, як весні капеж,
У дзяўчынкі коскі, як лён.
Галоўкай дзеду лягла на плячо,
Ўсміхаецца ў сне чамусь.
- Куды вы вязеце такое дзяўчо?
- Сын памёр. Там сумна яму.
Так і я. Мой май адспяваў, адзвінеў.
Шчасце знікла, як сон.
Адзавіся! Што ты так вабіш мяне?
Добры прывід мой. Янаў агонь.
Пераходны мосцік.
Тамбур пусты.
У душы нарастае жах.
Першы вагон, і ў вагоне - ты.
Дзяўчынкай. І слёзы ў вачах:
Любы загінуў. Колаў звон.
Не тужы. Не тужы ў журбе.

Падумай, як бы пакутаваў ён,
Каб вайна забрала цябе?!
Як бы імкнуўся праз чорны дым,
Як клікаў бы смерці касу?!.
Мёртвым лягчэй, і нясцерпна жывым,
Што мёртвых у сэрцы нясуць.
Пераходны мосцік. З тупой вышыні
Нехта арфуе снег.
У другім вагоне згаслі агні,
І ніхто не пабачыў мяне.
А я пабачыў. Гарэла свяча
Над святлом жаданняў маіх.
Ты з другім. І боль такі у вачах,
Што лепей бы слёзы ў іх.
Я шукаю цябе. Я не магу
Загасіць свой равучы агонь,
Я з вагона пустога ў вагон бягу.
Трэці. Апошні вагон.
І ты. Як свечачка у снягах,
Як цёплы кахання сон.
Я сказаў, што знясу для цябе на спіне
Самы жахлівы цяжар,
І ты мне з усмешкай сказала: "Не".
І лепей бы мне - на ліхтар.
Ноч. Матляе вагон. Спакойны час.
Як разбіць мне сэрца турму?
Дзед, і ўнучка,
І ты, - за кожнага з вас,
За кожнага смерць прыму.
І не буду клясці свой першы ўздых,
Свой лёс, свой няпросты канец.
Што ж, адмучыцца сэрцам сваім за траіх
На долю выпала мне.
Не я дзяліў з табой сталь, і бой,
І шчасця светлага час.
І ўсё ж мы ў Вечнасць едзем з табой,
Хоць вагоны розныя ў нас.
І ўсё ж са мною, са мною ты,
У бязмежнай маёй цеплыні...
Масты ляскочуць. Ляскочуць масты.
Скупыя плывуць агні.
Прыляцелі з халоднай начной зямлі,

З дрымучых глыбокіх снягоў
І ў вачах вясёлкаю паплылі
Агні нямых хутароў.
Нічога. Нічога. Цягнік ляціць
У Вечнасць праз снег густы.
Там разбяруцца. Там створаць трох.
Кропля ў кроплю, як ты.
І мне падаруюць сапраўдную з трох
За тое, што на зямлі
Ніхто нават смерцю самой не змог
Мяне ад цябе аддзяліць.
За тое, што я дагарэў і згас
На вялікім, як сонца, агні.
За тое, што сеў я ў начны гэты час
Без білета ў цёмны цягнік.

...Спустошаны, надзіва спакойны, ён сядзеў над спісанымі лістамі паперы. Усё неяк стала на месца. Словы Ірыны аб тым, што, маўляў, у яе могуць быць з-за яго непрыемнасці, што вось існуюць языкі паклёпнікаў, і што яна просіць, каб ён больш ніколі не праводзіў яе, жылі ўсе гэтыя дні як пустыя гукі, і толькі зараз, пасля гэтага сну, набылі рэальнасць і сэнс.

Ён раптам зразумеў, што яна ніколі не будзе з ім. І адначасова ўцячы ад яе ён не можа, а без яе няма жыцця. Значыць, няма чаго супраціўляцца. Жыццё абрыдзела, жыццё не дало шчасця - нашто тады ўсё.

Ён не скардзіўся. Адчай прайшоў. Застаўся нейкі халодны і разважлівы курс на канец. Андрэй пагарджаў самазабойцамі, але тут усё было інакш. Не было запалу, не было болю - проста іначай нельга было. Усё адно ён болей ні на што не варты.

Праз сценку ён чуў лёгкія гукі музыкі ў суседа. Гралі той самы канцэрт Мендэльсона. Андрэй склаў кнігі ў чамадан. Усе. У другі чамадан склаў рукапісы (яны ў яго заўсёды былі ўпарадкаваныя). Рукапісы нехта завязе ў Мінск. Трэба будзе, каб гэтымі грымзолямі заняліся толькі сябры і з імі Яніс.

Усё расклаўшы па чамаданах, ён падышоў да акна і стаў глядзець у яго.

За падстанцыяй, за яе марсіянскімі спарудамі паміралі гарадскія агні. Яны згасалі адзін за адным, але гэта, напэўна, ён проста страціў уяўленне аб часе.

Не, яму не хацелася паміраць. Ніколі ён яшчэ так не любіў жыцця. Без Ірыны ён не здолее напісаць ні радка. Уся гэтая гісторыя як зламала ў ім нешта.

Досыць! Ён зробіць вось што: сябра з Кіева, начуючы неяк у яго, забыў у тумбачцы свой люмінал, цэлых трыццаць таблетак. Многа гэта ці мала - Андрэй не ведаў, ён ніколі не ўжываў снатворнага.

Ён прыме гэты люмінал. Зараз ноч. Раней чым у дзесяць гадзін ніхто не перашкодзіць яму сваёй дапамогай. Калі ён засне і не прачнецца - хай будзе так. А калі гэтая доза будзе недастатковай - ну што ж, будзе замах на самагубства з непрыдатнымі сродкамі. Тады ён праспіцца і ў той жа дзень кіне інстытут, і Маскву, і працу. Паедзе кудысь далёка, у малярыйныя плаўні Нянджа або на Чукотку. І ні слова нікому.

Абдумаўшы гэта, ён нявесела ўсміхнуўся. Усё гэта трошкі патыхала піжонствам. Нешта накшталт гульні са смерцю ў цот ці лішку. Але д'ябал з ім!

Графін з вадою на стале. Таблеткі - вось. Зараз - пісьмо маці, кароткае, усё адно яна не даруе, як бы ні прасіў прабачэння. Следчаму ліст. Так робяць усе.

Каму ж кнігі? Вядома, Янісу. Вось і яму некалькі слоў. Ну, яшчэ каму? Цягнуць нельга: агні за акном сталі зусім рэдкімі; але дзіўна: зор на небе няма. І не таму, што хмары. Проста над Масквою ніколі не бывае зор. Зашмат ліхтароў, гэтага штучнага святла.

Каму яшчэ? Ага, Ірыне. Ці варта пісаць ёй наогул? Бадай, не варта. Але хочацца. Гэта як апошняя размова.

"Дарагая мая, бывай!

Калі ты атрымаеш гэты ліст - я ўжо буду далёка, і мы ніколі не пабачымся. І цяпер, калі ты ўжо не зможаш падумаць, што я нешта хачу змяніць, я змагу хоць у пісьме пісаць усё, як ёсць, не баючыся, што ўсё гэта будзе растлумачана неяк не так.

Я іду не толькі таму, што ў нас з табою здарылася так, што ты не кахаеш мяне. Ёсць іншыя прычыны, якія жылі даўно, а сёння авалодалі мною.

Я не буду казаць табе аб сваім болю. Ты была маім шчасцем, я даводзіў гэта словам і справай і ведаю - ты не скажаш, што гэта простая балбатня.

Не ведаю, чаму ўсё так скончылася. Ведаю толькі, я кахаю цябе да канца, як кажуць: ты на той свет, і я ўслед. Ты называла мяне "лёгкім чалавекам". І ты не ведала, што ніхто не стаў бы шукаць новую зорку пасля цябе. А я тым больш, бо я ведаю сваю кроў. Мы вельмі стрЬыманыя і вельмі верныя людзі.

Ты неяк была ў непаразуменні, што я не ўмею і не люблю казаць "аб сабе". Ну што ж, каб усё было ясна - давядзецца

сказаць пару слоў. Апошніх. Усе вы - і ты таксама - бачылі, як я спяваў, як цягаўся па вуліцах, і ніхто не думаў, што я, якога "нельга ўспрымаць сур'ёзна" (твае словы Ганне), - чалавек цяжкага лёсу, чалавек, што нясе нікому не патрэбны цяжар, які трэба было б трымаць многім-многім. Супраць гэтага не папрэш, і ў сэрцы маім няма ні нянавісці, ні ярасці. Толькі стома, якая ўсё расце.

Нічога гэтага не было б, калі б ты была поруч. Не было б чалавека, мацнейшага за мяне. Але зараз позна казаць пра гэта, дый апошняе, што засталося - годнасць, - не дазваляе.

Бывай. Хай лёс збірае камені з тваіх шляхоў. Абы толькі табе было светла. Апошні раз цалую на развітанне твае рукі і вочы, любы мой снягір. Той, якога мне якраз і не хапіла".

Перачытаў. Што ж, класічны ліст самазабойцы. Праўда, няясна, што чалавек збіраецца рабіць з сабою, але гэтага і не трэба. Не да сантыментаў. Падумаеш, лірычная сліна, "юнкер Шмидт из пистолета хочет застрелиться".

...Лісты трэба пакласці на стол. Чорт, а гэта што за ліст? Ага, пэўна, калі спаў, нехта прынёс яго ў пакой. Ні ён, Андрэй, ні Яніс ніколі не замыкаюць дзвярэй.

Андрэй разарваў канверт. Ліст быў ад Якуба Каптура, з Мінска. Надзвычай добры чалавек гэты дзядзька Каптур, і надзвычай добры пісьменнік. У апошні свой прыезд ён, Андрэй, быў у яго дома. Ладна выпілі, учынілі "вечар забытага раманса". Спявалі такія песні, якіх, пэўна, не помніць ніхто: і беларускія, і рускія, і польскія. Гэта быў добры вечар. Андрэй тады на падпітку абмовіўся Якубу аб сваёй "трагедыі". "Стары" страшэнна ўсхваляваўся, хоць і хаваў узрушанасць за вечнай сваёй іроніяй. Шкада "старога". Добры чалавек!

"Дарагі Андруша, дарагі ты мой хлопча!

Я заўсёды, пачынаючы з першых тваіх вершаў і нашай з табою сустрэчы ў цэнтральным кніжным магазіне, думаю пра цябе з добрай усмешкай, як пра малодшага брата, ад якога вельмі многа спадзяюся. Малодшым лічу цябе не толькі таму, што нарадзіўся ты трохі пазней за мяне, а таму, што ўсміхаешся ты вельмі молада, чыста, што абяцаеш ты вельмі многа, што зробіш ты многа, хоць і б'еш часамі ў хамут, пераступаеш цераз пастронкі, а гаспадару гэта не вельмі, як вядома, падабаецца... Людзі, якіх мы любім, любяць цябе.

Ну дык чаго ж ты, юнача, так затузаўся, апусціў крылы? Гарэць - гары, але і кнот свайго свяцільніка сам падкручвай... Ты, відаць, не быў бы са мною шчырым, каб не тое, што і я не

любллю кан'юнктуры, што і мне бывае таксама цяжка, і даволі часта, і даволі адчувальна. Дык і павер, што я не апрошчваю, не зніжаю, а стараюся вышукваць і знаходзіць першапрычыны...

...Мне цяжка гаварыць аб гэтым... Палічы сабе ты мяне бурклівым дзядзькам, палічы нават пашляком, але, слухаючы твае словы, я міжвольна думаў: колькі харошых, мілых, цудоўных, юных, разумных істот марыць недзе сустрэцца з такім чалавекам, як ты, дарагі мой дзівак, паэт, сумленны чалавек!.. Нават і ў маім узросце цяжка бывае, а то і немагчыма, акрэсліць, размеркаваць сваё і чужое - пазнаць, наколькі ў прадмеце нашага захаплення сапраўднай прыгажосці, а колькі нашага ўяўлення, прыхарошвання звычайных спраў паўлінавым пер'ем закаханасці. Даруй за грубасць, але гэта праўда. Праўда, і маё братняе жаданне - каб ты не браў на сэрца сваё непасільнага цяжару, каб ты не йшоў без патрэбы па лініі найбольшага супраціўлення, каб ты прасейваў пачуцці свае праз няўмольнае сіта жыццёвай мудрасці, якая - не заўсёды проза. Я не да разважлівага эгаізму клічу, а да чысціні пачуццяў, да як найбольшай увагі да чалавека, да справы святой, якой ты ўжо не маеш права не служыць... Зрэшты, даруй, браток, і трымайся на вышыні!..

Я буду невымоўна рад атрымаць ад цябе радаснае разумнай радасцю, спакойнае вялікім спакоем пісьмо.

*Цалую цябе па-брацку.*
Якуб Каптур".

Андрэй сядзеў, звесіўшы рукі з Каптуравым пісьмом паміж каленяў, і няўлоўна ўсміхаўся. Ён вельмі любіў гэтага чалавека, але так, як сёння, - ніколі. Вельмі шкада, што давядзецца засмуціць яго, зрабіць яму балюча, ды яшчэ як. Ён харошы, у яго моцная рука, ён такі грубавата-разумны і дасціпны.

Але ён не бачыў марозных пальмаў тады, на шыбах... Добры чалавек. Добры да добрых, злы да злых. Сапраўдны чалавек. Гэты не даруе. Таму, што сам і ў цяжэйшых выпадках заўсёды трымаў сябе мужам...

Шкада, што Якуб, пэўна, плюне, даведаўшыся аб усім, назаве яго, Андрэя, бабскай спадніцай і дурнем, а яе, пэўна, сцервай або яшчэ горш.

Да слёз шкада Каптура. Памятаў, думаў аб ім. І Андрэю раптам так захацелася пабачыць Яніса. Ну што будзе, калі ён, Андрэй, паглядзіць на яго яшчэ пяць хвілін? Апошніх. Яніс не

зачыняе дзвярэй таксама. Андрэй паглядзіць на яго, спячага, а потым пойдзе насустрач лёсу. Яніс жа таксама, як і Каптур, думаў аб ім і тужыў яго болем.

...Ён асцярожна зачыніў за сабою дзверы Янісавага пакоя і спыніўся ў нагах яго ложка.

Вулічнае святло давала разгледзець амаль усё ў пакоі. Яніс спаў на спіне, высока закінуўшы нейкі адразу змужнелы, нават састарэлы твар з высокім лобам. Андрэй глядзеў на яго, адчуваючы ў сэрцы амаль фізічны боль. Ніколі яшчэ ні да каго не было ў гэтым сэрцы такой пяшчоты, як сёння да Яніса і Каптура. Любыя, мужныя людзі. Сябры.

Горад за вокнамі спаў мёртвым сном, і стаяла такая цішыня, што Андрэй чуў удары ўласнага сэрца.

І раптам цішыню разарваў гартанны, нясцерпна балесны гук. Спачатку Андрэй падумаў, што гэты гук вырваўся з яго горла, але гук паўтарыўся, і Грынкевіч зразумеў, што гэта вырвалася з Янісавых вуснаў. Што ён сніў? У гэтым сухім мужчынскім стогне быў такі боль і безнадзейнасць, што сэрца Андрэя перавярнулася. Як ён, Андрэй, мог думаць толькі пра сябе, радавацца, што праз гадзіну яго боль скончыцца назаўсёды і наступіць шчаснае забыццё? Як мог не думаць, што наняе другу яшчэ адзін удар? Як мог пакінуць яго аднаго?

Андрэй сеў на ложак да спячага, паклаў рукі яму на плечы.

- Янка, бедны мой Янка! Што з табою?

Яніс адкрыў вочы і нават не здзівіўся, пабачыўшы, Андрэя. Ён закрыў вочы далонню і голасам, у якім упершыню пачулася слабасць, сказаў:

- Не магу. Не магу за сябе. Не магу за цябе.

- Ну што ты хочаш?

- Не выходзь, Андрэй! Мне страшна аднаму.

- Хочаш, каб я пачытаў табе нешта? Хочаш казкі Скалбе?

- Не, - сказаў Яніс, - пачытай лепей сваю казку,

- Добра. Я зараз.

Казак у Андрэя не было. Ён зайшоў у свой пакой, узяў першае, што трапілася пад руку, - гэта быў ліст да Горавай, - і пайшоў да друга. Нічога, абы трымаць нешта ў руках. Казку ён будзе прыдумваць тут, адразу на месцы.

...Прайшла палова гадзіны, і "казка" набліжалася да канца. Вельмі цьмянае святло начной лямпы падала на ліст, які Андрэй трымаў у руцэ, на яго дурныя, далёкія словы. А ў цемры, непадалёк, суха блішчалі вочы Яніса.

- Мятлушка пакінула яго, - чытаў Андрэй. - А ён з-за яе сышоў з дарогі смелых, застаўся ў гэтай прыгожай, але соннай краіне, дзе нават птушкі спалі ў той час, калі ім трэба спяваць. Іржа патрушчыла яго меч, а ў сэрцы звіла гняздо боязь жыцця. І вось яна, завабіўшы, нанесла апошні ўдар, і ён пачаў клікаць смерць. Яна здавалася яму такой прывабнай, поўнай такога спакою. Абы ад дрыжачых мужчын і хлуслівых жанчын. Абы ад тугі да канца, што ідзе пасля здрады кахання.

Ён клікаў яе. Яна здавалася яму, як сонца і зоры, як цёплае мора, як ветрык, што гамоніць з майскай лістотай. Яна была, як разлівы крыніц за мяжою пустынь і як праўда пасля шматвяковай хлусні.

... - І багіня кахання злітавалася. Ідзі, сказала яна, я зноў даю табе памяць аб шляхах, і аб смеласці, і аб бразгаце мяча ў праведнай бітве, калі барвяныя харугвы лунаюць над галавой. І аб марах, вада якіх салоная і бурхлівая, як кроў смелых. Я ўсё даю табе, толькі не кліч смерць, бо мы жывём не для сябе, а для тых, каго любім, і таму не маем права пайсці ад іх, нават калі нясцерпна стае жыць. Чалавек народжаны для бітвы і мае права памерці толькі ў бітве. І кожны воін павінен думаць, што ён, як апошняя надзея гарадоў і вёсак за яго плячыма, што ён, як апошняя песня роднай зямлі. І ён павінен змагацца нават тады, калі ніхто больш не хоча змагацца, адзін супраць усіх. Павінен надарвацца, легчы на парозе, як Рэйтан. І калі сэрца рвецца ад болю - хай апошнім яно рвецца ў яго. Што ў хлуслівых жаночых словах, што ў гэтай маленькай жанчыне, хай нават яна - Мятлушка, калі вялікая Жанчына стаіць у кожнага за спіной?

Андрэй апусціў ліст.

- І ён плыў між лазурных, як неба, пякуча-халодных хваль, а паўз яго праплывалі караблі з барвянымі ветразямі. Барвянымі, як сонца захаду, як кроў, пралітая за справядлівасць. І караблі білі з гармат у гонар таго, хто адзін, у лядаштым чаўне, плыў у Нязведанае, і парахавы дым слаўся над сіняй вадой.

- Дзякую табе, - ціха сказаў Яніс.

- Гэта табе дзякуй.

- Нічога, - сказаў Яніс, - нічога. Ведаеш, жыць яшчэ можна, калі друг поруч. Ідзі. Дзякуй табе.

Андрэй зачыніў за сабою дзверы. У сваім пакоі ён з дрыжыкамі агіды агледзеў падрыхтаваныя чамаданы і люмінал побач са шклянкай вады...

Багаж склаў, ідыёт, у ваяж сабраўся, баязлівае быдла. А ці не хочаш вечнай вайны, падонак? Лёгка адкараскацца захацеў. Баба яму, ці бачыце, адмовіла ў вышэйшым шчасці, не захацела з ім, такім харошым, пайсці ад соннага ды цёплага гнязда. А ты не прыніжайся. Хопіць. Моўчкі прайдзі, хаця б сэрца рвалася. Нічога, знойдзецца другі жмут кісяі. Люмінальчык падрыхтаваў, боўдзіла! Не, брат, распакоўвай чамаданы. Людзі церпяць - цярпі і ты. А сам ты што для людзей? Аб гэтым забыў? Рабі ім паслугі, сволач, хоць, можа, і не адчуваюць яны ў іх патрэбы пасля сённяшняга.

Ён ірвануў акно, з трэскам аддзёр папяровыя палосы, якімі яно было заклеена на зіму, і з ярасцю выкінуў люмінал на вуліцу. Туды ж пайшла і вада.

З пачуццём вяртання з далёкага падарожжа ён рыўцом адчыніў чамадан і выкінуў рукапісы на падлогу.

...Над Масквою пачынала днець. Бэзавае святло ляжала на ажурных металічных канструкцыях, рабіла бязважкімі і прывіднымі дамы. Пачынаўся дзень.

Андрэй ведаў: ён ніколі больш не зробіць такога.

Ніколі ў жыцці.

## Раздзел XXIV

Яніс стаяў перад Горавай, якая сядзела ў крэсле, і, гнеўна надзьмуўшы таўставатыя губы, глядзеў на яе. У кватэры было трохі холадна ці гэта, можа, здавалася, бо Ірына зябка ўціснулася ў куточак крэсла, схавала рукі пад футравай накідкай.

- Я забараняю вам гаварыць са мной на гэту тэму, - суха, з нейкай асаблівай жорсткасцю сказала яна.

- Я і не хацеў гаварыць. Але ён мой друг, і як вы з ім сябе паводзіце - гэта ўжо занадта.

- А як мне з ім сябе паводзіць? Я замужам.

- Гэта не перашкаджала вам калісь дазваляць яму хадзіць з вамі...

- Вы нічога не ведаеце, Ян.

- І не хачу ведаць. Але гэта бес-ча-ла-вечна. Або будзьце з ім, або пакіньце тлуміць чалавеку галаву.

- Што за тон? - вочы яе былі халоднымі.

- Гэта яшчэ замяккі тон для ўсёй агіднасці, што вы з ім робіце, - кулак Яніса ўладна рассек паветра.

- Яніс, я буду вымушана паказаць вам на дзверы.

- А я не пайду.

- Пабачым.

Вайвадс зразумеў, што яго сапраўды могуць выставіць. Гэта не ўваходзіла ў яго планы, і таму ён сказаў ужо больш мякка:

- Ды не будзьце ж вы Ірынай Сяргееўнай. Будзьце хоць сёння проста Ірынай, другам, што любіць майго друга.

Яна прыўзняла вечка сігарэтніцы. Апусціла вочы:

- Гэты ваш друг апошнімі днямі пазбягае мяне. Ён сухі і жорсткі.

- А што яму рабіць у адказ на тыя словы, якімі вы яго пачаставалі?

- Ён не мае права нічога патрабаваць ад мяне.

Вайвадс зноў выбухнуў:

- Ды зразумейце ж, ён вас кахае. Ка-ха-е!!! Гэта такое каханне, якое раз у стагоддзе бывае на зямлі. Такое каханне, аб якім марыць кожная жанчына, вечнае, магутнае, нязменнае! А вы яго ў бруд! Багатыя занадта! Усё жыццё вам такія пачуцці пад ногі клалі!

Яна падціснула вусны ў нітачку, і твар яе ўпершыню здаўся Янісу непрыемным.

- Дакараеце? - сказала яна. - А я проста бачыла, што ён як адурэў, што нельга адразу ж пакінуць яго без усялякай надзеі, што трэба паступова. Я хацела дапамагчы яму і не дала ніякай падставы спадзявацца.

- Хлусіце! - Яніс наліўся крывёю абурэння.

- Ян!..

- Харошанькае дзела, - бурчаў Ян, уладкоўваючыся ў крэсле. -Як гэта? Я на свае вушы чуў, якія гэта былі авансы з мастаком і псіхіятрам.

- А хіба я казала нешта прама? - яна шырока раскрыла нявінныя вочы. - Вы проста не зразумелі мяне.

- О, вядома, - закалаціўся Яніс. - Вы, жанчыны, усіх абведзяце. Не хапала яшчэ, каб вы прама казалі. Вы ж заўсёды пакінеце для сябе пралазіну. А я тыдзень таму бачыў, як ён ледзь не паміраў, гаворачы пра вас, а потым паляцеў на лыжах з такой стромы, дзе шыю скруціць было - раз плюнуць. Як назнарок смерці шукаў. Я ўжо думаў - мазгі разлятуцца, як бэнкне галавою ў дрэва.

- Хлопчык, - пацiснула плячыма яна.

- Ну так, мы хлопчыкі, мы несучасныя, мы - сентыментальныя саплякі ў часіну цыгарэт "Арбіта", мы і

кахаем, як у дзевятнаццатым стагоддзі. Але ведайце: менавіта так будуць кахаць, калі чалавек стане дасканалым. А нежаданне ахвяраваць у імя кахання сваім жыццём тады назавуць брыдотай.

- А як тады назавуць залёты да замужняй?!

- Каханне не пытае, замужам каханая ці не, здаровая яна або хворая, шчырая ці нядобрая. Яно кахае, і гэтым сказана ўсё.

Вочы Яніса раптам сталі разгубленыя. З нейкай мяккай уладнасцю, быццам гіпнатызуючы, ён сказаў, паклаўшы рукі ёй на плечы:

- Кахайце яго, Ірына. Вам пашанцавала. Ён вялікі ў каханні чалавек. Махніце рукою на ўмоўнасці, на дабрабыт. Усё гэта лухта! Ідзіце з ім, пакуль сэрца маладое, пакуль яно кахае і хоча кахання. Верце мне, няма на свеце нічога над каханнем і трэба яго шанаваць, не забіваць недаверам, не прыніжаць нават жартамі. Кахайце яго.

Яна глядзела ўбок. Потым спытала ціха:

- Гэта ён параіў вам прыйсці да мяне?

- Дрэнна вы яго ведаеце. Ён нічога не ведае. Я сам, бо яму зараз вельмі патрэбна дапамога.

- А дзе ён зараз?

- Мяркую, стаіць перад сінедрыёнам.

- Якім?

- Перад вучоным саветам інстытута і дырэктарам, - знешне спакойна сказаў Яніс. - Трымае адказ.

- У чым гэта?

Латыш прыкурыў ад недакурка другую папяросу.

- Ён страціў раўнавагу з-за гэтай гісторыі. Нервы напятыя. Забыў аб асцярожнасці і лезе на ражон па ўсякім выпадку і без усякага выпадку.

Яна ўважліва глядзела на яго.

- Што сказаў?

- На лекцыі Пружыніна абазваў сяго-таго з нябожчыкаў палітычным прайдзісветам і апрычнікам.

- А хіба не так?

- Так. Але ж вы ведаеце...

- Што? Што вясной шасцідзесятага года ні я, ні вы, ні вучоны савет, ні нават дырэктар... ніхто нічога яшчэ не ведае.

- Менавіта,

- Так, не крыўдуюць толькі на лёс, на натуральную смерць. Што ж, калі так здарылася... А за астатняе трэба адказваць. Так лічыць мой друг, і я з ім у згодзе.

- А вы не думаеце, што збоку Андрэя гэта як запознены ўдар капытам.

- Андрэй мае на гэта права. Ён не любіў і не любіць тых, хто хоча сабою падмяніць лёс чалавечы. Гэта ж падумаць: двухногі лёс нада мною, ім, вамі? І ведаеце што? Каб мне спатрэбіўся таварыш, з якім я мог бы пайсці ў полымя за свае перакананні, - я ўзяў бы яго.

- Як гэта здарылася? - Ірына нарэшце прыкурыла цыгарэту,

- Пружынін сказаў, што некаторыя шумяць вакол апошніх падзей у свеце больш, чым трэба. Я не паспеў стрымаць Андрэя. Ён ускочыў: ноздры трапечуць, вусны непаслухмяныя, белыя. А потым уся кроў у твар.

- Вы літаратурны крытык. Значыць, прэтэндуеце на званне чалавеказнаўцы. Цярпімага і спачувальнага, Дык успомніце хаця б перадваенныя літаратурныя... гм... дыскусіі. Тыя людзі... Яны ў труне перавярнуліся б, каб маглі пачуць ваш цынізм! Адной душы бязвінна загубленай хопіць, каб ніколі не забыць.

Пружынін малінавай чырванню наліўся: "Хлапчынка, дэмагог! Зрабіце спачатку столькі, сколькі мы, я, сколькі ён". А Андрэй: "Я не збіраюся рабіць тое, што ён. І за добрае і за злое - бог і людская памяць яму суддзі. Але я не хачу, каб мяне ўспаміналі, як яго і яшчэ некаторых, Я выхаваны зусім у другіх правілах і не хачу быць прайдзісветам, які робіць першым героем рускай гісторыі апрычніка, бо адчувае сваё ўнутранае падабенства з ім". Пружынін выскачыў з аўдыторыі і пабег скардзіцца да дырэктара. І вось...

- Можа скончыцца дрэнна.

- Што? - яна падалася наперад, не заўважаючы, што накідка спаўзла з яе плячэй на падлогу. - Вы сапраўды так думаеце?

- Так, - кіўнуў Яніс.

Слупок сіняватага попелу, што нарос на цыгарэце, упаў на падлогу,

- Дрэнна, - сказала яна.

...Якраз у гэты час Андрэй сядзеў у невялікім кабінеце дырэктара. За акном ляжаў адліжны сіняваты скверык, там вецер хістаў мокрыя верхавіны дрэў, а тут было ціха і як быццам глухавата.

За сталом, насупраць Андрэя, сядзелі і моўчкі глядзелі на яго некалькі чалавек. Пружынін, груздлы і сівы, нервова курыў. Поруч з ім сядзеў дырэктар з жаўтаватым стомленым тварам,

яўна хваравітым. Вочы яго за шклом акуляраў здаваліся ненатуральна вялікімі, глядзелі на Андрэя з уважлівасцю і нейкім нават грэблівым шкадаваннем. Далей машынальна маляваў чарцянят на клапціку паперы выкладчык Маркаў, па-за межамі інстытута нядрэнны крытык. Хітраваты, з сівінкаю ў цыганскіх валасах, ён зрэдку кідаў на Андрэя вясёлыя позіркі, быццам, казаў: "Што, брат, уліп? Не бянтэж дзядзяў. Дзядзі ціхага жыцця прагнуць".

Быццам нічога не здарылася, сядзеў намеснік дырэктара Копцеў. Андрэя заўсёды нават у нейкае замілаванне прыводзіла вытанчаная інтэлігентнасць яго аблічча, аксамітна-цёмныя, жывыя вочы, рукі артыста. Ды ён і сапраўды быў падобны на нейкага вядомага артыста... Аксёнаў, ці што? Або, можа, нехта з амерыканцаў. Закінуў нагу на нагу, пагойдвае ступою ў люстэркавым туфлі і стракатай шкарпэтцы. Хоць глядзіся ў туфель, быццам і няма на вуліцы сляты.

А ў куточку, у крэсле, прымасціўся гнуткі і ўвесь нейкі моцны, як стылет, дацэнт Бічыкашвілі. Гэты глядзіць таксама даволі непрыхільна. І чырвоныя вусны жорстка складзены пад вусамі.

- Ну, - парушыў цішыню дырэктар, - раскажы ты нам, Андрэй, як гэта ты дайшоў да жыцця такога?

- Да якога жыцця? - спакойна сказаў Андрэй. - Нічога, здаецца, не адбылося, Сказаў тое, што думаў.

- І не сорамна? - з дакорам спытаў Копцеў.

- Які ў іх у халеры сорам! - пачырванеў Пружынін. - Святога ў іх нічога за душою няма. Лічаць, што мы ўсе дурні.

- Не ўсе, - сказаў Андрэй.

- Вы чулі? - здзіўлена абвёў усіх позіркам Пружынін. - Вось яно. Нігілісты нейкія.

- А я не ведаю, чаго слова "нігіліст" павінна быць лаянкай. Мне здаецца, Тургенеў укладваў у яго другі сэнс. Базараў, між іншым, таксама быў "нігілістам". Ну, скажам, Тургеневу ён быў несімпатычны. Мне, калі шчыра казаць, таксама. Але яго зрабіў час. І аб'ектыўнаму гэтаму часу ў вышэйшай ступені напляваць на вашы і мае сімпатыі і антыпатыі. Гэтым словам можна пахваліць, а можна і аблаяць, гледзячы на тое, хто і супраць каго яго ўжыў. А прафесар Пружынін робіць з яго нейкае пудзіла.

Маркаў скрушліва пахітаў галавою.

- Але мы нігілісты не ў тым сэнсе, - пасля паўзы прадоўжыў Грынкевіч. - Мы верым у свой край, і ў нашу працу, і ў патрэбнасць яе для радзімы. Мы толькі не верым вам, прафесар.

Магчыма, вы і добры чалавек, але слухаць такія вашы выказванні нам нeяк сорамна. Прабачце на гэтым ужо.

- Вы думаеце, што вы гаворыце? - ціха спытаў дырэктар. - Ёсць людзі разумнейшыя за вас, і яны лічаць, што гэты чалавек меў заслугі. А паэт Грынкевіч дазваляе сабе не быць адной думкі з гэтымі людзьмі.

Андрэй глянуў у яго ненатуральна вялікія вочы:

- Ды і вы ж не адной думкі з імі.

Дырэктар апусціў вочы.

- Якой я думкі наконт гэтай асобы - гэта мая справа, - буркнуў ён.

- Не, вы глядзіце, - сказаў Пружынін, - глядзіце, якія яны! Раней вы, пэўна, іначай думалі, дыфірамбаў не спявалі толькі таму, што не паспелі, а зараз...

- Я ў тыя часы думаў тое самае. Гэтаму ёсць мноства сведкаў, - спакойна сказаў Андрэй. - Я толькі не ведаў усяго. Але я адчуваў, што нешта няладна.

- Бачыце вы... Касандра-прарочыца, - сказаў Пружынін.

Маркава перасмыкнула ад голасу Пружыніна.

- Паспакайней бы вы, прафесар, - сказаў ён.

- Вы таксама... шаноўны... маглі б сесці поруч з ім.

- Я сядзеў, - сказаў Маркаў, - але, на шчасце, не поруч з гэтым хлопцам. Я сядзеў за тое, што быў супраць Іванова, а потым даведаўся, што Іваноў, здаецца, сядзеў за тры камеры ад мяне.

Копцеў засмяяўся.

Дырэктар закрыў вусны рукою, але вочы яго смяяліся таксама.

- Андрэй, - сказаў Копцеў сваім мяккім, вельмі ласкавым тонам, - вы павінны папрасіць прабачэння ў прафесара, і тады справа не выйдзе з гэтага кабінета.

- Я гатовы, - сказаў Андрэй, - я дапускаю, што мог па-чалавечы пакрыўдзіць прафесара Пружыніна, і гатовы ў гэтым прынесці свае прабачэнні. Але толькі ў тым выпадку, калі прафесар прынясе прабачэнні аўдыторыі.

- Гэтага ніхто не будзе рабіць, - сказаў дырэктар.

- А шкада, - сказаў Маркаў. - Гэта было б па-джэнтльменску. Узаемна. І ні стуку, і ні груку.

- Не, - сказаў дырэктар.

- Тады і я - не, - скалануў галавою Андрэй.

Запанавала маўчанне. Яніс, гаворачы такое ў Горавай, меў рацыю. Ні яны ўсе, ні вучоны савет не ведалі той вясною, а што ім далей рабіць.

- Вы вельмі здольны чалавек, - сказаў Копцеў. - Не псуйце сваіх адносін...

- Я гатовы на горшае. Я помню, і я разумею: самым страшным была не жорсткасць і падазронасць аднаго, а душы, знявечаныя падазронасцю і няввер'ем у свайго суседа. І вось гэтага дараваць нельга.

Бічыкашвілі, які да гэтага сядзеў моўчкі, раптам сказаў з ненатуральным спакоем:

- Гэта нават абразліва. Вы падумалі, як мне, грузіну, слухаць такое?

Андрэй, гледзячы яму ў вочы, сказаў спакойна:

- Вы не маеце рацыі, Георгій Луарсабавіч. Не палічыце за падхалімаж - мне няма ў ім патрэбы, - але я велымі люблю гэтую зямлю і яе людзей. Я ведаю, патрэбна была нечалавечая мужнасць, каб зберагчы мову, і звычаі, і старыя камяні Свеціцхавелі, Сіёні і Джвары. Гэта вялікі народ, і яму ёсць кім ганарыцца і без гэтага чалавека. Славы яго гэта не паменшыць.

Ён нервова закурыў:

- Добра, адзін з арлоў, як выявілася, зусім не арол, але ж ніхто не змяншае гэтым спалучэння "Грузія і рэвалюцыя". ...І вы ўспомніце яшчэ Паола Яшвілі, Тыцыяна Табідзе, Гапрындашвілі? Тры паэты з залатымі галасамі. Іх мог слухаць свет, а зараз слухае толькі зямля ды нашы сэрцы, якія ўсё помняць...

Бачыкашвілі не глядзеў у яго бок.

- Прабачце, - глуха сказаў ён. - Я пагарачыўся.

- Калі патрабуюцца яшчэ тлумачэнні, я магу даць іх, - сказаў Андрэй. - Я выхаваны на веры ў тое, што чалавечае жыццё ёсць самае каштоўнае на свеце. І хай прафесар Пружынін ведае: у гэтым мы ворагі. Да канца. І мы паклапоцімся ўжо, каб нават цень гэтай з'явы знік з зямлі, каб яна не паўтаралася нават у фарсе, нават у адзіным слове знявагі аднаго чалавека да другога.

Цяпер на Андрэя не глядзеў ніхто. Панавала ціша.

- Выйдзіце, Андрэй, - сказаў дырэктар.

Андрэй выйшаў. Яму было душна ў будынку, і таму ён вырашыў чакаць у скверы.

Даволі доўгі час ён хадзіў па алеі. Дрэвы ранялі на яго знобкія кроплі. Пад снегам, калі капнуць яго нагою, была ўжо свежая і празрыстая вада. Андрэй ні аб чым не шкадаваў. Ён

проста назіраў, як ветрык моршчыць ясныя лужыны, як ён пругка і вільготна шуміць у верхавінах дрэў.

Пачыналася вясна вады.

...Першым выйшаў з будынка Копцеў.

- Нічога не вырашылі, - сказаў ён, гледзячы на Андрэя добрымі жывымі вачыма. - Будзем рабіць выгляд, быццам нічога не адбылося.

І пайшоў да машыны. Андрэй накіраваўся быў да брамы, але яго аклікнулі зноў. Гэта быў Маркаў. Ідучы поруч з Андрэем, ён маўчаў. І толькі ля самых варот, працягнуўшы руку для развітання, сказаў з нязвыклай для яго пяшчотай:

- Эх, Андрэйка, Андрэйка, усё-та вы разумееце. А паэт павінен быць трошкі дурнаватым.

Так, быць дурнаватым было ў тую вясну - і не толькі - сапраўды лепей, але якраз гэтай раскошы Андрэй і не мог дазволіць сабе.

"Хопіць, пабыў ужо, - думаў ён. - І з жанчынамі і з мужыкамі. Трэба, урэшце, зразумець, што адзінае, дзеля чаго пушчаны чалавек на свет, гэта - кеміць".

...Пераходзячы ўжо вуліцу, Андрэй раптоўна ўбачыў Гораву, якая прамавала ў інстытут і чагосьці вельмі спяшалася. Яна прайшла каля яго ў дзесяці кроках і не заўважыла, а ён не пазваў. З гэтым усё было скончана.

Ён ішоў бульварам і думаў, куды яму падзецца зараз. Горад быў мокры, няўтульны, першыя агні глядзелі ў туман аранжавымі вачыма. Вялікі горад, а месца ў ім для яго няма.

З адчаю ён хацеў быў пайсці ў рэстаран, але тут неяк трапіўся на вочы пад'езд Ганнінага дома. І Андрэй махнуў на ўсё рукою і вырашыў закаціцца туды.

...Сустрэла яго тая самая кампанія. Толькі мармурова-бледны Аленін на гэты раз быў цвярозы і, закасаўшы рукавы на руках, мускулістых, хлапечых, ладзіў на падлозе электрычны чайнік.

- Прывітанне забытаму эпігону Хвелькі Тапчэўскага, - змрочна сказаў ён. - Дапамажы...

- Не магу, - сказаў Андрэй. - Канстытуцыя тандэтных рук не дазваляе.

- Лірык, - з пагардаю сказаў Аленін.

- Я не лірык. Я арыстакрат духа. Я спірытуаліст, нігіліст і заўзяты прапагандыст біметалізму. А ты проста няўдалы спадкаемца "Блакітнай ружы". Цябе выгналі за няздольнасць

нават з майстэрні гадзіннікаў, і ты тады вырашыў перавярнуць славянскі жывапіс.

- Малаток, - сказаў Яхненка. - Так яму.

- Ганна дзе? - спытаў Андрэй.

- У Ганны вельтшмерц, яна ў сваім пакоі.

- Тады не будзем яе турбаваць. - Андрэй абвёў позіркам кампанію. - Што гэта з вамі? Твары нейкія авальныя і доўгія.

- Калі Аленін наладзіць чайнік, - змрочна сказаў Петрык, - можа, будзем піць чай.

- Не жэрлі сёння? - здагадаўся Андрэй.

- Мы елі анчоусы, - сказаў Аленін. - Сірэч звычайную камсу. На фунт сто галоў.

- У мяне ёсць грошы, - сказаў Андрэй, вымаючы з кішэні дзве сотні. - У мяне сёння выпадкова ёсць грошы. І ёсць трывалы намер надзерціся.

- Купала, - сказаў Аленін. - Пушкін. Я заўсёды казаў, што няма на свеце больш белакурых і добрых людзей, чым беларусы. Ім належыць будучыня. Яны... звышчалавекі духа...

- Я не звышчалавек, - сказаў Андрэй. - Я проста мецэнат. Я сердабольны стары кавалер, якому нясцерпна глядзець на пакуты галадаючага чалавецтва. Я дам вам частку сваіх нарабаваных дывідэнтаў... А цяпер давай чайнік.

Спрытна арудуючы адвёрткай, ён пакалупаўся ў вантробах чайніка і сунуў штэпсель у разетку.

- Ну вось, зараз будзем піць чай... калі, вядома, кампанія захоча гэтага... Ну дык што, цягнем запалкі, каму пабегчы? Сібірскі закон?

- Не, - сказаў Аленін, - бадай, давядзецца бегчы мне. Не будзем выпрабоўваць лёс. Не хапала яшчэ, каб мецэнаты бегалі па гарэлку для сваіх кліентаў.

І, звярнуўшыся да Андрэя, Пятроўскі сказаў:

- Вас даўно не было, Андрэй. А мы вельмі чакалі. Не прыміце за камплімент, але вы спадабаліся тут. Мы нават падрыхтавалі вам падарунак. Але вас так доўга не было, што сёння той-сёй прапанаваў здаць яго ў антыкварыят.

- Змоўч, - басам сказаў Яхненка. - Не ў антыкварыят, а ў ламбард. Выкупілі б потым.

- Хлопцы, - сказаў Андрэй, - нашто гэта? У мяне пакуль што ёсць грошы. У мяне ўзялі сцэнарый і п'есу, а грошы, выявілася, мне зараз зусім непатрэбны.

Ён не вельмі весела ўсміхнуўся.

- Цяжка камусь - бярыце. Пад вексель будучай славы кожнага. Выб'ецеся ў людзі - падорыце па эцюду. Я стану ганарыцца знаёмствам з вамі.

- Ты дурань, - сказаў Яхненка, - ты вялікі добры дурань! І ты нічога не разумееш ні ў псіхалогіі, ні ў дзяўчатах, ні ў сябрах... Глянь лепей сюды. Гэта зрабілі для цябе Петрык з Аленіным, сабака ты. Кожны намаляваў каго хацеў. І ніхто не шкадуе, дорачы гэта табе.

Упала завеска з невялікага палатна. Андрэй, гледзячы на яго, з цяжкасцю падавіў уздых. На палатне быў салатна-зялёны, росны, увесь у сонечных зайчыках сад, трава, у якую нехта густа сыпануў залатымі манетамі адуванчыкаў. А на траве сядзелі дзве дзяўчыны. Гэта было нешта накшталт гагенаўскай ідыліі, толькі самая ідылія была мяккая, размытая, паўночная, без уласцівых поўдню грубавата-кафейных і глянцава-зялёных адценняў. Трапяткая, здаецца, ледзь дыхаючая, родная зеляніна першых дзён лета.

Адна дзяўчына сядзела ў траве, матаючы на рагульку воўну. У свежым твары, у кароне залацістых валасоў, у белай, трохі занадта па-маскараднаму простай сукенцы было нешта засцянковае, міла старамоднае.

Другая, у значна больш сучасным уборы, не такая прыгожая, але адухоўленая, сядзела на зэдлічку, гледзячы кудысь паўзверх раскрытай кнігі. Вусны няўлоўна ўсміхаліся, але ў схіленай, быццам пад цяжарам вузла валасоў, галоўцы, у шэрых вачах быў сум.

Ганна і Ірына. Два бакі адвечнага, прага якога заўсёды жыве ў мужчынскім сэрцы. Андрэю на імгненне аж подых перахапіла, так гэта было зроблена, так хацелася павесіць гэта ў сябе. Але амаль адразу ён сказаў ціха:

- Дзякуй, хлопцы. Гэтага не забуду. Але нашто мне гэта зараз!

- Дурань, - нячутна сказаў Яхненка. - Ты нічога не разумееш. Не крыўдзі іх і нас.

- Добра, - адказаў Андрэй.

Амаль адразу ён адчуў на спіне чыйсьці позірк. Павярнуўся. Ганна стаяла ў дзвярах. Двайнік той, з карціны, але куды больш прыгожая. І, калі яна сустрэла яго позірк, нейкае нязвыклае сяйва з'явілася ў яе вачах.

- Андруша... О то ж бо вельмі даўно хацела вас бачыць... Пакіньце ўжо гэтых бэйбусаў адных, заходзьце на пару хвілін да мяне.

- Дык што, хлопцы, - спытаў Яхненка, - адпусцім яго на пяць хвілін?

- На дзесяць, - сказаў Пятроўскі, - пакуль не прыйдзе Аленін.

...Грынкевіч упершыню быў у гэтым маленькім пакойчыку са шкляным ліхтаром, што выдаваўся ў сад. Амаль чвэрць пакоя займала тахта, потым былі яшчэ кніжныя паліцы, стол і глыбокае мяккае крэсла.

Ганна была ў просценькай блакітнай сукенцы, нейкая хатняя, вельмі змарнелая і ад гэтага яшчэ больш свойская і гожая.

- Сядайце, дзікун палескі, - сказала яна. - Скідайце пінжак, тут горача. Адчувайце сябе як дома...

Андрэй сеў. Яна выцягнула з аддзялення сэкрэтэра пузатую бутэльку французскага каньяку.

- "Камю", - сказала яна. - Калі ўжо на маю думку, дык дрэнь страшэнная, але больш нічога няма.

Нейкім прасцецкім жэстам пашкрабла пад патыліцай, дзе, як у дзіцяці, кучаравіліся залатыя валосікі.

- А закусваць?.. Ага, здаецца, нешта ёсць.

І дастала вазачку з засмяглымі палачкамі каўказскай чурхелы, якая залацілася інжырнымі зернейкамі.

- А хлопцы "анчоусы" елі, - падкалоў Андрэй.

- Гэта ім не ў каня пакорм, - сказала Ганна.- І да таго ж яны тут амаль кожны дзень, а ваш голас я пачала забываць.

Яны чокнуліся келіхамі, шкло якіх здавалася вясёлкавым, як мыльная бурбалка.

- За вас.

Ганна, відаць, любіла колер асенніх лісцяў. Гэты пакой таксама быў вытрыманы ў іх адценнях. І абажур клаў на ўсё гэта цьмяны аранжавы адбітак, рабіў яе валасы зусім залатымі, а твар зусім янтарным.

- Вы былі ў вёсцы? - сказала яна. - "Распавядайце".

- Быў, але нічога не бачыў. Падарваўся працуючы.

- Што вы мне прывезлі адтуль у падарунак?

- Прывёз, - сказаў Андрэй. - Але я не думаў заходзіць да вас сёння. З сабою няма.

- Што?

- Дзве сапраўдныя народныя выцінанкі. А для душы слоік бруснічнага варэння.

- З грушамі?

- Угу.

- Гэта праўда? - яна глядзела на яго вельмі сур'ёзна.

- Як бога кохам.

- Вы заўсёды памятаеце аб усіх... Бог ты мой, бруснічнае варэнне! Ненавіджу ўсе гэтыя гарадскія "Ружы" і "Дыні". Каб яны папрахлі дзе былі... Ах, як журавіны растуць! На зялёнай нітачцы, нябачныя ў імхах.

- Не пакутуйце вы так, - сказаў Андрэй. - Кіньце ўсё і з'ездзіце на спатканне з пералескамі.

- Хіба так проста? - сказала яна. - Не, гэта, што вакол, - яно трымае. Яно не выпусціць.

- Што з вамі? - спытаў Андрэй. - Скажыце мне.

Яна агледзела яго нават з памяркоўнай усмешкай.

- А вы і сапраўды на зайздрасць румяны і здаровы правінцыял, які дарваўся нарэшце да горада.

- Што з вамі?

- Нічога. Лепей давайце вып'ем... Ну вось... Што з вамі здарылася?

- Сёння лаялі на савеце.

- Цяжка?

- Цяжка.

- А ў астатнім?

- У астатнім таксама цяжка, - прызнаўся Андрэй.

Бровы Ганны здрыгануліся:

- Нясцерпна?

- Амаль нясцерпна, Ганна.

Яна склала рукі на каленях. Наступнае, відаць, каштавала ёй цяжкіх намаганняў:

- Вы пыталіся, што са мной... Добра... скажу... - Памаўчала. - Прынцыповая старая дзеўка, здаецца, нарэшце пакахала.

- Дык гэта ж вельмі добра, - сказаў Андрэй.

- Гэта вельмі дрэнна, - сказала яна.

- Чаму?

- Таму, што ён ніколі не пакахае мяне.

- Хацеў бы я пабачыць, які гэта дурань можа не пакахаць вас. Скажыце мне, я з ім тады пагавару.

- Андруша, - сказала яна, - вы такі недалёкі?

Толькі тут у Андрэя міжвольна пачырванеў твар.

- Няўжо?..

- Так, - проста сказала яна. - І я ніколі не сказала б вам гэтага, каб не бачыла, як вам цяжка. Я ведаю, гэта не надае прыгажосці дзяўчыне, такія прызнанні... Але я падумала, - а можа, вам будзе лягчэй... Няма нічога, чаго я не зрабіла б для

вас... Калі вас можа трошкі суцешыць гэта - я... мне больш нічога не будзе трэба.

Глыбока расчулены, Андрэй глядзеў на яе схіленую галоўку.

- Вы лепшая дзяўчына на свеце, - сказаў ён са спазмаю ў горле.

- І ўсё ж вы кахаеце не самую лепшую?

- Так. Я кахаю не самую лепшую.

- Ну вось, - сказала яна быццам з палёгкаю, хоць вочы яе блішчалі, - я прызналася, але з гэтага нічога не вынікае, Андруша. Я проста буду, не спадзеючыся залішне, быць недзе поруч. Буду заўсёды дапамагаць вам. Зраблю ўсё, каб вы былі з Ірынай...

- Гэтага не будзе, - сказаў ён. - Яна чужая. А ад вас я ніколі не прыму такой ахвяры.

- Які вы дурны, - нейкім танюткім, птушыным галаском сказала яна. - Што вы разумееце ў ёй? І як вы можаце думаць, што мне гэта будзе цяжка?! Для ўсяго, што цяпер ажыло ўва мне, гэта не ахвяра, гэта... радасць. І вы не пакутуйце маім болем, Андруша, не ўнікайце мяне. Прыходзьце, калі шчаслівы, прыходзьце, каб паскардзіцца. Я буду бязмерна рада.

- Але ж вам цяжка...

- О то ж, - з сумнаватай усмешкай сказала яна. - А між тым, яно... як у раю ды на краю, то лепей у пекле на сяродцы.

- За што вы мяне так?

- Хіба я ведаю? Але з першым вашым прыходам, як свежым ветрам пранесла па пакоях. Быццам у камяніцу ўнеслі кавалачак зусім іншага жыцця.

- Даруй мне, Ганна, даруй.

- Што ты? - сказала яна прасветлена. - Хіба ты вінен?

Бязважка гладзіла яго валасы.

- Ну вось. Ну вось і супакоіўся. Ты не думай - гэта шчасце. Бо я ўжо зусім перастала спадзявацца, што гэта можа прыйсці. Ідзі зараз. Ідзі да іх. Аленін ужо прыйшоў. Чуеш смех? Я зараз таксама выйду. Толькі пераапрануся. Мне трэба быць прыгожай, каб табе заўсёды хацелася гаварыць са мной.

## **Раздзел XXV**

Бурхлівая, утрапёная прыйшла ў той год вясна. Усяго за некалькі дзён не па-веснавому цёплае сонца з'ела снег. Бэзавай парай дымелі, прасыхаючы, тратуары. Трава ў парках так буяна лезла з зямлі, што прабівала бурае, сятчастае мінулагодняе лісце.

Пасля паліто не спатрэбілася нават плашчоў, і таму асабліва лёгка было ісці па вуліцах, пругка скакаць на панелі, слухаць з адчыненых вокан гукі радыёлы. Нават цвіценне чаромхі не дало вельмі халодных дзён.

Тры падзеі за гэтыя дні паказалі Андрэю, што адбылася нейкая змена ў яго адносінах з Ірынай. Па-першае, Вайвадс страшэнна вылаяў яе Андрэю за тое, што яна так абыякава паставілася да гісторыі з Пружыніным і адразу выправадзіла яго, Яніса, за дзверы, сказаўшы, што яна чакае людзей з візітам.

Андрэй толькі плячыма паціснуў. Выправадзіла, потым заспяшалася ў інстытут - што яму да гэтага?

Але наступнага дня Галіна Іванаўна спыніла яго ў калідоры і з трывогаю спытала:

- Што гэта вы там нарабілі з Горавай, дрэнны вы хлапчына? Прыбегла ўчора ўстрывожаная, з твару змянілася: "Што яны там з ім робяць?" Я адказала, што гэта сам ён з усякім зробіць, што захоча. Што з ёю?

- Перажывае за вучня, - суха сказаў Андрэй. Гэта ўсё былі чужыя словы. А потым яна сказала і сама - на лекцыі, - сказала з дапамогаю ўсё таго ж самага падтэксту. Нешта ў сувязі з каханнем аднаго з мастакоў, якому быццам сказала каханая:

- І я дам табе бязмернае шчасце, а ты мне за гэта бяссмерце.

Усё гэта было не так. Усё гэта не было словамі, якія прама кажуць аб усім. Андрэй не паверыў ім і дачакаўся таго, што Вайвадс нахіліўся аднойчы, у канцы лекцыі, да яго і непахвальна сказаў:

- Яна прасіла цябе затрымацца.

У Андрэя так змяніўся ў паўцемры твар, што Яніс сказаў стрымана:

- Сляпы. Ганну не заўважаеш. А каго заўважаеш?

- Заўважаю ўсё, - шэптам сказаў Андрэй. - Ведаю яе, ведаю ўсё, ведаю ўсю. І ўсё адно...

У той дзень яна, калі Андрэй праводзіў яе дадому, толькі і здолела сказаць:

- Вы ведаеце, што мне сказала ўчора Ганна? Сказала мне, што я дурніца. Што мяне мала забіць за тое, як я трымаюся з вамі.

Андрэй змоўчаў, таму што ў душы згаджаўся са словамі Ганны, і Ірына адчула гэта.

- Крыўдуеце на мяне?

- За што?

- За сябе.

- За сябе - не. Трошкі - за вас.

Ірына зразумела таксама.

- Пачынаеце менш паважаць мяне?

- Так, - сказаў ён, хаця ведаў, што гэта пашкодзіць яму.

Але гэта, відаць, не вельмі пашкодзіла, таму што яна, праводзячы яго да чорнага ходу, каб мінуць вахцёршу, якая вязала панчоху ля дзвярэй, сказала:

- Іскры забыў? Як жа ж гэта ты?

І ён, спыніўшыся ў двары, з адчаем прыціскаючы да сябе яе вузкія плечы, сказаў:

- Не магу забыць. Няма забыцця. Алё ж зразумей і ты мяне. Я несур'ёзны, я спяваю нават там, дзе нельга. Бадай, ты адзіная мяне ведаеш. Але нават ты не думаеш, што я, магчыма, паэт самага цяжкага лёсу. Бо я ўсё жыццё ані на імгненне не хадзіў у аўтарах прыказкі: "На тое права, каб было лева". І мяне не чакае лепшае. Ніколі. Я веру, што паэты чуюць усё нават пасля. Думаеш, лёгка Катулу?

Гэтыя бязладныя словы былі, у сутнасці, пазбаўлены сэнсу. Але ў тым і быў сэнс, што самотнае дрэва вільготна шумела над галавой, што набліжалася вясна, і сэнс быў проста дадаткам да шолаху траў і святла, нябачных над Масквою зорак.

- Я ведаю, - сказала яна. - Катулу было б лягчэй, каб Лесбія засталася з ім.

- Прынамсі, так здавалася б яму, - сказаў ён.

...А потым пачаліся дні і тыдні падвойнай гульні. Усё ў свеце, здавалася, спявала аб аднаўленні, а яна, купляючы ў антыкварыяце кітайскую "багіню шчаслівага кахання", глядзела на Андрэя адчужана і казала, што ён зноў "гіпнатызуе сябе".

Паўсюль лезла трава, міцэлій прабіваў грыбамі нават бетон на аўтастрадах, - а яна прымаўляла нешта наконт таго, што, не спадзеючыся калісь на цеплыню, так распланавала час, што зараз ёй дыхаць няма калі.

Ён разважаў лагічна: распланаванае можна змяніць. Яго вуснамі казала вясна, яго вуснамі казалі карэнні тапаляў, што прабіваліся на святло. Яны выбіваліся з бульвара на вуліцу, вучылі асфальт, пускалі яго дробнымі расколінамі і, нарэшце, высоўвалі да святла дэфармаваныя страшэнным цяжарам парасткі. Але што было да гэтага ёй? Яна "вышэй за ўсё ацэньвала сваю працу" і "кінула б таго, хто забараніў бы ёй яе". Як быццам ён, Андрэй, толькі і марыў аб гэтым.

А ў адзін з першых дзён мая, калі нават Чыстыя Пруды расквітнелі зялёным колерам жыцця, калі нават мёртвыя дошкі рэдкіх драўляных платоў укрыліся пасля дажджу аксамітным налётам і калі ён сказаў ёй: "так альбо не", - яна адказала з ледзянымі вачыма:

- Выявіце раней свой шлях, а потым скажыце мне. А што да блазенства, то яго давядзецца кінуць.

Абражаны да глыбіні душы, ён спытаў, чым ён мог заслужыць такія адносіны з яе боку. І тон, якім яна адказала яму, быў легкаважна-жорсткі:

- А вы ніколі і не глядзелі на мяне як на чалавека. Нават не пыталіся маёй думкі. аб сваіх вершах, глядзелі на іх як на лісты да мяне, а на мяне - як на цацку.

І гэта ў той час, як ён проста не асмельваўся патрабаваць яе ўвагі да сваіх вершаў.

Хіба гэта можна было растлумачыць? І ён сказаў:

- Гэта, апошняе, асабліва справядліва... Бог з вамі, жорстка вы мяне абразілі.

Яму хацелася, каб ёй стала на хвіліну балюча. І таму ён, узяўшы яе за вузкія плечы, сказаў:

- Досыць гуляць у хованкі. Трэба, каб трэці ведаў усё. Застанецеся вы з ім альбо не - хай вырашаюць гэтыя дні. Бо я больш не магу,

Ірына бачыла ў цемры яго вочы і, відаць, зразумела, што ён здатны на ўсё.

- Гэта ўжо не ваш смутак, - назнарок сурова сказала яна.

Замест добрай размовы зноў атрымалася "авантура", як сказала б Ганна. Не разумеючы, за што яго мучаць, ён пайшоў, куды глядзелі вочы, і ўсю ноч праблукаў завулкамі, потым выйшаў у поле і, адмахаўшы чорт ведае колькі кіламетраў, выбраўся на шашу недзе каля Пятрова-Дальняга.

Маладая канюшына ўжо кучаравілася на схібах. Нейкім невыразным прывідам стаяў у вачах пабачаны ноччу Архангельскі палац, заліты блакітным сяйвам месяца. Гудзела ў нагах.

Дадому ён дабраўся толькі ў гадзіну дня. Яніса не было. Будынак быў пусты: людзі выбраліся за горад.

Разумеючы, што Яніс можа парушыць яго сон, Андрэй заторкнуў за нумарок дзвярэй запіску: "Я сплю. Заходзь. Вячэра ў шафе" і, скінуўшы толькі пінжак і чаравікі, зваліўся на ложак.

Спаў ён пасля бяссоннай ночы доўга і прачнуўся, відаць, позна, бо шолах аўтобусных шын па асфальце гучаў ужо зусім

па-начному. Але разбудзіў яго не шолах шын, а нешта зусім другое, насцярожанае: прысутнасць другога чалавека ў пакоі. Хутчэй падсвядома ён пабачыў цень гэтага чалавека ў крэсле ля акна. Гэта быў не Яніс, і таму Андрэй працягнуў руку да выключальніка настольнай лямпы.

- Чакайце, - сказаў цень з занадта інтэлігентскім вымаўленнем. - Не запальвайце святла... Не варта.

- Гэта нейкі новы прынцып знаёмства, - сказаў Андрэй. - Што вам патрэбна, мая каліта ці маё жыццё?

- Мне мала патрэбы ў тым і ў другім, - сказаў цень. - Хутчэй мне патрэбна ваша сумленне.

Такія словы меў права сказаць яму толькі адзін чалавек у Маскве. І Андрэй ужо цвёрда ведаў, што гэта Ён, той, хто меў гэта права.

- А я толькі збіраўся зайсці да вас, - сказаў Андрэй. - Вы трошкі апярэдзілі мяне, Міхал... Добра, будзем гаманіць без святла. Прынамсі, вы хаця дазволіце мне закурыць?

- Валяйце, - сказаў цень.

- Можа, і вы?

- Я не куру.

- Каньяк?

- Піць яго ў такім доме? - з пагардай спытаў цень.

Андрэй пачынаў злавацца:

- Гэты дом не горшы за другія.

- Так, - сказаў цень. - Паўсюль аднолькавае дзярмо... Я не прашу ў вас прабачэння за ўварванне... як вы не прасілі ў мяне. Я падняўся сюды, пабачыў запіску. Дзверы не былі замкнёны. І вось я тут...

Па столі пакоя слізганула святло ад аўтамабільных фар. У гэтым святле Андрэй пабачыў высокі, трохі залысы лоб і цёмныя вочы, у якіх зараз акрамя іроніі жыла насцярожанасць.

- Яна пра ўсё расказала мне, - сказаў чалавек.

- Добра зрабіла. Я сам збіраўся зрабіць гэта заўтра.

- Чаму ж вы не зрабілі гэтага раней?

Успыхнуў чырвоны святляк папяросы ў пальцах Андрэя.

- Не прыміце гэта за прабачэнне, - сказаў ён. - Але каб я з самага пачатку ведаў, што яна замужам, - я неяк адолеў бы сябе. На жаль, потым было позна... Не ведаючы цвёрда яе адносін да мяне, я не мог падвесці яе, сказаўшы аб усім вам... Але заўтра я хацеў высветліць з вамі ўсё... Даю вам у гэтым слова гонару.

- Ваш гонар... - сказаў цень. - Чаму, вы думаеце, я не хачу зараз святла?

- Ну?

- Яна сказала, што я і так бачыў вас. У сорак першым. Што вы падобны на... таго...

- А вы не можаце даравацъ яму і зараз?

- Не. Мне проста не хочацца лішні раз глядзець у хлуслівыя вочы чалавека, які прыйшоў у мой дом і...

Андрэй сеў на ложку. Тонка зазвінела панцырная сетка. Потым у пляме святла з'явілася на стале вузкая рука Андрэя з пачкам цыгарэт.

- Курыце, - сказаў Андрэй іранічна. - Гэта не мае. Гэта забыў мой асабісты вораг Стаўроў падчас высвятлення адносін са мною...

- Гэтыя закуру з асалодаю.

- Ну вось, - сказаў Андрэй,- кажу далей. Я ведаю, я нарабіў вам болю і гора і прызнаюся: вы маеце права на жорсткія словы...

Шкадаванне да гэтага ценю ў паўзмроку пакоя было непаддзельна ад сораму за самога сябе. Андрэй ведаў: больш балюча, чым гэта зрабіў ён, нельга было ўразіць другога чалавека. Але ён не шкадаваў аб зробленым.

- Маеце права, - паўтарыў Андрэй. - Але маеце права ў апошні раз. Цяпер усё ясна між намі, і лепей за ўсё абысціся без залішняга віску. Па-мужчынску...Скажу вам шчыра: я кахаю яе. Але я не ведаю, што сказала вам яна.

- Сказала, што, здаецца, неабыякавая да вас, што не ведае, як ёй паводзіць сябе зараз.

- Тады я не ведаю, чаму б вам не саступіць з дарогі? - спытаў Андрэй.

- А вы думалі, што я таксама кахаю яе?

- Думаў.

- Тады ідзіце ад яе. Бо яна яшчэ сказала, што не захоча нанесці мне апошняй крыўды... Такое можа здарыцца з усякім. І таму я дарую ёй.

- А хіба любоў патрабуе даравання? - горка спытаў Андрэй. - Ці не думаеце вы, што з каханнем нешта няладна, калі ёсць патрэба даравацъ?.. Я не магу пайсці ад яе, Міхал.

Бягучае святло праплыло па сценах. Андрэй бачыў, як вочы Міхала беглі за ім, акідваючы позіркам больш чым сціплае абсталяванне пакоя...

- А што вы можаце даць ёй? - холадна спытаў муж, калі святло знікла.

- Нічога зараз, - сказаў Андрэй.

- А потым?

- Праз тры месяцы - усё. Але і зараз, і праз тры месяцы, і да канца дзён я дам ёй самае патрэбнае: цеплыню.

- А пакуль што яна хворая.

- Ведаю. І не вам яе лекаваць. Відаць, няма ў вас нечага даравальнага і добрага. Таму яна і пацягнулася да мяне.

Чалавек устаў. Андрэй таксама ўзняўся з ложка.

- Не, - сказаў чалавек, - я ўсё ж не магу пайсці адсюль, не пабачыўшы вас на свае вочы.

- Калі ласка, - сказаў Андрэй, уключаючы святло.

Абодва стаялі твар у твар, насцярожана і варожа аглядаючы адзін аднаго.

- А-а, - сказаў Міхал, - той, што прыходзіў тады!.. Сапраўды... падобны.

У куточку яго вуснаў ляжала грэбліва-з'едлівая складка.

- Я, відаць, недаацаніў сілы першага кахання.

І, стоячы ў дзвярах, сказаў:

- Да спаткання.

- Бывайце, - сказіаў Андрэй. - І, калі гэта можа вас суцешыць, скажу: ніколі яшчэ я не адчуваў сябе такой дрэнню.

- Ат, - сказаў Міхал, - што мне?..

- Баіцеся, - сказаў Андрэй. - Тут зараз усё на сумленні. Перамога будзе за лепшым. Але вы павінны ведаць, я не адыду.

- Я ведаю.

За постаццю госця зачыніліся дзверы. Андрэй падышоў да акна. Лёгкі ветрык варушыў фіранкі, нёс у пакой гукі начнога горада і бензінавы пах, перамешаны з пахам нагрэтага за дзень пылу і амаль няўлоўным водарам, прынесеным аднекуль, дзе камень саступаў дарогу кветкам і траве,

Добра было, што скончылася хлусня, што пачынаўся шчыры двабой: адзін на адзін.

## Раздзел XXVI

Прайшоў і амаль увесь май, як праходзіць усё добрае на свеце. Пару разоў Андрэй ездзіў у Мінск.

У яго адносінах з Ірынай нічога не змянілася. Цяпер яна не мучыла яго, але ўсяляк пазбягала. Кожны раз пасля лекцый

прыдумвала прычыну, каб пайсці адной, знікнуць, а калі гэта не ўдавалася - пераводзіла размову зусім на другія тэмы.

- Ну што, што з вамі? Хіба вам мала, што я ва ўсім прызналася яму? Куды вы спяшаецеся?

- Да вас.

- Не магу ж я забіць Міхала. Пачакайце, няхай звыкнецца з думкаю, што я не з ім.

- Што ён кажа вам, Ірына?

- Нічога. Маўчыць.

- А я не магу маўчаць.

- Зразумейце, усё яго жыццё ўва мне.

Гэта ставала нясцерпным. Андрэй ужо не мог ні есці, ні спаць. Горш за ўсё, што ён разумеў прычыну гэтага, але не мог не кахаць. Розум не меў ніякага дачынення да ўсяго, што з ім, Андрэем, адбывалася. І ўжо зусім не суцяшалі невясёлыя жарты Яніса, што гісторыя з гэтым каханнем даволі тыповая для дваццатага стагоддзя. Так, вакол сапраўды быў дваццаты век з яго падвышанай уражлівасцю, з яго высакалобасцю і бурхлівай пераацэнкай каштоўнасцей, катэгарычнай жорсткасцю адных і прасветленай цярпімасцю другіх, але ж у астатнім усё было як раней: жанчыны снавалі свае мярэжы, а мужчыны ўсё даравалі ім. Бо кахалі,

Дваццаты век, цень верталёта
Ляціць над гмахамі дамоў.
На ярасна-высокай ноце
Трапеча праца гарадоў.
Бяжыць над залатым бетонам,
Над эстакадамі ў сусвет,
Над трызненнем людзей шалёным
Трывожнае святло ракет.
І горад ад неона сіні,
Дзе век прыстанак свой знайшоў,
Трымае ў вуліцах жанчыну
З дзіцячай, спуджанай душой.
Ў адвечнай празе чалавека
Яе душа, яе рука
Шукае месца ў гэтым веку
І ўсё не можа адшукаць.
То ў шыльдах Суціна, то ў Хласка,
То ў Бацічэлі, то ў Манэ,
Ў канкрэтнай музыцы, ў Пікаса,
Ў хлусні, ў каханні і ў віне,

Ў карэктным мужы і ў кватэры,
Ў калекцыі старых карцін,
Ва ўсмешлівых старых хімерах...
Ці новых? - Знае бог адзін.
Мана - ад прагі ўстаткавання,
Мана - ад снегу за акном.
Няма святла, няма кахання.
Халодны свет. Халодны дом.
Не ведае, што век дваццаты
Ў святле, што бачыць ясны зрок,
У літасці, ў ламанні кратаў,
Ў паўстанні полымя на змрок.
Мне скажуць: моцным без патрэбы
Трымаць над прорваю такіх.
А я ўяўляю зоры ў небе
І вочы, што жывуць без іх.
І нават больш яе кахаю.
Няўтульная душой да дна,
Зусім малая, трапяткая,
Яна адна ў мяне. Адна.

Так, разважанні не прыносілі заспакаення, і колькі ні называй дваццатага стагоддзя дваццатым - гэта не магло змяніць прыроды кахання. Яно радавала і мучыла, як і на світанку чалавечых дзён.

...У канцы мая вялікая група хлопцаў і дзяўчат разам з Горавай і Галінай Іванаўнай паехала на некалькі дзён у Ленінград. Гэта было нешта накшталт развітальнага падарожжа. У чэрвені большасць з іх павінна была назаўсёды раз'ехацца па сваіх гарадах, пакінуўшы Маскву і адзін аднаго. Таму нават у весялосці прысутнічаў нейкі сум.

І толькі Грынкевіч ехаў на поўнач радасны, бы ў вяселнае падарожжа. Быць з Ірынай у адным вагоне, жыць у адной гасцініцы, цэлы тыдзень быць з ёю... І гэта перад тым, як яна назаўсёды будзе з ім.

Не, гэта было такім нясцерпным шчасцем, што кружылася галава.

...Гэта быў горад - мара. Андрэй зразумеў гэта на самым першым спатканні з ім, калі, пакінуўшы ў гасцініцы спячых сяброў, выйшаў на Неўскую набярэжную. Світання, уласна кажучы, не было, бо стаяў канец мая і цямнела ўначы толькі на гадзіну-дзве.

Нява, яшчэ напаўсонная, каціла ў заліў плыні, зрэдку ўсплёскваючы грабеньчыкамі. Невядома, адкуль яны браліся: ветру не было ў бескалярова-блакітным небе, у паветры, якое пахнула ёдам і аж нясцерпна пашырала грудзі. Шпіль Петрапаўлаўкі ўпіваўся ў неба, ужо злёгку пазалочаны на самай вяршыні. Ён быў лёгкі і горды, як бессмяротны радок.

І, акінуўшы ўсё гэта, Андрэй зразумеў, што прапаў. Гэты горад быў падобны на тыя гарады, якія сняцца ў самых шчаслівых снах дзяцінства, аб якіх потым плачаш, не маючы змогі трапіць у згублены рай.

Упершыню пасля дзён дзяцінства захацелася ўзняцца і паплысці над гэтай вадою - вышэй, вышэй над будынкамі і шпілямі, над недалёкім морам.

О, толькі б жыць!

Рука апусцілася на балюстраду поруч з ім. Андрэй паглядзеў і пабачыў Ірыну, усю нейкую маленькую і ласкава-зажураную.

- Я ведала, што вам не спіцца. Нават чамусьці ведала, дзе вас шукаць.

Замест адказу ён накрыў усю яе руку сваёй вялікай далонню. Рука ляжала пакорліва, не варушылася.

Андрэй знемагаў ад цеплыні і шкадавання да яе.

Стаяла поруч з ім нейкая смешная, быццам нават трохі заспаная, моўчкі глядзела, як налівайся золатам шпіль за ракой,

- Калі мне было цяжка, - сказаў Андрэй, - я тады хацеў выпаліць з сябе ўсё. Толькі так, таму што ніколі пачуцці не даюць нічога, акрамя гора і болю. Але цяпер я спакойны. Вы поруч. Я пабачыў гэты горад і сустрэў вас, Нашто супраціўляцца каханню, калі ўсё на свеце мае канец, і мы з'явіліся аднекуль і кудысь знікнем, і маглі нават не сустрэць адзін аднаго за дні, адпушчаныя нам.

Бязважка дакрануўся шчакою да яе скроні:

- Я і не супраціўляюся. Дзве залатыя іскры выпадкова сустрэліся. Ёсць яны і гэты горад, - досыць...

- Не трэба, Андруша, - сказала яна. - Я не хачу аб тым, што будзе...

- Чаму?

- Які вы... Жыць трэба больш лёгка і проста... Нашто вы... Ну я вас прашу, я вас вельмі прашу - не трэба загадзя... Каму гэта вядома, што там будзе... Будзьце задаволены, што я поруч... і не хачу больш ні з кім, і вакол гэты горад, а ў нас наперадзе яшчэ дзесяць дзён, аж цэлых дзесяць дзён. Стагоддзе. Вечнасць.

Так пачалася песня песняў. Тая, што нават для самых шчаслівых гучыць толькі адзін раз.

Былі астравы, а потым мора, вялізнае, пустое, бялёса-блакітнае, бясколерна-блакітнае пад бясколерна-блакітным небам, з залатымі іскрамі сонца, якія нараджаліся і чэзнулі недзе ўдалечыні. А можа, і не было мора і неба? Можа, проста было нешта блакітнае, што заняло палову ўсяго свету? Ён не ведаў, а яна, седзячы поруч з ім у аўтобусе, казала:

- Што вы ўсё гледзіцё на мяне? Туды глядзіце.

Але ён разумеў, што ўсе гэтыя словы проста так, і разумеў, што яна ведае гэта. Яна разумела ўсё ў ім. Нават калі ён выходзіў з брамы Петрапаўлаўкі да прычала, адкуль калісьці вывозілі людзей на востраў Галадай, выходзіў занадта прамы, склаўшы за спіною рукі, шапнула яму:

- Цяжка, праўда?

Яна разумела ўсё, акрамя таго, што яму хацелася гаварыць аб каханні і аб будучым. Гэтага яна не хацела і вымаліла ў яго гэтае абяцанне, а ён з горыччу і пакорай даў ёй яго, быццам зразумеўшы, што ёсць толькі дзесяць хуткаплынных дзён, што нельга патрабаваць большага ад жыцця, што яна, калі захоча - будзе з ім, але хутчэй за ўсё не захоча.

І ён безнадзейна змірыўся, таму што ведаў: усе гэтыя дні яна аддасць толькі яму, толькі для яго. Усе. Цалкам. У гэтым быў нейкі горкі гонар, які даваў яму сілы жыць.

Ірына сапраўды ўсё аддавала яму: кожны позірк, кожны рух, кожнае слова. Нават калі расказвала ў Эрмітажы аб "Старым у чырвоных адзеннях" - усе яе словы нейкім дзівосным чынам былі накіраваны да Андрэя, адказвалі на самыя таемныя з яго думак, мацавалі ў добрым і суцяшалі ў дрэнным.

Гэта былі дзіўныя адносіны, якіх пакуль што амаль не бывае на зямлі. Быццам сама душа каханай перайшла ў душу каханага. Напэўна, калісь, калі на зямлі пакінуць крыўдзіць, калі не будзе моцных і слабых, калі знікнуць хлусня і непаразуменні і брыдкая гульня ў хітрыкі, калі змагацца за жанчыну будуць толькі з ёю самой - менавіта такімі будуць адносіны тых, хто захоча быць адзін з адным. Ні цэню непаразуменняў, дабрыня да кожнага выгіба думкі другога, добразычлівае імкненне ўсё аддаць для яго, нічога не патрабуючы ўзамен, вера ў тое, што ён таксама зробіць гэта.

А вечарамі яны ўцякалі ад усіх і гадзінамі блукалі па горадзе, на які ўсё больш упарта наступалі белыя ночы з іх

замрэяным святлом. І тут ужо маглі казаць шчыра, словамі або без слоў.

Пётр імкнуўся ў свой вечны палёт над ракою.

- Усё як наканавана для нас, - сказаў Андрэй, трымаючы яе за тонкую руку. - Памятаеце, пры Напалеоне рускі салдат і беларускі мужык затрымалі корпус, які ішоў на Пецярбург.

- Ну...

- Каб я верыў, я ўвесь час маліўся б за іх. Колькі ўсяго яны зберaглі! Гэты палёт Пятра і гэтых сфінксаў. Што яшчэ?

- І юнацтва Пушкіна ў ліпавых алеях, - напомніла яна.

- Так. І ўсё астатняе... І зберaглі гэтыя дні. Для нас.

Дзіўна, яны не адчувалі, што іх словы занадта высокія. Яны не дзівіліся б нават, абое загаварыўшы вершамі. Усё было іншым у гэтыя дні.

На гарбатым мосціку, дзе струмень чыстай неўскай вады ўліваўся ў Зімнюю канаўку, у час, калі за Стрэлкаю на алым фоне захаду ўстаюць цені рагатых калон, яна ў адзін з вечароў сказала яму:

- Ты робіш мяне такой высокай, што мне страшна, мне брыдка за многае ў жыцці. Няўжо не так, як трэба? Як жа тады вымаліць дараванне за ўсё, родны?

- Мы за ўсё вымалілі дараванне. Усім гэтым.

Яму так было шкада яе, што дрыжалі рукі, якімі ён саграваў яе пальцы. А пад мостам змяіліся і беглі кудысь у чыстай вадзе тонка-зялёныя пасмы водарасцей. Была толькі адна хвіліна, калі яны адчулі нейкую насцярожанасць. Ён прызначыў спатканне ля Казанскага сабора, прыйшоў зарана. Сядзеў, гледзячы на тое, як дзеці малююць нешта на пяску. Малявалі ружу, і малявалі дрэнна, гэткія смешныя пульхныя дзеці, карапузы з ільнянымі валосікамі. Нельга было не дапамагчы ім. І таму, прыйшоўшы на месца спаткання, Ірына са спіны пабачыла Андрэя, які сядзеў на кукішках і дапамагаў дзецям.

- Лісцікі ў ружы не такія, лапа. Яны ледзь-ледзь вызубленыя. Вось такія... Вось... Вось...

А калі яны сустрэліся позіркамі, пайшлі адзін да аднаго і дзеці кінуліся за Андрэем, нават падбегам, Андрэй раптам пабачыў дзіўны выраз, з якім вочы Ірыны глядзелі на іх, і сказаў:

- Ідзіце, любыя. Ну чаго вы, сапраўды? Мы заўтра яшчэ тут будзем.

Супакоілася яна толькі ў кафейным доміку. Ён амаль ужо зачыняўся, і іх з хвіліну не хацелі пускаць. Андрэй з жартаўлівым адчаем умаўляў афіцыянтку, і тая, паглядзеўшы ў яго вочы і на Ірыну, сказала з уздыхам:

- Ідзіце ўжо.

Залацілася віно ў келіхах. Шэрыя вочы спагадліва і стомлена глядзелі на Андрэя. З Фантанкі, заснаванай маладой зелянінай дрэў, даляталі ўсплёскі вёслаў, мяккая вячэрняя песня.

...Дзесяць дзён здаваліся вечнасцю. Дзесяць дзён прайшлі. За два дні да тэрміну яна атрымала выклік з Масквы. Андрэй збялеў, пачуўшы аб гэтым. А яна расказала гэта вельмі вытрыманым, вельмі спакойным голасам, быццам адбыла нешта, што патрабаваў ад яе абавязак, і ніхто не можа патрабаваць ад яе звыш гэтага.

На вечар у іх былі білеты ў кіно. І яны пайшлі туды, у вялізны кінатэатр за Нявой, хоць заўтра яна павінна была ехаць. Увечары. Усе гэтыя дні з іх шчасцем, са святлом, што лілося з ракі ў шырокія вокны Эрмітажа, са штодзённымі залатымі дажджамі, якія наляталі аднекуль, а праз дзесяць хвілін заставаліся ўжо толькі вільгаццю на зелянiне і мармуры Летняга саду, з фасфарычна-блакітнымі вечарамі - усе яны скончыліся.

- Няўжо гэта ўсё? - спытаў ён, калі яны сядзелі ў скверы ля кіно.

- А ў каго зусім не было? Ані дня?

- Усё?

Цыгарэта трэслася ў яе пальцах.

- Ах, нічога, нічога я не ведаю.

Непаразуменне, адчай і пратэст супраць усяго гэтага былі такімі, што Андрэй, закалаціўшыся ўвесь, узяў яе за рукі, сціснуў вузкія пальцы.

- Бяжым адсюль, Ірына. Бяжым. Вам трэба бегчы. Ад яго. Ад сябе. Далёка.

- Куды ўцячэш?

- Спачатку ў Сухадол, да дзядзькі. Там чыста, там дабрыня людзей і дрэў. Бяжым. Калі вам цяжка браць развод, цяжка глядзець у вочы гэтаму чалавеку - абыдземся без яго.

У прысмерку ён не мог заўважыць яе вачэй, а твар вонкава быў спакойны.

- Потым, - глуха сказала яна. - Пасля сеанса. Хадзем... Зараз... пачнуць.

Яны сядзелі, не вельмі сочачы за экранам. За іх спінамі ўздымалася сцяна наступнага яруса, ствараючы ўражанне іхняй самоты ў гэтай зале. Ды хоць бы яе і не было - што было Андрэю да іншых?

Ішла нейкая французская камедыя пра вайну, хоць вайна, вядома, зусім не камедыя. Куражыўся прыдурак-эсэсавец; пад нацыянальным французскім сцягам адплываў у эвакуацыю, не жадаючы здавацца на літасць ворага, гераічны вясёлы дом.

Андрэй нічога гэтага не заўважаў. Яна, напэўна, заўважала не больш. Узяўшы ў цемры яе руку ў карункавай пальчатцы, ён, схіліўшыся да яе галавою, абсыпаў яе пацалункамі, увесь калоцячыся ад цягі і адчаю і непапраўнасці таго, што мелася быць заўтра.

Толькі тут, упершыню за вечар, з плыні абыякавых слоў вырвалася:

- Так любіш мяне? - і голас гучаў адчайна нават у шэпце.

Спалоханая тонам, ведаючы, што выдала сябе, аддала сябе яму ў рукі, яна адразу ж сказала:

- І вам яшчэ не абрыдла гэтая пальчатка? - але голас, зрываючыся, казаў зусім не тое, і гэта прагучала, як "вазьмі мяне адсюль".

...Над паркам вісела кароткая, на дзве салаўіныя песні ноч. Бэз распасцёр над галовамі цьмянае і загадкавае лісце.

Шчоўкнуў непадалёк, выпрабоўваючы голас, салоўка. Потым, наўздалёк, пусціў калена яшчэ адзін, яшчэ, яшчэ. Першы адказаў - быццам крыштальная вада падала на срэбра. Забулькацела радасць яшчэ ў адным маленькім горле. А потым усе яны, забыўшыся на ўсё, аддаліся спеву.

- Я ўсё скажу табе ў Маскве... Адразу... Слова маё... Толькі не пакутуй так... Куды спяшацца, калі ўвесь... увесь свет наш...

Цяпер ужо сад звінеў.

...Калі яны ішлі начным горадам, ён казаў ёй:

- Буду чакаць. Толькі не падманіце мяне... Нельга...

Вялізным лукам павіснуў над імкліва-спакойнаю ракою мост. Агні адбіваліся ў вадзе, і Ленінград спаў над вадою, як здань, а крокі гучалі... гучалі... гучалі.

- Мы адны не спім у горадзе, - сказала яна. - Як хлапчукі... Як маладосць... Як жыццё спачатку... Даверлівыя шэрыя вочы глядзелі на Андрэя.

- Прачытай мне вершы, дарагі... Ты вельмі даўно не чытаў мне вершаў...

- Памятаеш, быў такі Іксіён? - пасля паўзы спытаў Андрэй. - Закахаўся ў Геру, жонку Зеўса. Яго вырашылі злавіць і падсунулі яму воблака, надаўшы яму вобраз Геры. Ён выдаў сябе, абдымаючы воблака, і яго навекі прывязалі да кола, якое круцілася.

- Ну, - шэптам сказала яна.

Голас пачаў чытаць прыглушана, у тон гэтай ночы і ракі, што шапацела пад быкамі моста.

Я позабыл начало всего.
Мне неведом конец.
Молот вырвав нз рук моих,
Слепая кует судьба.
Теплой весной, прошедшей весной
Я увидел во тьме,
В дебрях ночных, в мерцании звезд
Смертоносной прелести лик.
Гера, Гера, любовь моя!
Ветви в зеленых огнях.
Тень, как отдыхающий лев,
Улеглась у ног голубых...
К ней стремлюсь, обнимаю ее.
Она сквозь пальцы течет.
Только облако, только туман,
Только призрак в руках моих.
И привязали меня к колесу,
К карусели улиц ночных.
Город прыгает... Город ревет...
Город пылает огнем...
Вертится, вертится колесо,
Жаждой пылает мозг..
Ты бессилен, могучий Зевс,
Сердце во мне убить.
Гера, Гера, как ты могла
С ним быть заодно?
Жаль, что облаком ты была.
Ничего остального - не жаль.

Некаторы час панавала маўчанне. Толькі крокі паміралі ў начных палацах над набярэжнай. Слаба фасфарасцыравала рака, адбіваючы рэдкія агні.

- Ты пішаш і па-руску?

- Спрабаваў адзін-два разы. Чаго я толькі ў жыцці не спрабаваў? Калісь нават па-ўкраінску і па-польску спрабаваў... Напісаў дзве лацінскія эпіграмы. Нічога цяжкага.

Прыціскаючыся да яго, яна сказала:

- Я не заадно з імі... Я таксама папалася... Але я вырвуся да свайго Іксіёна... Ты пабачыш...

За карункавай агароджай драмалі ў цеплыні шаты Летняга саду. Дыхалі сонным водарам траў, цёплай вільгаці, кветак.

Спыніўшыся на мосціку цераз Фантанку, гледзячы ў вочы Ірыны, што адбівалі іскры зарэчных агнёў, ён сказаў, прыціскаючы яе да сябе:

- Я веру... Толькі ведай - калі ты забудзеш - здарыцца непапраўнае. І ты ведай толькі адно... Гадзіна маёй смерці скрытая ад мяне, і таму я не ведаю, ці доўга буду цябе кахаць.

Цалаваў яе вочы.

- І перад гэтым, калі ты пакінеш мяне, - ведай - адчай усё адно застанецца. Нават старым падумаю, як пятроўскі стольнік калісь, што вось была Венецыя, і маладосць, і быў я там "инаморато в славную хорошеством читадинку, синьору Франческа Рота, и тако был инаморато, что доселе тот амор из сердца мово не вышел и, чаю, не выдет".

Уся дрыжучы, яна прынікала да яго, а ён сурова і горка казаў ёй:

- Дні праходзяць, Ірына. Праходзяць дні.

## **Р а з д з е л XXVII**

Гэта адбылося праз тры дні пасля вяртання з Ленінграда. Андрэя чакаў у Маскве рэжысёр, што пачаў рабіць фільм па яго сцэнарыю. Рэжысёр прывёз ліст ад сябра, што з домам усё гатова, і ліст ад дырэктара студыі. Прасілі яшчэ адзін сцэнарый.

Пасля размовы з дзвюма актрысамі, якія меліся браць кінапробы на галоўную ролю, Андрэй папрасіў рэжысёра пачакаць і пазваніў Ірыне, каб расказаць ёй аб усім тым добрым, што здарылася.

- Андруша, - сказала яна ўзрадаваным ціхім галаском. - Вось добра... Кажаш, рэжысёр?.. Не, з ім не трэба прыходзіць... І самому, напэўна, не трэба сёння... Пачуваю так сабе... Не, не прыходзь...

Уздыхнула:

- Не магу больш, Андруша... Прыходзь заўтра ў сквер ля інстытута... Вырашым усё да канца... Не пакутуй, спі спакойна ноч... спі, добры мой.

Гэты пяшчотны, безабаронны голас усё яшчэ спяваў у яго вушах, калі ён падыходзіў да дома паэтаў.

А ўвечары адбылася цяжкая гісторыя.

Вечар стаяў спякотны, і таму Андрэй у адных трусах і майцы ляжаў на кіліме, на падлозе, і чытаў "Боскую камедыю" Дантэ, калі да яго ў пакой уварваўся Яніс.

- Адаліска ў гарэме, - сказаў Яніс,

- Ідзі да д'ябла.

- І чытае, напэўна, казкі Маргарыты Наварскай. Гісторыю аб тым, як у швейцарца была занадта гарачая жонка.

- Ёлуп, - сказаў Андрэй. - Гэта не ў Маргарыты, гэта ў Дзюпер'е. Гэта ўсё адно што зблытаць Апалона з Панам, каб цябе чэрці ў пекле з грэшнікамі блыталі, каб цябе...

- Д'ябал з імі, - сказаў Яніс. - Што Апалон, што Пан - адна мінералогія.

Сеў у крэсла.

- Выгляд у цябе сёння не вельмі разумны. Што ты там знайшоў у Дантэ вясёлага, амаральны ты чалавек?

- Янка, - сказаў Андрэй, - заўтра ўсё вырашыцца. Па тону мяркую, што ў добры бок.

- Ну! - сказаў Яніс і сеў на падлогу, абхапіўшы рукамі калені.

Запанавала маўчанне.

- Я шчаслівейшы за цябе, - сказаў урэшце Яніс. - Шчаслівейшы, нягледзячы нават на тое, што яна жорстка мяне абразіла, ледзь не пасварыла з табою.

- Ведаю, - проста сказаў Андрэй.

- Ну-к што, - уздыхнуў Яніс. - Тады табе, вядома, не да гулянкі. А нас Харунжы запрасіў. Ачуняў ад хваробы. Было ў яго "воспаленне всегда лишнего нерва". Відаць, пайду адзін.

- Чаму? - весела ўзняўся Андрэй. - Возьмем і мы сапераві белага або цынандалі, пойдзем да іх. Ніхто не будзе ведаць, а для нас нешта накштдлт хлапечніка.

...Сабраліся ў пакоі Харунжага. Акрамя гаспадара і нашых хлопцаў быў гультаяваты Баранаўскас з нейкім земляком літоўцам ды яшчэ Стаўроў з маленькім Ліпскім. Прыцёгліся "на агеньчык". Непрыемна, вядома, але д'ябал з імі.

Суцянела. Над дахамі далёкіх дамоў пераліваласа ледзяным крышталём чыстая зорка. Праз адчыненае акно было чуваць, як

недзе далёка, у кветніку аднаго з дамкоў, на якія адусюль наступалі новыя дамы і краны, жаночае сапрана і дзіцячы альт, з перадыхамі, вельмі па-вясковаму, вялі песню пра тое, што "он не чувствует любовн ннкакой". Матыў гучаў старадаўняй рускай тугой.

- Знайшла, дурышча, рэпертуар для дуэта з хлопчыкамі, - з какетлівым сарказмам сказаў Ліпскі. - А потым той вырасце ды і дзёўбне гэтага "дорогого родителя" ў цемечка за тое, што той ягонай "любови не чувствует".

- Кінь, - сказаў Харунжы. - Яны простыя, яны разумеюць. Лепей няхай дзеці даведаюцца аб пакутах кахання па гэтай песні, чым па словах у пад'ездзе, як шмат хто з інтэлігенцкіх дзяцей.

Стаўроў, відаць, вьшіў недзе раней. Непрыстойна прыгожы твар яго з пашыранымі ад віна і цемры зрэнкамі перакрывіўся так, што гэта было прыкметна нават у прысмерку:

- А каханне што, не ў пад'ездзе?

- Кінь, - сказаў Харунжы, - лухту кажаш. П'яны ты.

Стаўроў не сунімаўся:

- Пад'езды і платы праўду кажуць, брат, Я такія словы на адным з ленінградскіх платоў чытаў - вось толькі пяць дзён таму, - што там твой Эклезіяст?! Разумееш, на вышыні дзіцячага росту крэйдай начыркана: "Усе будуць мерцвякі!" Во! І пра любоў праўду пішуць, чаму гэта да адной гэткая перавага? Што ў яе - усё іначай уладкавана? Аднолькава, брат, ва ўсіх. Ведаеш адну - усіх ведаеш.

- Стаўроў, - ціха сказаў Андрэй, - ты гаворыш брыдоту.

- На брыдоту - кнігі патэнт узялі. А я чалавек просты.

Ліпскі засмяяўся гуллівым тэнарком.

- Мярзоту кажаш, - сказаў Андрэй.

- Хопіць, хлопцы, - сказаў Яніс.

- Ды хлопцы, хлопцы, - пачаў умаўляць Харунжы. - Што вы завяліся? Можа, вы яшчэ і мяне наб'яце? Пілі ў Філі ды Філю і набілі.

- Прыйшлі ў маю хатку, ды б'юць майго татку, - па-беларуску дадаў Баранаўскас.

Ліпскі і тут засмяяўся, але значна менш лісліва.

- Вып'ем лепей яшчэ, - сказаў Харунжы. - Ну, хто па цынандалі?

Выпала ісці Янісу. Ішоў ён неахвотна, доўга ўмаўляў Андрэя збегаць за кампанію. Андрэй адмовіўся.

А Стаўроў, ледзь за Янісам зачыніліся дзверы, завёўся зноў:

- Каханне, соплі лірычныя распусцілі. У нас, брат, атамны век. Людзям няма часу ні на чытанне доўгіх кніг, ні на шпацыр пад ліпамі. У вашага цнатлівага кахання белая сукня. А час не той. Вакол не ліпы. Вакол машыны і мазут.

- І праўда, - падхапіў Ліпскі, легкаважна ўзрадаваны тым, што відавочна наспявае скандал, а яго патрон такі пераканальны і так вобразна гаворыць. Тварык ягоны, лялечна-маленькі, бліскаў вочкамі ў прыцемку.

- Пакінь, - нарэшце сказаў Андрэй,- слухаць ванітуе, такой дрэнню панесла.

- А ты - іншы? - спытаў Стаўроў. - Ты з Марыйкай Крат што, на зоры глядзеў?

- Глядзеў і на зоры, - нечакана сур'ёзна сказаў Баранаўскас.

- Ды я ж не асуджаю, - з вонкавай памяркоўнасцю, дабрадушна сказаў Стаўроў. - Сёння ён, заўтра - іншы. Жывыя людзі.

- Быдла ты, - сказаў Баранаўскас.

- Чакай, - сказаў яму Андрэй, - не абараняй мяне... Я ведаю, Стаўроў, ты маеш права кінуць камень у мой агарод за мінулае. Не чапаючы Марыі, я скажу: я сапраўды апусціўся ў той час. Гэта было з-за абыякавасці да жыцця. І мне вельмі брыдка за сябе...

- Ты што ж, змяніўся? - спытаў Стаўроў.

- Мяркую. Ва ўсякім разе, каханне не тое, аб чым ты гаворыш, Яно ўсё дае: кнігі, музыку, гераізм. Бо нельга ў вачах каханай быць слабым, дрэнным, бяздарным.. Вядома, гэта шчасце быць з ёю разам, блізка. І толькі з адной, заўсёды. Але гэта яшчэ і тое, што яна разумее без слоў, што думаеш з ёю аб адным, што можаш аддаць ёй апошняе. Гэта яшчэ і бяссонныя ночы, калі хварэе, і чаркі, якія выпіў, блукаючы вакол радзільнага дома, і мастацтва, і музыка ў доме, і нават смерць. Ведаеш, аб чым моляць для каханых беларускія казкі як аб апошняй ласкасці? Памерці ў адзін дзень. Каб не біцца галавою аб крыж, аб пусты ложак, аб кожны пень у лесе, куды пайшоў выплакацца.

- Надбудова, - у голасе Стаўрова налівалася нейкая аж занадта вялікая для такой спрэчкі злосць. - Надбудова над базісам... Размовы аб мастацтве - ах-ах! Перыйкі ўсё! Шлюбны ўбор у цецерука. Ходзіць і балбоча.

Ён махнуў рукою:

- А, ды што там. Вось адна, усім вам вядомая. Толькі і ішлі ў нас размовы пра Эль-Грэка, што да лыжка... Адразу як нажом адсекла. А вытанчанасці, здаецца, на ўсю акадэмію мастацтваў хапала.

- Хто гэта? - амаль адразу спыталі Баранаўскас і Харунжы, і ў галасах іхніх было непаразуменне. - Не ведаем.

Андрэю быццам гноем ляпнулі ў твар. Ён здагадаўся, куды хіліць Стаўроў, і ведаў усімі глыбінямі душы і сумлення, што гэта няпраўда, што гэта помста, што не пасуе нават нікому з жывёл. А тут сядзеў чалавек. Чалавек?

Ён толькі з вялікім намаганнем устрымаўся ад поўхі. Поўха адкрыла б усім імя. Андрэй ведаў, усе абураліся б, але ніштo, нават край ценю, не павінен быў упасці на гэта імя. Яго не павінны былі назваць. Устаць на абарону павінен быў толькі адзін чалавек, ён. Ён, які адказваў за яе лёс, за чысціню яе дарогі не толькі з заўтрашняга дня, а з таго імгнення, калі, яшчэ не закаханы, ён зразумеў, што яна дарагая яму як друг.

- Я таксама не ведаю хто, - цяжка сказаў Андрэй. - Але я мяркую, што нават калі прамоўца насупор свайму звычаю не хлусіць - тое, што ён сказаў, нявартa мужчыны... Усякага, а не толькі прыстойнага. Яны давяраюцца нам, спадзеючыся на наш гонар, і мы маўчым. А хто не маўчыць - той баба.

Прамаўчаў.

- Спадзяюся, што ты, Стаўроў, не зробіш апошняй нізасці. Я, напрыклад, ніколі не бузую імён дзяўчат па корчмах. І ніколі не кажу нікому, што другі мужчына атрымаў ад жанчыны абшыд.

Страла трапіла дакладна ў цэль. Але гэта разумелі толькі Андрэй і Стаўроў. Запанавала цяжкае маўчанне. Потым Харунжы кашлянуў.

Маленькі Ліпскі вырашыў, відаць, выручыць друга:

- Ды ён не хлусіць, - тэнарком сказаў ён. - Я, калі хочаце, ведаю. Я, калі хочаце, і...

- Вось што, - перарваў яго Толька. - Ідзіце вы, хлопцы, удвух адсюль. Мне непрыемна бачыць вас тут.

- Не вельмі трэба, - уздымаючыся, сказаў Стаўроў. - Чыстаплюі.

Калі за ім і Ліпскім зачыніліся дзверы, Харунжы злосна хмыкнуў:

- Ах, дрэнь бывае! Ах, дрэнь! І шанцуе ж гэткай дрэні! Што ў жыцці, што ў літаратуры!..

- Б...... бл...., а бог ёй долю гатуе, - змрочна сказаў Андрэй.

- Твая праўда, - плюнуў Харунжы.

І ненатуральным тонам сказаў:

- А Янкі няма. Як за смерцю пайшоў. Пайшлі Вайвадса, а за ім другога... Во каб гэта ён дзверы адчыніў ды сказаў: "Вы яшчэ палайцеся. Я і зусім тады не пайду".

Але ніхто не засмяяўся. Усім было пякуча сорамна.

Андрэй сядзеў вонкава спакойны, але ўнутры ўсё ў ім высока трапятала, як на грані абрыву. Надыходзіў ягоны час. Трэба было толькі счакаць, каб не здагадаліся.

- Вып'ем, - бестурботна сказаў ён.

Усе загаманілі, чокаючыся. Усім стала трохі лягчэй. І тады Андрэй устаў:

- Пайду я насустрач гэтаму латышу, - сказаў ён. - Гэта ён, напэўна, за нешта палаяўся там,

Тон быў натуральны. Толькі Баранаўскас мог не паверыць. І таму, асабіста для яго, Андрэй сказаў:

- Ведаеш, Гінтас, як мы з ім вячэру здабывалі?

- Не.

- Гэта даўно было. Вярталіся позна, вячэраць не было чаго. Яніс тады яшчэ забываўся, што я па-латышску ведаю толькі "лудзу", "сірдс", "шняпс" ды яшчэ пачатак песні пра пеўніка: "Куды ты, маўляў, бяжыш, пеўнік?" А тут скандал. Перад святамі магазін павінен да дванаццаці гандляваць, шыльда адпаведная вісіць, а тут 11.15, а зачынены. Не пускаюць, Мы - высняць гэта пытанце. Слова за слова - Яніс пачаў гарачыцца. Падыходзіць міліцыянер. Ну, думаю, дрэнна. А Яніс у гарачай вадзе купаны, пачынае лаяцца на латышскай мове. Ну, думаю, трэба падтрымаць кампанію. Развёў рукамі і тонам страшэннага абурэння пераказваю прозай пачатак песні: "Куртутэ-эцы". Яніс глядзіць квадратнымі вачыма. Потым разумее тактыку і, у той самай танальнасці: "Кур-ту-тэ-э-эсцы". А я яшчэ на дзве актавы вышэй, быццам у мяне на вачах дзіця пакрыўдзілі: "Га-ай-літ-ман". Міліцыянер бярэ пад казырок і кажа: "Прабачце, панове, я не ведаў, што вы англічане".

- Прапусцілі? - спытаў Баранаўскас.

- Прапусцілі.

- Брэшаш ты, як наняты.

- Чаму. Ты вось ідзі і спытай у чаргі па-літоўску: "Праўда, што ад віна галава баліць?" Адразу без чаргі пусцяць.

Кампанія нязлосна зарагатала.

- Уліп, - сказаў Баранаўскас са смехам.

Андрэй выйшаў.

- Добры хлопец, - сказаў Харунжы.

- А Янка, па-твойму, дрэнны? - спытаў Баранаўскас.

..."Добры хлопец" тым часам стаяў ужо ў пакоі Ліпскага.

- Што табе?

Варта было б даць яму, але Андрэй разумеў: гэта толькі падгалосак Стаўрова, Моська, якую можна перашыбіць саплёю.

- Ліпскі, прызнайся, што збрахаў.

- Ды я што, - чырвань плітамі папаўзла па лялечных шчаках Ліпскага. - Я... веру Стаўрову.

- Чаму? Авансы табе рабілі?

- Не зусім... але...

- Сумленне тваё дзе? Пэцкаць імя жанчыны. Брахаць.

Ён бачыў, што Ліпскі ачуньвае ад спуду і пачынае казырыцца. І тады Андрэй узяў яго за грудзі і, прыўзняўшы, пасадзіў на біла ложка.

- Ліпскі, - сказаў ён, - ты ведаеш, я гіджуся бойкі, мы не звяры дзікія. Але ўлічы, подласць б'юць. Сёння я стану біць твайго Стаўрова смяротным боем. За хлусню.

- Гэта яшчэ хто каго.

Заўвага была слушнай. Стаўроў быў відавочна больш узмацярэлы, чым Андрэй, важыў, нават на вока, кіло на дванаццаць больш. Сутыкніся яны проста так - ад Андрэя, магчыма, пер'е ляцела б. Але тут Андрэй ведаў, што б там ні было, ён наб'е Стаўрова, наб'е двух Стаўровых. Іначай - хоць і не жыві.

- Я стану біць яго смяротным боем... А ты, ты толькі скажы мне, ці любіш сваю маці?..

Ліпскі падумаў, што Андрэй успомніў маці не на дабро.

- Чаго ты мяне чапаеш?! Пры чым тут маці?!

- Я не аб тым. Скажы, каб пра тваю маці, сястру, дачку сказалі нешта такое... Што б ты тады?..

Ліпскі апусціў вочы:

- Забіў бы, - глуха сказаў ён і дадаў пасля паўзы: - Я схлусіў. Я думаю, што схлусіў і Стаўроў... Пусці мяне.

Стаўшы на ногі, ён ціха падышоў да акна.

- Хочаш, я скажу хлопцам, што схлусіў? - гледзячы ў цемру, спытаў ён.

- Калі спатрэбіцца - скажаш.

...Пакой Стаўрова быў за паваротакаю калідора. Андрэй пастукаў у дзверы. Магчыма, занадта гучна.

- Галавой, - сказаў раздражнёны голас.

Андрэй адчыніў дзверы. Стаўроў сядзеў на ложку ў трусах і ў майцы. Грудзі, зарослыя валасамі, былі шырокія, хаця і занадта атлусцелыя, але затое ногі, рэльефна ўкрытыя дробнымі і буйнымі мускуламі, былі застрашліва-дасканалыя.

"Калі пачне брыкацца, будзе дрэнна", - падумаў Андрэй.

Так, было ў гэтым чалавеку нешта ад звера, нягледзячы на акуляры, нягледзячы на непрыстойна прыгожае аблічча. I горш за ўсё было тое, што Андрэй аддаваў яму належнае: гэты мог мець поспех у жанчын. Гэта было дрэнна. Не таму, што Андрэй баяўся за Ірыну. Ён проста ведаў: калі хлусіць такі чалавек - яму могуць паверыць. Нават многія. Як многія вераць у яго вытанчанасць, бо вытанчаны да рафініраванага снабізму ягоны пакой.

Пакой, сапраўды, не адпавядаў паху дзікага звера, які ў ім стаяў. Забавак больш, чым у дзяўчыны. I рапіра над тахтой, зробленай з той самай сеткі, што ў другіх ляжыць на ложку.

Кола для "хула-хуп'а" (круціць кожная чарговая "дзяўчынка"), рэпрадукцыя "Гернікі", левая частка якой завешана, бо "там Пікаса парушыў унутраную дынамічнасць".

I на стале заўсёды назнарок раскрытая кніга. Месяц таму гэта былі "Метамарфозы" на лацінскай мове, вядома ж з малюнкамі. Андрэй тады паспрабаваў быў пагаварыць з гаспадаром кнігі на мове Авідзія і са здзіўленнем пераканаўся, што той цвёрда завучыў толькі два лацінскіх словы, ды і тыя - "прымус" і "аўтобус".

Андрэй не злаваўся б ні за кола, ні за Авідзія, каб гаспадар сумленна развіваў першым брушны прэс, а другім - эстэтычную цягу да жанчын. Але ён на свае вушы чуў, як гэты чалавек аднойчы казаў аб "рускім кітаізме", а на другі дзень распінаўся ў любові да радзімы, ледзь не абараняючы баганоснасць яе людзей.

Увесь у выкрунтасах, а кнігі піша звычайныя: пра пабудову круглых цялятнікаў і іх перавагу над цялятнікамі трохкутнымі.

- Што трэба? - спытаў Стаўроў.

- Вазьмі назад сваю плётку, - сказаў Андрэй.

- А што, можа, будзеш біцца?

- Не пэцкай імя жанчыны. Гэта занадта лёгка.

Стаўроў не слухаў. .

- Чаго ж ты тады пры ўсіх мяне не біў?

- Маглі разбараніць, - проста сказаў Андрэй. - Дык бярэш назад свае словы?

- З'ясі ты, ведаеш чаго.

- Ты хлус, Стаўроў, - сказаў Андрэй. - Ты манюка, што ваюе з жанчынамі.

Стаўроў ужо стаяў перад Андрэем:

- Зараз ты возьмеш назад свае словы. Таму, што я казаў праўду пра гэтую...

Андрэй не даў яму скончыць. Гучны ляпас аддаўся ў пакоі.

- Я цябе знішчыць хачу, сволач, - у Андрэя дрыжалі ноздры. - Такія, як ты, усё гадзяць: каханне, зямлю, праўду. Усіх вас знішчаць трэба... Бяры назад словы, дрэнь гнілая...

Гаспадар, відаць, з цяжкасцю ўсведаміў тое, што яму далі поўху. Але ўсведаміў. Праз хвіліну Андрэй адляцеў і ўдарыўся спіною аб шкляную горку з керамікай. Зазвінела разбітае шкло.

У наступны момант Стаўроў мядзведзем насунуўся на Андрэя, і Грынкевіч літаральна знік пад ягонымі ўдарамі. Ён не лічыў, што шрамы і сінякі - украса ваякі, і таму імкнуўся толькі прыкрыць твар. Немагчыма было заўтра ісці да яе з абліччам, збітым, як горкі яблык.

Тройчы яшчэ адлятаў Андрэй, але злосць не ўтаймоўвалася, але нянавісць не пераходзіла - і не магла перайсці - у баязлівасць. Ён быў спакойны. Ён толькі чакаў. Ён ведаў, што ён слабейшы, і ведаў, што ён павінен правучыць гэтага звышчалавека з яго Авідзіем.

Стаўроў шалеў. Малаціў, як па гумавай грушы, адчуваючы сябе ў ярасці гаспадаром становішча. Гаспадар становішча не заўважаў, што разбіў суглобы сваіх пальцаў. Ён малаціў.

І тут у пакой нечакана ўварваўся Яніс. З рыкам ён кінуўся быў на дапамогу.

- Назад! - крыкнуў яму Андрэй. - Не лезь, іначай і табе перападзе.

Вочы яго былі такія гнеўныя, што Яніс адступіў; дрыжучы ад ярасці, стаў глядзець. Некаторы час у пакоі чулася толькі хрубасценне шкла, хрыплае дыханне Стаўрова ды гукі ўдараў: частыя - у гаспадара, рэдкія - у Андрэя.

Яніс не заўважаў, што Андрэй гэтымі рэдкімі ўдарамі паспеў ужо разбіць Стаўрову броў, што левае вока Стаўрова ледзь глядзіць праз шчыліну сіняка, што ў яго дрэнна рухаецца ад удару ў мускул пляча левая рука. Яніс не заўважаў, што твар Андрэя чысты.

- Ды ён заб'е цябе.

- Не руш, - дыханне Андрэя было глыбокім і спакойным. - Гэтага я сам.

Зноў удары і храбусценне. І раптам, якраз у тое імгненне, калі Стаўроў занёс кулак над галавою Грынкевіча, напаўсагнутая рука Андрэя слізнула ўгору. Яніс пачуў глухі ўдар. У наступны момант Стаўроў усім целам бразнуўся на падлогу.

Гэта не быў накаўт. Раз за разам, чатыры разы ўзнімаўся "звышчалавек", але ўдар кожны раз - ён не паспяваў нават стаць на калені - валіў яго на падлогу. Урэшце ён прымірыўся з ляжачым становішчам. Толькі вочы глядзелі востра, бы ў тхара.

- Бярэш назад словы? - спытаў Андрэй.

Стаўроў маўчаў.

- Ды што ён зрабіў, нарэшце? - спытаў Яніс.

- Зачапіў Яе, - сказаў Андрэй.

- Яе? - Яніс рушыў на гаспадара. - Чакай, Андрэйка, я яму яшчэ падкіну.

- Не пэцкай рук аб дзярмо. Адыдзі... А ты прасі прабачэння...

- Чакай, - з пагрозай сказаў ляжачы.

І тады Андрэй выбухнуў:

- Ты бруд... Ты - слабенькую... Ты - слабых... Вазьмі назад брахню, іначай я яе з языком тваім смярдзючым, г....м у глотку ўваб'ю.

- Чакай, - сказаў Яніс. - Я яго падыму, каб тваё сумленне спакойным было.

Андрэй сам узняў Стаўрова за грудзі і шпурнуў на руіны горкі. Дзіка забразгатала шкло.

- Д-добра, - сказаў Стаўроў. - Прашу прабачэння.

Толькі тут стала ясна, як ён здаў, як трэсліся ягоныя рукі.

- Кажы, зманіў?

- Зманіў. Але нічога, я ўсім вам... вясёлае жыццё... А табе, Яніс, асабліва будзе. На бюро прыйду...

- Прыходзь, - сказаў Яніс. - Мы табе тады ўсім складам бюро натаўчом карак. У нас там людзі сур'ёзныя, жартаваць не любяць. У трох разрады па боксу.

- А... бабе тваёй...

- Змоўч, - збялеў Андрэй.

Невядома, адкуль узяліся сілы, але ён адарваў Стаўрова ад падлогі збялелымі на касцяшках кулакамі і пусціў на дзверы шафы.

- Мы пойдзем, - сказаў Андрэй. - Але калі ты хоць слова - мы зноў прыйдзем. Калі зноў плётка, калі пра яе - тут будзем біць удвух.

...У пакоі Андрэя Яніс, сцягнуўшы з гаспадара падзёртую сарочку, разглядаў разнастайныя па якасці і колеру сінякі.

- М-да. Рыцарства! Шкада, што ў мяне бальзаму няма, - бурчаў ён. - Гэта нават горш, як мяне на вакзале жандары білі. Там што? Там я ціхутка лёг ды і гляджу, як яны мяне прасуюць. Надта ўжо цікавы працэс. А тут... тут, брат, проста чорт ведае што такое...

Грынкевіча раптам закалаціла.

- Яніс, - хрыпла сказаў ён, - за што ён яе, гадзюка?.. Я ведаю, яна не заўсёды добрая. Змучыла мяне... Год вар'ятам хаджу, на апошніх нервах. Ведаю - часам зменлівая. Ведаю - часам гуляе са мною... Але хто мае права заўважаць гэта... акрамя мяне?.. Ніхто.

Сціснуў скроні далонямі. Сказаў ужо спакойна:

- Апошнія мае сілы, Яніс. Шчасце, што заўтра - усё. А то - на Канатчыкаву дачу праз тыдзень.

- Нічога, - сказаў Яніс. - Усё будзе добра, дружа. Заўтра ўсё будзе дабра. Евіна племя, яно, брат, таксама не ўсё з сабачага хваста.

...У прызначаны час наступнага дня Андрэй чакаў яе ў скверы ля інстытута. Дыхаць было цяжка, але наогул ён адчуваў сябе ніштавата. Асабліва таму, што аблічча было не кранутым у бойцы.

Яна спазнілася на сорак хвілін. За гэты час ён тройчы пералічыў дрэвы ў скверыку, хмызы пад імі. Пясок пад нагамі быў густа засеяны акуркамі.

Калі яна нарэшце прыйшла, ён ужо так хваляваўся, што не заўважыў нічога. Кінуўся да яе, здзіўлены, што яна праходзіць паўз яго, быццам не заўважаючы.

- Дзень добры, Ірына.

- Дзень добры, - яна стаяла напаўпаварота да яго.

- Я чакаў, - сказаў ён.

І тут яна павярнула да яго аблічча, нейкае такое незнаёмае аблічча, што ў Андрэя абарвалася ўнутры. Што ў ім было, у гэтым чужым аблічча? Вядома, было яно трохі больш змарнелым, чым заўсёды. Але галоўнае было не гэта, не пустыя вочы, нават не пасмяглыя вусны. Галоўным быў выраз. Быў на гэтым твары выраз такой грэблівай пагарды, што стократна горшы і за самую нянавісць.

- Што з вамі? - жахнуўшыся ў душы, спытаў ён.

Але ён ведаў, нават без яе адказу ведаў: гэта канец. З такім выразам сціснутых вуснаў, з такімі пустымі вачыма не глядзяць нават на ворагаў.

- Чаго вы прыйшлі сюды? Вы не ведаеце, што гэта вокны інстытута?

- Але ж вы самі... - паспрабаваў напомніць ён. - Гэта ж вы сказалі, што не можаце...

- Я і не магу, - варухнуліся вусны. - Мне абрыдла ўсё гэта. Вы не думаеце аб размовах, аб маім імені. Вам усё адно...

Свет раптам пацьмянеў у вачах Грынкевіча. Адчуванне лёгкай млоснасці нарадзіла звон у вушах. Але ён справіўся. Можна яшчэ і самлець, бразнуцца аб зямлю - не, занадта гонару для яе. І яшчэ яна магла б падумаць, што гэта кліч да літасці. Яна часамі любіць выпускаць кіпцікі - хай точыць іх на іншых.

Ён моўчкі павярнуўся і пайшоў прэч. І выгляд яго спіны ярчэй многіх слоў казаў аб гідлівасці, якая раптам авалодала ім.

Каб ён азірнуўся, ён мог бы пабачыць, як выраз пустаты саступіў месца ў яе вачах непаразуменню, як бязвольна прыўзнялася рука. Але ён не азірнуўся. Ён не азірнуўся б нават на крык. Ён быў так уражаны, што проста не пачуў бы яго. Страціў прытомнасць, не трацячы яе.

...Наступнае патанула ў тумане. Часу не было. Ён не ведаў, гадзіны прайшлі ці дні. Бы ў п'янага, у вачах засталіся толькі рэдкія ўрыўкі падзей. А між тым, ён не піў ні кроплі. Наўрад ці ён і еў нешта ўсе гэтыя дні.

Памятаў, што сядзеў на адхоне ў Астанкіна і слухаў зязюлю. Зязюля налічыла сорак. І тады ён упершыню адчуў, як з абразы і адчаю нараджаецца гнеў. Што яму з гэтых сарака, калі праўды няма?.. Радуйся, дзева, твае лепшыя горш за горшых, гатовы быць з усімі, абы не з каханым... Для гэтага ў іх не хапае распланаванага часу. Быць з каханым амаральна... За гэта не шкадавалі імя... Маральным было быць з другім, "які не дараваў".

Потым зноў быў правал. Сустрэў на вуліцы суседа па інтэрнаце. Той казаў нешта аб тым, што яго шукаюць тры дні... Назольны сусед. Ледзь выратаваўся ад яго, скочыўшы ў аўтобус. Шукаюць тры дні. Значыць, тры дні не начаваў там. А дзе? Гэтага ён не помніў. Можа, проста хадзіў па вуліцах... Часта бывала цёмна... Аднойчы, здаецца, ляжаў проста ў кураслепе нейкага парку... Глядзеў на зоры... Смешныя былі зоры: рухавыя, як зайчаняты...

Гнеў прыйшоў аднойчы вечарам разам з пачуццём нясцерпнай стомы - ногі адвальваліся - і зверскім голадам. Аж цямнела ў вачах. У вулічным кафэ ён выпіў чатыры шклянкі кавы і ўпершыню, хаця і ліхаманкава, абдумаў, як яму быць.

Кава зрабіла сваё. Ідучы тратуарамі Садовага кальца, ён цвёрда ведаў, што рабіць. Па-першае, ён не можа больш. Гары яно гарам! Варта было пакутаваць, вар'яцець, паліць апошнія думкі на гэтым хлуслівым агні. Ён не зрабіў нічога, акрамя добрага. І вось... аддзячылі.

Столік на пошце. Пяро бегае па паперы. Толькі чатыры словы: "Няхай ты будзеш праклятай!" Жорстка? Так, але і добра. Пасля гэтага не вяртаюцца... Канверт падае ў скрынку...

А цяпер да Ганны. Ён растлумачыць ёй усё. Гэта не помста. Калі ёй хочацца быць з ім - чаму ён павінен адмовіць у гэтым. Невялікае шчасце, але калі ёй спатрэбіўся гэты кавалак - няхай бярэ. Ва ўсякім разе, ён будзе добрым мужам. Будзе берагчы яе, вельмі шкадаваць, любіць за дабрыню і чалавечнасць. Яна ж лепей за тую. Яна застанецца з ім на ўсё жыццё, на радасць і гора, нязменная з нязменным, верная - з верным.

Досыць з яго.

І ўсё ж ён нічога не сказаў Ганне. Сорам не дазволіў. Сказала яна сама, як заўсёды, нейкім дзівам адгадаўшы яго думкі.

- Ты гэтага ніколі не скажаш мне, Андруша.

Сядзела ў сваім улюбёным куточку канапы, асветленая аранжавым абажурам. Янтарны твар, залатыя валасы.

- Сорам не дазволіць. Але я ведаю, гэта не ад адчаю... Калі ты будзеш спакойны, хоць і няшчасны - я пайду з табой. Толькі гэта будзе потым - калі супакоішся. Магчыма, праз год. Я ведаю, ты ніколі не будзеш кахаць мяне. Але хіба не ўсё адно. Я зраблю так, што табе не захочацца пайсці ад мяне.

- Ты заўсёды даеш мне сілы. А што застанецца самой?

- Самой? - яна ўсміхнулася. - Самой застанецца ўсё. Як вы ганарыцеся сваёй сілай! А вы слабейшыя за нас, нават калі б'ецеся, як дзікія звяры... А зараз ідзі дадому... Ідзі, спі...

Яна хавала ад яго нешта, відаць, шкадуючы яго. Ён бачыў гэта па неспакою яе вачэй. Але ён так стаміўся, што не стаў дапытвацца.

Дома, перад тым як легчы спаць, ён знішчыў вершы, прысвечаныя Ірыне, знішчыў усе паперы, дзе хаця б прыпаміналася яе імя. Ён падаў з ног ад стомы, але не мог

спаць, пакуль у пакоі заставаліся сведкі яго слабасці і яго ганьбы.

**Р а з д з е л XXVIII**

Трэба было жыць. І невядома было, як жыць. Перш за ўсё трэба было спаліць усе масты, што звязвалі яго з мінулым.

Андрэй спаліў усе старыя канспекты, раздаў сябрам усе кнігі. Кнігі - першы друг, і гэтага друга перш за ўсё кідаюць, калі рэзка мяняюць жыццё. Яны занадта цяжкія для вандраванняў. Калі прыходзіць такі час - чалавек бярэ з сабою толькі тое, што змяшчаецца ў невялікі чамадан.

Таму Андрэй падарыў Янісу дывановае пакрывала і карціны. Харунжаму - бронзавага званара, што біў набат. Баранаўскасу - усе забаўкі. У чамадан, разам з вопраткай, ён паклаў толькі дагератып Каліноўскага.

Грошы для яго бадзянняў таксама не былі патрэбны. Толькі нямнога. Ён ведаў, што грошы псуюць падарожжа, ператвараюць яго ў турысцкую паездачку з паплёўваннем праз акно вагона-рэстарана. А ён збіраўся непасільна працаваць, бо толькі так і можна было забыць.

Сабе ён пакінуў толькі на білет да Уладзівастока і яшчэ дзве тысячы на выпадак, калі не адразу ўладкуецца на работу. Ды і што яму патрэбна? Хлеб, кава, два разы на тыдзень добры абед. Вось і ўсё. Адзенне пакуль што ёсць, а калі зносіцца - заробіць.

Цвёрдага плана ў яго не было. Прыблізны - выглядаў так.

Ён паедзе да Уладзівастока. Там альбо ўладкуецца падсобным рабочым у геалагічную групу, або матросам на нейкае судна. І тайга з яе гнусам або хвалі паступова, дзень па дню, выжывуць з яго гнеў, што душыць яго, і абурэнне. Зараз ён ненавідзіць яе, хоць ведае, што гэта эгаістычна, што яна невінаватая ў сваёй слабасці. Ненавідзіць яе рухі, вочы, яе погляды на жыццё і мастацтва, ненавідзіць цяжкі вузел яе валасоў. Потым хвоі, салоны вецер і абшар акіяна паменшаць яго пакуту, заб'юць нянавісць, і тады можна будзе вярнуцца.

Забраць Ганну, паехаць з ёю на радзіму. Яна так прагнула вырвацца з гэтых каменных цяснін, так хацела гурбаў у кветніку. Ён дасць ёй усё гэта.

Ён пакіне ўсё, а сам паедзе да Яніса. Янісу нельга без Латвіі. Яму - без Беларусі. Ну і што, хіба цяжка разблытаць гэты вузел? Яны пабудуюць свой агульны дом якраз на мяжы. Палова

яго будзе ў Латвіі, палова - у Беларусі. Сын Яніса будзе вадзіць Андрэевага сына, калі той народзіцца, апекаваць над ім, а потым, калі розніца ў гадах згладзіцца, яны пасябруюць, як іхнія бацькі. Пасябруе і Ганна з Лаймаю. Жанчыны будуць хадзіць адна да адной у госці "праз мяжу". А ён будзе працаваць, працаваць. Дзень за днём, год за годам. І ён забудзе ўсё. Забудзе. Забудзе.

Нікога не хацелася бачыць, акрамя сяброў. Жанчын - асабліва. Калі вахцёрша на трэці дзень сказала Андрэю, што яго выклікае да тэлефона Галіна Іванаўна і хоча яму нешта паведаміць, Андрэй кінуў:

- Скажыце, што мяне няма дома. І не будзе два дні.

Яніс глядзеў на зборы Андрэя з маўклівымі зітханнямі, але нічым не перашкаджаў. На пяты дзень, калі ўся падрыхтоўка была скончана і яны засталіся сам-насам з голымі сценамі і невялікім чамаданам, Андрэй нарэшце не вытрымаў гэтых уздыхаў.

- Янка, - сказаў ён, сядаючы на чамадан, - не шматуй ты майго сэрца. Ну што? Табе ж яшчэ месяц у Маскве. Потым цябе чакае жонка. Сын. Каб не гэта ўсё - я адразу, нават без адзінага слова, узяў бы цябе з сабою.

Яніс маўчаў. Толькі таўставатыя добрыя вусны часам уздрыгвалі. І тады Андрэй, адчуваючы, што ён зараз не вытрымае, сказаў:

- Згода. Калі табе немагчыма без мяне - прабудзь гэты месяц у Маскве, на ліпень і жнівень з'ездзі ў Рыгу, пажыві з жонкай недзе ў Дубалтах, а потым на ўсю восень прыязджай да мяне. Прабач, але мне хаця да восені трэба пабыць аднаму. Маім "банкірам" будзе Якуб Каптур. Я ведаю, зараз табе цяжкавата. Ён зробіць, каб ты даехаў да мяне. Уладкуем цябе як журналіста на той карабель, дзе буду я. Будзем плаваць разам... Курыльскія астравы, мора, вулканы на берагах. Памятаеш Кіплінга?

Пулею и решеткой подкрепленный закон Москвы:

Котиков на Командорских трогать не смеете вы.

А потым, восенню, там такія ясныя дні. А калі прыйдзе позняя восень, тады пачнуцца ўраганы, сівыя хвалі, лёд на робах... Ты прабудзеш са мною ўсю восень.

Яніс ужо ўсміхаўся, зачараваны, зусім як дзіця, якому расказваюць казку. І тады Андрэй дастаў з апусцелай шафы кетавы балык, хлеб, бутэльку "Белавежскай" і сказаў:

- А цяпер паслухай, што я прыдумаў. Наш з табою будучы дом. Мы пабудуем яго калісь, а пакуль не будзем вельмі бавіцца. Мора і вецер, і да д'ябла падалы хлуслівых жанчын.

...Яны правялі гэты апошні вечар у гарачай і шчырай бяседзе аб усім. Гэта называлася ў іх: "паплакаць аб лёсе латышскіх стралкоў". Потым Яніс пайшоў. Андрэй умацоўваў ручку чамадана дротам, калі зноў прыйшла вахцёрша, сівая старая жанчына:

-- Нейкая дзяўчына звоніць вам па тэлефоне.

- Скажыце, калі ласка, што я ні з кім не жадаю размаўляць.

- Як жа гэта, Андруша?

Андрэй устаў і абняў яе:

- Так, Мацвееўна. Проста так... Голас хаця спакойны?

- Вельмі. Кажа, што хоча пабалбатаць.

- Ну вось... Таму і не трэба... Не трэба, Мацвееўна. Вы былі добрыя да мяне...

- Дык так і сказаць?

- Ведаеце што... Не трэба казаць, што я не хачу... Гэта, пэўна, Галіна Іванаўна або Ганна... Скажыце, што мяне няма.

Старая пайшла. Андрэй лёг у ложак і выключыў святло.

...Апошняя ноч у гэтым пакоі яго пакут. Заўтра дарога. Які ён гулкі, гэты пусты пакой. Як бягуць часам па яго аскетычна голых сценах адбіткі святла.

І раптам навалілася. Раптам у цішыні і цемры ў яго сэрцы выбухнула такая вострая цяга да яе, такая туга, што ён застагнаў. Абдымаючы падушку, ён калаціўся ад усведамлення, што нічога не прайшло, што гнеў яго дарэмны, што ён не забыў і нічога не здолее забыць.

Яго калаціла гадзіны дзве, а потым ён праваліўся ў сон.

...Перакулены ўніз купаламі, калыхаўся ў вадзе бязважка-белы адбітак Пакрава на Нерлі. Вада рабіла яго асабліва выцягнутым і стройным... Дзіўна, але сухая бяроза, якую яны тады бачылі, зараз аджыла і зазелянела клейкімі, вясёлымі лісцікамі.

...Ірыны не было поруч, і ўсё ж яна была тут. Гэта яе подыхі варушылі траву, гэта яе рука, а не ветрык, дакраналася да яго валасоў. Яна была паўсюль: у нейкім асабліва высокім небе з рэдкімі, сляпуча-срэбнымі аблокамі, у вільготнай, раскошна-прахалоднай лотаці. Яна была тут, але не было як дакрануцца да яе.

Нехта ішоў наперадзе, наводдаль. Ён плыў, не дакранаючыся да травы, і дазволіў Андрэю амаль дагнаць сябе.

Андрэй ведаў, хто гэта, і не здзіўляўся таму, што ведае. Гэта быў маладзенькі княжыч, што загінуў тут на паляванні. Вузкі, вельмі худзенькі і вузкі, з акварэльна-празрыстым румянцам на шчоках і легкімі, як залаты пыл, доўгімі валасамі, ён сумна ўсміхаўся Андрэю. На ім быў срэбны з блакітным каптан і блакітныя саф'янавыя чаравічкі. Лёгкі-лёгкі і сумны-сумны княжыч з сокалам на плячы.

- Хадзем, - сказаў ён, паказваючы на царкву, - там вас чакаюць, за вас прасіў я, бо вы пакахалі тут.

- Але дзе ж яна?

- Тут, поруч з табою. Бачыш, варушыцца трава. Яна заўсёды будзе поруч з табою. Вось так.

- Але чаму, чаму яна не з'явіцца?

Княжыч сумна схіліў галаву. Андрэй адчуў, што рыданні пашыраюць ягонае горла.

- А потым куды? Дзе мы будзем з ёю?

- Бачыш, вясёлка?

Сапраўды, вясёлка стаяла над зямлёю, апёршыся пятою ў ваду.

- Хіба мала месца паўсюль, - сказаў княжыч. - Да сонца, да ясных зораў у карагод. За рэкі светлыя, за нетры - лясы.

- Я не знайду яе, не знайду.

Княжыч паплыў, усё аддаляючыся. Плыў і клікаў Андрэя рукой... Чорны парыў вятрыска прабег па лугах. Пачало насоўвацца нізкае сталёвае неба... Не было ўжо нічога, і ён не ведаў, лугі гэта або цясніны вуліц... Ён адчуваў, што гэта нешта цяжкае, гнятучае. Ён адчуваў.

І раптам ціхі пагрозлівы голас аддаўся ў пакоі:

- Рэмбрант, уставай...

У першы раз гэта сказалі, як быццам сталёвыя хмары над прывідам Нерлі. І зноў аддаўся голас:

- Рэмбрант, уставай. Твая Саскія памірае.

Гэта сказалі як быццам дрэвы за акном пакоя.

- Рэмбрант, уставай. Твая Саскія памірае.

Калі гэта сказала сэрца, ён паверыў і адкрыў вочы. Ляжаў адразу напружаны, адразу бяссонны. Глядзеў у цемру пашыранымі вачыма.

А потым устаў і моўчкі стаў збірацца. Ён не сумняваўся, ён ведаў і таму быў надзіва спакойны і размераны.

Накінуўшы плашч, ён спусціўся сходамі, прайшоў паўз спячую вахцёршу і выйшаў на вуліцу.

Было тры гадзіны ночы. Транспарт даўно не хадзіў.

Андрэй ішоў начнымі вуліцамі, быццам на кліч. Ён не ведаў, каго ён сустрэне ў яе доме, як там расцэняць ягоны прыход у такі час. Ён хацеў упэўніцца. Яго клікалі, і ён ішоў на кліч.

Паступова нарастала трывога. Ён ведаў, калі Міхал там - дзверы да Ірыны будуць канчаткова зачынены, але прадчуванне і трывога раслі, рабіліся нясцерпнымі. Ён не ведаў, абразілі яго ці не, праўда гэта ці соннае трызненне. Ён ляцеў. Ратаваць.

Ён ужо амаль бег гулкімі начнымі вуліцамі. Адно таксі слізганула паўз яго, і ён з нарастаючым адчаем пабачыў, як шафёр адмоўна пахітаў галавой. Праз два кварталы з'явілася яшчэ адно - тая ж гісторыя. Гэта было як у страшным сне: чалавек бег, і свісцячае дыханне вырывалася з ягоных грудзей.

Калі з'явілася трэцяя зялёная іскра, ён кінуўся акурат на яе дарогу. Узраўлі тармазы.

- На могілкі спяшаешся, псіхапат?

Айдрэй кінуўся да яго:

- Друг, любы, вязі... Хутчэй толькі!

Шырокае - рэшатам не накрыеш - аблічча шафёра скрывілася:

- У парк!

Андрэй торкаў яму скамечаныя грошы.

- Чалавек ты ці хто?

- А ты чалавек? Лезе пад колы! Засыпаю за рулём. Дзве змены адгрукаў... Кожны затрымлівае. Тры гадзіны таму змена другая скончылася.

У Грынкевіча калаціліся зубы.

- Я кажу табе, чуеш... Я ведаю, з ёю нешта здарылася...

Шафёр паглядзеў на яго зблытаныя валасы і па-вар'яцку спакойныя вочы. Уздыхнуў:

- Валі поруч са мной. Хрэн з табою.

- Толькі хутчэй! Хутчэй!

Машына рванула з месца. Шафёру, відаць, перадалася трывога пасажыра, таму што ён, зрэдку кідаючы на Андрэя косыя неспакойныя позіркі, гнаў "Волгу" так, што дамы ледзь не зліваліся ў шэрую смугу.

Ля дома Ірыны, калі Грынкевіч сунуў яму грошы, поўны камяк, ён асцярожна аддзяліў адну паперку.

- Хопіць.

І дадаў нечакана мяккім для такой морды голасам:

- Бывае, брат... Ты - трымайся...

Самым нясцерпным быў гук званка. Толькі націснуўшы кнопку, Андрэй зразумеў, што ўсё гэта - вар'яцтва, што зараз выбухне страшэнны скандал. Зразумеў, але пайсці не здолеў, бо сэрца ад трывогі аж выскоквала з грудзей.

Пачуліся крокі. Дзверы адчыніліся. Перад Андрэем стаяла Ганна ў лёгкім халаціку колеру асенніх лісцяў. Даючы яму дарогу, яна сказала, быццам не было нічога дзіўнага ў яго прыходзе:

- Праходзь. Яна чакала цябе.

- Што з ёю? - аднымі вуснамі спытаў Андрэй.

- Надзвычай моцны сардэчны прыпадак. Нават цэлая серыя. Я званіла табе, але цябе не было.

- Калі гэта?

- Сёння... А ты адкуль даведаўся?

- Адтуль. Яна ж таксама ведае, што я прыйду. Калі адзін увесь час думае - другі не можа не адчуць.

- Распранайся, - сказала Ганна.

- А яна не спіць?

- Яна не спіць звечара. Трывожыцца.

Андрэй зайшоў у пакой. Асветлены хворым святлом начной лямпы, вымалёўваўся на светлай падушцы закінуты твар Ірыны з цёмнымі, раскінутымі валасамі. Упершыню ён бачыў іх не складзенымі ў вузел ці начную прычоску, - і гэтая нязначная акалічнасць асабліва балюча разанула Андрэя па сэрцы. Быццам толькі тут зразумеў памеры бяды.

Ганна моўчкі выйшла. У глухой цішыні пакоя Андрэй, стоячы, глядзеў на апушчаныя веі жанчыны. Бяскроўны твар быў спакойны, і на яго глядзелі са сцен, як праз цёмную ваду, задумлівыя вочы людзей на карцінах.

Па вуліцы, відаць, прайшла нейкая асабліва цяжкая машына - нячутным, камарыным звонам адказала ёй лыжачка ў пустой шклянцы.

Усё было такім, як і ў той вечар. Толькі не было марознай папараці на шыбах. Тыя ж лікі на іконах, той жа спакой, тое ж чырванаватае святло. І тахта была тая самая.

Усё было такім самым і зусім не такім.

- Сядай, - сказала яна. - Дай мне тваю руку.

Зусім блізка ён убачыў яе распасцёртае цела, прасціну, няўлоўна ўзнятую на грудзях, бяздонныя шэрыя вочы і стомлены вялікаваты рот. І гэты рот сказаў, з цяжкасцю склаўшы вусны ў сумную ўсмешку:

- Слухай. Я хачу апраўдацца перад табой.

- Нашто? - спытаў ён.

- Не ведаю, ці можна мне дараваць за ўсё гэта? І ўсё ж я прашу: даруй мне тыя словы. Даруй мне сотні такіх слоў.

- Не трэба, - сказаў ён. - Ты ж мне казала і сотні іншых слоў. Я памятаю толькі іх.

- Не, ты слухай... Не ведаю, як растлумачыць... Але я прадчувала сённяшні дзень... Мне здалося на хвіліну, што табе будзе лягчэй, калі ты будзеш успамінаць мяне з нянавісцю, а не з вечным болем... У той дзень я ўпершыню па-сапраўднаму пачула набліжэнне... Я думала, як мацней абразіць цябе...

Працягнула руку. Паклала яе на яго калена.

- Я зрабіла гэта. Але тут я ўбачыла твой твар. Бог ты мой, табе быццам нажом пад сэрца ўдарылі... Так бывае, калі паміраюць.

Павекі апусціліся.

- Я зразумела, што абразіла лепшае, што было ў мяне на зямлі... Але разумееш, я проста не верыла, што каханне можа быць і гэткім... Вось-вось, менавіта не верыла... А тут паверыла, адразу. І зразумела, што я нарабіла, што я толькі нарабіла... Пасля ўсяго, што было, такая хлуслівая здрада, такая няшчырая, дробна-жаночая подласць.

Ён нахіліўся і прыпаў ротам да яе вуснаў.

- Пацалуй мяне яшчэ, - сказала яна. - Яшчэ раз, любы. Ну вось, а цяпер слухай далей.

Перарывіста ўздыхнула:

- Я зразумела і вырашыла выкупіць усё. Мне каштавала вялікіх цяжкасцей удаваць з сябе цалкам здаровую. Ведаеш, сэрцабіцце, млоснасць. Але я прыкінулася, я ведала: іначай ён будзе шкадаваць мяне і не пакіне... Я пайшла дадому і сказала яму, што больш не магу, што канчаткова вырашыла - без гэтага кахання мне не жыць. Сказала, што пайду адсюль. Ён за апошні час усё дараваў мне. Ён баяўся страціць мяне.

Плечы яе здрыгануліся:

- Мне было вельмі шкада яго - усё ж многа і добрага было, - але я сказала, што гэта маё апошняе слова... Ён тады сказаў, ён сказаў гэта спакойна, але я ведала ўсю меру яго пакут. "Пераможаны, - сказаў ён, - што ўжо тут. Я, пэўна, паеду сам". - "Ідзі, - сказала я, - з табой больш нельга. Сумленне не дазваляе". - "Заставайся тут, калі хочаш". - "Не, ён не захоча". - "Добра, тады я дачакаюся, пакуль ён не забярэ цябе з сабою". І ён паехаў апоўдні.

- Ён мужны чалавек, - сказаў Андрэй.

- А вечарам мяне скруціла, - сказала яна.

- Куды ён паехаў?

- Паехаў на Памор'е. У Архангельск. Кіжы. Ён не ведае, што са мной.

Андрэй вагаўся:

- А можа?..

- І не трэба, каб ведаў, - нечакана цвёрда сказала яна. - Не трэба, каб ведаў.

Вусны яе задрыжалі:

- Хіба не ты мой муж?

Гладзіла яго руку:

- Я хачу хоць памерці пры табе, бедны хлопчык.

Вочы Андрэя сталі разгублена-дзікімі.

- Пакінь, - сказаў ён. - Я цябе вырву... я не дам.

- Што не дасі, - сказала яна, - тут ужо і з войскам не вырвеш. Пройдзе праз яго і возьме, калі ўжо суджана так.

- Маўчы, - сказаў ён, - я хачу, каб ты жыла. Мне без цябе будзе вельмі дрэнна. Мне без цябе нельга.

- Сапраўды так? - быццам здзіўлена спытала яна.

- Сапраўды, - сказаў ён. - Для мяне зараз добры снег толькі таму, што яго можна стрэсваць на цябе. Месяц толькі таму, што - памятаеш? - ехалі з Загорска і ты была поруч, а месяц, як на вадзе, праклаў на лёдзе сцежку, і былі вербы, і беглі пад імі цені... Нашто я сабе, калі цябе няма поруч?.Нашто мне рукі, калі я не магу абдымаць цябе? Нашто вочы, калі не магу імі глядзець у твае вочы?

Ён казаў гэта, не чуючы сам уласных слоў, не ведаючы іхняга сэнсу:

- Хохлік мой з ліхтарыкам, птушка мая сініца, агеньчык мой у ледзяную ноч, заяц мой.

Яна слухала моўчкі, з закрытымі вачыма. Потым сказала ледзь чутна:

- Добра. Відаць, тады трэба біцца. Тут ужо нічога не зробіш. Трэба.

І дадала:

- Заўтра пойдзеш у інстытут груднай хірургіі. Пастарайся неяк, можа, нават паглядзець на аперацыю на сэрцы. Скажаш потым, згодзен ці не.

- А твой стан як?

- Ты ж ведаеш, гэты асколак зарубцаваўся ў капсулу. Працэс ідзе далей. Парушэнне праводнасці - сэрцабіцце, мленне.

- Тады я кажу адразу. Аперацыя.

- І ўсё ж не спяшайся. Схадзі заўтра.

- Сёння, - сказаў Андрэй, - скора пачне днець. Зараз.

- Транспарт не ходзіць.

- Дайду пехатою. А ты спі. Табе трэба спаць.

Ён казаў гэта назнарок уладна. Трэба было пераканаць яе ў тым, што ўсё будзе добра. Чужая моцная воля павінна была зрабіць гэта. Яго, Андрэя, воля.

- Я сапраўды, бадай, засну, - сказала яна. - Я спакойная зараз.

Пацалаваўшы яе, Андрэй выйшаў. Ганна цягнула ад дзвярэй чорнага сабаку.

- Непакоіцца, - сказала яна. - Так і ладзіць вырвацца да яе дзвярэй.

- Сябра ў няшчасці, - сумна ўсміхнуўся Андрэй. - Што, гэта сапраўды можа скончыцца кепска, Ганна?

- Гэта можа скончыцца вельмі кепска, - проста сказала яна, і ў вачах яе Андрэй пабачыў слёзы.

- Ну-ну, - сказаў ён. - Не трэба. І вось яшчэ што, Ганна. Я буду ў клініцы, мне не будзе часу. Пазваніце Вайвадсу. Ён будзе поруч, калі што спатрэбіцца.

Ён выйшаў на вуліцу, напоеную свежым водарам майскай раніцы. Вуліцы былі пустыя. Толькі рэдкія дворнікі шоргалі мётламі па асфальце.

Горад пагасіў агні, і таму над ім на хвіліну з'явіліся зоры.

Ветрык часам уздыхаў, несучы аднекуль з парку водар расы і кветак.

Зоркі, самыя буйныя, чэзлі. Андрэй ішоў пад імі, і вадкае зеленаватае неба вісела над яго галавой.

Чамусьці ён успомніў магільную пліту ў старым Мядзелі, сярэдневяковую пліту. Тады беларусы любілі строіць кепікі са смерці, іранічна ставіліся да яе, не баючыся быццам ні бога, ні д'ябла. На пліце быў выразаны чалавек з шырокім разумным тварам, у вольных, відаць, тканых, адзеннях. Пад галавою яго была выразана сулея, пры баку - меч, у нагах - маленькі сабачка, падобны на карлікавага льва. Чалавек уіміхаўся быццам тым словам, што былі выразаны ніжэй сабачкі:

Тут ляжыць Іван Сямяшка.
Ў галавах гарэлкі пляшка.
Пры баку востры меч ляжыць,
У ног верны сабачка тужыць.
Ого-го, ого-го,
Што каму да таго?

Сапраўды, што каму да таго? Продкі любілі пасмейвацца са смерці. Але смерць, але прадчуванне яе - гэта зусім не смешна. Гэта агідна, брыдка, гэта варожа. З гэтым не можа прымірыцца сэрца... Леаніды адзначылі шлях прадзеда, і хоць гэтым святлейшая была ноч перад яго стратай. Іх няма зараз. Яны рэдка прылятаюць, і мы чакаем іх, такія самотныя ў цемры.

Яго, Андрэя, таксама прысудзілі да страты. Калісь. Даўно. Прысудзіла вайна, ад якой усё яшчэ часам паміраюць людзі, з якой яны ўсё яшчэ, задыхаючыся, уступаюць у адзінаборства такімі вось зеленаватымі, свежымі раніцамі мая.

Божа, пакарай іх, калі ты ёсць. Пакарай расстрэлы, пакарай атакі, пакарай іх за асколкі ў сэрцы, пакарай за слабенькія, як пялёсткі кветак, пальцы кволых жанчын, якія дрыжаць, чапляючыся за жыццё.

Божа, пакарай іх!

А калі ты смяешся там, над намі, смяешся смехам старога ідыёта, які ўзрадаваны мукамі пароды людской, яе слабасцю, слабасцю гэтых вуснаў, якія ловяць паветра, - тады сцеражыся! Сцеражыся тады, бо гэта ўжо за-над-та.

А калі цябе няма - хопіць прыдурвацца. Тады няхай сцерагуцца тыя, хто прыдумваў гэтую хлусню, гадаваў яе цэлымі стагоддзямі, хто па-езуіцку казаў, што забіваць нельга, але можна забіваць чалавека "чужой" крыві, што падмануць нельга, але можна зрабіць гэта ў імя тых ці іншых меркаванняў, неабходнасці... Хай сцерагуцца, бо гэта немагчыма, каб самыя дарагія вусны хапалі паветра, якое павінна быць радасцю для ўсіх.

Да чор-та-вай ма-та-ры!

Людзі занадта лёгка забылі пра вайну. Яны лічаць, што гэта забаўкі. У многіх кацінач памяць, ім абрыдлі напаміны аб ёй, яны не хочуць глядзець нават фільмаў аб тым, як людзі пакутавалі тады. "Вайна? Гэта прайшло".

А вайна не памерла. Не кажучы пра новую пагрозу, не памерла і старая. Яна толькі стаілася, яна гадамі падпільноўвала ахвяру. Будавалі дамы, пісалі кнігі, кахалі, а яна пільнавала... пільнавала... Яна не спяшалася. І вось дачакалася, калі прыйшло нясцерпнае шчасце, калі Нерль і Нява завабілі двух і далі ім бяссмерце, - кінулася і прыхлопнула цяжкай рукой.

Цяпер Андрэй ішоў ужо над Масквою-ракою. Мост вёў яго кудысь. Над горадам вось-вось павінна было ўзысці сонца, і немагчыма, немагчыма было, прадбачваючы ягоны прыход, не

пакутаваць за вусны, там, на падушцы, і не абурацца да самых глыбінь душы.

Насустрач самотнай постаці Андрэя ішла ў першых праменнях сонца палівальная машына. Ішла, распусціўшы белыя вусы, гонячы перад сабою вясёлку.

І, калі яна прайшла, за яе спіною сталі два гарады, адзін сапраўдны, а другі бліскучы, размыты ўсімі абрысамі, перакулены ў другое неба, якраз пад нагамі.

## Раздзел XXIX

Андрэй сядзеў у кабінеце намесніка дырэктара інстытута грудной хірургіі. Сядзеў удвух, разам з гаспадаром гэтага сляпуча-белага, вылізанага да люстэркавай матавасці пакоя.

Гаспадар, прафесар Глінскі, вялізны, вельш нязграбны, нейкі па-мужыкаватаму натапыраны сядзеў перад ім. Мажны, увесь у жорсткіх мускулах твар, сівеючыя скроні. Дзіўна было слухаць з гэтых вуснаў па-інтэлігенцку мяккую мову, дзіўна было бачыць пры гэтых магутных руках малатабойца кісці арыстакраткі-прыгажуні з матава-бледнымі вузкімі пальцамі.

- Адкуль я магу ведаць, - сказаў Глінскі. - Я сам не ляжаў пад нажом.

- Разумееце, - хваляваўся Андрэй, - я гэта да таго, што хачу ведаць, вельмі балюча гэта ці не. Я не магу, каб ёй - балюча.

За вокнамі быў зялёны трапяткі сад, яшчэ споўнены ранішняй прахалодай і ціньканнем птушак. Прафесар глядзеў туды.

- Што адчувае хворы пад нажом, калі робяць аперацыю сэрца, можа сказаць пакуль што толькі адзін чалавек на зямлі. Дарэчы, з вашага Мінска... Гэта хворы Пушкін. Тады ён працаваў на радыёзаводзе. У пяцьдзесят сёмым годзе яго аперыравалі ў трэцяй клінічнай бальніцы. Аперыраваў доктар Раўноў. Давялося аперыраваць пад мясцовай анестэзіяй.

- Ну, а наогул...

- Баіцёся - не кладзіце, - жорстка сказаў Глінскі. - Улічыце, гарантый тут не даюць... Так, аперацыя цяжкая, так, пасля яе, нават калі яна ўдалася, хворы дзён сем нават дыхае з цяжкасцю, так, гэта балюча. Балюча слова сказаць... І не дзіва - сэрца і сталь. І ў гэтым паядынку яны дзве... тры... зрэдку, вельмі рэдка, чатыры гадзіны.

"Не, - думаў Андрэй, - да гэтага жывадзёра я не пушчу. Калі ўсё адно без аперацыі не абысціся - хай лепей другі... Як ён

раўнадушна кажа пра гэта!.. Якія грубыя рысы аблічча!.. Нездарма Талстой не любіў дактароў".

Ён ведаў, што ён несправядлівы, але пакінуць думаць менавіта так не мог.

А ў словах прафесара ўсё яшчэ гучала жорсткая сталь.

- І гэта яшчэ не ўсё, - Глінскі глядзеў светлымі, калючымі вачыма, быццам душу цягнуў з вачэй субяседніка. - Ваш выпадак цяжкі. Вельмі цяжкі. Я ведаю яго і даўно здзіўляюся, чаму яна не магла прыйсці сюды тры гады таму. Тады было лягчэй.

- У яе не было тады прагі жыць што б там ні было, - сказаў Андрэй. - Была абыякавасць.

- А зараз яе няма, - даволі бессардэчна, на думку Андрэя, усміхнуўся Глінскі. - Ну што ж, не буду суцяшаць. Вы мужчына і павінны ўмець глядзець смерці ў вочы, іначай і жыцця не варты такі чалавек...

Закурыў, гледзячы зараз зноў у акно.

- Дык вось, у яе мала шансаў. Але павінны выбіраць і вы. Або павольная смерць праз некалькі месяцаў і пакуты сумлення, што не ўратавалі, або... Або пакуты сумлення, што паклаў пад нож. Сам.

- Так, - проста сказаў Глінскі. - Можа быць, і так. У жыцці часта бывае так. І яшчэ папярэджваю. Часам аперацыя прайшла. Усё добра. А потым выяўляецца, што чалавек павольна гіне, што і мы яму нічога не далі, бо гэткая траўма для сэрца аказалася не пад сілу. Я кажу вам гэта, каб вы загадзя ведалі: можа быць горшае...

- Я згодзен на аперацыю, - сказаў Андрэй.

А сам сабе думаў:

"Згодзен. Але толькі не табе. Толькі камусь іншаму, мяккаму, пяшчотнаму да чалавечага матэрыялу, аддадзенага ў яго рукі".

- Вось сволач, - сказаў раптам Глінскі, і Андрэй сумеўся, а ці не адгадаў той часам ягоных думак.

Прафесар глядзеў у акно, і на яго твары ляжалі зялёныя рэфлексы ад садовай лістоты, напоенай сонцам.

- Не, - сказаў ён, - вы бачыце, вы бачыце, што яны там робяць?

Ён павярнуўся, і Андрэй здзівіўся змене, якая адбылася з Глінскім. Зусім другі чалавек сядзеў перад ім. Куды падзелася ідальская нерухомасць аблічча, пахмурыя калючыя вочы.

Зараз гэтыя вочы таксама былі калючыя - ад іскрачак смеху, што скакалі ў іх, - а рот расцягнууся ледзь не да вушэй у такой дзіцячай і хітрай усмешцы, якой могуць усміхацца толькі ах якія людзі!

Ён узяў Андрэя за плячо і павярнуў да акна:

- Глядзіце, глядзіце, што ён там выкамарвае, падшывалец.

Ён смяяўся і торкаў пальцам у вокны ніжняга паверха, што ў левым крыле.

З аднаго акна звісалі ўніз дзве дзіцячыя нагі. Гэтыя ногі яўна належалі хлопчыку год шасці і яўна прымалі сонечную ванну: варочаліся, быццам гаспадар хацеў падсмажыць іх з усіх бакоў. Ногі былі беленькія, як малако, і тоненькія, як былінкі. Звісалі яны амаль да зямлі, а на зямлі на задніх лапах стаяла пярэсценькае кацяня і хапала лапкамі за ногі, бы ў валейбол гуляла.

Занятак, відаць, падабаўся і кацяняці і ўладальніку незагарэлых ножак, бо з акна, прыглушаны адлегласцю, далятаў лікуючы віск.

- Гэта абавязкова Азалін з пятай палаты, - захлёбваўся ў захапленні Глінскі. - Такога прайдзісвета і бандыта яшчэ пашукаць трэба. Я зусім нядаўна ліквідаваў яму мітральны стэноз. Дый ён зараз наганяе. Такая прага жыць! Усё яму задавальненне прыносіць. Учора заходжу, а ён у палатнай прыбіральні. Б'е, як фантан... Ну, не раўнуючы, як у Іярданса, дзе хлапчанё... проста на галаву сабаку. А на мордзе ўсмешка аж за твар лезе. "Што, - пытаю, - уцаляеш, каб далей?" А ён, ох-хо, ён мне: "Цяпер можна. Цяпер як хочаш пніся".

І хаця гісторыя была не вельмі разумнай, Андрэй усміхнууся, так заразліва Глінскі расказваў яе. А ў прафесара ўсмешка ставала ўсё больш мяккай і адначасова сумнаватай:

- Думаеце, гэта чаго ён ногі высунуў? Гэта ён спяшаецца ўзяць ад жыцця ўсе ягоныя раскошы... Раней на сонцы нельга было, дык вось зараз... Хутчэй усё: хутчэй сонца, хутчэй упершыню загараць, хутчэй каб кацяня хапала... Варта б вам было паглядзець, як яны мяняюцца... Прыводзяць маленькага старога: пазногці сінюшна-бледныя, вусны амаль заўсёды сінія... Надумае прабегчы і праз тры крокі спыніцца... Гонар яму не дазваляе прызнацца ў тым, што не можа, дык ён смяецца, слабенькім такім галаском... Быццам вінаваты... Ах, сволач натура! Ах, сволач!.. І вось глядзець, як вусны робяцца звычайнымі ружовымі вуснамі, цёплымі, прынаднымі, - гэта, я

вам скажу, не вашы вершы там нейкія пісаць... пра карысць курэй у барацьбе з каларадскім жуком.

"І тут падкалоў", - падумаў Андрэй, але ў сэрцы яго не было злосці, а насцярожанасць знікла кудысь.

Уголас ён сказаў:

- Пушкін - таксама вершы.

- Так, - гаварыў Глінскі, - але як, па-вашаму, такія вершы:

Выяўляйце шкодніка,<br>Каларадскага жука,<br>Спавяшчайце агранома,<br>Як знайдзеце шкодніка.

- Не чуў я нешта такіх вершаў, - сказаў Андрэй.

- А я чуў. Сваімі вачыма на этыкетцы для запалак чытаў.

Пасур'ёзнеў:

- Ну, вернемся да нашай тэмы. Хворая - ваша супруга?

- Яна не супруга, - сказаў Андрэй. - Яна ўсё існаванне маё.

Прафесар прыкрыў далонню вочы, а калі апусціў яе, нічога не засталося ў іх ад тых калючых жорсткіх вачэй, якімі яны былі на пачатку размовы.

- Дык, значыць, Кай хоча дапамагчы маленькай Гердзе выплакаць з сэрца асколак люстра?

- Так, - сказаў Андрэй.

У голасе Глінскага з'явілася раптам такая ўважлівая нота, што Андрэй зразумеў: з гэтага імгнення ён, Андрэй, пагарджае сабою за слепату.

- Што ж, - сказаў прафесар, - вязіце яе. Сем - дзесяць дзён мы будзем падрыхтоўваць яе.

- Што гэта такое?

- Гэта аналізы крыві, - добразычліва, як маленькаму, тлумачыў Глінскі, - рэнтген, здымкі ў розных праекцыях, замеры хуткасці кровапльыні, вянознага ціску... Ну, потым электракардыяграма.

- Што гэта?

- Запіс біятокаў сэрца. І яшчэ фонакардыяграма, запіс шумаў сэрца... Калі ёсць застоі і ацёкі, тады...

- Гэтага няма, - сказаў Андрэй.

- Ну вось, - усміхнуўся Глінскі, - усё не так страшна. Як вы хацелі б, каб яе паклалі?

- А як можна?

- Звычайна ў нас чатыры чалавекі ў палаце. Але ёсць і па адным. Па стану. Ну і часам ствараем лепшыя ўмовы. Зноў жа псіхіка. Некаторым лепей разам, некатораму калі ён адзін.

- Адну, - сказаў Андрэй. - Калі трэба, я заплачу.

Стары паглядзеў на яго здзіўлена:

- У людзях не разбіраецеся, юнача. А таму абражаеце медыцыну... Хто вы хочаце, каб рабіў аперацыю?

- Вы, - сказаў Андрэй.

- Добра. Значыцца, тыдзень падрыхтоўкі і аперацыя, ну, скажам, у чацвер вечарам.

- Дзякую вам, - сказаў Андрэй.

Ён амаль ужо выйшаў, але спыніўся ля дзвярэй:

- Прафесар, дазвольце мне на свае вочы пабачыць нейкую адпаведную аперацыю.

- Нашто вам гэта?

- Не ведаю. Але мне гэта чамусьці вельмі трэба... Я павінен ведаць.

- Я не магу гэтага дазволіць. Каб усе сваякі...

- А вы дайце мне гэтую магчымасць не як сваяку, а як журналісту.

Прафесар уважліва разглядаў Андрэя;

- Хочаце самі бачыць ступень небяспекі?

- Так.

- Добра, - з ранейшай суровасцю сказаў Глінскі. - Не магу толькі зразумець, жорсткі вы або бязмежна чуллівы. Але вы маеце рацыю, небяспеку трэба ведаць, небяспеку трэба сустракаць у твар. Відушчым. Не страусам, што хавае галаву... Крыві не баіцёся?

- Эх, прафесар, бачыў я яе. Столькі давялося бачыць!..

- Добра. Пагуляйце зараз у парку. Можаце паснедаць дзе-небудзь...

- Хіба я магу...

- А вы не распускайцеся. Яны вам яшчэ спатрэбяцца, сілы!.. А ў дзве гадзіны чакайце ў вестыбюлі. За вамі прыйдуць.

І сказаў ранейшым сталёвым голасам:

- Я дам вам магчымасць глядзець на гэта не па тэлевізары, не праз купал. Будзеце стаяць поруч з усімі... І крый вас бог траціць прытомнасць.

Памаўчаў, паціраючы свае рукі:

- А каб вам было лягчэй верыць мне - я паабяцаю вам зрабіць усё, што толькі даступна сілам чалавечым.

- Чаму вы даяце мне такое абяцанне? - ціха спытаў Андрэй.

- Я ўдавец, - ненатуральна абыякавым тонам сказаў Глінскі. - Я застаўся вельмі малады ўдаўцом. Быў урачом

медсанбата недзе на тым участку, дзе параніла вашу каханую. Жонка была ў мяне медсястрой. Было гэта напярэдадні пятнаццатага кастрычніка... Бедныя апалчэнцы!.. Героі!.. Колькі іх прайшло праз мае рукі... І колькі было падобных раненняў... Магла і ваша дзяўчына прайсці калі не праз мае рукі, дык праз рукі суседа... А мы ўсе былі аднолькавыя. Усе не маглі.

Глінскі закурыў, гледзячы ў аліўкава-зялёны парк:

- Вядома, за кожнага такога, ураженага ў сэрца, кожны з нас перажываў, але неяк адхілена. Сэрца на вайне чарсцвее, і нельга перажываць за кожнага, як за свайго... Потым прыйшлі сібіракі... А на другі дзень пасля іхняга прыходу снарад разарваўся... А, што там... Раненне жонкі, відаць, было больш цяжкае, чым у вашай... Яна пражыла суткі. А я - не мог. І гэтую слабасць сваю я не забываў усё жыццё.

З сілаю прыціснуў папяросу:

- Цяпер бы я мог выратаваць яе даволі лёгка, хаця і зараз людзі паміраюць. Мы "нядрэнна пасунуліся ў гэтым пытанні..."

- Я разумею вас

- Ідзіце, - сказаў Глінскі. - Чакайце.

...Андрэй выйшаў і перш за ўсё таксама закурыў. Курыць у кабінеце ён саромеўся. Ён ішоў і думаў.

...Так, відаць, трэба было згаджацца. Глінскі - выдатны хірург. Гэта кажуць усе. Да таго ж, нясцерпна будзе бачыць павольнае згасанне Ірыны. Але ён не будзе казаць свайго слова. Ён проста раскажа ўсё, што бачыў.

З першага ж аўтамата ён пазваніў Ганне. Усё было добра: Ірына яшчэ спала. Вайвадс прымчаў адразу ж, як толькі яму пазванілі, паспеў ужо натупацца па аптэках і магазінах і зараз пільнаваў, калі Ірына прачнецца, каб разам з Ганнай накарміць яе. Ганна перадала яму на хвілінку трубку.

- Ты там трымайся, - сказаў Яніс. - Я маюся падскочыць да цябе потым.

- Падскоч, - сказаў Андрэй. - Гадзін у пяць.

Рабіць пакуль што не было чаго, і Грынкевіч пайшоў на агледзіны.

Дом інстытута быў стары, таго тыпу, як будавалі пры Казакове. Перад домам быў кветнік са старымі дрэвамі, так што гукі вуліцы даляталі да вокан моцна прыглушанымі. Але гэта быў парадны фасад. Цікавей было пабачыць чорны ход.

За домам быў парк, таксама стары і зараз увесь пранізаны сонцам. Сходы двума крыламі збягалі ў яго, старыя сходы,

вытрыманыя ў стылі класіцызму, аблямаваныя фігурнай балюстрадай.

Будынак пашыралі, прыбудоўвалі новыя крылы і карпусы, але рабілі гэта тонка, імкнучыся вытрымаць стыль, не сапсаваць старой архітэктуры.

Андрэй падышоў да аднаго з задніх ганкаў якраз тады, калі да яго падвезлі на машыне сняданне. Жанчыны ў белым насілі ў дзверы розныя бітоны і вёдры. На кожным вядры быў недарэчны надпіс: "Сасуд".

Што за бязглуздзіца? Які "сасуд"? Нашто?

Ён дачакаўся, пакуль машына ад'ехала, і падышоў да нянечак, што сядзелі на ганку. Яны не заўважылі яго і пляткарылі, як усе нянечкі на свеце.

- Выношу і выношу, - казала адна сівеючая, вельмі кемная баба. - Спасу майго няма. Такія зас... усе гэтыя мужыкі.

Другая, значна больш маладзейшая, заўважыла Андрэя жывымі чорнымі вачыма і штурхнула сівеючую локцем. Андрэй адышоў, каб не перашкаджаць.

Зноў абагнуўшы будынак, ён падышоў да акна, з якога "прайдзісвет і бандыт" Азалін дражніўся з кацянём.

Там сядзелі дзеці і гулялі бліскучым самалётам з фіялетавага металу. Вялікавокія, прыгожыя дзеці. Андрэй скурчыў ім смешную рожу, і адзін з дзяцей - пэўна Азалін - віскнуў ад нечаканасці і захаплення.

У яго, Андрэя, напэўна, ніколі не будзе дзяцей. Пасля такога ёй, напэўна, нельга мець дзяцей, шкодна.

"Што ж, жывуць і без гэтага. Возьмем з дзіцячага дома. Хлопчыка. Вельмі буду яго любіць".

Час падыходзіў да дзвюх. Трэба было ісці ў вестыбюль. Там было прахалодна і прыемна. Толькі каб не гэтая трывога, што расце невядома адкуль... Зноў пазваніў Ганне... Ірына прачнулася, трохі пад'ела і заснула зноў. Няхай спіць. Андрэй не павінен нерваваць яе.

Ён сядзеў ля століка, на якім ляжала рэгістрацыйная кніга, і глядзеў навокал.

Нейкі дзядзька, напэўна, урач ці, можа, ардынатар, спяшаючыся, убег з вуліцы, скінуў у гардэробе пінжак і сарочку і надзеў проста на майку халат... Вядома, дзень спякотны для мая.

Хлопчык з дарослым мужчынам. Відаць, ідуць на спатканне. Можа, з маці хлопчыка. Вясёлы хлопчык. Накінулі

яму халат на плечы, і той звісае двума белымі крыламі да зямлі, адкрываючы доўгія, як у жарабяці, ногі.

Ідзе і ўсміхаецца: яму падабаецца новы ўбор.

Дурны, дурны хлопчык! Не думаеш. А ты, Андрэй, лепшы? Таксама думаеш чорт ведае аб чым.

Андрэй разгарнуў рэгістрацыйную кнігу, пачаў чытаць. Шмат прозвішчаў, шмат дат, і за кожнай - жыццё.

Паміраюць мала; тых, што выжылі, куды больш, але кідаюцца ў вочы чамусьці перш за ўсё тыя, што памерлі.

Імёны. Даты. За кожнай жыццё, боль, надзеі. Вось Майер. Ён памёр трыццаць першага снежня, пад Новы год. Масква, напэўна, была ўся ў вэлюме падаючага снегу, захутаныя "баб-марозы" неслі ялінкі, людзі спяшаліся з пакункамі. А Майер, нейкі зусім невядомы і, аднак, блізкі Майер, ляжаў і думаў, што выжыве і наступны год сустрэне ў сям'і, а потым памёр.

А за два дні да гэтага паступіў Карэеў. Малады ён быў ці стары? Бачыў, напэўна, смерць Майера. І думаў, што з ім так не будзе. Спадзяваўся. А памёр вясной, калі зялёны шум ідзе па зямлі, а ў маладых зялёных шатах, як ашалелая, безупынна - як горла не забаліць? - кувае і кувае зязюля.

Крыўдна.

Трывога нарастала і ставала ўжо нясцерпнай. Дзе гэты чалавек ад Глінскага, чаму не ідзе?

...Чыясь рука лягла Андрэю на плячо. Перад ім стаяў малады чалавек у белым халаце, з рукавоў якога на дзве пядзі выглядалі вялікія рукі. Ногі таксама былі вялікія, і таму малады чалавек вельмі нагадваў куцапага і смешнага, але надзіва сімпатычнага шчанюка сенбернара. Вочы разумныя, глядзяць на субяседніка добра, рот шырока і ветліва ўсміхаецца.

А галава калматая звыш меры.

- Гэта вы Грынкевіч?

- Я.

- Я да вас ад Глінскага - голас пяшчотна-мяккі і залівісты, таксама як у падлетка сенбернара, калі ён гуляе і імкнецца брахаць далікатна. - Хадзем са мной.

Грынкевіч пайшоў за ім да гардэроба, дзе хлопец узяў Андрэю халат і дапамог надзець, з нейкім асаблівым шыкам, накшталт рымскай тогі, абкруціўшы адну палу гэтага халата вакол усяго Андрэя.

- Зараз ужо не выблытаецеся. Пакуль не прыйду на дапамогу.

Такім душэўным здароўем патыхала ад яго, што Андрэю аж лягчэй стала на сэрцы.

- Мяне завуць Яшам. Можаце зваць проста Якавам Прохаравічам. Я з кандовых уральскіх казакаў.

- Вадзяную свінню на Сакмары лавілі?

Андрэй меў на ўвазе асятра, як яго часам завуць на Сакмары за тое, што рухаецца ён па дне, рыючы тупой дзюбай глей.

- Вы што, былі там?

- Быў. Добрая рака. Светлая.

- Ого, самая лепшая рака, - паважна сказаў Яша.

Памаўчаў. Потым казаў далей:

- Я працую тут ардынатарам. Цывілізаваны казак. Пугачоў, як вядома, з нашых. Дрэнная спадчыннасць. Таму я схільны да маральнага разлажэння і небяспечных аналогій. Асабліва за каньяком, які мы ўзаемна паставім адзін аднаму, калі ваша справа скончыцца добра.

- Вы мяркуеце, што гэта так?

- Аб-бавязкова. Глінскі гэта ведаеце хто? Гэта бегемот штодзённых жыццёвых зносін і тыгр хірургічнага стала. Гэта віртуоз! І не схільны да сантыментаў. Перажыве нас і згоцае індзейскія скокі на нашых капцах.

"Дрэнна ты яго ведаеш", - падумаў Андрэй, праніклiва гледзячы на Яшу.

- Што вы ўсё жартуеце? Хочаце падбадзёрыць мяне? Я не баюся.

- Брэшаце, - з чароўнай праматою сказаў Яша. - Нельга паэту не баяцца рассечанай грудной клеткі і ўсведамлення таго, як у сэрца лезуць пальцам... Паэты дагэтуль уяўляюць сэрца ў выглядзе рэпы. Тая рэпа пахне, як кветнік, і напханая аж да самага нельга каханнем, уразлівымі ўздыханнямі і альбомнымі вершамі.

Грынкевіч усміхнуўся.

- Хадзем, Яша, - сказаў ён.

- Хадзем.

Яны прайшлі раней і таму не бачылі, як з'явіўся Яніс і папрасіў у калідорнай паказаць яму прафесара Глінскага, калі той пройдзе да аперацыйнай. Ён чакаў не больш дзесяці хвілін.

- Унь, - сказала калідорная.

Яніс заступіў дарогу.

- Што вам? - спытаў прафесар.

- Скажыце, ці дрэннае становішча ў Ірыны Горавай? Сёння ў вас быў мой друг.

- Так, - сказаў Глінскі. - Стан цяжкі.

Увесь інтэлігенцкі глянс спаў з аблічча Яніса. Разгублены, з дрыжачымі вуснамі, ён стаяў перад доктарам, трымаючы ў руках шапку. Такі выгляд быў, напэўна, у яго бацькі, калі той прасіў урача аб візіце да хворай жонкі.

- Доктар, - сказаў ён. - Уратуйце яе. Калі вы яе ўратуеце, я ўсё жыццё кнігі буду толькі вам прысвячаць... Я... сам да вас у парабкі пайду. Толькі ўратуйце яе.

Глінскі апусціў вочы і маўчаў.

- Добра, - глуха сказаў ён. - Калі тры чалавекі так любяць адзін аднаго - тут ужо нічога не зробіш. Тут трэба зрабіць... нават немагчымае.

## Раздзел XXX

Андрэй нічога не сказаў ёй, бо тое, што ён бачыў, было велічна і адначасова страшна, быццам рабілася недазволенае, быццам нахабна глядзелі туды, куды нельга глядзець.

Яна згадзілася на аперацыю. Сама. Таго ж вечара яны перавезлі яе з кватэры ў маленькую палату на аднаго чалавека, дзе маглі змясціцца толькі ложак, тумбачка і стол, ды яшчэ крэсла для дзяжурнай медсястры.

Палата была на трэцім паверсе. Верхавіны паркавых дрэў молада і сонечна глядзелі ў акно. Парк цягнуўся далёка-далёка, фортачка была круглыя суткі адчынена, і таму паветра ў палаце было прыемным і свежым.

Размясціліся ў кватэры Ганны: тры сябры неяк насцярожана ставіліся да кватэры Ірыны, адчувалі сябе ў ёй няёмка, а што да Грынкевіча, дык таго гэты пакой, дзе ён пабачыў яе такой хворай і слабенькай, проста гнёў.

Ключ аддалі Ганне і ўсе ўтраіх пераехалі да яе. Грынкевіч і Вайвадс размясціліся ў майстэрні, заслалі кілімам падлогу ля ног гранітнага чалавека і спалі там. Абавязкі размеркавалі так, што Ганна рыхтавала перадачы, Вайвадс бегаў па справах, а Андрэй рабіў патроху тое ці іншае, але галоўным чынам сядзеў ля Ірыны.

Яны не тужылі, прынамсі, вонкава. Нават Ганна перастала плакаць. Ім трэба было працаваць, улагоджваць усё як мага лепш. Ім трэба было змагацца за яе жыццё. Ваяваць.

І толькі ўначы туга прыходзіла і захлёствала ўсё. Грынкевіч падоўгу ляжаў з заплюшчанымі вачыма, і калі ўжо добра ведаў, што Яніс не спіць, яны шэптам заводзілі свае бясконцыя размовы.

Часам да іх прыходзіла Ганна, сядзела ля іхніх ног і пачынала суцяшаць Андрэя, заўсёды неяк так, што пасяляла ў іх веру.

Андрэй кожны дзень хадзіў на спатканне. З Яшам яны пасябравалі, зменныя медсёстры ставіліся да Андрэя з Ірынай добра: старэйшыя - як да дзяцей, маладзейшыя - як да брата і сястры.

Нават Глінскі неяк мякчэў, гледзячы ў вочы Ірыны і сустракаючы неспакойны, заўсёды заклапочаны позірк Андрэя, накіраваны на яе, чуючы яго вечныя пытанні, ці не баліць, ці не трэба пакласці вышэй падушак, ці не трэба вады.

- Я магу і сама. Я ніколі так добра сябе не адчувала. Пяць дзён не чую сэрца.

- А вы згаджайцеся, - буркнуў Глінскі. - Што з таго, што можаце? Хіба справа ў падушцы? Гэта прыемна яму, карысна вам. Ён на сёмым небе, калі можа зрабіць такое... Ганяйце, ганяйце яго - мацней кахаць будзе.

- Я вам так удзячна. І яму. Мне ўжо няма чаго жадаць... Вы ж ведаеце, як у нас усё адбылося?

- Ведаю. Мне гэты ваш латыш усё расказаў з таемным спадзяваннем, што я буду праяўляць максімум увагі... Скажу вам, што вы былі дрэннай маленькай жанчынай, якой не падушкі б папраўляць, а добра нашлёпаць.

- Прафесар, - з папрокам сказаў Андрэй.

- Нічога, - сказала яна, - прафесар гэта не ад злосці.

- Бачыце вы яго, - сказаў прафесар. - А зрэшты, хто ведае, як бы яно было, каб вы яго не мучылі?..

Узрушаны дабрынёй гэтага чалавека, дабрынёю ўсіх вакол, Андрэй заказаў па кошыку белых руж, вялізнаму, як клумба, і даслаў іх усім, хто лячыў Ірыну.

Сустрэўшы Акдрэя на наступны дзень, Глінскі ўзяў яго за вуха, як Напалеон маршала.

- Хабары, - з лютым гумарком буркнуў ён. - Хабарчыкі. А вы ведаеце, што хабарадаўца адказвае як і той, хто бярэ?

Засаромлены Андрэй пайшоў у палату Ірыны і ўбачыў, што адзін з яе куткоў завешаны прасцінай, а за ім стаіць глыбокае мяккае крэсла.

- У чым справа? - спытаў ён у маладзенькай медсястры.

- Дзякуй за кветкі, Андруша... А гэта загадаў учора паставіць "стары". Сказаў, што вы можаце часам заставацца і сядзець колькі хочаце. Заставацца і на начныя дзяжурствы... І пасля аперацыі дазволіў дзяжурыць. Бо медсёстрам цяжка, яны не могуць увесь час быць поруч. А вы спраўляецеся не горш за кожную з нас. Нават больш уважліва.

- Што вы, Сашанька? Вы ўжо такая ўважлівая.

Сашанька ўздыхнула:

- Прыемна бачыць такое. Нават трошкі зайздросна.

- Не трэба зайздрасці, - сказала Ірына. - У яго жахлівы характар. Ён эгаіст, індывідуаліст, абстрактны гуманіст, жонкалюб і спакусіцель чужых жонак...

- Ох, - сказала Сашанька.

- Ірына, - узмаліўся Андрэй. - Вы не верце ёй, Сашанька. Яна сама... У яе кіпцікі - ого!

- Ну вось, - усміхалася Ірына. - Не паспелі стаць поруч, як адразу папрокі.

Сашанька марудзіла ля дзвярэй.

- Толькі... дарэмна вы, Андруша, даслалі кветкі шэфу. З'явіўся сёння злосны. "Я, - грукоча, - яму дабро, а ён мне... Прэч гэтае крэсла. Каб следу не было".

Андрэй збялеў і ў адчаі пабег расшукваць Глінскага. Знайшоў яго ў кабінеце. Хірург паглядзеў на яго аблічча і памякчэў:

- Добра, добра, - сказаў ён, - усё застанецца. Гэта я так... Вы не думайце, Андруша, мне таксама прыемна... Шкадую, што напалохаў вас... Я ж таксама люблю кветкі. Асабліва ружы. І дзе вы іх здабылі? Масква недаравальна бедная на аранжарэі.

- З Рыгі знаёмы лётчык прывёз, - сказаў Андрэй. - Самалёт, пэўна, пахнуў, як кветнік.

Прафесар аглядзеў Андрэя:

- Вар'ят. Жонка за вас возьмецца. Быць вам рабом да схілу дзён. І не адчуваць рабства.

Устаў:

- Я зрабіў гэта вось чаму... У Ірыны адразу падае настрой, калі вас няма... І рэзка паляпшаецца стан, калі вы поруч... Веру, што гэта дарэмнае папярэджанне, але ніколі не ўздумайце падмануць яе. У будучым. Вы з боем здабылі сабе сапраўднае, рэдкае, якое мала ў каго ёсць... А пакуль ёй патрэбен запал бадзёрасці і шалёнага жадання выжыць. Таму я і паставіў крэсла.

Буркнуў, гледзячы ў акно:

- Я ведаю - глупстваў не будзе. Але вы проста часцей дакранайцеся да яе, дапамагайце, як рабілі дагэтуль, расказвайце вясёлыя і цікавыя гісторыі, гаварыце аб будучым... Гэта асабліва пасля аперацыі... Тады вы будзеце гаварыць, бо ёй будзе цяжка.

Пацёр лоб.

- Так, што яшчэ? Ага... Часцей... цалуйце яе. Абавязкова часцей цалуйце. Гэта суцяшае. Паверце, нішто так не суцяшае жанчын, як пацалункі... Я нават схільны думаць, што яны часам могуць дапамагчы больш, чым медыцына... Вось.

Адвярнуўся.

- Ідзіце да яе... Ідзіце.

...Калі яны сядзелі ў палаце, туды ўварваўся шумны, як бразготка, Яша.

- Дзякуй за кветкі, - сказаў ён. - Ты нязмерна падвысіў маю думку аб сабе. З гэтага кошыка атрымаецца шэсць букетаў, і я маральна заб'ю шасцярых сваіх супернікаў. Сёння ж увечары... Я прадстаўнік "чацвёртага пакалення". Мне непрыстойна мець менш шасці дзяўчат.

Ірына ўсміхнулася:

- Які вы смешны, Яша. Нікога ў вас няма.

- Як гэта нікога? - абурыўся "нашчадак пугачоўцаў". - Я абражаны, я зараз пералічу. Валя. Саша...

- Вось, - сказала яна. - Саша, Саша і яшчэ раз Саша. Гэтая самая. А Валя гэта і не дзяўчына зусім, а ваш друг, Валька Юркоў, таксама ардынатар.

Яша густа пачырванеў.

- Вы не саромейцеся чысціні, Яша, - сказала яна. - Што гэта за погляды, калі даводзіцца саромецца чысціні? Гэта - самае дарагое, што ў вас ёсць.

Ардынатар сядзеў, апусціўшы галаву.

- Вы кажаце праўду, - сказаў нарэшце ён. - Хаця я нікому дагэтуль не прызнаўся б у гэтым.

- Вось, - сказала яна, - бітнікі ці традыцыяналісты, а ўсе мы звычайныя людзі з берагоў Урала ці Дняпра. Харошыя людзі. Вельмі. Браты. І браты ўсіх людзей з берагоў Сены ці Меконга.

Яша тупаў на месцы, відавочна вагаючыся.

- Вы... не скажаце ёй?

- Абавязкова скажу. Бо іначай у вас, пры недахопе смеласці, няскора атрымаецца...

- А вы думаеце?

- Я не думаю. Я знаю. Вы ніколі не задумваліся, чаму яна не глядзіць вам у вочы?

- Гм, - пачухаў патыліцу Яша.

Нарэшце ён пайшоў, відавочна ўзрадаваны. Яны засталіся адны.

- Якія харошыя людзі, - сказала Ірына. - Якія ўсе - людзі. Дзіўна, але я тут, у палаце, пачала так аджываць душой, што мне страшна.

- Цвіцеш, як букет бэзу.

- Угу. І ты поруч.

З таго часу ён усе ночы сядзеў поруч з ёй, гледзячы на яе твар. Яму ставала балюча ў горле, так ён яе кахаў.

Аднойчы, зусім ужо збіраючыся засынаць, яна трымала сябе так неспакойна, што ён спытаў, ці не баліць у яе што.

- Не, - сказала яна, - але я павінна прызнацца табе яшчэ ў адной маёй хлусні.

- Споведзь на сон градучы? А можа, не трэба?

- Трэба, - рашуча сказала яна. - Ты не спіш трэцюю ноч. Ты занадта, аж да неразумнасці, сочыш за мной. Я скажу, мне будзе лёгка, і я засну. Тады заснеш і ты. Баюся, але скажу.

- Добра, любая мая, - сказаў ён. - Ты толькі не хвалюйся.

- Сядай бліжэй, - сказала яна. - Пацалуй мяне.

Ён перасеў і пацалаваў яе ў вусны, а потым, прыпаўшы тварам да яе чыста прамытых, дзівосна мяккіх валасоў на падушцы, падрыхтаваўся слухаць.

Маўчанне было такім доўгім, што ён падумаў, а ці не заснула яна?

- Я ведала гісторыю на пароме, - раптоўна і хутка сказала яна. - Гэта і сапраўды быў мой прадзед. Толькі ніхто ў нас не ведаў прозвішча расстралянага.

Ён прыўзняўся, прыгаломшаны, але здолеў усё ж спытаць:

- Ну і што?

- Апусці зноў галаву, - папрасіла яна, і ён зноў пакорліва апусціўся шчакою на пахучыя валасы.

- І што? - шэптам, дакорліва спытаў ён.

- Але я... я пабаялася прызнацца табе ў гэтым.

- Чаму ж?

- Гэта быў бы тады канец. Як наканаванне. Звароту назад тады ўжо не магло быць... А я так баялася. Баялася жыцця з такім, як ты, бо трэба было стаць зусім-зусім іншай... Баялася цяжкасцей, баялася пасля стольκіх год пакут пайсці з гэтага абрыдлага гнязда, баялася быць цяжарам для цябе.

За вокнамі лёгкі подых начнога ветру прабег па цьмяных верхавінах дрэў і зашалахцеў далей, каб прапасці недзе ў замрэяных дрэвах над Масквой-ракой. Слухаючы гэты заміраючы шолах, яна казала:

- Мне шкада было цябе. Шкада. Ох, як я цябе мучыла.

- Пакінь. Гэта было ўсё адно шчасце.

- Усё адно?

- Досыць, усё яшчэ наперадзе...

- Вядома. Даруй мне за ўсё. Я добрай буду да цябе. Я ўсё-ўсё выкуплю. Буду ласкавай і пяшчотнай да канца свайго...

Ён узяў яе разам з падушкай за плечы, быццам збіраўся люляць дзіцёнка. Яна прыстроіла твар на яго грудзях, паварочалася, каб было зручней, уздыхнула некалькі разоў па-дзіцячаму і заснула, бы ў гняздзе.

Трымаючы яе на руках, ён толькі тут адчуў раптам, што гэта не жанчына, роўная яму вопытам, а безабаронны дзіцёнак, аддадзены ў абарону яму, мацнейшаму. Лухтой было зведанне страшных дзён апалчэння, нястачы, крыўд і штодзённай барацьбы. Лухтой было тое, што не сёння-заўтра ў яе валасах з'явіцца першая срэбная ніць, што ім, нават у лепшым выпадку, застаецца якіх дзесяць - восем год маладосці. Усё гэта было лухтою ў параўнанні з гэтымі ўздыхамі, з гэтым даверлівым сном на яго руках,

Быццам не год нясцерпнага кахання звязаў іх, не месячныя іскры, не тая подлая ноч з люміналам, а гэтыя дні яе пакут, калі яна дзеля яго трымалася за жыццё. Гэты давер нельга было падмануць.

Быццам з глыбіні мінулага веку працягнулася моцная ніць і наканавана звязала праўнука расстралянага, праўнука жанчыны з цёмнымі азёрамі вачэй, і праўнучку чалавека, сэрца якога адкрылася насустрач дабрыні ў паромную, вераб'іную ноч. З веку подласці і здрады працягнулася яна ў век навальніц і надзеі, каб цягнуцца далей у нейкі новы век нязмернага шчасця, які прыйдзе, не можа не прыйсці, і да якога яны, напэўна, не дажывуць. Працягнулася і звязала повяззю неадрыўна-моцнай, амаль не жаночай ужо і не мужчынскай, а нейкай таварыскай, нейкай братняй любві.

...З гэтай хвіліны ён стаў па-мацярынску ўтрапёным у сваіх клопатах аб ёй. Шчасце было ў недасыпанні, у выдаткаванні ўсіх нервовых і фізічных сіл дзеля яе, у змардаванні, у вычарпанні ўсіх запасаў дасціпнасці і весялосці, у тым, што ён, нават заснуўшы, прачынаўся - ледзь толькі яе дыханне ставала

няроўным, ледзь толькі яна паварочвалася на бок. Угаварыць яго хоць на дзень адмовіцца ад гэтага не мог нават Глінскі, і ён здаўся, пабачыўшы, якую асалоду знаходзіць Андрэй у гэтым адмаўленні ад сябе, загадаў, каб увесь цяжар перакладі на плечы Грынкевіча, загадаў, каб сёстры заходзілі ў палату толькі па яго выкліку ды яшчэ падчас двух штодзённых абходаў.

- Ён робіць усё лепей за вас, вар'ят чортаў.

Пасля гэтага дзён не было. Было свядомае спусташэнне ў імя таго дня, калі яна ачуняе, вышэйшы нервовы падём, які часам дазваляе чалавеку тыднямі амаль не спаць, сочачы за здароўем другога... Здавалася, давалі ежу; здавалася, заходзілі ўрачы; здавалася, рабілі аналізы.

Толькі часам, уначы, калі яна спакойна спала, ён, седзячы ў глыбокім крэсле, паглыбляўся ў дрымоту з адкрытымі вачыма. Гэта была дрымота, калі сон мяжуецца з явай, калі бязладныя малюнкі і сказы ніколі не прымушаюць забыць, што за акном ноч і дрыжачыя таполі, што Я н а кожную хвіліну можа прачнуцца, калі нават крэслы здаюцца нечым пачварным, тыграмі, што прыселі ад залішняй злосці на нізкія лапы.

Такое ж было і ў апошнюю ноч перад аперацыяй. Ён драмаў, і твар яго быў прасветлены, знясілены, змарнелы. Удзень ні яна, ні другія ніколі не маглі гэтага заўважыць. Уначы ён заўсёды нараджаўся з дрымоты для явы, не бясхмарна-трывожнай явы, явы замгленнай і чорнай.

На гэты раз яго заспелі.

Калі ён адкрыў вочы - яна глядзела на яго з-пад доўгіх вей. Глядзела сур'ёзна і ўважліва. На белым і ў белай хусцінцы, спакойны і вызвалены ад усяго, яе твар здаваўся тварам манахіні-царыцы з гістарычных фільмаў.

- Дык ты... вось так? - бязгучна спытала яна.

- Глупства, - шэптам сказаў ён.

- Табе трэба выспацца па-сапраўднаму, у ложку, - сказала яна. - Заўтра табе спатрэбяцца ўсе твае сілы.

- Глупства.

Зашапацелі дрэвы за акном.

- Не, - сказала яна, - не глупства. Бедны мой, бедны, што я з табою зрабіла?

І працягнула да яго руку:

- Кладзіся са мною.

- Табе нельга.

- Я ведаю. Ты проста паляжы... Выспіся.

- Табе будзе нязручна.

- З табою?

Ён лёг. Яна прынікла да яго. Шэпт прагучаў ля яго вуха:

- А шкада, што нельга. Але ж у нас усё жыццё... Спі, мой родны, спі да раніцы, мой стомлены.

Паступова правальваючыся ў дрымоту, ён слухаў яе апошнія, кволыя, засынаючыя словы. Яны былі соннымі і цёплымі, як яе цела, гэтыя словы, і таму ім нічога не трэба было саромецца:

- Я благаслаўляю жыццё за тое, што яно звяло нас, дало хаця адно... шчасце... Як ты стаміўся... Спі... Да светлай раніцы...

Абняўшы яе апошнім рухам рукі, з радасцю адчуваючы, што яна тут, поруч, ён адчуў, як сон уладна лёг на яго... У наступную хвіліну яны спалі так, як не спалі ўсе гэтыя дні.

Шапацелі змрочныя таполі за адчыненым акном. Цішыня панавала над горадам. Яны ляжалі, як дзеці, і іхнія чыстыя подыхі, змешваючыся, бязважка блукалі па спячых, спакойных тварах.

## Р а з д з е л XXXI

Раніцаю яны прыйшлі да свядомасці адначасова. Яны не ведалі, што за гадзіну да гэтага ў палату заходзіў Глінскі. Нячутна зайшоў, прычыніўшы за сабою дзверы, і з хвіліну глядзеў на хлопца і жанчыну, што спалі ў той самай паставе, што і звечара, інстынктыўна кожны баючыся ў сне патрывожыць адзін аднаго: рука хлопца на яе плячы, рука жанчыны - на стане хлопца. Абліччы побач. Спакойныя, чыстыя паставы целаў.

"Пашкадавала, - з нечаканай для самога сябе пяшчотай падумаў стары. - Пасунулася і дала месца, каб адпачыў. Відаць, пабачыла нарэшце, як ён звёўся, як дрэмле, амаль не закрываючы вачэй".

І, толькі нячутна зачыніўшы за сабою дзверы, даў на хвіліну пачуццям авалодаць сабой. Таму што ніхто, акрамя яго, старога, спрактыкаванага "тыгра ад хірургіі", не прадчуваў цяжкасцей, якія чакалі сёння гэтае дзяўчо. Бедныя дзеці! Няхай ужо незваротна папсута яго жыццё, але за што такое ім?

А яны прачнуліся абое, разам, адразу адчуўшы, што прасынаецца другі. Андрэй адчуваў сябе такім свежым, бадзёрым і моцным, такім упэўненым у гэтым дні і ва ўсіх наступных днях, што яму хацелася спяваць.

Ды і яна, гледзячы ў ранішні парк з яго шчодрай, дымчата-вясёлкавай расой, з яго сцюдзёна-сінімі ценямі і сонечнай лістотай ля верхавін, сказала, шчасліва ўздыхнуўшы:

- Ніколі, здаецца, так не адпачывала.

- Ну вось і добра, - сказаў Андрэй, - а то мяне сумленне мучыла. Зараз я ўмыю цябе.

- Ведаеш, - з усмешкай сказала яна, - мне нават падабаецца быць хворай. Ты ўсё робіш са мною так пяшчотна, твае рукі лягчэй за тапалёвы пух.

- Ну што ж, калі хочаш, я заўсёды буду ўмываць цябе раніцай, расказваць казкі на сон і папраўляць тваю падушку.

- Што ж, - засмяялася яна. - Ты не думай, я не такая. Я магу хадзіць, як мужчыны, і плаваць, як яны. Калі ты будзеш блукаць па дарогах з рукзаком і кіем, я табе буду верным спадарожнікам.

Залікавала птушка ў росных дрэвах, быццам адчуўшы подых роснай свежасці з надрэчных шатаў.

- Май, - сказала яна. - Глядзі, якая раса. Будзе добры-добры, сонечны дзень.

- Гэта нічога не значыць, раса, - сказаў Андрэй. - Часам, вельмі рэдка, прыкметы не збываюцца. Сёння ўвечары збярэцца на дождж.

- Адкуль ведаеш?

- Памятаеш, я табе распавядаў, як той ачмураны хлопец з Заходняй рубануў мяне... Бедны... Ён і не думаў, што падарыў мне такі барометр. Рана часам ные на непагадзь.

- Ну і добра, што дождж, - сказала яна. (Дні сапраўды стаялі занадта спякотныя.) - Дождж абмые лістоту, яна ажыве... Ах, любы, любы мой. Якое гэта шчасце, дождж!

- Ну, вядома. Вось ты ачуняеш, і мы паедзем у Сухадол. Як там дождж бяжыць па рацэ! Набліжаецца, набліжаецца. Захапіў. Кроплі скачуць, як цвікі, потым пераходзяць у бурбалкі. Вада як закіпае. А ў нас над чаўном тэнт, а ў чаўне шмат сена, пульхнага, свежага... Галава дурэе.

- Я вельмі хачу ў твой Сухадол. Абавязкова. Мы з'ездзім на месца, дзе быў паром.

- Так. Каб нашы, тыя, што былі, маглі бачыць гэта, як бы яны ўзрадаваліся.

Андрэй гладзіў яе валасы.

- Ведаеш, - сказаў ён, - мне заўсёды здавалася, што ў тую ноч паміж маёй прабабкай і тваім прадзедам быў пакладзены пачатак чамусьці падобнаму на вялікае, амаль нязмернае

каханне. Яно толькі не паспела набрацца сілы. Каб быў час на тое, каб яна забыла боль, каб яна не трапіла ў высылку - яны б, магчыма, пакахалі. Добра было б.

- Не, - сказала яна, - гэта было б вельмі нядобра.

- Чаму?

- Няўжо не разумееш? Тады мы былі б сваякамі, братам і сястрой. Нам нельга было б так, як мы зараз.

- Шкада, - уздыхнуў Андрэй. - Мне вельмі хацелася б, каб і ў іх было так, як у нас...

- Чакай, - быццам знайшоўшы магчымасць суцешыць яго, сказала яна. - Ну вядома ж, гэта нічога не вырашае. Нават каб яны былі разам. Твой дзед і мой прадзед былі б ад розных бацькоў. Прайшло чатыры пакаленні.

Яна радасна засмяялася:

- Мы з табою былі б чымсьці накшталт "васьміюрадных" брата і сястры. У нас была б толькі шаснаццатая, калі не меней, частка агульнай крыві... Вядома, маглі б быць разам і яны... Гэта не перашкодзіла б нам... Няхай і яны...

Як быццам гэта залежала менавіта ад яе, быць Грынкевічавай і Гораву разам альбо не.

Абое ўсміхаліся, так удала развязаўшы заблытанае пытанне. Потым шэрыя вочы пасумнелі. Яна ўздыхнула:

- Шкада, што ў іх не атрымалася тое, што ў нас. Мне зараз заўсёды шкада ўсіх, у каго не атрымалася тое, што ў нас,

- Нічога, - пацалаваў яе Андрэй. - Не сумуй за іх. Яны шукалі. Як мы.

- Так, - сказала яна. - А цяпер дай мне лекі. Я вельмі хачу хутчэй быць здаровай. Для цябе. І прыгожай хачу быць. Нават сёння. Потым ты прычэшаш мяне. Я магу і сама, але ты робіш гэта лепей.

- Не трэба самой, - сказаў ён. - Беражы сілы. Яны табе сёння вельмі прыдадуцца.

Так праходзіў гэты неверагодна шчаслівы, споўнены сонечнымі зайчыкамі і птушынымі спевамі, споўнены да краёў любоўнай увагаю і адначасова трывожны дзень.

Толькі кожны з іх хаваў трывогу.

...У тры гадзіны апоўдні Андрэя выгналі. Трэба было рыхтаваць Ірыну да аперацыі. Выганяць прыйшоў Глінскі.

- Ну, - дабрадушна сказаў ён, - давай адсюль, хлопча, давай. Яна ў добрым стане, ты аб гэтым паклапаціўся. А зараз - марш. Астатняе аддай ужо нам...

Зусім не саромеючыся гэтага чалавека, Андрэй абняў яе за плечы і пачаў ціха казаць на вуха:

- Ты толькі спакойна. Ты не бойся. Усё будзе добра. Я буду тут, поруч.

- Я не баюся, - сказала яна. - Гэта ж я іду да цябе.

Андрэй устаў.

- Да спаткання, - сказаў ён.

- Да спаткання, - усміхнулася яна.

Глінскі пасуровеў.

- Ды пацалуйцеся ж вы, - сказаў ён. - Пацалуйцеся вы, урэшце. Як маленькія, не разумеюць усёй карысці... Некалькі дзён ёй нельга будзе... Ну!

Андрэй схіліўся і пацалаваў яе.

...Пакуль яе рыхтавалі да аперацыі, ён хваляваўся, але ведаў: асаблівай небяспекі не было на бліжэйшыя тры гадзіны. Ён вырашыў прыйсці акурат у шэсць. Каб яна адчувала, што ён чакае, што ён тут.

Дамовіўся з Сашанькай, каб яна кожную палову гадзіны выходзіла да яго і казала, як справы. Паспрабаваў сказаць пару слоў Яшу і Глінскаму, каб яны...

Але першы кінуў толькі пару падбадзёрваючых слоў, а другі наогул абарваў Андрэя.

Так, ён зараз быў непатрэбны тут.

Толькі Сашанька паглядзела на яго спагадліва, вільготнымі вачыма і мякка сказала:

- Усё будзе добра, Андруша... Ідзіце вы лепей пад'ешце, пакуль не пачалося.

Ён падумаў, што яаа мае рацыю, і выйшаў са сквера на залітую сляпячым сонцам шумлівую вуліцу. Вуліца жыла звычайным жыццём, і, можа, гэта было б нават правільна, каб да аперацыі рыхтавалі звычайнага хворага, а не жанчыну ў росквіце год, уражаную людскою рукой!

У нейкай сталовай, падобнай на студэнцкую, ён сеў за стол і спытаў сабе абед. Яму вельмі хацелася есці, але як толькі ён апусціў лыжку ў суп, адразу адчуў, што не здолее праглынуць і кроплі, - як завязала.

Выйшаў. Адчуваючы ўсё ж, што ён можа зваліцца з ног, не дачакаўшыся канца аперацыі, ён зайшоў у вулічную кавярню пад тэнтам і выпіў там тры чашкі кавы. Цяпер сэрца білася зусім па-іншаму, напоўнена і моцна, а вочы прыдбалі, здавалася, асабліва бязлітасную яснасць погляду на навакольны свет.

Стрэлкі гадзінніка паўзлі марудна. Ён сядзеў і, апёршыся на столік, на якім слаба дымела некранутая чацвёртая чашка, глядзеў у той бок, дзе за скверам бачны быў інстытут. Папяроса таксама сцяліла валокны, шызыя з боку тытуню, жаўтаватыя і цяжкія - з муштука. Тры струменьчыкі: празрысты, шызы і дымны. І ўсе яны чэзнулі, па меры таго як кава стыла, а папяроса згасала.

Ён устаў і рушыў у інстытут, хаця да аперацыі было яшчэ з паўгадзіны. Назіральнік з боку пабачыў бы яго занадта выразныя рухі і зразумеў бы, што гэты чалавек шалёна нервуецца, але сам ён думаў, што ён спакойны.

...Шэсць гадзін. Дзень хіліцца да вечара, Ад дрэў ляглі ўжо вячэрнія цені. Зараз яе вязуць у аперацыйную, Трэба быць бліжэй да яе. Хоць бы ў вестыбюлі.

У вестыбюлі той самы гардэроб, тая ж брыдкая кніга на стале, кніга існаванняў і сконаў, кніга лёсаў.

Дзверы без стуку хістаюцца за праходзячымі: туды-сюды, туды-сюды, у розныя бакі. Белыя дзверы на дзве палавіны.

За аднымі з такіх дзвярэй яна. Пэўна, пачалі. Хто б зрабіў, каб іхнія рукі былі спрытнымі і ўдалымі, каб шчасліва скончылася ўсё?

Бог? Ён, Андрэй, не верыць у бога. А веруючым, пэўна, лягчэй.

Як гэта ў малітве: "Захавай дом мой". Не, ён не памятае. А можа, гэта і не ў праваслаўнай малітве?

Мозг, здавалася, нічога не мог, а на самай справе заўважаў усё так зорка, як ніколі.

...Вось правезлі на пахілых драбінках вялізны сіні балон з надпісам "вадарод"... Балон... Пакуль не правялі газавую лінію - давядзецца мець балоны. Ёй нельга, каб холадна... Добры дом...

- Што з вамі? - дакранулася да яго пляча Сашанька. - Вам дрэнна?

- Чаму? - здзівіўся Андрэй.

- Вы бледны, як смерць.

- Нічога, - голас гучаў, як чужы. - Як там?

- Цудоўна, - адказала Сашанька. - Усё ідзе як трэба... Я выйду праз гадзіну.

- Я, пэўна, пачакаю ў скверыку, - тым самым голасам сказаў ён.

Занадта прамы, ён накіраваўся да дзвярэй. Сашанька паглядзела на яго і пахітала галавой.

Ён выйшаў проста ў добры майскі прысмерак і сеў на лаўку. Успомніўся хлопчык, што дзесяць дзён таму весела ішоў на спатканне з маці. Дурны хлопчык!

Ну, а хіба ён, Андрэй, больш разумны, калі думае аб газе, аб дзецях, чорт ведае аб чым у час, калі яна так пакутуе?

І раптам ён зразумеў, што ўвесь гэты час ён толькі вонкава думае аб іншых прадметах, што ўвесь гэты час у душы жыў і катастрафічна нарастаў жах, нясцерпны жах і бязмерная боязь за яе.

Сэрца падала ўніз. Цьмянела ў вачах. Каб быў голас, ён з насалодаю закрычаў бы па-жывёльнаму, дзіка, нема.

Ніколі, ніколі яшчэ ў жыцці не было такога жаху. Нават тады, калі ўцякала партызанская армія і "фокевульфы" ныралі над самымі галовамі.

І не так страшна было, калі хлопцы наступалі на сяло, занятае бандай, а са званіцы білі кулямёты.

І не так страшна было, калі шкляное паветра калыхалася над разбітай машынай, там, на шашы, над невялікай рэчкай, якая завецца Бобр.

Неяк занадта скора і зусім де ў час пачало цямнець. Калі ён узняў галаву, здзіўлены гэтым, ён пабачыў, што з боку Масквы-ракі на будынак, на вяршыні дрэў, на ўвесь застыглы горад насоўваецца цяжкая хмара, свінцова-чорная, з нейкім цьмяна-барвяным водбліскам. Пэўна, ад незлічоных агнёў, што спуджанымі іскрачкамі гарэлі пад ёй.

"Так, паўсюль запалілі агні. Бо стала зусім цёмна. Нават вулічныя ліхтары запалілі. Нават тут, у скверы".

Чаму не ідзе Сашанька? Ён глядзеў на гадзіннік і ўпершыню ясна зразумеў, што аперацыя цягнецца ўжо больш чым дзве гадзіны. І такі спакой вакол, быццам прырода і ўвесь горад уцягнулі галовы ў плечы, чакаючы непазбежнага.

Ён амаль пабег у будынак і сутыкнуўся з медсястрой.

- Як?

- Ды не нервуйцеся вы так, - сказала Сашанька. - Фу! Не мужчына, а мокрая курыца.

- Што?

- Усё ідзе як мае быць. Быў лёгкі шок. Спынілі пераліваннем крыві непасрэдна ў аорту, па метаду Пятроўскага... Аперацыя складаная, але самае цяжкае скончылася... Ідзіце ў вестыбюль: зараз будзе дождж.

- Не магу. Я заўважу, калі ён пойдзе.

- Вы заўва-ажыце, - сказала сястра.

I раптам узяла яго руку і, гладзячы яе, сказала:

- Ну не трэба, не трэба. Я даю вам слова, чуеце, я даю вам слова, што ўсё ідзе добра..

Знікла. Ён адышоў ад сваёй лаўкі і з трывогаю, ад якой як толькі не разарвецца сэрца, глядзеў на крывава-свінцовую хмару, на фоне якой вартымі жалю, малюсенькімі лапікамі кідаліся ў трывозе галубы.

Пэўна, так яны кідаліся і тады, калі ішлі нейкія там татары і полымя жэрла прадмесці, падступаючы да муроў Крамля.

Няма прыстанку! Няма жыцця! I дзе ён, прытулак, знішчаны агнём?

З жахлівай выразнасцю ён адчуў, што і ён слабы, як птушка перад страшнай навалай, перад тупой, жорсткай сілай, якая рушыць на яго. Не дапамогуць смеласць, розум, сіла - нічога, нічога!

Насунецца і знішчыць яго прыстанак, яго прытулак, яго цеплыню - адзінае, дзеля чаго ён жыў усе гэтыя дні,

I тады Андрэй сеў і, як закляцце, пачаў ліхаманкава і страшна ці то кленчыць, ці то проста ўмаўляць кагось:

- Я вельмі, вельмі, вельмі люблю яе. Я вельмі, вельмі, вельмі буду яе любіць... Ратуй яе, ратуй... Справядлівасць, калі ты ёсць, зрабі, каб яна жыла... Справядлівасць, калі ты ёсць, зрабі, каб яна засталася жывой... Ёй нельга, нельга, нельга... Вазьмі ў мяне палову жыцця і падзялі з ёю... Вазьмі ў мяне... Вазьмі... Вазьмі...

Ён хлусіў, не адчуваючы гэтага. У сэрцы ягоным не было ў гэты момант ні кахання, ні планаў - нічога. Адзін толькі боль за яе, адзін толькі жах за яе, адно толькі жаданне, каб скончыліся яе мукі і яна была здаровай.

- Няхай ніколі не бачыць яе... Няхай ніколі не бачыць яе... Няхай ніколі. Абы ведаць, што жыва... Нават ведаць, што кахае другога... Так, нават гэта... Абы ведаць, што яна засталася жыва, што яна недзе жы-ва...

Ён не чуў ужо, як хвастануў ачышчальны лівень, як зямля набрыняла вадою, прагна ўсмактала яе і перастала прымаць, разліўшы па ўсім абшары сквера лужыны, як стала свежым паветра, як сталі цяжкімі і абвіслі галіны дрэў і самая іхняя кара стала вугальна-чорнай. Ён сядзеў і ўмаўляў кагось.

- Андрэй!

Перад ім стаяў Яша, мокры, хоць выціскай. З кароткіх рукавоў халата струменямі лілася вада. Мокрыя валасы касіцамі звісалі на лоб, і выгляд ад гэтага быў такі няшчасны, што ў Андрэя як нешта штурханулася ў сэрцы.

- Усё?- з жахам спытаў ён.

- Вядома, усё, - з непаразуменнем сказаў няшчасны Яша. - Я ж табе казаў, што гэта тыгр ад хірургіі... Я дзесяць хвілін клікаў цябе з ганка. І вось прамок з-за цябе, як цуцаня... А ўсё філантропія да розных недаробленых Вертэраў. Каб яе, каб...

Толькі тут, толькі пасля гэтай лаянкі, толькі пасля таго як падбегла мокрая Сашанька і Яша з раптоўнай рашучасцю абхапіў яе, захінуўшы крысамі халата (быццам гэта магло чымсьці дапамагчы ад дажджу), Андрэй зразумеў, што пакуль што ўсё скончылася, і, кінуўшыся да ардынатара і медсястры, абняў іх дрыжачымі рукамі.

## Раздзел XXXII

Калі ён пабачыў Ірыну ўпершыню пасля аперацыі - у яго ўпала сэрца. Не ў тым справа, што аблічча было знясіленым і нейкім перапалоханым.

Справа была ў тым, што на гэтым твары быццам адразу адбіліся пражытыя гады. Яна заўсёды была падобная на поўнае жыццём дзяўчо. Зараз гэтага жыцця не было. Яно ледзь тлела недзе ўглыбіні, не маючы змогі ажывіць блакітны твар. Яна ўвесь час была ў поўнай прытомнасці. Але што гэта была за прытомнасць?! Прытомнасць позіркаў, прытомнасць дрыжачых вей. Ёй было балюча сказаць слова, цяжка дыхаць. Самае найбольшае, што яна магла, гэта сказаць:

- Папраў падушку.

Усе пяць дзён, што ёй было так цяжка, ён сядзеў каля яе і супакойваў. Не спаў.

- Вар'яты, - казаў Глінскі, - чортавы вар'яты.

А Яша, дарэмна ўдаючы цынізм, усміхаўся:

- Прапаў казак.

Андрэю было ўсё адно. Ён ніяк не мог забыць, што ў першыя хвіліны сустрэчы гэты адчужаны ад жыцця твар паспрабаваў усміхнуцца яму. Ён ведаў: у адной гэтай няўдалай усмешцы было выкупленне ўсіх яе і яго грахоў.

А потым ёй стала лягчэй. Яна відавочна ачуньвала. Нават колер скуры пачаў набываць румянец: не так, як да аперацыі. Пачала есці. Пачала ўсміхацца яму і ўсім іншым па-сапраўднаму,

Як дзіцёнак, радавалася кожнай праяве жыцця за акном, кветкам, якія прыносіў ён, гучнаму, бы ў пустую бутэльку, буркатанню голуба.

Аднойчы Андрэй бачыў з-за завескі, як яна тонкімі пальцамі спрабавала злавіць на сцяне сонечны зайчык, які выпадкова трапіў у чашку з вадой і не мог вырвацца, кідаючыся то на сцяну, то на коўдру.

На трэці дзень пасля таго, як ёй стала лягчэй, яна ўпершыню папрасіла пацалаваць яе.

- Я так рада жыццю, - сказала яна. - Раскажы мне штось.

- Што?

- Раскажы, як ты закахаўся ў мяне.

- Спачатку была рука, - сказаў Андрэй. - Рука на экране. І яшчэ голас. А самае галоўнае - думка. Думка ў цемры... Гэта я пачуў перш за ўсё і адчуў сабою... А потым я пабачыў і цябе самую. Ты была ў шэрай, званочкам, пушыстай спадніцы і цёмна-шэрай нейлонавай кофтачцы...

- Так, - сказала яна, - а ты быў у нагавіцах нейкага цёмна-васількавага колеру і ў шэрым пінжаку. А гальштук у цябе быў таксама сіні. Я падумала яшчэ: "Вось які блакітны хлопец з'явіўся".

- І ты памятала ўсё гэта?

- Дурань, - сказала яна.

Андрэй пацалаваў яе рукі, што нерухома ляжалі паўзверх коўдры.

- Ты ляжы, - папрасіў ён, - маўчы. Я сам буду казаць.

-Ну.

- А потым была Нерль. Там я зразумеў, што ты неяк адрозніваеш мяне сярод іншых, шмат чаго ведаеш пра мяне. І там я неяк адтаў ад таго холаду, які жыў ува мне, ад усяго гэтага свінства, што зрабіла са мною жыццё... Ты ж ведаеш, я тады ляжаў у руінах... І раптам пяро голуба на месцы, дзе калісь забівалі, і тая белая свечачка ў лугах. Такая празрыстая, стройная, адбітая ў вадзе. Як ты... І ты была поруч, ты адкрыла мне ўсё гэта, і выратавала, і прывяла да святла.

Ён бязважка гладзіў яе нерухомыя рукі.

- Табе не балюча?

- Не. Мне прыемна.

- Але тады я яшчэ не ведаў, што гэта каханне. Я зразумеў гэта на сваёй рацэ, на месцы парома, і вышэй, за вёскаю Кручы... Яна была такая цёмна-кучаравая, вёска. Там буслы плавалі над ракою і паветра было вячэрне-празрыстым і месячным. Там я зразумеў, што ўся ты, са сваёй сілай і слабасцю, раптам стала патрэбна мне. На радасць і гора. І мне нельга жыць без цябе. Свет без цябе пусты, а дрэвам няма чаго

спяваць аб радасці. Бо ты адзіная, каго мне трэба было сустрэць на зямлі, а другіх няма...

Маўчанне было ў пакоі. Яна ляжала, гледзячы на яго мяккімі шэрымі вачыма.

- Якое яно добрае, жыццё, - сказала яна. - Ах, толькі б жыць. Мне нават страшна з табою. Вышэй жа, здаецца, ужо няма куды... Што ж нам рабіць, міленькі? Што рабіць са скарбам, які трапіў да нас у рукі?

- Слухай мяне, - сказаў ён. - Ты не палохайся скарбу і шчасця. У нас наперадзе вялікае жыццё, і мы не стомімся адзін ад аднаго за гэты час. Мы будзем вельмі многа працаваць. Пісаць дзівосныя кнігі... Калі хочаш, мы напішам першую сапраўдную гісторыю беларускага мастацтва. Гэта цяжка. Нам давядзецца аб'ездзіць разам усю Беларусь, адшукваць тое, што забыта, вывучаць, біць у набат, калі штосьці занядбалі або бураць. Гэта будзе сумленная гісторыя. Яна не будзе забываць ні добрага, ні дрэннага... Ты прыкладзеш да гэтай кнігу веды, а я так выкладу яе, каб яна чыталася запоем, як легенда... З гэтых вандраванняў можа вырасці і другая кніга, пра Беларусь як яна ёсць, пра ўсё добрае і дрэннае на гэтай зямлі. Там будуць дарогі, людзі, запісы казак, песняў і сапраўдных апавяданняў аб жыцці, шмат фатаграфій усіх прыгожых і непрыгожых куткоў радзімы...

- Гэта добра.

- І ва ўсім гэтым будзе твая добрая іронія і маё жорсткае захапленне. А яшчэ мы будзем пісаць кожны свае кнігі... А вакол будзе зямля, глухія пушчы, светлыя рэкі, азёры, поўныя неба... Мы будзем засынаць і прачынацца разам, восем тысяч разоў прачынацца разам.. А можа, і больш. І адчуваць адзін аднаго, і зоры, і вячэрнія песні, і след за галавою выдры, што пераплывае раку, і камяніцы разбураных палацаў, і ўсплёск бабра ў месячным сяйве... Мы будзем шмат працаваць і шмат ездзіць. Па ўсёй зямлі, па ўсіх акіянах...

- Акіяны потым, - сказала яна. - Раскажы спачатку пра твае азёры, пра тваю зямлю.

- Яна непрыгожая з акна цягніка, - сказаў Андрэй. - Таму што немцы, баючыся партызан, высеклі лес паабапал дарог... Для таго каб даведацца, якая яна, трэба заглыбіцца ў яе. І там можна пабачыць адны з самых лепшых куткоў зямлі. Там азёры на захадзе сонца стаяць чырвонымі, а ў іх спакойнай вадзе б'е рыба. Там лясы, у якіх трубяць ласі... Амаль ніхто не ведае, што ёсць там не толькі раўніны, а і высокія ўзгоркі, парослыя лесам.

З узгоркаў бягуць празрыстыя ручаіны, у якіх жыве рыба-стронг... Прысмеркам вада ў Дняпры робіцца малочна-жамчужнай. І неба тады такое ж, як вада. Бледны месяц вісіць у гэтым небе. Калі ў такі час плывеш па рацэ ў крылатым чаўне - неба над табою і пад табой. Як казачны карабель у паветры, плыве човен... Яна мірная і пяшчотная, як дзяўчына, як ты, мая зямля... Але ёсць на ёй і змрочныя куткі. Замшэлыя лясы, сівыя імшары, па якіх уначы, пад самотнай зоркай скача прывіднае дзікае паляванне... У навальніцу бары гудзяць так страшна, як душа майго мірнага народа, калі яго пакрыўдзяць... Але гэта праходзіць з першым праменем сонца або месяца, і зноў уначы кусціцца сонная бузіна над курганамі продкаў...

Ён змоўк, пабачыўшы, што яна ляжыць, закрыўшы вочы, а веі яе вільготныя.

- Вельмі буду цябе кахаць, - не адкрываючы вачэй, сказала яна.

...Гэта адбылося на чацвёрты дзень пасля размовы аб азёрах і курганах. Ірына відавочна ішла на папраўку. Яна ўжо спрабавала напаўляжаць на падушках, гледзячы ў парк, у якім пасяліўся раскошны і сонечны чэрвень, жартавала з Яшам, з асалодаю абуджэння да жыцця нюхала і гладзіла пальцамі кветкі, прынесеныя Андрэем.

І вось надвячоркам таго дня Андрэй, вяртаючыся з кветкавага магазіна, зразумеў па мітусяніне ў калідоры, што адбылося нешта дрэннае. Ля дзвярэй палаты стаяў небывала сур'ёзны Яша.

- Чакай, Андрэй, - сказаў ён. - Пакуль што туды нельга.

- Што такое? - спытаў збялелы Андрэй.

- Упаў пульс, - сказаў Яша.

Сашанька высунулася з дзвярэй, устрывожаная, у збітым набакір белым каўпачку.

- Як? - спытаў Яша.

- Пульс часты, малога напаўнення, - сказала яна і знікла ў палаце.

Ардынатар пакруціў галавой.

- Яша, гэта дрэнна? - спытаў Андрэй.

- Зараз змерым ціск. Калі ўпаў - гэта вельмі дрэнна, Андруша.

- Пусці, - сказаў Андрэй.

- Чакай, - сказаў Яша. - Там зараз ідзе змаганне. Не перашкаджай.

Не заўважаючы Андрэя, у палату амаль прабег Глінскі з асістэнтамі.

- Што ж рабіць, Яша? Што рабіць?

- Чакай. Чакай і трымайся.

Ён стаў чакаць. Гэта цягнудася вельмі доўга, вельмі-вельмі доўга. На дварэ пачало цямнець, а тыя, у белым, усё яшчэ былі ў палаце.

Потым адтуль выйшаў Глінскі, відавочна пастарэлы, з бліскучымі вачыма.

- Яна просіць цябе, Андрэй.

Андрэй кінуўся паўз яго.

- Як? - спытаў у Глінскага Яша.

Той толькі махнуў рукою, заходзячы за Андрэем у палату.

...Першае, што пабачыў Грынкевіч, было яе аблічча, нейкае незваротна змененае, аблічча жыхара ўжо не гэтага свету.

Вакол яе завіхаліся, але яна не звяртала на гэта ўвагі. Вочы яе глядзелі толькі на Андрэя, быццам у палаце не было нікога, акрамя яго.

І Андрэй адразу, з незвычайнай яснасцю зразумеў: гэта ўсё. Зразумеў, але не паверыў сэрцам.

- Хадзі сюды, - ясным высокім голасам сказала яна.

Ён падышоў, сеў. Яна паклала на яго руку сваю далоньку.

- Я хачу сказаць табе нешта. Не забывай Ганну. Чуеш? Не забывай. Мне цяжка казаць табе гэта, але яшчэ цяжэй пакінуць цябе аднаго.

- Я не кахаю яе.

- Ведаю. Але мне цяжка пакінуць цябе аднаго. Дай мне слова... Яна будзе добрай да цябе... Дай слова...

- Не магу, - сказаў Андрэй. - Ты выправішся, ты будзеш са мной.

Яна адразу неяк звянула, і нават цень ласкавай усмешкі з'явіўся ў шэрых глыбокіх вачах.

- Так, - сказала яна. - Вядома. Я рада, што ты не даў слова.

Ад гэтага ценю ўсмешкі ў сэрцы Грынкевіча зноў аджыла слабая надзея. Яна ўсміхалася да яго, яна магла і павінна была жыць.

За вокнамі невыразна цямнелі дрэвы. З-за іх далятаў прыглушаны шум вячэрняга горада. Там, у дрэвах, быў, напэўна, ветрык, але такі слабы, што яго можна было заўважыць толькі па рэдкіх, слабеючых уздыхах у лістоце.

У палаце цьмяна гарэла святло, адзін чалавек схіляўся над другім, а вакол стаялі маўклівыя, небывала сур'ёзныя ўрачы.

Але яны зараз не існавалі ні для яе, ні для яго.

- Андрэйка, - сказала яна, - як ты пакутуеш... Ох, як я цябе буду кахаць.

Андрэй сеў ля яе. Было вельмі-вельмі ціха. І тады Ірына абвяла позіркам людзей у белым і сказала:

- Пакіньце нас адных.

"Мы зрабілі ўсё, што магчыма", - казалі вочы Глінскага, але ўголас ён сказаў другое:

- Нельга. Я павінен застацца.

- Пакіньце нас адных, - паўтарыла яна.

Глінскі абвёў вачыма калег. Потым ягоны позірк спыніўся на твары Ірыны, на безудзельна-адчайным твары мужчыны.

- Пакіньце, - ціха сказаў ён.

Яны выйшлі. Гусцеў змрок за акном, і ўздыхі ўсё яшчэ ляцелі з начной лістоты. Усё радзей і радзей.

- Пацалуй мяне, - сказала яна.

І ён бязважка, каб не зрабіць ёй балюча, але палка прыпаў да яе вуснаў сваімі дрыжачымі вуснамі, быццам імкнуўся пераліць у яе ганебны збытак уласных сіл.

- Праспявай мне нешта ціхае, - сказала яна, прыціскаючыся да яго.

- Добра.

- Толькі пачакай. Яшчэ два словы.

Ён гладзіў яе валасы.

- Дай мне слова, Андруша, - трывожна сказала яна. - Дай слова.

Ён ведаў, аб чым гэта, і згодна хітнуў галавою. Толькі каб супакоіць яе.

- Ну вось, - уздыхнула яна. - Мне спакойна. Спявай.

Андрэй заспяваў ціха. Заспяваў тую калыханку, што, як усе калыханкі Беларусі, падобная на трапяткі пяшчотны ўздых. Яна слухала, гледзячы на яго, а зітханні ўсё даляталі з лістоты. Радзей, радзей.

Яны былі такімі слабымі, гэтыя зітханні.

А голас вёў і вёў перарывістую песню:

Вавёрка ў закутку
Пражу прадзе,
Кола залатое
Сонна гудзе...
Сціхні, мой ветрык,
Вавёрка спіць,
Аб арэхах срэбных

Ваверка сніць...
Спіць яна...
Спіць...
Вочы закрывае,
Зашыўшыся ў дом,
Цёплым хвастом,
Рудым хвастом...
Рудым...

Зітханні далятаі з лістоты.

Радзей. Усё радзей. Зніклі.

Закрываючы вочы, яна сказала:

- А я і не думала, што вашы калыханкі такія... Я засну, любы.

- Спі, - сказаў ён,

Прыціскаючы яго руку да сваіх грудзей, яна апусціла веі.

Яна спала, і яго рукі былі ў яе руках...

...Потым пачалася агонія.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Ён сядзеў, трымаючы ў руках яе рукі, якія пачалі астываць. Нерухомы над нерухомай. Безудзельны над безудзельнай. Ён верыў, што пакуль яе рукі ў яго руках - у іх не можа знікнуць цеплыня.

І ён ні ўва што больш не верыў.

Пальцы халаднелі. Пальцы былі ўжо зусім халодныя. І тады ён вызваліўся і склаў на грудзях гэтыя бедныя рукі, а сам стаў чакаць. Пакуль ён мог спадзявацца на дзіва, ён не павінен быў кінуць, здрадзіць, аддаць у рукі цемры.

Ён чакаў, пакуль не перастаў спадзявацца, а потым з цяжкасцю разарваў свае апошнія абдоймы і назаўсёды, цяпер ужо назаўсёды, адарваўся ад яе. Сеў і стаў глядзець.

Здаецца, спала. У куточках вуснаў цень загадкавай усмешкі, а бровы злёгку, быццам здзіўлена, узняты.

Куды ты заглядаеш, мая апошняя, у якую таямніцу, невядомую мне? Чаму здзіўлены твае бровы?

І што зараз рабіць мне?

Зямная персць, зямная юдоль - будзьце вы благаславёны, будзьце вы пракляты.

І што зараз рабіць мне, калі ты не пускаеш мяне ў сваю таямніцу?

Хто адкажа? Хто адпомсціць? Хто суцешыць?

Цень усмешкі і здзіўленыя бровы. Куды ты заглядаеш? Куды?

Потым ён устаў і выйшаў. Яна не адказвала.

Бы ў тумане, пабачыў, твары Яшы, Сашанькі, твар Яніса, Ганны, спіну Глінскага, які стаяў ля акна.

- За што ж гэта, Андрэй? - глуха спытаў Якаў.

Хіба ён ведаў за што? Ён не ведаў. Не ведаў нават, чаму прыўзняты бровы.

- Адкасніцеся ад яго, - сказаў Яніс. - Нашто яму вашы словы?

І ён моцна абняў Андрэя за плечы.

Туман знік у вачах Грынкевіча ад гэтай грубай сяброўскай ласкі. Ён ведаў, Янісу таксама цяжка. Ён ведаў, што і Яніс плача, як ён, без слёз. Адным сэрцам.

- Правядзі мяне да выхаду, - глуха сказаў ён.

Яны спыніліся ў скверы, які спаў усімі галінамі, усімі птушынымі гнёздамі на іх.

Рукі Яніса ляжалі на плячах Андрэя.

- Мацуйся, мой родны.

Андрэй выцягнуў з кішэні і паклаў на далонь Яніса бумажнік.

- Вось, - сказаў ён. - Зрабі ўсё, каб адправіць яе ў Сухадол. Яна хацела быць там. Апошняе жаданне. Прабач, я проста не магу сам хадзіць паўсюль... Я толькі павязу.

- Я разумею цябе, - сказаў Яніс. - А як ты?

- З часам і я... - сказаў Андрэй. - Я абавязкова пайду туды, калі наблізіцца канец... Мы ляжам поруч. У маёй зямлі. Каб наводдаль бачыць буслянку, а пад гарою Дняпро.

Ён уздыхнуў.

- Паромная гісторыя скончылася... Канец.

- Куды ты пойдзеш?

- Я вярнуся. Раніцай. Да... раніцы, сябар.

- Да раніцы... сабрыс.

Андрэй павярнуўся і пайшоў у глыб скверыка. Яніс стаяў і глядзеў, як цень яго друга паглынае змрок.

## **Р а з д з е л XXXIII**

Ён ішоў начной Масквою. Крокі паміралі ў вуліцах, на якіх не сустракалася ні людзей, ні машын. Горад быў бязлюдны, аддаены ва ўладу яму. Блыталіся завулкі і вуліцы, і нікога не было поруч, акрамя ценю.

Ішоў, не задумваючыся, куды ён ідзе. Усё менш ставала святла, і гэта азначала, што ён набліжаецца да ўскраін. І тут ён

пабачыўся з зорамі, якіх няма ў цэнтры вялікага торада. Ноч была цёмная, ясная, зоры былі халодныя...

Упала адна, а за ёю другая. Гэта, вядома, не былі Леаніды. Леаніды не вернуцца да зямлі. Яны бачылі на ёй столькі, што не хочуць больш глядзець на яе нівы і цяністыя лясы, пакуль усе людзі не стануць іншымі.

Усе да аднаго.

Ён спыніўся. Перад ім невыразна сінеў у зорным святле лёгкі, узнесены да нябёс сваімі бязважкімі сценамі і ўсечаным дахам Круціцкі церамок. Даўно, вельмі даўно збудаваў яго нехта з продкаў Андрэя, вымушаны пакінуць Дняпро і яго берагі. Яму, напэўна, не было лягчэй.

Гульбішчы прывідна абдымалі ўвесь начны свет, а праз іхнія аркі мігцела зорамі начное неба.

Але яшчэ вышэй за іх стаяў блакітны церам. Стаяў пад зорным шатром, як мара, узнесеная да зор, як спроба суцяшэння ў тым, у чым нельга суцешыць.

Інстынкт прывёў чалавека сюды, дзе ён быў шчаслівы з ёю. І чалавек сеў на цагляныя сходы.

Дзе ты? Куды пайшла? Дзе адшукаю твае сляды?

Ён песціў рукою халодную цэглу, быццам гэта была яна, але ўсё гэта было дарэмна, а слёз не было. Таму ён устаў і апошнім позіркам акінуў блакітныя муры. Ён ведаў, што ніколі больш не прыйдзе сюды.

- Бывай, - сказаў ён. - Бывай.

Вуліцы. Крокі. Пустэча.

За што было ўсё гэта? Хто зрабіў гэта?

Андрэй раптам спыніўся. Так, зараз ён ведаў, хто гэта. Раптоўная думка - і ўсё стала на свае месцы.

Ён стаяў у гэты момант у нейкім парку, цёмным і пакручастым, як шляхі чалавечыя. Зоры заблыталіся ў галінах, але ўнізе было цёмна. І ў гэтай цемры чалавек раптам зведаў усё, а ў сэрцы, поруч з бязмежным болем, якому ніколі не будзе канца, поруч з бязмежнай і горкай любоўю, ажывала нешта другое.

Так, вядома, ва ўсім былі вінаваты я н ы.

Ім было начхаць на тое, што мірыяды існаванняў хочуць жыць, будаваць дамы, песціць дрэвы, Для нелюдзяў вайна і ўсё тое жахлівае, што яна нясе, - была толькі сродкам для ўсталкавання іхняй "геніяльнасці", іх асобы, іхніх смярдзючых, нікому не патрэбных, мёртванароджаных дактрын.

Так, жыццё не дае шчасця. Але яно дае запал вайны. Нельга дазволіць такога. І, калі трэба, ён стане першы супраць усяго гэтага.

Уладары жаху, ханжы, нечысць. Усё, чым жыў чалавек з часоў вялікай царыцы Хатшэпсут: яго ўсеабдымныя думкі, яго геніяльнасць, уся яго бязмерная добрая цеплыня, усё каханне мірыядаў, што адвеку жылі тут, - усё гэта - дай ім волю - магло стаць халодным атрутным пылам.

...Пасярод нешырокай пляцоўкі стаяла пад цёмнымі дрэвамі ручная дзіцячая каруселька. Ён не ведаў, дзеля чаго ён падышоў да яе, дзеля чаго паклаў руку, дзеля чаго стаў хадзіць вакол, павольна круцячы яе, пустую, нікому не патрэбную ў гэты глухі начны час.

Магчыма, і не мае права на шчасце чалавек, якога чакае вечны бой. Але за што яна?! Яна, добрая, светлая, уся створаная для жыцця...

Яны забілі яе, а самі жывуць і зараз. Забілі лепшую на зямлі. Забілі за тое, што яна была ўвасабленнем кахання і любві, а любоў - гэта самае небяспечнае для іх. За гэта яны і забілі яе. За гэта і забілі.

Ён хадзіў і хадзіў па крузе, хадзіў, як змучаны сляпы конь у прыводзе малатарні, якому толькі і засталося, што хадзіць вось так.

Яны забілі яе, і для чаго была зараз гэтая няхітрая прылада, якая круцілася пад яго рукой?

Ён адпусціў руку. Ён моўчкі пастаяў хвіліну, а потым пайшоў у цемру алей, пакінуўшы пустую дзіцячую карусель.

Невядома, колькі ён блукаў, але ўсё яшчэ была ноч і зоры, калі ён убачыў сябе на паркавым адхоне, пад якім павольна бегла ўдалячынь базальтава-цёмная начная рака. Ён сядзеў на лаўцы, сядзеў бяздумна, а рака плыла і плыла. У гэтай вадзе не магла больш адбіцца светлая Нерль, але што было да гэтага рацэ.

Нейкае слова гучала ў яго вушах. Дзіўнае, чужое па гуках слова.

Рагнарадзі. Рагнарадзі. Рагнарадзі. Што такое Рагнарадзі? Дзе ён чуў гэта?

Ага, калісьці ў скандынаваў было паданне, што наступіць дзень і тады ўсе багі і героі прыйдуць на поле, што завецца Рагнарадзі, і стануць біцца на ім у страшэннай сечы, пакуль усе не падуць, а пасля час скончыцца.

Змрочнае паданне. Але Рагнарадзі чалавецтва будзе зусім іншым, светлым. Загінуць усе, хто не хоча або не можа ўвайсці ў

новае. Туды ўвойдуць добрыя і жывыя. Туды ўвондзе Яна, зусім жывая, і ён застанецца з ёй у памяці жывых. А нават калі ён не застанецца, бо справа яго жыцця стане непатрэбнай для новых часоў. І - Яна застанецца навекі, яна застанецца жывой. Каханнем, любоўю, якія заўсёды патрэбны на зямлі,

Яна застанецца.

- Чакаю майго Рагнарадзі. Чакаю майго Рагнарадзі.

Рыданне раптам нясцерпна пашырыла ягонае горла. А потым словы, што з'яўляліся аднекуль, сталі складвацца ў радкі. Паперы не было, але яна і не была патрэбна.

Захлынаючыся ад сухіх рыданняў, якія душылі і раздзіралі горла, аднымі ліхаманкава-адчайнымі, утрапёнымі думкамі ён раджаў гэтыя радкі на свет:

Словы паўночных паданняў
Годы амаль што згладзілі;
Словы прароцтва змрочнага,
Як ф'ёрдау начных берагі:
"Настане апошні дзень -
Бітва пры Рагнарадзі,
Ў якой загінуць героі,
Ў якой загінуць багі.
Будуць біцца да смерці,
Рыкам поўнячы горла,
Ў полі жалезным лягуць
Апошняй данінай мячам.
Не будзе ні пекла, ні рая,
Загінуць душы памёрлых,
А час зжуе іх даспехі,
А потым скончыцца сам".

Зоры застылі над галавой. Цякла начная рака. І, як рака, нястрымна цяклі словы:

Годы мае,
Як строфы,
Строяцца ў моцным парадзе.
Лёс чакае няўхільны,
Просты, як хлеб і свінец.
Чакаю майго Рагнарадзі,
Чакаю майго Рагнарадзі,
Чакаю майго Рагнарадзі,
І мне не страшны канец.
Быў змагаром суровым,
Ворагам быў сталёвым,

Рыцарам чалавечнасці
Над прорвай страшных баёў.
Я не ўцякаў ніколі
Ў вечнай бітве за волю,
Браў тое, што мне належала,
І тое, што не маё.
Меў я толькі радзіму:
Пушчы, палеткі, вежы,
Ясную песню жаўранка
Ў моры надрэчных траў.
Песня мне не належала,
Голас мне не належаў,
Слова мне не належала, -
І ўсё я ў змаганні ўзяў.
Бронзай гучала зброя,
Срэбрам звінела слова.
Зброяй і песняй такою
Здолеў я ўсё узяць,
І толькі не ўзяў адзінага,
Маёй адзінай любові,
Смерцю ўзятай любові.
Не мог у руках затрымаць.
Вазьмі сабе ружы тугі маёй,
Пакінь мне крывавыя макі,
Тыя, што на магілах
Забітых байцоў гараць.
Бывай, мой далёкі бераг.
Шчасце апошняе, дзякуй!
Няма забыцця на свеце,
І не ў ложку мне паміраць.
Я не пляміў ніколі
Рукі бязвіннай крывёю,
Не пляміў маною песню
І словам здрадніцкім - рот.
Я воінам быў нястомным
З жорсткасцю і хлуснёю,
І без забрала, да смерці
Біўся за просты народ.
Я ведаю: я загіну,
Загіну і не ўваскрэсну,
І ўсё ж за народы змагацца
Пакіну кагорты свае,

І будуць магутнымі словы,
І пераможнымі - песні,
Нават тады, калі прахам
Стануць косці мае.
Такія байцы не ўцякуць,
Такія сябры не здрадзяць,
Добрыя, як паветра,
Надзейныя, як свінец.
А потым настане бітва,
Бітва пры Рагнарадзі,
І чалавецтву старому
Прыйдзе паўсюль канец.

Нейкімі новымі, зусім не ранейшымі вачыма ён глядзеў за чорную раку, дзе нясмела пачыналі запальвацца першыя рэдкія агні. Ён не ведаў яшчэ, ці патрэбна ім яго крэда, яго новае "верую", гэтым агням.

Гэта будзе, напэўна,
Раніцай яснага мая,
Тады з не крывёю паэты
Параўноўваць будуць зару.
Зброя не будзе патрэбнай -
І людзі яе зламаюць,
Героі не будуць патрэбны -
І ў бітве апошняй памруць.
І лёсам нашчадкаў будуць
Толькі кахання раны,
І толькі аднойчы мужчына
Пралье жыватворную кроў,
І шчасце будзе нясцерпным,
Бы ад сліцця з каханай,
Толькі не два імгненні,
А тысячы тысяч вякоў.

Ён усміхаўся ў цемры, а агні, пакуль яшчэ вельмі-вельмі рэдкія, шырыліся і шырыліся за ракой.

Пралескі спакойна будуць
Квітнець на светлым прадвесні,
А дзеці - гуляць жалудамі
Пасаджаных намі дубоў,
І людзям не будуць патрэбны
Мае іржавыя песні,
І людзям не будуць патрэбны
Мой боль і мая любоў...

Думы мае загінуць,
Думы гневу і радасці,
Народжаныя ў пакутах
Тысяч бяссонных начэй.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Прыйдзі, маё Рагнарадзі,
Прыйдзі, маё Рагнарадзі,
Няхай забыццё, Рагнарадзі.
Прыходзь.
Наступай.
Хутчэй...

...Слёзы паліліся з вачэй адразу, нястрымна, цэлымі струменямі. І ён, без змогі стрымаць іх, упаў на траву і заплакаў так, як не плакаў ніколі ў жыцці. Ён ляжаў абліччам у траву і аплакваў свой лёс і лёс Ірыны, і яе пакуты, і чысціню яе вачэй, і рукі, якія песцілі яго валасы, і ўсё-ўсё, што магло быць і чаго ўжо не будзе: дарогі з ёю, музыку яе слоў, яе цеплыню поруч і яе радасць ад сонца, якога яна ніколі больш не пабачыць.

Потым, калі яму стала трошкі лягчэй, ён устаў. Трэба было ісці. Трэба было вярнуцца да яе, з якою не быў споўнены запавет продкаў. Трэба было супакоіць яе ў той зямлі, куды пойдзе і ён, скончыўшы шлях.

Гэты шлях толькі пачынаўся. На ім не было радасці. Была толькі праца, вайна, радкі... якім не было звароту да ранейшага.

Але на ім не было і хлусні, і абыякавасці, і боязі.

Баяцца больш не было чаго.

І ён пайшоў. Ён узышоў на гару і адтуль, з вышыні, пабачыў увесь абшар горада.

Гэты горад цяпер прачынаўся. Усё большала і большала агнёў на вуліцах. Кропля за кропляй, сотня за сотняй, яны ўзнікалі, успыхвалі, паступова адбіраючы зоры ў нябёс.

Зорнае неба сыходзіла на зямлю.

Горад прачынаўся.

1962 г.

**Караткевіч У.**
Нельга забыць: Раман. – Мн., Маст. літ., 1982. - 335 с., іл.

Раман прысвечаны жыццю творчай інтэлігенцыі. Аўтар падае сучасныя падзеі на гістарычным фоне. Праўнук беларуса Усяслава Грынкевіча, удзельніка паўстання 1863 года, сустрэў Ірыну Гораву, праўнучку рускага афіцэра Юрыя Горава і пакахаў яе.

Раман "Нельга забыць" вядомы таксама і пад назваю "Леаніды не вернуцца да Зямлі".